Хоцімская бібліятэчная сетка
Трасцінская сельская бібліятэка

# Спадчына трасцінскага краязнаўцы



2013

**Хоцімская бібліятэчная сетка**

**Трасцінская сельская бібліятэка**

# Спадчына
# трасцінскага краязнаўцы

***

*Зборнік артыкулаў*
*з перыядычнага друку*

**2013**

**Спадчыны трасцінскага краязнаўцы** : зборнік артыкулаў з перыядычнага друку [Тэкст] / Хоцімская бібліятэчная сетка, Трасцінская сельская бібліятэка ; [складальнік Л.А.Кляцова ; адказны за выпуск А.Ф.Лутчанкова]. – в.Трасціно, 2013. – 149 с.

Хоцімская бібліятэчная сетка, 2013

# Змест


АД СКЛАДАЛЬНІКА ........ 5

АД ЖЫЦЦЯ, АД СЛОВА НАРОДНАГА (да 100-годдзя з дня нараджэння М.Горкага) ... 7

БОЛЬШОЕ-БОЛЬШОЕ СПАСИБО! ........ 9

ВЕРНАСЦЬ СВАЁЙ ГАЗЕЦЕ ........ 10

ВЁСКА НАША РОДНАЯ ........ 11

ВОБРАЗЫ МІНУЎШЧЫНЫ ........ 18

ВОЛАТ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ (да 75-годдзя з дня нараджэння А.Куляшова) ........ 20

ВЫТОКІ ДРУКАВАНЫХ РАДКОЎ ........ 26

ГЛЫБОКАЯ СІМПАТЫЯ ДА ДОБРЫХ МАІХ ДАРАДЦАЎ ........ 29

ДЕЛО ЖДЁТ МАСТЕРА-УМЕЛЬЦА ........ 33

ДУШЫ СВЯТЛО ........ 34

ЗЕМЛЯ – БОГАТСТВО ........ 36

КАВАЛЕР ОРДЕНОВ СЛАВЫ ........ 37

КНИГИ ШОЛОХОВА – МОИ ДОБРЫЕ СПУТНИКИ ........ 39

КРЫНІЦА ЎЗБАГАЧЭННЯ ........ 41

ЛАСКОВОЕ СЛОВО – ЧТО ЯСНЫЙ ДЕНЬ ........ 44

ЛЮБИМЫЙ УЧИТЕЛЬ “КРАСНОЗВЁЗДНОЙ СИЛЬНОЙ ГВАРДИИ” (к 100-летию со дня рождения Аркадия Гайдара) ........ 47

ЛЮБОВЬ НА ДВОИХ ........ 49

МАЙСТАР МАСТАЦКАГА СЛОВА ........ 51

НАД ХОТИМСКОМ ВЗВИЛСЯ АЛЫЙ ФЛАГ ........ 54

“НАРАДЗІЎСЯ Я Ў ДНЯПРОЎСКАЙ СТАРАНЕ...” (да 85-годдзя з дня нараджэння А.А.Зарыцкага) ........ 55

НАРАДЗІЎСЯ Я Ў ХОЦІМСКУ (22 сакавіка-90 год з дня нараджэня Аляксея Зарыцкага) ........ 58

НАРОДНЫ ПАЭТ – ГОСЦЬ ХОЦІМШЧЫНЫ ........ 61

НЕ ЗАБЫВАЮЦЬ СЭРЦЫ МАЦЯРЭЙ ........ 66

НЕПАГАСНАЯ ПАМЯЦЬ ........ 68

НЕ РАСТЕРЯТЬ ДОБРОТУ ........ 71

НЕЎМІРУЧЫЯ ПЕСНІ КАБЗАРА ........ 74

О БРАТЬЯХ НАШИХ МЕНЬШИХ ........ 76

**Односельчане помнят своего журналиста** ........................................ 77

**Пакланіцца памяці блізкіх** ........................................................... 79

**Память подвигу** ......................................................................... 80

**Паэт мужнасці і любві на Хоцімшчыне** (12 снежня – 70 гадоў з дня нараджэння Кастуся Кірэенкі) ........................................................................ 83

**Першая з узнагароджаных** ........................................................... 87

**Першы дэпутат з Хоцімшчыны** ..................................................... 88

**Першы пісьменнік Хоцімшчыны** ..................................................... 91

**Першя старшыня** ......................................................................... 94

**По следам отряда особого назначения** ........................................... 97

**Пясняр зямлі Хоцімскай** (да 70-годдзя Пятра Прыходзькі) ........................ 98

**Пясняр-працаўнік** (да 70-годдзя з дня нараджэння І.Шамякіна) .............. 101

**Радасць сейбітаў** ........................................................................ 103

**Радасць сустрэч** .......................................................................... 105

**Самая дарагая радасць** .................................................................. 107

**Свая газета – наша пуцяводная зорка** ............................................. 109

**Светлая крыніца сэрца і памяці паэта** ............................................. 112

**Святліца з добрымі людзьмі** ........................................................... 116

**Сейбіт дабра і прыгажосці** .............................................................. 118

**Сонца і песня** (да 70-годдзя з дня нараджэння лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я.Купалы песняра зямлі Магілёўскай Аляксея Пысіна) ........................ 119

**Сустрэчы з пісьменнікам** ............................................................... 122

**Сябры-аднапалчане** ...................................................................... 124

**Сярод добрых людзей** ................................................................... 126

**Тактоўнасць і цеплыня** ................................................................... 130

**У васемнаццаць хлапечых гадоў** ...................................................... 131

**Хадзіў па “Хоцімскаму друку”** ......................................................... 133

**Цуд радасці** ................................................................................ 136

**Чытаю дакументы ветэранаў** .......................................................... 138

**Шчырая песня салдата з вёскі Альшоў** (да 75-годдзя П.Ф.Прыходзькі) .. 140

**Яе вялікасць – вернасць і мужнасць** .............................................. 143

# Ад складальніка

У 2013 годзе сышоў з жыцця выдатны чалавек, вядомы краязнаўца на Хоцімшчыне, былы загадчык Трасцінскай сельскай бібліятэкі Міхаіл Аляксеевіч Ласоўскій. Ён пакінуў яркі прыклад даўгалецця - больш за шэсцьдзесят год краязнаўчай дзейнасці. Міхаіл Аляксеевіч быў прапагандыстам, кнігалюбам, бібліяфілам, літаратурным следапытам, пазаштатным карэспандэнтам раённай газеты. Які б накірунак не прымала яго дзейнасць, яна вызначалася адной нязменнай лініяй - даследаваннем мінулага сваёй малой радзімы, бацькоўскага Прыбяседскаго краю.

Цікавы чалавек Міхаіл Аляксеевіч, цікавая ў яго і біяграфія. Нарадзіўся 20 чэрвеня 1926 года ў сялянскай мнагадзетнай сям'і на хутары Ласоўшчына. Прадзеды, дзяды і бабулі, іх сын і дачка – бацькі Міхаіла – родам з беларускай шляхты, праваслаўнай веры. Бацька Аляксей Рыгоравіч і маці Аксіння Васільеўна працавалі ў трасцінскім калгасе "Наша жыццё". Закончыў сем класаў. У 1943 годзе пры вызваленні Хоцімска ў 17 гадоў пайшоў на вайну. Потым, пасля вайны, быў вучэбны полк. І толькі ў 1951 годзе вярнуўся салдат з фронту і службы на радзіму.

Для Міхаіла Аляксеевіча штуршком для роздуму аб рабоце стала кніга І. Шамякіна «Глыбокая плынь», пасля прачытання якой ён яшчэ мацней прывязаўся да родных мясцін. Яна абудзіла нястрымавае жаданне жыць на зямлі бацькоў, будаваць і ўпрыгожваць жыццё роднай Хоцімшчыны.

Нейкі час ён працуе ў хаце-чытальні, а з 1951 года – загадчыкам Трасцінскай сельскай бібліятэкі. Паступае вучыцца на чатыры гады ў Мінск на завочнае аддзяленне бібліятэчнага тэхнікума імя Пушкіна. Міхаіл Ласоўскій, скончыўшы тэхнікум з чырвоным дыпломам, не спыніўся. Без перадыху паступае вучыцца завочна на бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя Горкага.

Трасцінская бібліятэка, дзе працаваў М. А. Ласоўскі, лічылася адной з лепшых у вобласці, пастаянна насіла званне «Бібліятэка высокай работы». М. А.Ласоўскі быў удзельнікам абласной навукова-практычнай канферэнцыі, дзе выступіў з дакладам "Новае і перадавое ў бібліятэчнай рабоце", а таксама быў удзельнікам саюзнай нарады бібліятэкараў у Маскве, прытым на нарадзе сельскіх бібліятэкараў рэспублікі, дзе таксама выступіў з вопытам краязнаўчай работы. Яго работа была ацэнена значком "За выдатную работу".

У 1954 годзе ў маскоўскім часопісе «Молодой коммунист» выйшаў артыкул М. А. Ласоўскага «Кніга — настаўнік, памочнік, сябар».

Цікава тое, што калі складаўся ў Маскве першы практычны дапаможнік «Сельская библиотека», дык аўтары кнігі рэкамендавалі і артыкул Ласоўскага надрукаваць у дапаможніку, які выйшаў у 1956 годзе.

Варта асобна сказаць аб сяброўстве пісьменнікаў-землякоў з М.А. Ласоўскім. У Трасціно прыязджалі Аркадзь Куляшоў, Аляксей Пысін, Пятро Прыходзька, Віктар Карамазаў, Іван Чыгрынаў, Аляксей Зарыцкі і іншыя знакамітыя пісьменнікі. З многімі з іх вялася цёплая перапіска.

- Сваім візітам на Хоцімшчыну яны ўблагародзілі наш край, - гаварыў Міхаіл Аляксеевіч.

Віктар Карамазаў зрабіў нарыс “Пахлі лугі някошаныя”, які надрукавала газета “ЛіМ” 30 ліпеня 1971 года.

Аляксей Пысін прысвяціў Ласоўскаму нарыс “Добры дзень, аднапалчанін!”. Газета “ЛіМ” надрукавала яго 8 мая 1974 года.

Іван Чыгрынаў некалькі гадоў запар наведваўся ў Трасціно, каб назапасіць матэрыялу для рамана “Апраўданне крыві”.

Аркадзь Куляшоў, высока ацаніўшы станоўчыя вынікі дзейнасці трасцінскага краязнаўцы, як дэпутат Вярхоўнага Савета БССР звярнуўся да кіраўнікоў сельскага Савета з хадатайніцтвам аб новым будынку для бібліятэкі.

Зараз, калі Міхаіла Аляксеевіча не стала, ўзнікае трывога за яго краязнаўчую спадчыну. Трасцінская сельская бібліятэка будзе імкнуцца прыкласці ўсе намаганні, каб захаваць творчую спадчыну краязнаўцы. Па-першае – выданне зборніка яго публікацый “Спадчына трасцінскага краязнаўцы”. Гэта дазваляе спадзявацца, што напісанае М.А.Ласоўскім захаваецца ў памяці пакаленняў. У зборнік уключаны найбольш цікавыя артыкулы, змешчаныя на старонках раённай газеты “Шлях Кастрычніка” у 1986-2012 гг.

Спадзяёмся, што жыхарам вёскі Трасціно і хацімчанам будуць цікавымі знаходкі чалавека, які з 1951 па 2013 год займаўся краязнаўствам.

# Ад жыцця, ад слова народнага

## (да 100-годдзя з дня нараджэння М. Гарэцкага)

«Шкадую, чаму я не скульптар, каб зляпіць яе вобраз ці выразаць яго так, як некалі, быўшы малым, ляпіў з гліны ці выразаў з дрэва розныя прыемныя фігуркі. Толькі цяпер зляпіў бы ці выразаў не маленькую фігурку, а вялікую і гордую постаць жанчыны, што, не схіляючы галавы, ідзе сваім шляхам жыцця...

І слава хай будзе таму, хто і на гэтых цярнёвых сцежках мае вочы, як у бачанае мною хоцімкі», — старанна, прыклаўшы ўсе свае лепшыя намаганні, выразна чытаю кожнае слова са спадчыны выдатнага беларускага пісьменніка, аднаго з пачынальнікаў беларускай мастацкай прозы, таленавітага вучонага і літаратурнага крытыка, збіральніка і прапагандыста вучонай народнай творчасці Максіма Гарэцкага, нарэшце вернутае ў класічны фонд літаратуры, каб дайшлі яны да разумення маіх слухачоў — вучняў і настаўнікаў роднай школы ў дні правядзення тыдня нацыянальнай культуры.

«Я бачыў яе ў летні дзень, перад самым вечаровым змрокам... Станцыя Талбага... Пуста на станцыі. Толькі адна баба на бедным століку, з убітымі ў зямлю ножкамі, нешта прадае. Усе туды бягуць і бачаць, што прадае нейкіх смажаных ліньkoў, ці што, і дзве ці тры бедныя ляпёшкі. І паглядзелі, і адходзяцца... Яна высокая, з загрубелым і чырванаватым тварам. А на гэтым твары.., на гэтым твары — такая жыццёвая горкасць, толькі ж незлавімая, і пад такою ж моцнаю пячаткаю цвёрдасці і быццам пагарды!.. Галава, узнятая высока, і невялікія, але глыбокія і жудасна-разумныя вочы пазіраюць не на блізкіх, а на далёкіх. А ля спадніцы два дробныя хлопчыкі, як звераняткі каля маці. Худыя дзеткі, вочы ў іх не па ўзросту шмат ужо бачылі», — працягваю чытаць і адначасова сачыць за ўплывам на аўдыторыю прапануемага тэксту. З павагай скіравалі свае погляды на партрэт пісьменніка-юбіляра і ў задуменні з захапленнем слухаюць змест мастацкага твора вучаніцы старэйшых класаў Лена Кавалеўская і Наташа Прошкіна, выкладчыцы беларускай мовы Марыя Васільеўна Барыбкіна, Галіна Мікалаеўна Прошкіна, Людміла Міхайлаўна Астраух, выкладчыца гісторыі Беларусі Тамара Архіпаўна Раманоўская і ўсе прысутныя ў кабінеце беларускай мовы і літаратуры. На вялікае маё здзіўленне, прыціхлі і самыя непаседы-гарэзы хлопчыкі. І тады я з усім майстарствам чытальніка працягваю:

«Ніхто ў яе не купіў ні ліньkoў, ні ляпёшак... А яна яшчэ і не дужа набіваецца сваімі лінькамі.

Цягнік зараз пойдзе, а мне хочацца сказаць ёй што-небудзь ласкавае... Я чую ў яе акцэнце нешта роднае, хоць гаворыць яна даволі добра па-расейску, і я пытаюся:

— А Вы не з Магілёўшчыны перасяленка?

— З Хоцімску я... калі, можа, ведаеце, — адказала па-беларуску.

— Ведаю, ведаю! Сам адтуль недалёка...

— Ну як там цяпер жывуць людзі?

— А нічога... Патрошку папраўляюцца...

— Добра, хоць папраўляюцца. Збіраюся і я паехаць назад... Можа, як-небудзь... — і пагладзіла мужчынскаю, загрубелаю рукою, але далікатна, як жанчына і маці, пагладзіла мімаволі не бачачы, меншага хлопчыка па галоўцы, хлопчык яшчэ больш укруціўся ў спадніцу...».

Максім Гарэцкі заканчвае свой твор «Хоцімка» падзеямі наступнага дня: «Сонейка, цёпла і ціха, кукуе зязюлька, а суровы вобраз хоцімкі стаіць мне ўваччу. І сум, і радасць змагаюцца ў маім падарожным сэрцы».

Зноў гляджу на твары сваіх слухачоў і радуюся, што словы мастацкага твора ўраджэнца зямлі мсціслаўскай кранулі сэрцы кожнага. Проза пісьменніка працягвае жыць, прыходзіць чытацкая любоў і цікавасць да яе, а імя пісьменніка становіцца ў класічную рубрыку. Чатырохтомнік — найбольш поўнае, навукова каменціраванае выданне яго спадчыны, у якое ўвайшло ўсё лепшае, што стварыў аўтар на працягу кароткага жыцця, маецца і ў бібліятэках Хоцімшчыны. Пажадана, каб хацімчане асабіста сустрэліся і з прапанаваным творам.

Цалкам згаджаюся з думкай-выказваннем пісьменніка Алеся Адамовіча (пляменніка настаўніка А.М. Тычыны), што «...факт, рэальная падзея, дакладная фраза, лік, дата — усё гэта запісвалася Гарэцкім так, быццам, загадзя адчуваў пісьменнік эстэтычную радасць ад факта, які паступова стане гісторыяй і, адфактураны часам, набудзе часам эстэтычнае гучанне. І вось дзякуючы гэтай творчай радасці, творчай актыўнасці на стадыі, якую звычайна называюць «збіраннем матарыялу», дзякуючы гэтай якасці таланту Гарэцкага мы маем мастацкія творы, хоць сам пісьменнік спачатку (і доўгі ж час!) лічыў усяго толькі «матэрыялам» да будучых літаратурных твораў». Падкрэсліваю, што вяду падрабязную размову аб адным з твораў цікавага і арыгінальнага цыкла невялікіх апавяданняў, нарысаў і падарожных замалёвак «Сібірскія абразкі», напісаных на аснове канрэтных фактаў у час свайго летняга адпачынку, калі ён рашыў пазнаёміцца з жыццём беларусаў-перасяленцаў (сярод якіх шмат было і з нашай Хоцімшчыны) , што калісьці выправіліся ў свет, у далёкі, невядомы, шукаць «прасторную зямлю», вальнейшую працу, хлеб, долю.

З нашай зямлячкай-хоцімкай у аўтара адбылася сустрэча 7 ліпеня 1926 года. Нам, хацімчанам, вельмі дарагі і каштоўны гэты абразок, які накіроўвае нас на добрыя гаспадарчыя адносіны да прыбесядскай зямлі, якую нам неабходна берагчы і даражыць, як нашай роднай кармільшчыцай. Прыводжу вельмі цікавы запіс аўтара ў каментарыях, калі аўтар планаваў: «Уставіць успаміны аб радзіме. Цяжка было са сваім кутком расставацца. Мо ніколі ўжо не ўбачым. А як тут жыць? Трэба ехаць. Прадалі ўсё, Зямлі жменьку роднае ў хустачку набралі, каб на новым месцы на магілку пасыпаць і пад хату».

Звярніце ўвагу, што слова «Зямля» напісана аўтарам з вялікай літары, бо Зямля гэта ад роднай калыскі, роднай Белай Русі.

М. Гарэцкі пісаў у час, калі маладая проза зусім натуральна імкнулася мець «свае апавяданне», «беларускую аповесць», «беларускі раман». У аутара-дакументаліста многае засталося неапрацаваным, бо так распарадзіўся лёс у дні «чырвонага сталінізму». Але ўсё з цягам часу становіца на свае месца. Грамадскасць рэспублікі адзначае 100-гадовы юбілей выдатнага класіка, творчасць якога ўплывае на ўсю глыбіню беларускай літаратуры XX стагоддзя. У нас хацімчан, сёлета ў юбілейныя дні атрымалася ўваскрэшанне твора-юбіляра, які захаваў нам з замілаванасцю і любасцю вобраз нашай перасяленкі хоцімкі. І быў у свой час надрукаваны ў часопісе ‹‹Аршанскі маладняк››, 1928, №7 за подпісам ‹‹М.Г.››.

Адначасова трымаю светлую надзею, што з адраджэннем свядомасці ў пазнанні ўсяго сапраўднага мінулага без усялякай фальсіфікацыі аб Хоцімшчыне — нашай бацькаўшчыне, кола даследчыкаў расшыраецца і, магчыма, камусьці зусім нечакана ўдасца прыадчыніць занавес і даведацца, як у далейшым склаўся лес нашай перасяленкі хоцімкі альбо яе хлопчыкаў-сыноў, а цяпер ужо, магчыма, дзядуль, калі шчаслівы выпадак захаваў іх у жыццёвых віхурах і шмат новых радасных пазнанняў і адкрыццяў з уменнем «у беднасці» нашай убачыць «багацце» — духоўнае, маральнае.

**Ласоўскі, М.** Ад жыцця, ад слова народнага : [да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага] / Міхаіл Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1993. – 31 сакавіка. – С. 4.

— Что же ты, хозяин, не проявляешь никакого беспокойства? На исходе уже овсяные хлопья для пойла тёлочки. Да она, слава Богу, уже подросла и, по-моему, набрала свой вес, обозначенный в договоре с совхозом, - ставит в известность меня хозяйка - хранительница домашнего очага.

Направляюсь в исполком сельского Совета, в кабинет к председателю И.И. Ковалёву. Почти одновременно заходит в кабинет и начальник управления райсельхозпрода Н.А. Науменко. Оба интересуются, добровольно ли я выполняю договорные условия, ибо многие односельчане отказались отдавать телят, когда к их подворьям был направлен совхозный автотранспорт для их сбора.

— Завтра на наряде я скажу директору совхоза о Вашем желании, - пообещал Иван Иванович Ковалёв.

И отрадно было для нас, стариков, что эти слова стали, не затягиваясь, претворяться в жизнь.

Зоотехник совхоза Борис Хилькевич вместе с водителем Николаем Лупекиным погрузили тёлочку в автомашину. Вежливо предложили поехать вместе с ними до фермы, чтобы взвесить телёнка. По состоянию здоровья мы доверили это сделать самим, только попросили привезти нам накладную. А потом события следовали для нас будто по сказочному щучьему велению. В течение трёх дней в наше хозяйство было доставлено совхозным транспортом в рулонах сено - сеяных трав - тимофеевки.

Перед тем как уложить корм в сарай, пересмотрели его и досушили, где были какие сорнячки, выбросили. Когда мы в радостях исполняли весь комплекс завершающих работ, проезжая мимо, остановил свою машину директор совхоза Геннадий Леонидович Ефременко и поинтересовался, довольны ли мы доставленным кормом.

— Большое-большое спасибо за качественное сено, за чуткость и заботу о нас, стариках, - от всей души был наш ответ.

Своевременно, регулярно производится оплата и за продаваемое молоко деньгами и выделены сенокосы за закупленное молоко.

**Ласовский, М.** Большое-большое спасибо! / Михаил Ласовский // Шлях Кастрычніка. – 2003. – 30 июля. – С. 1.

# Вернасць сваёй газеце

У апошні час усё большае пашырэнне набываюць вершаваныя загадкі якія называюцца літаратурнымі. Увогуле загадкі развіваць, паэтычнае мысленне людзей. Вось і на днях разгарнуў я загадкі, напісаныя беларускім паэтам Нілам Гілевічам на аснове народных загадак, і з вялікім захапленнем іх прачытаў. Вельмі ж добра ў яго атрымліваецца, вось, напрыклад:

*Белы голуб прыляцеў,*
*Белым крыллем шалясцеў*
*І з усёй зямлі навіны*
*Расказаў за паўгадзіны.*

Дзеянне прадмета накіравана адгадку, хаця і пра нежывы прадмет гаворыцца як пра жывую істоту. Разгадкай атрымалася — газета.

Адначасова на ўспамін чамусьці прыпомніліся і апавяданні рускага пісьменніка Сяргея Аляксеева аб Пятру 1 і яго часе, дзе паданы падзеі далёкіх гадоў гісторыі нашай Айчыны.

— Час ужо і нам сваю газету мець, — не раз гаварыў Пётр сваім блізкім. — Ад газеты і купцу, і баярыну, і гараджаніну — усім карысць.

Напярэдадні Новага, 1703 года, разам з Фёдарам Палікарпавым, друкаром, падбіралі матэрыял да першага нумара рускай газеты.

— З Казані, гасудар, пішуць, што знайшлі там шмат нафты і меднай руды, - чытае Палікарпаў.

— Вось пішы, - гаворыць Пётр, - няхай ведаюць, што на Русі багаццяў край непачаты, не падлічаны тыя багацці-скарбы, не памераны.

Праз некалькі дзён газету надрукавалі. Далі ёй назву “Ведамасці”. Газета атрымалася маленькая, шрыфт дробненькі, чытаць цяжка, папера шэрая. Але Пётр быў задаволены — першая. Схапіў Пётр «Ведамасці», і каго не сустрэне, газету паказвае:

— Паглядзі, - гаворыць, - газета свая, расійская, першая!

З крыніц вядома з якой радасцю сустрэлі першую газету на Русі, а значна пазней і першую беларускую газету, а потым першую газету ў нашым Клімавіцкім павеце, а ў 1935 годзе і ў нас на Хоцімшчыне — сваю раённую.

З пашанай гартаю старонкі раёнкі за 55-цігадовы выхад. З кожным нумарам яна становіцца цікавей па зместу. Зніклі стандартныя перадавыя артыкулы. У публікацыях стала больш вастрыны, аператыўнасці, канкрэтнасці.

Мая падпіска на газету пайшла ўжо на пяты дзесятак (падпісчыкам з'яўляюся з 1951 года, а чытачом: з 1935 года, з першага нумара). Хочацца, каб газета была больш баявой у пытаннях культуры, ва ўроках маральнасці, ўроках сумлення, расшырала кругагляд, светапогляд. Трымаю размову з пенсіянеркай Шасцерыковай Матронай Лявонаўнай, былой даяркай, саўгаса, якая яшчэ ў даваенны час закончыла 9 класаў і таксама з'яўляецца чытачом і падпісчыкам з дня выхаду першага нумара газеты.

— Я не ўяўляю сабе жыцця без вестак маёй Хоцімшчыны, — дзеліцца яна сваімі ўражаннямі аб газеце. — А весткі гэтыя заўсёды мне прыносяць не птушкі на хвастах і не размовы жанчын каля студняў, а свая газета «Шлях Кастрычніка» і трэба каб кожны жыхар Хоцімшчыны яшчэ раз падумаў, пакуль падпіска прадоўжана, а ці не абяднію, не абакраў ён сябе духоўна, не падпісаўшыся на 1991 год на сваю раённую газету, сваю трыбуну. Кожны абавязан палічыць гонарам быць яе падпісчыкам і чытачом, тым больш што яе падтрымалі кіраўнікі ўсіх прадпрыемстваў і арганізацый раёна з фінансавага боку.

Шчырая прапанова-парада Матроны Лявонаўны мне была да спадобы, думаю што яна будзе да спадобы, думаю што яна будзе да спадобы і многім жыхарам Хоцімшчыны, якія зробяць крок да бліжэйшага паштовага аддзялення і папоўняць шэрагі падпісчыкаў і чытачоў сваёй газеты «Шлях Кастрычніка».

**Ласоўскі, М.** Вернасць сваёй газеце / Міхаіл Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1990. – 22 лістапада. – С. 2.

# Вёска наша родная

Калі мы глядзім на карту нашай Айчыны, родная Беларусь бачыцца нам кляновым лісточкам. Прыгледземся да гэтага своеасаблівага, дарагога кожнаму з нас лісточка, скіруем сваю ўвагу на ўсход ад Мінска, і наш позірк спыніцца на слове «Хоцімск». Наш родны кут! Зямля бацькоў, край чароўнай маляўнічай прыроды, ціхіх рэк і блакітных азёр, росных лугоў і сенажацяў з чаборам, мядунковым цветам, зялёных пушчаў і дубраў, неабдымная шыр хлебных палёў. З радасцю і хваляваннем на ўсіпаман прыйдуць і радкі з песні «Спадчына», якую выконвае ансамбль «Песняры», на словы Я. Купалы, музыка І. Лучанка, якія цешаць сэрцы памяццю — настаўніцай жыцця:

*Ад прадзедаў спакон вякоў*
*Мне засталася спадчына...*
*...Завецца ж спадчына мая*
*Усяго старонкай роднаю.*

Дапоўняць і пабудзяць узвышаныя пачуцці і добрыя радкі з вершаў К.Буйла «Люблю наш край — старонку гэту», А. Бачылы «Радзіма мая дарагая» і інш.

...Задоўга разасланыя запрашэнні і маляўнічая аб'ява паведамлялі і ласкава запрашалі ўсіх земляробаў гаспадаркі сумесна адзначыць у лесапарку ў нядзельны дзень 70-тадовы юбілей з дня нараджэння першай на Хоцімшчыне савецкай гаспадаркі «Разальмова» — калыскі сучаснага саўгаса «Трасціно». Супадала свята і з другой юбілейнай датай — 65-годдзем утварэння Хоцімскага раёна. Памяць — пачуццё духоўнае. Гэта ж такое наша багацце, як хлебныя палі, сенажаці, рэкі, лясы, нашы вёскі. І як мы помнім сваіх продкаў, так і нас будуць помніць нашчадкі. Як мы адносімся да святынь мінулага, так будуць адносіцца нашчадкі да таго, што вельмі каштоўна для нас.

Памяць сэрца! Яна ў кожным новым ураджаі хлеба, у кожнай яблыні, што вясной цвіце пад вокнамі аднавяскоўцаў, яна ў кожным народжаным дзіцяці. Не астывае і, відаць, ніколі не астыне ў савецкага чалавека цікавасць да гісторыі, асабліва да гадоў, першых год стварэння Савецкай улады, перабудовы нашых вёсак на новы лад. Як яно ўсталёўвалася — новае жыццё, як змагалася са старым, адольвала яго, як перайначвала чалавечыя долі, характары — пытанні, што хвалявалі і працягваюць хваляваць узнаўляюць той непаўторны час.

Гістарычная навука не можа развівацца паўнакіроўна і паўнацэнна без архіўнага матэрыялу, без дакументаў тых гадоў. Без дакументаў няма гісторыі, застаюцца толькі легенды і казкі. Пагэтаму актывісты пярвічнай арганізацыі таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры саўгаса арганізавалі фотавыстаўкі: «Старонкі з гісторыі саўгаса «Трасціно». (Час. Падзеі. Людзі) і «Памяць вайны...». (За свабоду і незалежнасць нашай

Савецкай Айчыны ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі загінулі і многія волаты зямлі Трасцінскай).

З трапяткім хваляваннем трасцінцы знаёміліся з дакументамі і матэрыяламі фотавыставак. Звярнулі ўвагу на архіўную выпіску Цэнтральнага Дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР са спісам кааператываў на Хоцімшчыне на красавік 1925 года. Дзейнічалі дзве камуны: «Бяседаўская» і «Праўда» (Ліпаўка), дзевяць арцелей: «Зара», «Малаліпаўская», «Чырвоны Гай», «Заруччa», «Івана-Аляксееўская», «Прахораўская», «Свет», «Сакалоўка» і «Ясная Паляна», два сельскагаспадарчыя таварыствы па супольнай апрацоўцы зямлі «Прагрэс» і «Зара», адзін саўгас «Разальмова».

Асаблівую ўвагу звярталі на здымкі, дзе занатаваны старонкі роднага саўгаса за сямідзесяцігадовы шлях. Ветэран саўгаса ветэрынарны фельчар Аляксей Уласавіч Падгурскі вядзе гутарку з моладдзю, на кадры побач — кавалер ордэна Леніна трактарыст Васіль Пятровіч Пахомаў удастоіўся гонару ўзняць сцяг адкрыцця раённага свята. Дачасная смерць унесла іх з жыцця, але памяць аб іх захавалася ў дакументах былых дзён.

А вось здымак падзей, калі сакратар райкома партыі таварыш Гарбузаў уручае Ганаровую грамату пераможцу другога конкурсу раённага спаборніцтва механізатараў Віктару Дзмітрыевічу Прошкіну, побач здымак радаснай падзеі ўручэння трактарысту Міхаілу Васільевічу Кісялёву ордэна Працоўнай Славы III ступені. Здымак пераможцаў раённага сацыялістычнага спаборніцтва 1977 года. Іх — 13, у тым ліку шэсць чалавек — з саўгаса «Трасціно». Ёсць кадры з падзеяй, калі саўгасу за вытворчасць малака ўручаецца раённы пераходны Чырвоны сцяг, калі праводзілася свята вёскі Трасціно і г. д.

З павагай, удзячнасцю і болем была праяўлена цікавасць да партрэтных здымкаў загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Вось і на здымку ў газоне вы бачыце, як ветэраны саўгаса Таццяна Аляксееўна Лімарава свайму ўнуку Ігару, а Анастасія Іларыёнаўна Шасцерыкова сваей унучцы Але паказваюць на выстаўцы - першая — брата Ягора, другая — мужа Аляксея, якая не вярнуліся з пажарышчаў праклятай вайны.


раcказваюць

— Вечна будзе гарэць полымя любві і гарачай удзячнасці гэтым волатам, — гаворыць шафёр Васіль Аляксеевіч Казакоў. — Яны выратавалі нам жыццё, свабоду і шчасце, і каб заўсёды цвіў белы-белы май, часцей іх трэба прыпамінаць. Калі б нас незнарок пакласці на іх месца, а яны б падняліся, то яны б нам залатыя помнікі паставілі, бо мы не цэнім і не даражым жыццём на гэтым свеце.

Паблізу з фотавыстаўкай былі арганізаваны выстаўкі малюнкаў дзетвары работнікаў саўгаса. Першыя крокі з пэндзлікам, пробы далучэння да свята прыгожага мастацтва, робяць выхаванцы дзіцячага сада. Вось і загадчыца дзіцячага сада Клаўдзія Захараўна Зайцава знаёміць бацькоў з малюнкамі сваіх выхаванцаў. Побач размешчана выстаўка работ вучняў школы. Усім да спадобы быў малюнак Т. Баксалавай «Наш саўгас у 2000 годзе», які журы адзначыла, як самы лепшы.


Памяць сэрца.

Ветэраны і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны ўсклалі да абеліска загінуўшым за свабоду і незалежнасць нашай Айчыны аднавяскоўцам гірлянды і кветкі.

Імправізаваная зала каля часова зманціраванай сцэны з кузавоў аўтамабіляў была шматлюднай. На свята прыйшлі, з аддалёных вёсак прыехалі і старыя, і малыя. Радасць свята трасцінцаў прыйшлі раздзяліць і работнікі з суседняга саўгаса «Забялышына», калгаснікі з калгаса «Перамога», многія жыхары райцэнтра, родныя якія пражываюць у саўгасе.

У вызначаны час выконваецца Гімн Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, і вядучыя Святлана Базека і Аляксандр Войценка віншуюць усіх са святам і запрашаюць разам зазірнунь ва ўчарашні дзень не дзеля святочнай цікавасці, а каб больш, *з* глыбінёй, адчуць павагу да людзей старэйшага пакалення, і слова прадаставілі мне, як краязнаўцу.

— Дэкрэтам аб зямлі, прынятым II Усерасійскім з'ездам Саветаў 8 лістапада 1917 года, адмянялася права прыватнай уласнасці на зямлю, — пачаў я сваю размову і далей працягваў: — Уся зямля пераходзіла ва ўсенароднае карыстанне і размяркоўвалася паміж тымі, хто яе апрацоўвае.

Але частка зямельных ўгоддзяў з высокакультурнымі гаспадаркамі: садамі, пітомнікамі і г. д. не падлягала падзелу, а ператваралася ў паказальныя гаспадарні і перадавалася ў выключнае карыстанне дзяржаве.

У дзяржаўным архіве Магілёўскай вобласці захаўваюцца дакументы, якія сведчаць аб стварэнні культурных народных гаспадарак у Клімавіцкім павеце ў мэтах забеспячэння насельніцтва палепшаным пасяўным матэрыялам, племянной жывёлай, кладовымі саджанцамі і насеннем гародніны з красавіка 1918 года.

У загадзе Клімавіцкага павятовага камісарыяту земляробства гаворыцца: «...сурова ўмяняецца ў абавязкі ўсім Саветам і грамадзянам павета ўсяляк захоўваць і абараняць гэтыя культурныя гаспадаркі як народную ўласнасць і не дапускаць самавольнага разграблення і ахопу ў гэтых гаспадарках Зямлі, інвентару, насення і г.д., а таксама ўсяляк аказваць садзейнічанне камандзіраванаму туды для вядзення гаспадаркі агранамічнаму персаналу, цвёрда памятаючы, што за ўсялякае самачыннае дзеянне ў гэтых гаспадарках у мэтах разграблення ці захопу і вядзення шкоднай агітацыі супраць гэтых культурных гаспадарак віноўныя будуць несці адказнасць перад ваенна-рэвалюцыйным трыбуналам па ўсёй суровасці законаў рэвалюцыйнага часу без усялякіх паслабленняў і прамаруджванняў...».

Прыемнай увагай загарэўшыхся вачэй шматлікіх слухачоў з вастрынёй адчуваю адказнасць за сваё выступленне за кожнае слова, за кожную хвіліну, аднятую ў вельмі занятых, натруджаных людзей, і бязмежную радасць, калі нейкія словы падабаюцца, знаходзяць водгук у слухачоў. З натхненнем працягваю свой расказ.

— У 1921 годзе Клімавіцкая эканамічная нарада пры Клімавіцкім павятовым Савеце рашыла выдаваць двухтыднёвы друкаваны орган — газету «Наша гаспадарка», каб абудзіць асабістую ініцыятыву кожнага грамадзяніна і імкнуцца ўцягнуць шырокія масы ў кааператыўнае будаўніцтва.

У трэцім нумары ад 3 жніўня 1921 года газета дае агляд спраў у савецкіх гаспадарках павета: «…у сёлетнім годзе праароблена работа па вырошчванню маладняку буйной рагатай жывёлы. Усе цяляты 1 года сабраны ў адным саўгасе «Разальмова», валодаючым лепшымі выганамі»

«Неабходна будаваць новыя будынкі: у «Разальмова» двор для жывёлы, хлебны хлеў, лазню. Пабудова пачата, і для заканчэння неабходны цесляры, матэрыял для даха і цвікі. Лес увесь нарыхтаваны».

Прапанавана правесці наступныя мерапрыемствы: «Завесці гатункавае насенняводства ў «Разальмове». Ужо здабыта насенне бульбы і аўса». У даведачнай кнізе «Уся Беларусь» на 1925 год» паведамлялася: «У Хоцімскім раёне маецца адна савецкая гаспадарка, якая карыстаецца павагай. Савецкай гаспадаркай бярэцца ўхіл на вытворчасць зернявых культур, але звяртаецца ўвага і на іншыя галіны, як жывёлагадоўля. Савецкая гаспадарка прадавала і абменьвала гатункавае насенне, ачышчала насенне сялянам сваімі машынамі. У савецкай гаспадарцы 154 дзесяціны зямлі, у тым ліку 56,44 ворыва, 59,62 — сенажацей, 14,49 — сада, 0,98 — гароду і іншых угоддзяў. Саўгас адносіўся да ціманаўскай групы».

У гэтым жа даведніку на 1927 год падкрэсліваецца, што арганізацыя савецкіх гаспадарак па рэспубліцы адносіцца на канец 1920 года (але ў Клімавіцкім павеце гэта было зроблена ў 1918—1919 гадах). Пры нацыяналізацыі памешчыцкіх гаспадарак суадносіны паміж ворывам і сенажацямі ў саўгасах самыя спрыяльныя. Высокая забяспечанасць сенажацямі саўгасаў спрыяе развіццю ў іх жывёлагадоўлі.

Нядаўна ў дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці паступіла частка дакументаў, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны захоўваліся ў г.Уфа Башкірскай АССР. Сярод іх былі знойдзены «Звесткі аб служачых і рабочых мужчынах саўгаса «Разальмова на 1 мая 1922 года». Першым значыцца дырэктар саўгаса Сіцькоў Мацвей Цімафеевіч, 1889 года нараджэння.

На службе з 1 мая 1919 года. Гэта дата і з'яўляецца датай арганізацыі саўгаса. Старастай у саўгасе працаваў Тарасаў Максім Васільевіч, конюхам — Шчакалаў Іван Кузьміч, рабочымі Захаранка Якаў Ісаевіч, Леваненкаў Еўдакім Васільевіч, Новікаў Піліп Купрыянавіч і Паўловіч Васіль Дзімітрыевіч.

Звесткі падпісаны дырэктарам саўгаса Сіцьковым і канторшчыцай Саседавай. На вялікі жаль, гэта апошні дакумент, які захаваўся ў архіве за асабістым подпісам Мацвея Цімафеевіча. Трагедыя адбылася ў ноч на 22 мая 1922 года, бандыты абрабавалі касу (толькі, што напярэдадні атрымалі грошы на заработную плату) і маёмасць саўгаса (павозку на жалезным хаду, коней). Доўга здзекваліся яны над дырэктарам у яго кватэры, а потым, ужо амаль нежывога, выцягнулі на вуліцу, долатападобнай жалязякай запіхнулі кляп у горла і павесілі на слупе, дзе вісеў кавалак рэйкі, па сігналу ад удару па якой рабочыя прыступалі да работы і заканчвалі яе, рабілі перапынак на абед. Боль сціскае сэрца: як горка было яму, яшчэ маладому, ва ўзросце 34 гады, паміраць у майскую ноч, заўсёды прадстаўляю, што ён трымаўся горда і смела, вочы былі поўныя нянавісці да ворагаў.

Асабліва вялікага росквіту дасягнуў саўгас «Разальмова» у трыццатыя гады. Калі ён спецыялізаваўся на адкорме свіней, значна расшыралася плошча зямлі, якая даходзіла да 2000 гектараў. На фермах толькі асноўных свінаматак было больш 300 і разавых каля 100. Усё пагалоўе на ферме даходзіла да 10 тысяч. Было каля 100 кароў 1 100 коней.

Ударніцай свінагадоўлі ў саўгасе была Ганна Бераснёва. Ад адной свінаматкі яна за год атрымала 32 парасяці дзякуючы яе майстэрству, увесь гэты прыплод вырасціла. Майстрам конегадоўлі зарэкамендаваў сябе Васіль Паўловіч. Разам са сваім жарабцом-вытворнікам чыстакроўнай арлоўскай пароды «Здаравякам» ён пабываў на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве ў 1937 г.

Аддзяленні саўгаса былі адкрыты ў вёсцы Елавец, якая праз некаторы час стала свінагадоўчым саўгасам «Звязда», а ў вёсцы Батаева — саўгас «Батаева».

Аднак жа саўгасная сістэма ў перыяд сацыялістычнай рэканструкцыі не атрымала больш шырокага развіцця. Савецкая дзяржава, накіроўваючы асноўныя капіталаўкладанні ў індустрыялізацыю, не магла забяспечыць фінансаваннем вялікую колькасць саўгасаў. Недахоп сродкаў і машын абмяжоўваў магчымасці развіцця саўгаснай вытворчасці. Пагэтаму адбылося скарачэнне ліку саўгасаў, большая частка якіх была ператворана ў калгасы. Саўгас «Разальмова» цалкам увайшоў у калгас «Разальмова» .

Такі ж лёс напаткаў і саўгасы ў Елаўцы і Батаеве і толькі 29 сакавіка 1959 года на землях былых калгасаў Трасцінскага і Забялышынскага сельскіх Саветаў зноў быў арганізаван саўгас «Хоцімскі», а 25 сакавіка 1965 года з яго выдзеліўся асобны саўгас «Трасціно».

Слова прадастаўляецца ветэрану ветэрану 83-гадоваму Тарасу Аляксандравічу Клімянкову—жыхару вёскі Разальмова:

— Мне ў той час было ўсяго трыццаць гадоў, калі ў нашай вёсцы на землях памешчыка Барысовіча арганізаваўся саўгас «Разальмова». У час сельскагаспадарчых работ і я прымаў удзел у працы ў саўгасе. Добра запомніўся мне прыгажун, храбры першы дырэктар саўгаса Сіцькоў, — успамінае Тарас Алянсандравіч і працягвае свой цікавы расказ. — Гавораць, што добраму чалавеку лёгка спіцца ў роднай зямлі, і, ён, наш дарагі Мацвей Цімафеевіч, заслужыў, каб зямля айчыннага краю была яму мяккай пасцеллю...

Але, божа мой, як балюча сціскаецца сэрца, калі ўспамінаеш, як цяжка гэты добры чалавек паміраў. Трэба з часам паставіць гэтаму чалавеку помнік і ніколі не пакідаць яго без кветак.

Ёсць у тых, хто жыве, адно вялікае багацце, якое не падуласна нават смерці, — ёсць жывая, магутная, заўсёды адданая сэрцу чалавечая памяць,— узнёсла разважае Тарас Аляксандравіч. — і пакуль яна ёсць, дагэтуль будзе непадуласна смерці вялікая ўдеянасць таму, хто ўзбагачаў нас сваім светлым розумам, цеплынёй свайго сэрца, шчодрай дабрынёй сваёй душы. І заўсёды ясней наша памяць, адновіць усё, што не можа адысці ў небыццё, што прыйшло ў жыццё аднойчы, каб застацца з намі да скону... І мы памяццю сваёй абавязаны весці размову і трымаць справаздачу парад піянерамі саўгаснага будаўніцтва. Добрыя людзі ў памяці жыць абавязаны вечна.

— Дзве тысячы кветак павінен вырасціць балгарскі кааператар у Казанлыкскай даліне, каб на радасць модніцам усяго свету атрымаць адзін грам пахучага ружавага масла. Пялёсткі з гэтых кветак можна збіраць толькі на світанні, пакуль не абсохла на іх начная раса, — пачаў сваё выступленне дырэктар саўгаса Іван Іванавіч Кавалёў. — Ну і што ж. Балгарскія кааператары з прыемнасцю і задавальненнем аддаюць сваю працу для ўсіх добрых людзей. Няхай спажываюць і успамінаюць працавітасць і руплівасць балгарскіх кааператыраў.

Трэба і працаўнікам саўгаса хутчэй перабудоўвацца, лепш працаваць і ствараць для другіх, аддаючы свой клопат у скарбніцу народнага дабрабыту і шчасця. Мы атрымліваем выдатны насенны матэрыял – суперэліту і эліту. Па ўсіх правілах агратэхнікі з улікам асабістага вопыту догляду пасеваў мы абавязаны выйсці на рубеж атрымання ураджаю па 40 цэнтнераў з кожнага гектара, у малочнай жывёлагадоўлі давесці статак дойных кароў да 1500. Вытворчасць мяса — да 200 цэнтнераў і малака — 1000 цэнтнераў на 100 гектараў сельгасугоддзяў.

Хочацца шчырымі словамі ўдзячнасці асабіста адзначыць старанную працу даярак Я.М. Бондаравай, Т.В. Дзёмкінай, Г.П. Куштарова, Я.Ф. Аўдзюшка; цялятніц Г.А. Лугаўцовай, Ф.В. Ермаковай; жывёлаводаў па адкорму буйной рагатай жывёлы У.І. Сідарэнка; свінарак З.М. Макаранка, В.А. Казаковай; механізатараў М.В. Кісялёва,

У.І. Лімарава, І.Ц. Гаўрыленкі; вадзіцеляў аўтамабіляў П.Ф. Нікіценкі, Ф.З. Корнева, братоў Аляксандра і Івана Кажанковых і інш.

Вялікай групе перадавікоў саўгаснай вытворчасці былі ва ўрачыстай абстаноўцы ўручаны падарункі і грашовыя прэмі. Іх атрымалі паляводы сёстры Ганна і Клаўдзія Бургуціны, жывёлаводы. В.С. Аўчыннікаў, К.І. Мароваў, В.А. Маісеенка, П.А. Селіванаў, Р. М. Кузьмянкова і другія.

А потым чароўную ціш нядзельнага чэрвеньскага дня, сасновага гаю на беразе рэчак Трасцінка і Маланка, што нясуць сваю ціхую плынь у прыгажуню-Бесядзь, парушыла шматгалосая мілагучнасць роднай беларускай песні. Яна спачатку плыве павольна, а потым льецца сама, ад душы, напоўненая любоўю да працы, да жыцця і да чалавека, простая народная песня. Як хвалюе да шчымлівага болю, здаецца, усё, чым свет багаты, чым душа чалавека прыгожая, было ў песні.

Праводзілася свята напярэдадні русальнага тыдня, які заўсёды ў народзе са старажытных часоў прысвечан памінанню продкаў. Кожнаму, думаю, успомніліся русальныя песні з яўна выражанай магічнай асновай (заклiканнем добрага ўраджаю):

*Пойдзем, дзевачкі,*
*Ва лугі-лужочкі*
*Завіваць вяночкі.*
*Мы заўём вяночкі*
*На годы добрыя,*
*На жыта густое,*
*На ячмень каласісты,*
*На авёс расісты.*
*На грэчку чорную,*
*На капусту белую.*

Альбо:

*Люблю тое жыта жаць,*
*Што буйнае зерне.*
*Люблю таго кавалера,*
*Што гаворыць верна.*
*Люблю тое жыта жаць*
*Што буйныя каласы.*
*Люблю таго кавалера,*
*Што русыя валасы.*

Трасцінцы не скупіліся на апладысменты. Імправізаваная канцэртная зала — удзячныя слухачы: працаўнікі саўгаса і госці з навакольных вёсак дзякавалі асабліва за выступленне двух фальклорных ансамбляў. Першы ў складзе: Р.Ц. Баксалавай, А.У. Цыганковай, М.П. Анішчанка, Е.З. Мікуцінай і М.А. Бургунінай. Другі — у складзе жывёлаводаў-пенсіянераў з вёскі Падлесная: М.І. Тулікавай, В.М. Пазняковай, З.П. Вашчылінай і В.А.Стрыгінай.

Песні з вясковымі вуліцамі і палявымі дарогамі, што вялі з мінулага ў будучае, і шчырымі людзьмі, якія перасяляліся з аднаго сюжэта ў другі, але заўсёды выказвалі свае думкі асаблівымі словамі і інтанацыямі, — такія песні сведчаць пра мастацкую глыбіню асэнсавання народам свайго жыцця, гісторыі, вечных праблем грамадства. Верыцца, што народныя песні будуць жыць, будуць спявацца, будуць гадаваць новыя творчыя пакаленні, бо яны патрабны, як жыватворная вільгаць, сучаснікам і, бясспрэчна, — гэта памяць народа. І пакуль яна жыве, жыве і народ.

Зводны хор школы, дзіцячага сада, устаноў культуры, саўгаса выканаў песню «Трасціначка» пад акампанемент аўтара тэксту і музыкі В. Беляковіча і рад песень, прысвечаных зямлі Магілёўскай, зямлі Прыдняпроўскай.



На свяце праводзілася прадметная латарэя. Уладальнікамі шчаслівых білетаў, сюрпрызных (парася) аказаліся даярка Ларыса Іванаўна Шалупіна, свінарка Ніна Ільінічна Дзёмкіна, настаўніца Надзея Іванаўна Балабенка і вучань Аляксей Масюцін. Былі арганізаваныя спарціўныя гульні, конкурсы. Працавалі гандлёвыя ларкі з марожаным, напіткамі і рускім квасам.

Усе былі задаволены святам, бо яно падкрэсліла, што жывая добрая сувязь паміж пакаленнямі, якая стварае пачуццё апоры, справядлівасці нашага шляху, надзейнасці і цеплыні ў жыцці, выхоўвае і замацоўвае ў свядомасці людзей паняцце гонару сям'і, гонару роду, ганару сваёй вёскі, свайго саўгаса, свайго роднага кута. Верыцца, што не будзе Іванаў і Мар'яў, якія не ведаюць духоўнай роднасці з добрым і сумленным жыццём людзей мінулага. Свята саўгаса было працягам свята вёскі Трасціно, якое праводзілася ў 1985 годзе.

**Ласоўскі, М.** Вёска наша родная : [да 70-годдзя саўгаса “Трасціно”] / Міхаіл Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1989. – 15 ліпеня. – С. 2-3.

# Вобразы мінуўшчыны

Летнім вечарам 1983 года, знаёмячыся з чарговай поштай, разгарнуў ліпеньскі нумар часопіса «Маладосць» з жаданнем прачытаць працяг рамана пісьменніка-земляка Івана Чыгрынава «Свае і чужынцы» аб падзеях у гады Вялікай Айчыннай вайны ў нашым Прыбяседдзі. Нумар чамусьці раскрыўся дзевятай старонкай, на яркой пад рубрыкай «Упершыню ў «Маладосці» была змешчана падборка вершаў невядомага для мяне аўтара, якая пачыналася вершам «Перапечкі». Верш уразіў мяне ад першага да апошняга радка:

*Толькі-толькі ранак золкі*
*Згасіць ветрам зоркі-свечкі,*
*Уставала маці з полку*
*І запальвала ў печы.*
*Грукатала чыгунамі*
*І патэльняй, чапялою:*
*Сіні чад вісеў над намі,*
*Пах бяростай і смалою.*
*Потым маці даставала*
*Бульбу шэрую з падполля,*

*Даставала з кубла сала,*
*Перасыпанае соллю.*
*І на пахі смачных скварак*
*І духмяных перапечак*
*Мы, не вытрымаўшы, шпарка*
*З полку слізгалі да печы...*
*Сёння выйшаў я на ганак*
*З сумнай думкай рана-рана.*
*І здалося — пахне ранак*
*Перапечкаю духмянай.*

Адразу чамусьці павеяла прачулай цеплынёй незвычайнага паэта — майстра Якуба Коласа, які як чараўнік, якому ўсё падуладна ў энцыклапедыі сялянскага жыцця «Новай зямлі» стварыў малюнкі сялянскага побыту трапнымі словамі і выразамі, і таму так жыва заўсёды паўстае перад намі малюнак з раздзела «Раніца ў нядзельку».

Нешта падобнае, але больш блізкае адчувалася ў радках верша «Перапечкі» і я з асаблівай увагай звярнуў свой позірк на прозвішча аўтара падборкі. Алег Мінкін значылася ў пачатку падборкі. Надрукаван быў і фотаздымак аўтара, а на апошняй старонцы даведка: «Нарадзіўся на Хоцімшчыне ў 1952 годзе. Скончыў інстытут у Маскве. Працуе інжынерам у Брэсце. Шукаў родзічаў у вёсцы Забялышына, таму што там шмат Мінкіных пражывае, а сапраўды атрымалася, што яны жывуць у вёсцы Чарняўка. Потым я чытаў вершы Мінкіна, якія друкаваліся на старонках рэспубліканскіх перыядычных выданняў у часопісах «Маладосць» і «Беларусь», газетах «Літаратура і мастацтва», «Чырвоная змена». Пасля Брэста Мінкін працаваў інжынерам у Наваполацку, цяпер яго, як гаворыцца, паклікала рамантыка дарог, новабудоўляў і ён апынуўся ажно ў далёкай Цюмені. Працуе там інжынерам на нафтавых радовішчах. У 1985 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла першая кніга паэта «Сурма» — назва музычнага інструмента — турынага рога. Яго нядаўна вярнуў нам з глыбіні стагоддзя рэстаўратар і музыкалюб У. Пузыня. Прыхільнікі беларускай паэзіі сустрэлі яе як арыгінальны зборнік, назваўшы яго лепшым з серыі «Першая кніга паэта». Кніжка выклікала да сябе цікавасць. Яе чытаюць студэнты, мастакі, аматары паэзіі, пра яе гамоняць. У друку з'явіліся рэцэнзіі. На рабочым стале яна і ў вядомага беларускага савецкага гісторыка і археографа М. М. Уланічыка, аўтара сотні публікацыі па гісторыі Беларусі.

— Мне падабаецца мова Мінкіна, — гаворыць ён, — і гістарычнае жыццё ў аўтара высокае, трапяткое... і дадае, што Мінкін на свой лад, па-сучаснаму ўглядаецца ў нацыянальныя традыцыі, у мінулае свайго народа.

Добры водгук аб зборніку Алега Мінкіна «Сурма» дае загадчык аддзела методыкі літаратуры інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР у К. Клышка, беларускі паэт, аўтар «Буквара» і прапісаў да «Буквара» («Маладосць», 1986, №3, с. 150—155).

«...Ужо сваёю назваю аўтар падкрэслівае сваю цягу да даўніны і лепшыя радкі яго твораў скіраваны супраць няпамяці, раўнадушнасці да гісторыі.

...У вершах маладога паэта жыве і, прага бачыць усё апетым у паэзіі — мінулае народа, звычаі, культуру... У вершах А. Мінкіна бачым адсылкі да Гомера, Дантэ, Купалы. Вядома, быць чытачом і быць вучнем не адно і тое ж. Але ж таксама паказальна: амаль у ніводнага з паэтаў «філалагічнага» пакалення, якімі ўсё гэта праходзілася «па праграме», не бачыш гэтулькі адсылак да тых вялікіх, як у гэтага выхаванца Маскоўскага інстытута інжынераў сельска-гаспадарчай вытворчасці».

У канцы рэцэнзіі Клышка робіць вывад: «Лепшае ў творах А. Мінкіна жыве клопатам пра гістарычную самапавагу народа».

Анатоль Сідарэвіч у рэцэнзіі «Кветка паэзіі і жытнёвы колас» («Літаратура і мастацтва», 1985, 6 снежня, с. 5) таксама адзначае, што «...зборнік А. Мінкіна сярод першых паэтычных кніг 1985 года вылучаецца больш высокаю культураю пісьма (паэтычнага выказвання), няма ў ім саманароды і экстравагантнасцей, слоў для запаўнення пустот». Рэцэнзент адзначае і недахопы зборніка, якіх маладому аўтару не давялося пазбегнуць. Асобныя творы з кніжкі на думку Сідарэвіча, як напрыклад: З хлопчыкам Маем, бабулькаю Восенню, руплівым хлопцам Жніўнем, дзядзькам Студзенем трапілі ў гэты зборнік выпадкова, яны больш прыдобныя для дзіцячай кніжкі. Але «... што А. Мінкін — творчая асоба, сведчаць ягоныя «Наследаванні Дантэ», — падкрэслівае рэцэнзент, — Дантавы тэрцыны трансфармаваліся ў чатырохрадкоўі, але дух захаваны. Спалучэнне Дантаванага духу з канкрэтнай праблематыкай нашага часу і нашай гісторыі надае гэтаму цыклу пэўную мастацкую і ідэйную каштоўнасць».

Хацімчане могуць асабіста азнаёміцца са зборнікам паэта-земляка, бо ён паступіў толькі што ва ўсе бібліятэкі раёна і пажадаць аўтару натхнення і плёну ў творчых пошуках свайго паэтычнага імя.

У вершы «Размова з ракою» аўтар сам выказвае надзею на лепшае:

— *Нясу я бязважкую пену ўгары*
*Над каменем цяжкім, што зросся з нядоннем,*
*Няхай жа каханне, як лета патоне,*
*А камень усплыве ў каламужным віры.*

**Ласоўскі, М.** Вобразы мінуўшчыны / Міхаіл Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1986. – 31 ліпеня. – С. 4.

# Волат беларускай паэзіі
## (да 75-годдзя з дня нарэджэння А. Куляшова )

Як толькі пераступаю парог Трасцінскай сельскай бібліятэкі, у якой працаваў бібліятэкарам больш трыццаці гадоў, заўсёды з вялікай пашанай скіроўваю свой удзячны позірк у краязнаўчы куток, дзе сярод дарагіх рэліквій захоўваюцца творы пісьменнікаў краю крынічнага, краю Магілёўскага, зямлі вялікай і роднай Белай Русі. На паліцах, як на аглядзе ў салдацкай шарэнзе, выстраіліся зборы твораў, выбраныя творы, асобныя выданні пісьменнікаў-землякоў: народнага паэта Боларусі, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Аркадзя Куляшова, лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій БССР паэтаў Кастуся Кірэенкі і Аляксея Пысіна, празаікаў Алеся Адамовіча, Анатоля Кудраўца, Івана Новікава і Івана Чыгрывава, драматурга Кастуся Губарэвіча, лаўрэатаў літаратурнай прэміі СП БССР імя Аркадзя Куляшова: паэтаў Сяргея Грахоўскага, Пятра Прыходзькі і Аляксея Русецкага.

Побач з кнігамі пісьменнікаў старэйшага пакалення Платона Галавача і Максіма Гарэцкага стаяць кнігі і маладых — Алега Мінкіна, Алеся Пісьмянкова, Лявона Яўменава і іншых. На многіх кнігах аўтографы аўтараў — землякоў у адрас трасцінскіх кнігалюбаў.

«Выбіраць кнігі для свайго і чужога чытання — не толькі навука, але і мастацтва, развіццю яго няма межаў», — гэтыя словы выдатнага рускага бібліятэказнаўцы і публіцыста Мікалая Рубакіна былі маім крэда ў паўсядзённай працы. Тым больш, што мяне хвалявалі праблемы захавання і развіцця нацыянальнай мовы, гістарычнай памяці. На вялікі жаль, у часы застою беларускамоўная мастацкая літаратура і беларускія газеты і часопісы асаблівай папулярнасцю не карысталіся. Але ж у мяне не гублялася надзея, што пяшчотная і ласкавая беларуская мова з цягам часу пры ўсебаковым развіцці культуры і новы кожнай нацыі нашай краіны будзе адыгрываць галоўную ролю і ў беларускай рэспубліцы. І я стараўся ўсебакова пасцігнуць гэту навуку пазнання. Чытаў і перачытваў па некалькі разоў напісанае мастакамі слова, вывучаў водгукі літаратуразнаўцаў аб прачытаным, вёў шырокую перапіску з аўтарамі, стараўся зазірнуць у іх творчую лабараторыю, каб з лепшым веданнем весці прапаганду беларускай літаратуры сярод чытачоў бібліятэкі.

І вось, ужо знаходзячыся па ўзросту на пенсіі, атрымліваю пісьмо ад дырэктара інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР доктара філалагічных навук В.А. Каваленкі. У пісьме паведамляецца радасная вестка, што інстытут у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў БССР рыхтуе сямітомны збор твораў адзінага народнага паэта Беларусі з Магілёўшчыны, нашага земляка Аркадзя Аляксандравіча Куляшова. У збор твораў мяркуецца ўключыць таксама эпісталярную спадчыну паэта. У сувязі з гэтым і вялікая просьба — даць у распараджэнне рэдакцыйнай калегіі пісьмы Аркадзя Аляксандравіча, адрасаваныя ў мой адрас, а таксама зрабіць паслугу і паведаміць, калі пачалася наша перапіска і ў сувязі з якімі канкрэтнымі падзеямі напісана тое альбо іншае пісьмо. Звесткі гэтыя будуць выкарыстаны ў каментарыях да пісьмаў.

Думаю, што наша перапіска зацікавіць і другіх і рыхтуючы адказ на пісьмо ў інстытут, рашыў расказаць аб гэтым на старонках раённай газеты і таксама звярнуцца з просьбай: магчыма, і яшчэ ў каго-небудзь з Хоцімшчыны ёсць пісьмы паэта-земляка, дык каб іх таксама выслалі ў адрас інстытута ў скарбонку спадчыны аўтара. Пры ўспамінанні імя народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова чамусьці мне ў апошнія

гады на ўспамін прыходзяць словы беларускага паэта Ніла Гілевіча, што «...калі на гістарычнай карце беларускай літаратуры правесці прамую па самых высотах паэтычных вяршынях, то яна пройдзе так: — Куляшоў. Куляшову, як і кожнаму з яго вялікіх папярэднікаў, было суджана лёсам рушыць далей паэтычнае развіццё нацыі, узняць нацыянальны паэтычны геній на якасна новую ступень». А далей Ніл Гілевіч робіць вывад, што Аркадзь Куляшоў, бясспрэчна, — самая буйная постаць, самая значная велічыня сярод тых, чыя творчасць істотна рассунула духоўныя і мастацкія гарызонты беларускай паэзіі.

Пад уражаннем сказанага ясней бачыш і разумееш, якога паэта ў асобе Аркадзя Куляшова, якога волата творчага духу дала нам, беларусам, і ўсяму свету наша сціплая ў бярозах і соснах магілёўская зямля.

## І. ПАЧАТАК ЗНАЁМСТВА З ПАЭТАМ

Перада мною даведка Дзяржаўнай кніжнай палаты БССР, дзе змешчана наведамленне, што на 1 студзеня 1989 года выйшла з друку больш ста кніг Аркадзя Куляшова агульным тыражом каля двух мільёнаў экзэмпляраў. Кнігі выдаваліся на роднай беларускай мове, рускай, армянскай, грузінскай, літоўскай, таджыкскай, узбекскай, украінскай, на мовах зарубежных краін: балгарскай, іспанскай, кітайскай, румынскай, югаслаўскай. Першае літаратурнае выступленне А. Куляшова адносіцца да 1926 года, калі ў Клімавіцкай акруговай газеце «Наш працаўнік» 30 верасня быў надрукаваны першы верш «Ты, мой брат», пад псеўданімам Арк. Дуда, аўтару ў той час было ўсяго 12 гадоў. Праз год было змешчана каля дзесяці вершаў у газеце «Магілёўскі селянін», а адзін верш быў надрукаваны нават у рэспубліканскай газеце «Беларуская вёска».

З асаблівым хваляваннем чытаю паведамленне «Хронікі»: у 1930 годзе за 5 кастрычніка ў Беларускім Дзяржаўным выдавецтве выходзіць у свет першы зборнік вершаў А. Куляшова «Росквіт зямлі».

Беларуская паэзія не ведала, «...здаецца, другога такога ранняга і крутога творчага ўзыходу. У шаснаццаць гадоў — першая кніга («Росквіт зямлі», 1930). У васемнаццаць — яшчэ дзве («Па песню, па сонца!» і «Медзі дождж», 1932), — пісаў літаратурны крытык Бечык Варлен. Большасць вершаў гэтых зборнікаў, як сцвярджаюць крытыкі, былі створаны паэтам над непасрэдным уплывам падзей, што адбываліся ў вёсцы ў гады калектывізацыі.

Беражліва гартаю старонкі першых зборнікаў з надзеяй прыпомніць акалічнасці сустрэчы з імі ў даваенны час, будучы вучнем школы. Чародкамі плывуць успаміны. Але ж на ўспамін чамусьці, абганяючы другія, прыходзіць чароўны малюнак, што ўвесь час стаіць перад вачыма.

... Дажджлівым лістападаўскім вечарам 1948 года я рашыў пагартаць у салдацкай бібліятэцы вораснёўскі нумар часопіса «Новый мир». У далёкіх гарах Закаўказзя, дзе ў той час праходзіла мая вайсковая служба, удалечыні ад родных мясцін мяне раптам нібы электратокам скаланула, бліскавічна ўзрушылі пявучасцю радкі:

*«Есть станция такая —*
*Коммунары.*
*Есть станция родная — Коммунары... ».*

Ад захаплення я, здаецца, быў на сёмым небе. Тры гады яшчэ давялося насіць гэты нумар часопіса ў сваім вайсковым мяшку, пакуль кожны дзень бліжэй і бліжэй быў да станцыі Камунары. На ўсё жыццё запомніў пятую старонку гэтага часопіса, дзе быў надрукаваны верш, які заўсёды чытаў і перачытваў у вольныя хвіліны. Ён дапамагаў мне пераадольваць цяжкасці вайсковай службы. Тады ўпершыню праявіў цікавасць да аўтара верша, як да свайго блізкага земляка. На старонках часопіса

«Новый мир» пазнаёміўся з паэмамі «Толькі ўперад», «Новае рэчышча» і «Простыя людзі», а ў «Огоньке» з вершамі паэта, якія былі надрукаваны ў той час.

Атрымалася так, што мая запамінальная першая сустрэча з паэзіяй Куляшова была па рускай мове, з дапамогай перакладчыкаў Якава Хелемскага і Міхаіла Ісакоўскага. На рускай мове я чытаў у суровым летапісе вайны паэму «Сцяг брыгады», знаходзячыся ў шпіталі пасля ранення на 1-м Прыбалтыйскім фронце ў канцы 1944 года ў невялікім літоўскім горадзе Седа. Але ў той час я яшчэ не ведаў, што аўтар — блізкі зямляк.

Памятаецца добра мне і такі выпадак. У жніўні 1944 года я прыбыў на фронт у адну з гвардзейскіх дывізій. Пасля жорсткага бою з ушанаваннем хавалі загінуўшых герояў у брацкіх магілах. І калі прагучаў развітальны набат, хтосьці з байцоў-беларусаў стаў выразна вымаўляць — чытаць, нібы малітву:

*«Мы сяброў засыпаем зямлёй—*
*Ленінградцы, татары, узбекі,*
*Мы клянёмся варожай крывёй*
*Напаіць беларускія рэкі».*

Бура гневу радкоў верша «Над брацкай магілай», своеасаблівага рэквіему клікала нас ненавідзець і помсціць лютаму ворагу. Пасля вяртання ў родны край з вялікай асалодай чытаю і перачытваю паэтычныя мілагучныя радкі, напісаныя паэтам-земляком аб родных мясцінах, усё, што выйшла з-пад пяра гэтага волата мастацкага слова, без граніц захапляюся хараством напісанага.

## II. НЕЗАБЫЎНАЯ СУСТРЭЧА З ЧАРАЎНІКОМ ПАЭЗІІ

Панядзелак, 3 ліленя 1972 года, быў у мяне звычайным працоўным днём. У сярэдзіне дня ў бібліятэцы за столікамі сядзелі камсамолкі — дочкі жывёлаводаў Шасцерыковых і чыталі свежыя нумары часопісаў «Маладосць» і «Полымя», а я растаўляў на паліцах кнігі, якіх сабралася багата пасля самага «ўраджайнага» па наведваняю нядзельнага дня.

Калі ж свой позірк, адарваўшы ад кніг і паліц, накіраваў на заходзячага ў памяшканне наведвальніка, то вачам сваім не паверыў ад здзіўленая. Нават разгубіўся. Да мяне з працягнутай рукой і ўсмешкай на твары падыходзіў наш зямляк, народны паэт Беларусі Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў. У свой час гасцямі нашай бібліятэкі былі пісьменнікі Іван Аношкін, Іосіф Васілеўскі, Іван Ісачанка. Віктар Карамазаў, Леанід Леванович, Пятро Прыходзька, Яраслаў Пархута,. Аляксей Пысін, Іван Чыгрынаў, а гэты выдатны майстар беларускай літаратуры наведаў нашу бібліятэку ўпершыню.

Пакуль ён ласкава вітаўся са мною, а я выказваў словы бязмежнай радасці ад нечаканай і прыемнай сустрэчы на гасціннай трасцінскай зямлі, у маёй галаве прамільгнулі тысячы думак, аб чым далей павесці размову? Нізкай, самі набягалі пытанні. Хацелася падрабязна даведацца аб усім: і як у садружнасці з Я. Коласам, К. Крапівой, М. Танкам рабілі пераклад Гімна Савецкага Саюза на беларускую мову ў 1945 годзе, і як ў 1951 годзе прымаў удзел у чарговай асамблеі ААН, і як адгукаліся літаратуразнаўцы на паведамленне, што славутыя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе» напісаны ў нашым краі на Клімаўшчыне, і якія паэтычныя планы зараз знаходзяцца на рабочым стале, і ці атрымаў наша апошняе пісьмо? Так, усё хацелася ведаць. Але няёмка было адразу задаваць усе цікавячыя пытанні. Выручыў сам Аркадзь Аляксадравіч, сам распачаў гамонку:

— Атрымаў ваша пісьмо з просьбай даслаць у бібліятэку свае новыя кнігі з аўтографамі. Едучы да бацькоў у Хоцімск, рашыў выканаць вашу просьбу і зрабіць чытачам бібліятэкі падарунак.

Сеўшы за стол, паважаны госць напісаў нам на сваіх, нядаўна выйшаўшых з друку кнігах «Сцяг брыгады» і «Сасна і бяроза» аўтографы: «Трасцінскай сельскай бібліятэцы ў дні яе 50-годдзя ад аўтара-земляка. А. Куляшоў. 3 ліпеня 1972 г., веска Трасціно».

Пасля ўручэння падарунка шаноўны госць пацікавіўся кніжным фондам бібліятэкі, якія кнігі карыстаюцца попытам у чытачоў, колькасцю і саставам чытачоў бібліятэкі, іх густамі. Дэталёва азнаёміўся з краязнаўчай работай, правадзімай бібліятэкай, даў ён станоўчую і высокую адзнаку:

— У будучым такую карпатлівую работу па краязнаўству будуць праводзіць усе бібліятэкі нашай рэспублікі, — сказаў ён.

У шчырай гутарцы я расказаў, з якім вялікім задавальненнем і любоўю чытачы нашай бібліятэкі чытаюць яго цудоўныя вершы «Мая Беларусь», «Станцыя Камунары», «Магілёўская хмарка», паэму-біяграфію «Далека да акіяна», прысвечаныя роднай Магілёўшчыне.

— Ад імя ўсіх хацімчая да Вас, Аркадзь Аляксандравіч, ёсць вялікая просьба. Напішыце, калі ласка, літаратурны твор аб нашым старажытным Хоцімску, — звярнуўся я да паэта. — Краязнаўцы нашай бібліятэкі адшукалі легенду аб далёкім мінулым нашага роднага гарадка. Змест легенды надзвычай цікавы. Такі ж, як і паданне аб узнікненні горада Магілёва, пакладзены Янкам Купалам у аснову паэмы «Магіла льва».

— Прыемна чуць ваша паведамленне і, калі можна, то дашліце мне тэкст гэтай легенды. Фальклорны твор мне трэба добра вывучыць, і потым даць яму надежны змест і гучанне. З крышталёвых глыбокіх крыніц фальклорных я заўсёды чэрпаю ручаінкі народнай паэзіі, — адказаў тады Аркадзь Аляксандравіч.

Потым госць звярнуўся з пытаннем да чытачкі Любы Шасцерыковай, які верш, з напісаных ім, больш за ўсё хвалюе яе. Дзяўчына адразу пачала выразна чытаць адзін з лепшых вершаў ваенных гадоў «Балада аб чатырох заложніках»:

*«Іх вядуць па жытняй сцяжынцы.*
*Чатырох.*
*Пад канвоем.*
*З дому.*
*Чатырнаццаць—старэйшай дзяўчынцы,*
*Тры гады хлапчуку малому...».*

Разам слухаем трагедыю мінулай вайны пра сям'ю народнага мсціўцы камбрыга бацькі Міная, узрушыўшую болем і тугой сэрца юнай чытачкі Міжволі яе боль передаўся і ў нашы сэрцы, на вачах выступілі слёзы.

Гэту нашу цёплую, незабыўную сустрэчу з народным паэтам Беларусі Аркадзем Куляшовым, творчасць якога яшчэ на першай дэкадзе беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве высока ацаніў рускі пісьменнік Аляксей Талстой, назваўшы яго «салаўём паэзіі», будзем памятаць вёльмі доўга.

Незабыўнымі засталіся ў памяці і тыя дні, калі работнікі кінастудыі «Беларусьфільм» рэжысёр У. Цяслюк і аператар У.У. Цяслюк здымалі дакументальную стужку «Край крынічны» — аб жыцці і творчасці паэта.

Быў абедзенны перапынак, і да памяшкання бібліятэкі, дзе рабіліся здымкі, прыйшло многа людзей, рабочых саўгаса з сенажацей, чытачоў бібліятэкі, каб вітаць свайго земляка, творы якога, як сказаў хтосьці з беларускіх паэтаў, не проста чытаем, і не проста любім, а іх хочаца чытаць, як хочацца дыхаць і есці. Творы Аркадзя Куляшова для многіх з нас — надзённы хлеб, чысты крынічны струмень. Радкі твораў

яго адчуваеш у сэрцы, як сцежку пад нагамі, як неба над сабою. Ва ўсіх была вялікая радасць: прыехаў паэт, без якога немагчыма ўявіць сабе сваё жыццё, чый лёс, чые словы зрабіліся часцінкай цябе самога, а яго кнігі — нашым агульным святам.

Цудоўная дабрата і сардэчнасць у адносінах да людзей была неад'емнай рысай характару нашага земляка — народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова, які быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР васьмі скліканняў, узнагароджан двума ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі.

— Бачу, шло зусім цесна вашай бібліятэцы ў гэтым пакойчыку, — гаварыў наш госць пры развітанні пасля здымкі кадра для фільма, бо апаратура не месцілася ў пакойчыку і здымкі вяліся з вуліцы, праз акно, з якога была вынута рама. А потым параіў: «Абмяркуйце пытаане аб, будаўніцтве памяшкання для бібліятэкі і дашліце сваё хадайніцтва на маё імя. Я паспытаю выкарыстаць свае дэпутацкія паўнамоцтвы і дапамагчы вам, каб і ў вашай вёсцы бібліятэка была размешчана ў добрым памяшканні».

Зараз бібліятэка знаходзіцца ў пабудаваным для яе асобным утульным, памяшканні — зборнашчытавым доме, абліцаваным сілікатнай цэглай, з вадзяным ацяпленнем і лямпамі дзённага асвятлення. Усё зроблена так, як хацеў бачыць зямляк — выдатны майстар паэзіі.

## III. СВЕТЛАЯ КРЫНІЦА СЭРЦА І ПАМЯЦІ ПАЭТА

Усходняя Магілёўшчына — радзіма народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова з якой непарыўна звязана яго паэтычвая творчасць. У другой страфе верша «Вуліца Маскоўская» паэт піша:

*«Пакланіўшы вясне і маю,*
*Кліч зязюлі ўчуўшы з-за ракі,*
*Кожны год*
*У вёску ад'язджаю,*
*Падышаць, чым дьшуць землякі»*

Паэт уславіў бацькоўскі край, сваю родную Бесядзь, і яна, дзякуючы свайму вялікаму сыну, стала вядомай ракой.

Бываючы ў Елаўцы і Альшове, я звярнуў асаблівую ўвагу на геаграфічныя прывязкі твораў паэта. Часам задумваўся, ці не ў гэтых месцах лірычны герой паэта напаткаў дзяўчыну незвычайнай прыгажосці? Менавіта пад удлывам асалоды крьнічна-празрыстай народнай паэзіі, народных звычаяў, вясельных і заручальных песень, якія аксамітамі рассыпаны ў рамантычна-ўзнёслай паэмы-песні «У зялёнай дубраве», я ў 1968 годзе звярнуўся з пісьмом да паэта, каб адказаў, ці не на Хоцімшчыне яна была напісана, і якія яшчэ творы паэта былі напісаны на Хоцімскай зямлі? Неўзабаве атрымаў шчыры адказ. Інтуіцыя мяне не падвяла. Вось радкі пісьма, якія даюць ясны прамень пра сувязь паэта з Хоцімшчынай:

«Паважаны т.Ласоўскі! Пасылаючы Трасцінскай бібліятэцы чатырохтомнік, хачу коратка і сціпла адказаці, на некаторыя вашы пытанні да мяне.

1. Маці мая працавала ў Хоцімскім раёне з 1927 года ў Юзяфоўскай, Альшоўскай і Елавецкай школах. Я прыязджаў да яе на летнія канікулы ў Альшоў і Елавец. Якія гэта былі гады, я ўжо дакладна не памятаю. Ва ўсялякім разе — трыццатыя.

2. У Елаўцы, дзе я адпачываў з сям'ёй у 1938 і 1939 гадах (летам) мною была напісана паэма «У зялёнай дуброве» і некаторыя асобныя вершы з цыкла «Юнацкі свет», у прыватнасці, «Бюро даведак». Там жа задуманы былі і напісаны ўжо ў Мінску «Магілёўская хмарка», «Мая Бесядзь», «На сотай вярсце», «Плыла, цалавалася хмара з зямлёй...», «Добры чалавек» і іншыя.

3. У 1940 годзе ў Хоцімску (у будцы на сядзібе бацькоў) напісана паэма «Хлопцы

апошняй вайны» (здаецца, май-чэрвень месяцы).

4. У той жа будцы, але ўжо ў 1950 годзе, напісана паэма «Толькі ўперад». Як бачыце, «творчыя сувязі» мае з Хоцімшчынай не такія ўжо малыя, і я ўдзячны сваёй роднай зямлі і яе людзям, якія і да гэтага часу з'яўляюцца светлай крыніцай майго сэрца і памяці. 3 павагай да Вас і нізкім паклонам да чытачоў Ар. Куляшоў. 11.VII.68 г. г. Мінск»,

Як самая каштоўная рэліквія, захоўваюцца яго творы ў чатырох тамах, на якіх ён пакінуў такі надпіс: «Трасцінскай сельскай бібліятэцы — аднаму з асяродкаў народнай асветы і культуры ў далёкім кутку роднай Магілёўшчыны ад аўтара. Аркадзь Куляшоў. 11.VII.1968 г., г. Мінск».

А на двухтомніку твораў у мой адрас пакінуў аўтограф: «Дарагому кнігалюбу і краязнаўцу М.Ласоўскаму на добрую памяць ад земляка. 3 павагай Ар. Куляшоў».

У запісных кніжках паэта-земляка Аляксея Зарыцкага занатаван успамін, што летам 1938 года ён разам з Аркадзем жыў у Елаўцы, дзе ён займаўся перакладчыцкай працай, а Аркадзь жа пачаў пісаць паэму «У зялёнай дуброве». «Раніцай Аркадзь ішоў да завітастай Альшоўкі і выбіраў такое месца, каб і лес быў побач. На прырэчным узлессі, у зацішку ён рассцілаў коўдру, узбройваўся алоўкам і паперай і браўся за працу. І ў гэтым аграмадным кабінеце, прыкрытым толькі «сінім дахам неба», Куляшоў пад спеў жаваранкаў, стракатанне конікаў і прарэзлівы крык кнігавак, працаваў надта плённа».

Хтосьці з пісьменнікаў верна сказаў: «Каб зразумець паэта, трэба наведацца ў яго краіну». Дык з чаго пачынаецца пісьменнік? Мабыць, з любві, з паэтычнага захаплення роднай зямлёй.

Маскоўская даследчыца Е. Мядзведзева ў дні (60-гадовага юбілею спытала ў Аркадзя Аляксандравіча: «Што такое натхненне? Як і калі яно прыходзіць да паэта?».

І вось што ён адказаў:

—Аднойчы я ішоў у Елавец да сваіх бацькоў. Гэта было на світанні. Яшчэ жоўтае святло месяца залівала жытнёвае поле, а ад рэчкі слаўся перадранішні туман. Не прыпомню зараз ужо аб чым тады думаў, але раптам адчуў, паверыў, што ўсё здзейсню ў жыцці, усё, што хачу, што задумаў. І гэта была такая лёгкая, расхінаючая душу і імклівая, нібыта прыўзнімаючая ад зямлі ўпэўненасць, што, магчыма, гэта і было натхненнем?

Сваю вялікую працалюбівасць у дні юбілею ён падкрэсліваў:

—Трэба працаваць. Юбілей — гэта свята, а жыццё — праца, нічога няма важней працы.

І сведкай гэтаму — кожны радок яго вершаў і паэм — гэта гарачае сцвярджэнне пераўтвараючай сілы сацыялістычнага ладу, яго гарманічнага ўздзеяння на асобу, на цэлыя пакаленні. Нам, хацімчанам, заўсёды радасна, што праз голас Бесядзі, праз голас свайго маленства наш дарагі паэт-зямляк, пясняр новага свету, сведка і ўдзельнік вялікіх гістарычных падзей, просты юнак, што вырас на тройчы блаславеннай магілёўскай рачулцы з ціхай і цёплай, быццам дыханне блізкага чалавека, назвай Бесядзь, нясе штодня чары і цуд сапраўднай паэзіі, якая вызначаецца высокай паэтычнай культурай, глыбокім ідэйна-палітычным і выхаваўчым зместам. Толькі, на вялікі жаль, «...самотным жаўранкам звініць і плача май...». У тым ліку і мы, землякі, бо няма Аркадзя Аляксандравіча ў дні яго 75-годдзя з намі. Недапісанымі засталіся і шмат задуманых твораў, якія б так радавалі нас у жыцці.

**Ласоўскі, М.** Волат беларускай паэзіі : [да 75-годдзя з дня нараджэння А.Куляшова] / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1989. – 4 лютага. – С. 4. ; 9 лютага. – С. 3. ; 16 лютага. – С. 3.

31 сакавіка — 55 год з дня выхаду першага нумара нашай райгазеты «Шлях Кастрычніка».

Першая газета ў нашым краі выйшла 26 красавіка 1918 года і называлася «Известия Климовичского уездного Исполнительного комитета крестьянских и рабочих депутатов». Выходзіла яна да лістапада 1918 года. Выдавалася на рускай мове, выходзіла два разы ў тыдзень і на сваіх старонках друкавала ўсе пастановы выканкома і іншыя распараджэнні савецкай улады. Рэдагаваў яе Іван Сурта— хацімчанін.

9 мая 1919 года ў Клімавічах выходзіць газета «Климовичская беднота» — орган павятовага камітэта Камуністычнай партыі бальшавікоў. Выходзіла два разы ў тыдзень на чатырох старонках.

Летам 1921 года тыражом 200 экземпляраў на рускай мове выходзіць газета «Наше хозяйство», якая выдавалася раз у два тыдні і ставіла мэтай прабудзіць уласную ініцыятыву кожнага грамадзяніна, імкнулася прыцягнуць шырокія масы да кааператыўнага будаўніцтва. Газета адзначала добрую работу пасяўнога камітэта Хоцімскай воласці, шырока асвятляла жыццё саўгаса «Разальмова».

Некаторы час потым друкавалася «Насценная газета РОСТА».

У ліпені 1924 года другая сесія ЦБК БССР шостага склікання прыняла рашэнне аб стварэнні акругі раёнаў.

12 снежня1924 года з'явіласяў свет невялікая, на чатырох старонках на беларускай мове газета «Наш працаўнік». Выходзіла газета два разы ў тыдзень. З вялікай радасцю сустрэлі сяляне, сельская інтэлігенцыя, служачыя і рабочыя сваю першую газету. Партыйныя і камсамольскія арганізацыі адразу ўзяліся за распаўсюджванне яе сярод насельніцтва.

Цяжка прыйшлося газеце ў першыя месяцы існавання: адсутнічалі пастаянныя супрацоўнікі, не было неабходнай тэхнікі, матэрыяльныя цяжкасці перашкаджалі росту газеты. Першым вызваленым рэдактарам стаў вядомы беларускі паэт Андрэй Александровіч.

У 1926 годзе, 30 кастрычніка, на старонках газеты быў надрукаван першы верш «Ты мой брат» Аркадзя Куляшова.

Са жніўня 1925 года асобна, раз у тыдзень, выдаецца газета «Малады камуніст» — орган акружнога камітэта ЛКСМБ, якая адразу ўзялася за падняцце культурнага і палітычнага ўзроўню рабочай і сялянскай моладзі.

Штомесячна з 1927 года да газеты «Наш працаўнік» выходзіць літаратурны дадатак «Світанне».

З радасцю сустракалі газету «Наш працаўнік» на Хоцімшчыне. А як толькі выйшлі першыя нумары — з'явіліся рабкоры і селькоры, якія пачалі пісаць у газету свае матэрыялы.

28 снежня 1924 года ў Клімавічах адбыўся першы павятовы з'езд рабселькораў, а 5 снежня 1925 года — другі. На старонках газеты «Наш працаўнік» за 13 снежня 1925 года ў карэспандэнцыі Я.Курэпка «Райсценгазета» паведамлялася, што ў Хоцімскім раёне пачаўся селькораўскі рух, створана раённая насценная газета «Чырвоны ратай», у якую сяляне падаюць многа матэрыялаў. Газета выходзіць у вызначаны тэрмін у трох экземплярах і вывешвалася на відных месцах.

«9 жніўня ў м. Хоцімск была склікана першая нарада селькораў, якая адбылася ў нардоме. Заслухалі даклад аб селькораўскім руху, вызначылі значэнне райгазеты, выбралі бюро. Рэдкалегія спадзяецца, што сяляне раёна і далей будуць так актыўна

пісаць у сваю газету. «Чырвоны ратай» — гэта маленькае сэрца раённай культурнасці», — такім паведамленнем заканчвалася гэта карэспандэнцыя.

Перад 2-ім акружным з'ездам рабселькораў у кастрычніку-лістападзе 1925 года адбылася Хоцімская раённая канферэнцыя рабселькораў. У красавіку 1926 года ў Хоцімску адбылася раённая нарада селькораў і юнкораў, на якой было 25 чалавек. На нарадзе была арганізавана выстаўка насценных газет, якіх налічвалася 15. Тры газеты з сяла былі прэміяваны.

8 ліпеня 1931 года Хоцімскі раён быў ліквідаваны, а тэрыторыя Забялышынскага, Арлоўскага сельскіх Саветаў далучаны да Клімавіцкага раёна, а 12 сельскіх Саветаў да Касцюковіцкага.

З 1930 года ў Клімавічах выдавалася раённая газета «Камуна» (зараз «Новае жыццё»). На яе старонках часта расказвалася аб калгасах Забялышынскага сельскага Савета.

Вось і ў нумары ад 31 студзеня 1932 года супрацоўнік П. Кавалёў (зараз вядомы беларускі пісьменнік) пісаў аб калгасе «XII Кастрычнік», які арганізаван у студзені 1930 года з 80 сялянскіх гаспадарак, старшынёй калгаса выбран Падабед. Адзначаючца лепшыя калгаснікі Ігнаценка П., Прэзідэнтаў П., Казлоў, Паўлючэнка, Дземчанка і другія.

У нумары ад 8 кастрычніка 1932 года змешчан фотаздымак «Сяўба жыта ў калгасе «Барэц» Забялышынскага сельскага Савета».

У красавіку 1931 года выйшаў у свет першы нумар Касцюковіцкай раённай газеты «Сталінскі прызыў» (зараз — «Сцяг камунізму»).

Са старонак газеты становіцца вядома прамова на першым Усебеларускім з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў — брыгадзіра з калгаса «1 Мая» Чарняўскага сельсавета Машаруева аб наведванні Касцюкоўшчыны і Хоцімшчыны старшынёй ЦВК БССР Червяковым у жніўні 1933 года, аб першых ударніках – калгасных конюхах В. Мурашку з калгаса «Праўда», В. Бяспалаве і Громаве з калгаса «Бальшавік» Вялікаліпаўскага сельскага Савета, В. Паўловічу з саўгаса «Разальмова», свінарцы М. Крывянковай з калгаса «Праўда», аб тым, што ў лютым 1932 года закончана пабудова Хоцімскага льнозавода, а ў жніўні 1934 года была арганізавана Хоцімская МТС.

З трапяткім хваляваннем чытаем на старонках Касцюковіцкай раённай газеты пастанову ЦВК і СНК БССР «Аб новай сетцы раёнаў Беларускай ССР» ад 12 лютага 1935 года, згодна якой быў утворан Хоцімскі раён.

Згодна пастановы ЦК ВКП (б) ад 18 студзеня 1931. года «Аб сельскім, раённым і нізавым друку» 31 сакавіка 1935 года выходзіць на двух старонках першы нумар газеты «Калгасная звязда» — орган, толькі што адноўленага Хоцімскага РК КПБ і РВК тыражом 2 тыс. экземпляраў. Першыя нумары райгазеты друкаваліся ў Клімавіцкай друкарні і толькі ў жніўні сталі друкавацца ў Хоцімску. Першым рэдактарам быў супрацоўнік рэспубліканскай газеты «Звязда» Дзям'ян Трафімавіч Лебедзеў, намеснікам — Максім Галабурда. Газета з першага нумара выконвала актыўную ролю ў арганізацыі і мабілізацыі працоўных раёна на пабудову фундамента сацыялістычнай эканомікі, у камуністычным выхаванні людзей.

З выхадам газеты шырыцца селькораўскі рух у раёне. На нарадзе 5 мая 1937 года прысутнічала ўжо каля ста чалавек. Захавалася фатаграфія ўдзельнікаў гэтай нарады, якую доўгі час беражліва захоўвала і передала рэдакцыі выкладчыца беларускай мовы і літаратуры Клаўдзія Аляксандраўна Макаранка — родная сястра аднаго з першых супрацоўнікаў газеты Мікалая Хайноўскага. Дарэчы, у нумары ад 2 ліпеня 1936 года ў карэспандэнцыі дырэктара Трасцінскай сямігодкі Ліпінскага «Вечар выпускнікоў» сярод прэміраваных выпускнікоў выдатнікаў сёмага класа на выпускным вечары 21 чэрвеня 1936 года адзначана падарункам і Макаранка Клава.

Зараз, напярэдадні 45-й гадавіны з дня Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі чамусьці адразу на ўспамін прыйшлі радкі заметкі «Буду камандзірам», надрукаванай у раённай газеце 2 верасня 1938 года. «Мала любіць Радзіму, — гаварылася ў ёй,— а галоўнае ў сучасны момант тое, што кожны савецкі патрыёт павінен ведаць і ўмець абараняць сваю зямлю. Брат мой, Цярэнцій, пайшоў служыць у авіячасць, а я пасля заканчэння Барысаўскага педвучылішча падаў заяву ў артылерыйскую школу. Працуйце, рабочыя на фабрыках і заводах, калгаснікі на палях, вучыце моладзь,будуйце заможнае жыццё, а мы заўжды гатовы абараняць усе заваёвы Кастрычніка». Пад заметкай подпіс Іван Цыганкоў.

Захацелася больш даведацца пра лёс камандзіра. Пошукі прывялі ў вёску Боркі калгаса «Перамога». У братоў героя-воіна чытаю пажоўклыя дакументы, у якіх гаворыцца, што ў бітве за Днепр, пры вызваленні Данбаса *«...камандзір батарэі артылерыйскага палкакапітан І. М. Цыганкоў у баях з ворагам загінуў 11 верасня 1943 года пад сялом Шастакоўка. Пахаваны з ваеннымі ўшанаваннямі ў с.Соф'ін-Ліман, затым перазахаваны ў с. Беззаботаўцы. На магіле ўстаноўлен скульптурны помнік».*

Галоўнае ўпраўленне кадраў Узброеных сіл паведамляе, што «за баявыя подзвігі Цыганкоў І. М. узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі ідвумя медалямі «За баявыя заслугі». Загінуў у баях і яго брат лётчык Цярэнцій.

Павольна перагортваю старонкі даваенных нумароў. Баюся прапусціць з поля зроку і ўвагі падзеі таго часу, прозвішчы перадавікоў калгаснай вытворчасці. Вось адказная па вырошчванню льну П. Іванкова з калгаса «Праўда» Вялікаліпаўскага сельсавета дзеліцца радасцю аб удзеле ва Усебеларускім злёце майстроў льну ў кастрычніку 1935 года. У лістападзе 1935 года за прададзены хлеб калгасы раёна атрымалі сем аўтамашын, ужо прыбылі тры, і іх атрымалі калгасы «ІІІ Інтэрнацыянал», «Маяк» (Елавец), «Піянер» (Баханы).

Даярка Марыя Раманенка з калгаса «ІІІ Інтэрнацыянал» — удзельніца Усебеларускай нарады перадавікоў ад 14 кароў вырасціла 14 цялят, надаіла ад кожнай каровы па 2 тыс. літраў малака, узнагароджана Граматай ЦБК і СНК БССР.

У 1936 годзе ў Хоцімскую МТС прыйшлі першыя два камбайны. У 1937 годзе ў Хоцімскай МТС арганізавана жаночая трактарная брыгада, брыгадзірам прызначана Марыя Аляксандраўна Храмянкова, брыгада па выпрацоўцы на трактар знаходзіцца ў ліку пёрадавых.

Гадывайны. Зноў адноўлена рэдакцыя. Лістапад 1944 года. Калгаснікі калгаса «ІІІ Інтэрнацыянал» на пабудову танка ўнеслі 46 тыс. рублёў. Алена Саўчанка, загадчыца фермы з калгаса «Чырвоная пчолка» — удзельніца рэспубліканскай нарады па жывёлагадоўлі — дзеліцца вопытам сваёй работы. Першага мая 1945 года — адноўлен ільнозавод. Красавік 1946 года — адкрыт кінатэатр «Радзіма». Лістапад 1947 года — устаноўлен электрагенератар і ў Хоцімску запаліліся лямпачкі Ільіча.

Гартаю павольна. Кожнае паведамленне газеты — гэта гісторыя роднай зямлі хоцімскай. Радкі паведамленняў — летапіс яе для нас і нашых нашчадкаў.

**Ласоўскі, М.** Вытокі друкаваных радкоў / Міхаіл Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1990. – 31 сакавіка. – С. 2.

# Глыбокая сімпатыя да добрых маіх дарадцаў

Як хутка бяжыць час. Вось ужо і 75 год.

*"А думы, думы роем-роем...*
*Я з імі дзень і ноч жыву.*
*Часамі прыйдзе і такое,*
*Што не завеш у галаву",* - так пісаў у сваім вершы знаходзячыся ў такім стане І ўзросце народны паэт БССР Пятрусь Броўка. А вось радкі нашага земляка Аркадзя Куляшова:

*"Мой год, нам трэба даражыць хвілінамі,*
*Для нас гадзіна – тэрмін не малы.*
*Ужо не абрусамі, а ўспамінамі*
*Сталы засланы. Доўгія сталы.*
*Склікай гасцей. Стаў крэслы і віно,*
*Па звычаю для ўсіх абавязковаму:*
*Па правы бок - свайму*
*сяброўству новаму,*
*Па левы - тым, каго няма даўно..."*

Часценька і я задумваюся над сваёй біяграфіяй. У думках аналізую, што паспеў зрабіць, які яшчэ след намеран пакінуць. Такі ўзрост мудрасцю жыццёвай змацаваны. Як гаворыць народная пагаворка: "Перажытае не забываецца". Пабольш бы толькі сілачкі. А планаў і задумак праз край, быў бы толькі порах у парахаўніцы.

Гартаючы старонкі жыцця, звяртаю ўвагу і на тыя абставіны, ці сказаў узаемна ўдзячныя словы добрым людзям, якія ў свой час падарылі ў мой адрас залацінкі дабрыні, запалілі веру у людзей і іх дабрату, што навокал многа добрых сардэчных людзей і свет такі прыгожы.

Дабрата асабліва надоўга западае ў памяць. Вярнуўся я ў родныя мясціны пасля фронта і службы ў радах Узброеных Сіл СССР пяцьдзесят год таму назад, у маі 1951 года. Туга, настальгія па дому і дыму з комінаў роднай вёскі ў прыбесядскіх мясцінах непакоілі амаль восем год пасля развітання. А дома адна старэнькая матуля. І хаця маці была непісьменная, але прыкметы, што бытавалі на зямлі яна старанна саблюдала. Чакаючы сына ці дачку, на самыя лепшыя кветкі заўсёды глядзела.

Прайшлі вёсны і зімы, выраслі дзеці такімі ж як кветкі, што бачыла маці. І дзіячыя душы былі чыстыя, як рамонка, а вочы цвілі сінімі васількамі. У народзе гавораць, што дубы вырастаюць з малых жалудоў, а з дзетак маленькіх праз дваццаць гадоў уздымаюцца хлопцы - дзяржавы сыны. І вось пяць дзяржавы сыноў адстойвалі ў баях незалежнасць бацькаўшчыны на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Трое з іх: Рыгор, Іван і Пятро аддалі сваё жыццё на алтар Перамогі Айчыны. Тры старэйшых сястры – дзве настаўніцы, а адна працаўніца гандлю, выйшлі замуж і абзавяліся сваімі сем’ямі. Хата патрабавала неадкладнага капітальнага рамонту. Калгас беднаваты, адзін голы пусты працадзень. Грошай няма. “Што рабіць?”. Ажно крыху разгубіўся, хоць на фронце ў пяхоце-матухне давялося многае за вайну пабачыць і перажыць. Была думка падацца зноў у багатае Закаўказзе, дзе служыў у арміі ў апошні час, альбо ў горад на будоўлю. А пакуль афармляліся дакументы з рознымі прыдзіркамі ды затрымкамі, пачаў працаваць у калгасе.

Як аматар-чытач зайшоў аднойчы ў сельскую бібліятэку. Кніг у ёй у той час было небагата. Звярнуў увагу на вельмі зашмальцаваную "Глыбокую плынь" Шамякіна, якая выйшла з друку ў 1949 годзе, а ў 1951 годзе была адзначана дзяржаўнай прэміяй СССР.

Знешні выгляд сведчыў аб тым, што пабывала яна ўжо не ў адных руках маіх аднавяскоўцаў.

Раман запаланіў мяне і я прачытаў яго не адрываючысь. Глыбокай сімпатыяй пранікся да яго аўтара, які захапляючы і па майстэрску апісаў усенародную партызанскую барацьбу, і да герояў кнігі, якія стойка і мужна змагаліся з ворагам на беларускай зямлі і перамаглі яго ў смяротнай схватцы. Асабліва запомніўся мне канец рамана, калі Карп Маеўскі "...паплываў у далоні, глыбока капнуў рыдлёўкай старое вогнішча, адкінуў зямлю ўбок і сказаў:

- Ну, дзеці, будзем будавацца."

Словы гэтыя, у якойсці ступені, падыходзілі і мне, зрабіліся як бы камандай і перамянілі мае папярэднія задумы. Яны, у якойсці ступені, яшчэ мацней прывязалі мяне да родных мясцін, пабудзілі нястрымнае жаданне жыць на зямлі бацькоў, будаваць і ўпрыгожваць жыццё роднай Хоцімшчыны.

Пры чарговым неведанні бібліятэкі, я сутыкнуўся там са старшынёй выканкама райсавета Пятром Несцеравічам Післяком і старшынёй выканкама сельскага Савета Іванам Ільічом Ільюшчанкам, якія звярнулі ўвагу на тое, што я узяў для чарговага чытання некалькі кніжак таксама на беларускай мове. Распачалі размову, папрасілі прынесці асабовую справу з маімі армейскімі характарыстыкамі і картай заахвочванняў, а за восем год службы іх набралася багата. Што я і зрабіў. А неўзабаве прапанавалі пасаду загадчыка хаты-чытальні ў роднай вёсцы, бо папярэдняга загадчыка, таксама ўдзельніка вайны Івана Архіпавіча Анішчанку, абралі, на толькі што адбыўшыхся выбарах у мясцовы Саветы сакратаром сельскага Савета.

Ветліва сустрэлі мяне загадчык аддзела культурна-асветных устаноў райвыканкама Іван Сцяпанавіч Грэбянькоў і дырэктар РДК Міхаіл Фядотавіч Карпенка. Так з благаславення маіх новых начальнікаў, з армейскай хваткай я іпачаў сваю справу культасветработніка. Паступіў вучыцца на завочнае аддзяленне Мінскага бібліятэчнага тэхнікума імя А.С. Пушкіна. Заслухоўваўся цудоўнымі лекцыямі выкладчыцы рускай мовы і літаратуры Кацярыны Восіпаўны Кулаковай. Чаравалі ўрокі роднай мовы і літаратуры пісьменніка Сцяпана Аляксандровіча. Гэта былі задушэўныя песні, далучэнне да чароўных гукаў матчынага слова, да гісторыі і фальклору народа, на ўроках мы не толькі вывучалі прадмет, а і чулі мелагучнае слова, вучыліся прыгожа гаварыць моўнымі залацінкамі.

Неўзабаве быў пераведзены на пасаду загадчыка сельскай бібліятэкі, завочна таксама закончыў факультэт Мінскага пединстытута імя М. Горкага. Працаваў з натхненнем. Сельская бібліятэка была сапраўднай школай прапаганды беларускай літаратуры. Трымалі цесную сувязь з кабінетам беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы, усе масавыя мерапрыемствы праводзілі разам сумеснымі намаганнямі.

Праходзяць гады, але і зараз з вялікім задавальненнем і асалодай зачытваюся творамі, якія так плённа выходзяць з-пад пяра майго добрага дарадчыка Івана Пятровіча Шамякіна, які адзначае сваё 80-годдзе. У кожнай яго кнізе я знаходжу штосці новае, цікавае, захапляючае... Так, у "Добрым часе" з асалодай прачытаў аб пасляваенным аднаўленні калгаснай вёскі і ўдзеле ў ім франтавікоў і партызан. У "Крыніцах" - убачыў чысціню крыніц народнага жыцця. У "Трывожным шчасці" – перажыў гады ваенных выпрабаванняў, рамантыку маладосці, вернасць каханню, юнацкія мары. У "Сэрцы на далоні" - душэўная чуласць людзей, сэрцы якіх адкрыты насцеж для дабрыні.

Запомнілася, дарэчы, на ўсё жыццё і сустрэча з Іванам Пятровічам на канферэнцыі чытачоў у час вучобы ў Мінскім падінстытуце ў 1965 годзе. Пры чытанні "Снежных зім" пранікся глыбокай павагай да той пары ў жыцці чалавека, калі сівізной пакрываецца галава, а ў творы "Ах, Міхаліна, Міхаліна" яшчэ раз перажыў вечна хвалюючае пачуццё. У аповесцях "Шлюбная ноч" і "Гандлярка і паэт", рамане "Зеніт" – зноў усляўленне мужнасці і гераізму савецкага чалавека на фронце і ў тыле. У аповесцях "Лёс майго земляка", "Браняпоезд", "Таварыш Ленін" і рамане "Петраград-Брэст" – адлюстраванне гісторыка-рэвалюцыйнай тэмы. У рамане "Вазьму твой боль" – праблема памяці і ёмістая карціна жыцця людзей вёскі.

За 50 гадоў, на працягу якіх я не развітваюся з творамі Шамякіна, моцна пасябраваў і нават парадніўся з героямі яго кніг. Героі літаратурных твораў пісьменніка дапамаглі знайсці мне сваё месца ў жыцці, працаваць і вучыцца, захапіцца яшчэ глыбей кнігай і вялікай павагай да яе, стаць бібліятэкарам вышэйшай катэгорыі, кнігалюбам, увогуле быць сумленным чалавекам. Як і герояў Шамякіна, вабіла мяне апантанасць, захапленне любімай справай ў пераадоленні цяжкасцей, барацьбе з адмоўнымі з'явамі навакольнага жыцця, адбывалася маё ўнутранае і духоўнае пасталенне. Было нечага шкада, што штосці святое страчваем, разменьваем на дробязнае. Надта ж паглыбіліся ў асабістае, з-за гэтага і светлае наўкола не заўважалі развучваліся разумець, адчуваць другога чалавека, яго радасць, боль.

Як радавы работнік культуры заўсёды разумеў, што ў перыяд уборкі ўраджаю ў саўгасе, мае месца ў полі дзе вяскоўцы рашаюць харчовую бяспечнасць краіны. А не сядзець у зацішку сваёй установы і займацца "чыстай, паветранай" культурай, як гэта рабілі другія культработнікі ў планах якіх было сабраць больш ягад і грыбоў - лясных дароў, калі вяскоўцы заняты працай на палях. З горада прыязджалі групамі шэфы. Райвыканкам некалькі год запар пасылаў і мяне працаваць загадчыкам збожжатока ў тым саўгасе, які меў насенневодчы накірунак. Але гэта чамусці не спадабалася загадчыку аддзела культуры райвыканкама. Спачатку ён хацеў вызваліць мяне ад работы ў бібліятэцы, што не адказаўся дапамагаць вёсцы. Для мяне гэта было дзівам. Выходзіць я мог бы адмовіцца і на фронце ісці ў атаку пры наступленні на ворага. Нейкі час нават не выдаваў мне заработную плату, хаця я працаваў, як кажуць, на два франты. Разам з усімі па 14-16 гадзін штодзённа працаваў у пылу, пад дажджом і вятрамі. Прыйшлося праз народны суд даказваць сваю праваху.

Дарэчы, наша бібліятэка абслугоўвала тады 600 чытачоў і рабіла 12 тыс. кнігавыдач у год. А былі ж іт акія, што пры аднолькавай зарплаце (ураўнілаўцы) абслугоўвала толькі 150 чытачоў і рабілі 3000 кнігавыдач. Можа таму, што сядзелі ў тых бібліятэках жонкі начальнікаў і перад загадчыкам рабілі справаздачу паперкамі, маўляў, у сваіх падшэфных гаспадарках адпрацавалі па столькі вось дзён. У той час нікому не дазволена было думаць самастойна, прывучалі да калектыўнага сярэднянства, ды пастылай ураўнілаўцы, адбівалі ахвоту праяўляць знаходлівасць, думаць неардынарна, працаваць з поўнай аддачай.

А калі ж па парадзе дактароў спатрэбілася мне санаторная пуцёўка, то Благачынная, старшыня нашага прафкома, паставіла маё прозвішча сотым па парадку. Вытрымаў ад інфаркта, бо стаж з армейскім быў ўсяго 44 гады і прашу Бога прадоўжыць мой календарык. Але ж ведаю, мая чарга будзе ўжо на тым вечным свеце. Але ж аб усім не раскажаш...

Ва ўсіх гэтых справах мне дапамагла цвёрдая падтрымка герояў Шамякіна. Увасобленыя ў вобразе Алёшы Касцянка лепшыя рысы нашай моладзі – сціпласць, працавітасць, прынцыповасць – натхнялі прыемна было адчуваць, што адрознівае герояў Шамякіна тое, што прыкметы новага часу, - калі адыходзіць спрадвечны страх, няверʼе ў справядлівасць, што жывуць у чалавечым розуме і сэрцы фарміруючы якасна

новы тып чалавека. Бо перспектыва за тым грамадствам, у якім чалавек не баіцца і не сароміцца быць чалавекам, у якім найвышэйшая ідэалогія - гэта ідэалогія дабрані і справядлівасці.

За час знаёмства з творам Шамякіна ажыццявіў добры наказ Паўла Маеўскага: і дом пабудаваў, і абзавёўся сям'ёй, зараз ужо дзядуля. А ад кніг юбіляра засталіся самыя чыстыя ўраджанні не толькі ў мяне, а і ва ўсіх маіх аднавяскоўцаў, яны сталі любімымі нашымі кнігамі.

Грэх будзе не ўспомніць добрым словам цудоўных людзей, якія падтрымлівалі, аберагалі і абаранялі ад зайздроснікаў-зласліўцаў мяне, бунтара раўнадушша сакратара райкама партыі Васіля Антонавіча Пруднікава; сакратара партыйнай арганізацыі саўгаса, а потым старшыню выканкама сельскага Савета Уладзіміра Фёдаравіча Міхеенку; іспектара абласнога ўпраўлення культуры Віктара Іванавіча Арцем'ева; дырэктара абласной бібліятэкі Вольгу Дзмітрыеўну Баранаву; рэдактараў нашай раённай газеты – Міхаіла Іванавіча Бутэліна, Льва Міхайлавіча Севелева, Адама Адамавіча Капусціна, Дзмітрыя Ягоравіча Лапцеўскага. Маё вялікае шчырае дзякуй, зямны паклон ім!

Закончыць хочацца Коласаўскімі радкамі:

*“О край родны, край прыгожы!*
*Мілы кут маіх дзядоў!*
*Што мілей у свеце божым*
*Гэтых светлых берагоў…”.*

Безумоўна светлых берагоў мілай Хоцімшчыны, часцінкі краю Магілёўскай зямлі, што на белай Русі.

**Ласоўскі, М.** Глыбокая сімпатыя да добрых маіх дарадцаў / Міхаіл Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 2001. – 18 ліпеня. – С. 3.

# Дело ждёт мастера-умельца

На качество хлеба Хотимского хлебозавода полно нареканий, как это и говорится в материале И. Николаева «Едет, едет хлебушек в село...» («Шлях Кастрычніка» от 20 марта 2004 года). Однако, я согласен с Борисом Исаковичем Прудниковым, пенсионером из деревни Юзефовка, который справедливо сказал: «Хлеб не всегда хороший, а другой раз и хороший. Видно, зависит, какой пекарь его печет...».

В ожидании привозки хлеба разговор о хлебе насущном, о хлебе, носящем имя существительное.

Мои односельчане-сторожилы в разговорах часто вспоминают о лучших хозяйках в деревне, которые умели выпекать хорошие и вкусные хлеба. Раньше ведь в тридцатые, сороковые и пятидесятые годы прошлого столетия, как и в старину, в каждой семье занимались выпечкой хлебов. Хозяйств же в нашей деревне было около сотни. Но не каждая хозяйка могла показать, похвалиться принародно своим умельством, ведь не каждой это и дано. Конкурсов, безусловно, не проводили. В деревне же все на виду, как на ладони. И когда в колхозе организовывали коллективные обеды на сенокосах, жатве хлебов, уборке картофеля или в праздники, то хлеб испечь руководство колхоза, по единодушному мнению всех членов сельхозартели, всегда поручало Екатерине Волковой, которую признавали как умельца-мастера хлебопечения. Кстати, уроженкой она была деревни Кружиловка, что на Смоленщине. Ее и величали ласкательно «Наша Катеринка» (по росту она была маленькой). Пенсионер, бывший строитель, Виктор Иванович Шпаков вспомнил и пример неряшливости некоторых хозяек. Так одной сделали замечание, что руки ее в неприглядном состоянии, на что она отпарировала, оправдываясь перед односельчанами, «давно не пекла хлеба, а соответственно не месила теста, ведь руки в квашне хорошо отмываются». В разговоре многие приводили примеры, что не так уж это просто довести до высоких вкусовых качеств квашеную капусту, моченые яблоки, огурцы и помидоры, засоленные и маринованные грибы, и прочую снедь. На все надо умельство и трудолюбие. Как хлебопашцу — хороший плужок, жнее — отточеный и назубленый серп, косцу — хорошая коса. Вспомнили разных хитрецов-дельцов. Как школьный повар готовила детям невкусные обеды, от которых они отказывались, а она их скормила своим свиньям, которых регулярно продавала в райзаг. И все сходило очень гладко, так как она была женой директора школы. Все тростинцы единого мнения, что все зависит только от пекаря и его мастерства.

В самый разгар наших разговоров подошла и машина с хлебом. И как только водитель Мартищенко внес хлеб, магазин наполнился приятным ароматом знакомого запаха свежего хлеба. Все 150 буханок ржаного хлеба «Августовский» и 20 батонов имели красивый товарный вид и распроданы покупателям.

Как пример хорошего, 19 марта в магазине Тростино, к большой моей радости, купил новинку «Хлеб Солигорский подовый», испеченный из муки ржаной обдирной с добавлением дрожжей, сахара, тмина. Аппетитно, со вкусом съели эту новинку в семье. Часто при наведывании нас, стариков, привозит нам на гостинец такие хлеба дочь Татьяна из Витебска.

Как вывод, руководству Хотимского хлебозавода необходимо уделить внимание повышению квалификации пекарей. Тех пекарей, которые как зайцы косят трын-траву, заменить людьми любящими эту профессию и которые могут своими старательностью и умением качественной выпечкой хлебов приносить, дарить радость и наслаждение людям земли хотимской.

Есть и на Хотимском хлебозаводе хорошие мастера, выпекающие качественную продукцию. Число умельцев-мастеров необходимо множить, ассортимент продукции расширять. Считаю большим грехом сказать плохое слово об умельцах хлебопечения и на Хотимском хлебозаводе, правда, их число маловатое покуда, думаю, что оно будет расти.

**Ласовский, М.** Дело ждёт мастера-умельца / Михаил Ласовский // Шлях Кастрычніка. – 2004. – 10 красавіка. – С. 2.

# Душы святло

Гартаю свае чарнавыя накіды за мінулы год. І адчуваю недаравальнасць за ахайнасць, што не зрабіў задуманных публікацый. А трывога за тое, што адбываецца з чалавекам. З гісторыі мы ведаем, што не толькі рэжымы, імперыі і цэлыя цывілізацыі гінулі, калі людзі гублялі маральнасць, духоўнасць. Калі нашы погляды адхіляюцца ад прыгожага, гіне душа. А што такое чалавек без душы?

Душу чалавечую можа выратаваць толькі чалавек. Чалавек створаны па вобразу і падабенству Божыю. І калі адкрываем вочы і душу насустрач прыгожаму ў сябе і сусвеце, то мы выратуемся самі і сусвет будзе выратаваны. Раўнавага дзеянняў, учынкаў, поглядаў, пачуццяў - гэта чысцейшая экалогія. А кааб людзям было добра, трэба спачатку стварыць у іх душах святло альбо сонца: радасныя ўзвышаныя думкі, павагу сябра да сябра – самае галоўнае, што ёсць у прыродзе чалавечых адносін.

А прыгажосць нічога не патрабуе ад урада, апрача тага што патрабаваў у Аляксандра Македонскага старажытна-грэчаскі філосаф Дыяген: "Отойди, не загораживай мне солнца". А жыў Дыяген у вялікай беднасці ў бочцы. Гэта сціплая просьба звернута і да кожнага з нас. Не засланяйце света душы блізкіх і калег недаверам, асуджэннем, паклёпам. Трэба кожнаму навучыцца тактоўнасці, павагі, спачуванню. На ўспамін трапіў выпадак.

Калі была неадкладная патрэба наведаць цар-град Хоцімск, а ў нашай вёсцы заўсёды праблема, як зайсці ў салон рэйсавага аўтобуса Ціхань-Хоцімск, калі ўсе жадаючыя атакуюць і мяне якімсці дзівам волат-жывёлавод з вёскі Розальмова Іван Прошкін перад сабою ў чарзе занёс у аўтобус. Аўтобус перапоўнены, але ніхто не крыўдуе на нязручнасць, стаю і я, амаль на адной назе. На ўспамін прыйшлі радкі верша майго аднапалчаніна Аляксея Пысіна:

*Жанчына так апавядала:*
*- Усю дарогу да вакзала*
*Я на аднойназе стаяла:*
*Аўтобус повен, ледзь паўзе.*
*Стаю, а на маёй назе*
*Яшчэ аж дзесяць чалавек...*

І раптам мілагучным голасам жанчына ў аранжавай хусцы, у бурай куртцы з бліскучымі гузікамі, у акулярах з моднай аправай прапануе:

- Калі ласка, дзядуля, сядайце!

- Дзякуй, дзякуй, даражэнькая, - сыплю ў знак удзячнасці словы, - ды як бачна і вы ўжо верагодна бабулька? - звяртаюся да яе з цікавічым мяне пытаннем. Звяртаю

ўвагу, што такую прывабную жанчыну я бачу ўпершыню і па сваёй верагоднасці ці не працавала яна настаўніцай ў суседнім Забялышынскім сельскім Савеце.

А калі яна сцвердзіла, што знаходзіцца на пенсіі, я прадоўжыў гамонку:

- Цікава, ды і падзея цікавая, з якой жа Вы будзеце вёскі?

- А з Гарадка...

- У мяне ж быў на фронце добры сябра, ну проста Вася Цёркін з Гарадка Мікола Макеенка... Загінў у баях там у Прыбалтыцы...

- У размове высняецца, што ў аўтобусе з намі едзе і сваячка Міколы, толькі прозвішча ў яе зараз па мужу.

- А як жа Ваша імя і прозвішча? - сыплю я ёй рэпарцёрскія пытанні.

- Вера Тарасенка-Шаршнёва.

- А дзе ж Вы працавалі?

- Працавала на ферме ў сваёй вёсцы Гарадок даяркай аж трыццаць год.

Чырванею і прашу прабачэння, што я прынёс ёй столькі турбот. Прапаную ёй сваё месца, а я пастаю да канечнай астаноўкі**.** Але яна на маю прапанову наадрэз заяўляе пратэст. Непамерна здзіўлен, адкуль у яе дабрыня, цікаўлюся, хто зрабіў уплыў на яе выхаванне.

- А я асабіста ўдзячна за маё выхаванне цётцы Праскоўі...

Вера! Гэта праваслаўнае рускае імя. Яно не патрабуе дадатковых раз'ясненняў. Лічу, што я не памылілася, бо гэта інтытэле-гентная вясковая працаўніца ўвабрала ў сябе столькі цеплыні, света, духоўнасці, што другім выпадковым школьным настаўнікам і некалькіх жыццяў не хопіць. У думках прадстаўляю і лічу, што ў саўгасе на ферме даяркай аддавала ўсю сваю энергію, сілы, здароўе. Гэта і ёсць па-мойму доказ выключнай высокай інтэлегентнасці, самаахвярнасці дзеля высакароднай цэлі, ідэі. У гэтай элегантнасці любоў да людзей. У народнага паэта Пятруся Броўкі ў вершы "Прыгожы чалавек" ёсць радкі:

*Мы аб прыгожым заўжды марым,*
*Але да нас да ўсіх дайшло:*
*Прыгожыя не толькі тварам,*
*А тыя, ў кім душы святло!*

Пабольш бы такіх людзей, і ўсе мы жылі б значна лепш, чым жывём у сучасны момант зараз.

**Ласоўскі, М.** Душы святло / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 2001. – 23 чэрвеня. – С. 8.

- Что ты там ковыряешь? – с удивлением спрашивает у меня односельчанка Мария Никоноровна Лазукова-Недогибченко, хозяйка соседнего земельного участка.

- Навожу порядок. С корнями сорняки с участка убираю, - объясняю ей свои действия.

- Так, пожалуй, у тебя-то и косить травы не останется, - продолжает она тему нашего разговора.

Жыватворнымі сокамі роднай бацькоўскай зямлі ўдосталь напоены кожны яго мастацкі твор са зборнікаў апавяданняў: "Птушкі ляцяць на волю", "Самы шчаслівы чалавек", "Ішоў на вайну чалавек", раманаў: "Плач перапёлкі", "Апраўданне крыві, "Свае і чужынцы", "Вяртанне да віны", "Не ўсе мы згінем" і кніжкі драматургіі "Звон - не малітва". Яго маленькая радзіма - выток, адкульіпачалася поўнаводная рака творчасці - вёска Вялікі Бор на Касцюкоўшчыне ў якой ён нарадзіўся 21 снежня 1934 года.

Балюча гаварыць пра любімага чалавека ў мінулым часе. Але ж усё тое, што зроблена Іванам Чыгрынавым у галіне літаратуры, гэта буз усякага перабольшвання сапраўды подзвіг. У апошні час ужо цяжка хворы, не развітваўся з пяром, спяшаючыся выказаць тое, што было ў яго на душы, каб усім гэтым падзяліцца з чытачамі.

Іван Гаўрылавіч верыў у свой народ, верыў у яго шчаслівую будучыню і гэтай верай прасякнута ўся яго яркая і непаўторная шматгранная творчасць. Ён па праву насіў званне народнага пісьменніка Беларусі. Слынны сын Прыбесяддзя. У сваіх

раманах ён увекавечыў подзвіг нашых бацькоў і прадзедаў, асабліва ў гады цяжкага ваеннага ліхалецця. Расказам аб сваіх земляках-верамейкаўцах аўтар расказаў чытачам пра ўвесь беларускі народ – гераічны і шматпакутны.

У лютым 1971 года, калі на Магілёўшчыне праходзілі дні беларускай літаратуры, са сваёй творчай справаздачай, у складзе трупы беларускіх пісьменнікаў, Іван Чыгрынаў пабываў у нас на Хоцімшчыне. Сустрэчы праходзілі ў раённым Доме культуры, у калгасе "Чырвоны Маяк", саўгасе "Трасціно". Мне прыйшлося суправаджаць гасцей і выступаць з аглядам іх жыццёвага і творчага шляху. Ва ўрачыстай абстаноўцы госці былі прыняты ў ганаровыя піянеры Хоцімшчыны.

Для многіх хацімчан было вельмі цікавым блізкае знаёмства з пісьменнікам, як з чалавекам жыццярадасным, у якога душа нараспашку, унікнуць у якой-та ступені ў працэс яго творчасці.

У размове з хацімчанамі, на пытанне, як ён стаў пісьменнікам, Іван Гаўрылавіч з адкрытай душой расказаў:

- У нашай Саматэвіцкай сярэдняй школе вучыўся Аркадзь Куляшоў, паэт, які не мае патрэбы ў ацэнцы. Дык вось, калі ў іншых школах літаратуру пазнавалі па кнігах безадноснада мясцовасці, дзе вучні нарадзіліся і жылі, дык мы, хто хадзіў у Саматэвіцкую школу, мелі магчымасць знаходзіца сярод герояў куляшоўскіх кніг, сярод жывых герояў яго паэзіі.

На запытанне, што прывяло аўтара выдатных апавяданняў да раманаў і як гэта адбылося пісьменнік адказаў:

- Што прывяло? Можа пачуццё вінаватасці перад тым месцам на зямлі, дзе нарадзіўся, перад спаленым і разбураным маім Вялікім Борам, перад людзьмі, якіх я ведаў у дзяцінстве, перад маці Хадоскай Ігнатаўнай, братамі і сестрамі, перад аднавяскоўцамі, перад тымі, хто пайшоў у страшныя гады і не вярнуўся…

Увогуле да гісторыі трэба ставіцца з пачціваслю, не ляпаць яе паплячы, - працягваў сваю размову госць. - Я вярнуўся ў гісторыю, каб убачыць увесь народ і правесці сваіх сучаснікаў па тых дарогах, па якіх хадзілі нашы продкі.

На памяць аб нашай сустрэчы Іван Гаўрылавіч зрабіў каштоўны падарунак — на сваіх кнігах у бібліятэцы напісаў напоўненыя цеплынёй аўтографы ў адрас чытачоў бібліятэкі, а таксама і мне асабіста. Толькі некалькі радкоў уласнаручна напісана выдатным майстрам мастацкага слова сталі каштоўнымі - самай дарагой рэліквіяй, бо гэтай жа рукой, гэтым почыркам, гэтай самай шарыкавай ручкай напісаны былі вялікія творы — прадмет нашага вывучэння і захаплення. Гэтыя радкі натхнялі мяне на добрасумленную працу і іх патрэбна было апраўдаць, выканаць дадзеную адзнаку: *"Ласоўскаму Міхаілу, чалавеку з кнігай у руках, які прысвяціў сваё жыццё прапагандзе гэтай кнігі сярод людзей. Іван Чыгрынаў 20 лютага 1971 года".* На другой кнізе пакінут надпіс: *"Дарагому Міхаілу Аляксеевічу Ласоўскаму, адданаму прапагандысту савецкай кнігі, чалавеку, праца якога выклікае глыбокую павагу і захапленне з пісьменніцкай удзячнасцю. І. Чыгрынаў"* лічу гэты аўтограф самай высокай узнагародай.

У сваіх лістах да Івана Гаўрылавіча я дасылаю спіскі літаратуры і газетных публікацый па тэматыцы ягонай працы, лічачы што ён зверне ўвагу і азнаёміцца з імі ў бібліятэках Мінска. Але ў сваіх адказах ён прасіў: "Напішы, калі ласка, ці ёсць у цябе асабіста выразкі з газет і кніг, якія ты пералічыў у сваім лісце да мяне ад 3 сакавіка 1971 г." Выразкі газетных публікацый я захаваў у альбоме "Наш родны край" і калі прыязджаў на хоцімшчыну летам 1971, 1972, 1979 гадоў Іван Гаўрылавіч, то імі карыстаўся. У час сустрэч прайшлі з ім да вытокаў прыгажуні Бесядзі і па сцежках партызанскага атрада Дзмітрыя Мядзведзева, а таксама і па шляху воінаў-кавалерыстаў. За сяброўства, лічу вялікім гонарам, атрымаў раман "Плач перапёлкі" з

аўтографам *"Дарагому Міхаілу Аляксеевічу з удзячнасцю за дапамогу ў маёй рабоце. Іван Чыгрынаў 15.07.79 г."* Кнігі і аўтографы Івана Гаўрылавіча для мяне бальзам - яны даюць узнагароду-адзнаку маёй падзвіжніцкай працы, яны былі пуцяводнымі зоркамі ў працы сельскага бібліятэкара. Калі вярнуўся Чыгрынаў з Амерыкі, дзе быў у складзе дэлегацыі ААН, то пры сустрэчы (у той час я ў парадку шэфскай дапамогі працаваў загадчыкам збожжатока ў саўгасе) падарыў мне шарыкавую ручку з лямпачкай і батарэйкай, што дапамагалі весці ўлік у начны час.

Творы Івана Чыгрынава чытаюць за мяжой Беларусі, яны перакладзены на многія мовы народаў былога СССР а таксама на балгарскую, нямецкую, французкую і англійскую мовы. «Калі нам удасца жыць на гэтай зямлі, калі ўсё зладзіцца з радыяцыяй, - марыў пісьменнік, - то мы паспрабуем наладзіць сваю дзяржаву с сваёй прыгожай нацыянальнай душой, працавітай і вясёлай. Мяркую, што самай светлай старонкай стане наша дзяржава, думаю, што пераможам».

Але дачасна пайшоў з жыцця выдатны майстар мастацкага слова, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, літаратурнай прэміі імя Аляксандра Фадзеева, ганаровы грамадзянін горада Касцюковічы, кавалер ордэна Дружбы народаў, народны пісьменнік Беларусі Іван Гаўрылавіч Чыгранаў, пакінуў нам праўдзівую жывую памяць народа да нашага Прыбеседскага краю.

**Ласоўскі, М.** Майстар мастацкага слова / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 2004. – 24 снежня. – С. 2.

# Над Хотимском взвился алый флаг

На площади возле Дома Советов надпись на памятнике сообщает нам: "23 октября 1941 года партизанский отряд Д.Н. Медведева совместно с Хотимскими партизанами занял Хотимск и разгромил полицейское управление". Памятник установлен в 1973 году партизанами Медведевского отряда. Как проходила эта операция рассказывает бывший пулемётчик М. Оборотов:

"Как только Миша Ерофеев отправился в разведку, мы почувствовали: быть большому делу. Миша появился в лагере через несколько дней. Высокий и стройный, он казался собранным из одних мускулов: до войны Миша был инструктором физкультуры на Губинской бумагопрядильной фабрике в Подмосковье. Мы стали с нетерпением ждать, что же решит командование. Назавтра был отдан приказ готовиться в поход.

Одетый в серую солдатскую шинель, Дмитрий Николаевич шёл впереди. Он прихрамывал - след недавнего ранения. Но не давал себе послабления, стараясь наравнесо всеми переносить тяготы похода. Мы восхищались и любовались своим командиром.

Как обычно, о цели перехода знал лишь штаб. Но по возбуждённым лицам командиров мы догадались, что предстоит серьёзная боевая операция. Под вечер отряд остановился на лесной опушке вблизи деревни Варваровка. И здесь Медведев, наконец, сказал: "Будем брать Хотимск!". Затем Дмитрий Николаевич объяснил нам расположение опорных пунктов врага, познакомил с планом налёта.

Отряд был разделён на две части. Одну из них возглавил Герой Советского Союза майор Сипович, недавно заменивший нашего начальника штаба Дмитрия Дмитриевича Староверова, геройски погибшего в деревне Батаево. Эта группа уходила первой и должна была обойти город возле льнозавода. Напутствуя её, командир напомнил: "Встречаемся на площади возле церкви".

Вторую часть отряда повёл сам Медведев. Шли в сумерках напрямик к городу, через поле, где люди ещё убирали картофель. Они с удивлением смотрели на нашу колонну, теряясь в догадках: кто такие?

Десяток партизан, зачисленных на время боя в резерв командира, следовал за Дмитрием Николаевичем. Рядом шли его адъютант - известный боксёр, чемпион Советского Союза Николай Королёв и проводник - из местного отряда.

Точно в назначенное время наши боевые группы растеклись по улицам города, а затем почти одновременно ударили по вражеским гнёздам. В разных концах города поднялась интенсивная стрельба и вдруг всё стихло. Медведев и мы, находившиеся с ним рядом, встревожились. Что такое? Дмитрий Николаевич уже хотел посылать на помощь штурмовым группам нас, резерв, как прибежал Пётр Лопатин - будущий командир известной партизанской бригады "Дядя Коля" и сообщил: "Немцы разбиты".

Признаться, все мы не ожидали такого быстрогоисхода боя. Застигнутый врасплох враг не сумел оказать сопротивления.

**Ласовский, М.** Над Хотимском взвился алый флаг / М.Ласовский // Шлях Кастрычніка. – 2002. – 12 чэрвеня. – С. 2.

# ”...Нарадзіўся я ў дняпроўскай старане...“
## *да 85-годдзя з дня нараджэння А.А. Зарыцкага*

Як доўга блукаючы падарожнік у спякотнай пустыні з перасохшымі губамі прыпаў да крыніцы, каб наталіць смагу, так і я пасля васьмігадовай вайсковай службы ўдалечыні ад роднага бацькоўскага кута накінуўся на чытанне беларускай літаратуры ў арыгінале.

Вельмі чаравала паэзія: гэта ж паэты натхняюць у літаральным сэнсе — шчыра дораць чалавеку душу.

*І горды я, што вырас ля Дняпра,*
*Што шыр рачная мне ў душу запала,*
*Даўно, як ля рыбацкага кастра*
*Я грэўся хлапчуком яшчэ, бывала.*
*І слова даў я вернае тады,*
*Што, дзе б ні быў,*
*Дняпро мой помніць родны.*

Пры чытанні гэтых радкоў павеяла чымсьці блізкім, родным. Добра памятаю, як гэты цудоўны верш «Дняпро» захапіў мяне і прымусіў звярнуць увагу на аўтара. Ім аказаўся Аляксей Аляксандравіч Зарыцкі, які ва ўсіх сваіх аўтабіяграфіях, змешчаных у друку паведамляў, што «...нарадзіўся 22 сакавіка 1911 года ў глухім мястэчку Хоцімску». Бацька паэта быў акцызным кантралёрам. Маці працавала настаўніцай у школе, дарэчы, у паэта есць і верш аб маці «Вучыцелька Насця».

«Цікавіцца літаратурай я пачаў рана, пісаў Аляксей Аляксандравіч. — Гэтаму, відаць, спрыяў мой бацька. Спецыяльнасць яго не мела, здаецца, нічога агульнага з мастацтвам, але бацька вельмі любіў літаратуру, асабліва рускіх класікаў. Дома ў нас былі свае ўласныя Пушкін, Талстой, Чэхаў, Ляскоў і нават «Кабзар» Шаўчэнкі і народныя апавяданні Марка Ваўчка на ўкраінскай мове».

Пасля заканчэння сярэдняй школы працаваў электраманцёрам на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце. У 1936 годзе скончыў Маскоўскі інстытут замежных моў. З 1938 па 1946 годы знаходзіўся ў Савецкай Арміі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, прымаў удзел у баях пад Арлом і Москвой, у баявых аперацыях на Волхаўскім і Ленінградскім франтах.

У пасляваенны час выдаў кнігі паэзіі «Дняпроўскае рэха», «Арліная крыніца», «Наш сын», «Світанскія сады», «Вершы і паэмы, «Залатое дно», «Праз бурныя парогі», «Пасылка ў рай», «Размова з сэрцам» і іншыя. Выдадзены кніга апавяданняў на рускай мове «Вересковый мёд», кніга ўспамінаў, крытычных артыкулаў, нарысаў «За словам-падарункам». У 1969 і 1981 гг. выйшлі выбраныя творы ў 2-х тамах.

У сваіх вершах і паэмах Аляксей Зарыцкі ўслаўляў ратны подзвіг савецкага народа ў гады вайны, гераічную працу па аднаўленню разбуранай гаспадаркі, праўдзіва і ярка адлюстроўваў духоўны свет, нашых сучаснікаў. Яго паэзіі ўласціва шчырая інтанацыя, мастацкая непасрэднасць.

Вершы і паэмы Аляксея Зарыцкага неаднаразова перакладалі на рускую і іншыя мовы народаў СССР.

Вялікае месца ў творчасці паэта займала перакладчыцкая праца. Ён перакладаў з рускай, украінскай, літоўскай, нямецкай, польскай, лужыцка-сербскай моў. Памёр 29 кастрычніка 1987 года.

Творчы шлях шаэта не быў заўсёды роўны але, як зазначае ў сваім уступным артыкуле да двухтомніка паэт Алесь Звонак: «Паэзія Аляксея Зарыцкага своеасаблівая і

арыгінальная, творчы почырк яго глыбока індывідуальны, бачанне свету яснае і шырокае, разважлівае і спакойнае і філасофска-задуманнае».

Я асабіста прачытаў усё, што выйшла з-пад пяра пісьменніка-земляка, карпатліва шукаючы радкоў аб роднай Хоцімшчыне. Але, на вялікі жаль, спачатку нічога не знаходзіў. І калі ў 1971 годзе ад імя ўсіх чытачоў Трасцінскай сельскай бібліятэкі я пасылаў віншавальны адрас з 60-гадовым юбілеем, то адначасова напісаў Аляксею Аляксандравічу і паўтарыў, як і ў папярэдніх пісьмах, асабістую просьбу, каб у новых жамчужынах сваёй паэзіі ён адлюстраваў нашу хоцімскую зямлю. Неўзабаве зямляк даслаў свае кнігі з аўтографамі ў адрас чытачоў сельскай бібліятэкі: «Чытачам і супрацоўнікам Трасцінскай сельскай бібліятэкі са шчырай прыхільнасцю і з найлепшымі пажаданнямі на добры ўспамін ад аўтара. Аляксей Зарыцкі».

І пісьмо-адказ: «...З Хоцімска мае бацькі выехалі, калі мне не было і двух гадоў, пагэтаму ніякіх дзіцячых успамінаў аб ім у мяне не захавалася. З гэтай прычыны я, відаць, нічога не напісаў аб Хоцімску і не ведаю — ці змагу што-небудзь аб ім напісаць. У Хоцімску і на Хоцімшчыне пасля таго, як выехалі адтуль з бацькамі, я быў першы раз у 1929 годзе: мне тэрмінова спатрэбілася пасведчанне аб нараджэнні. Другі раз я быў летам 1938 года, адпачываў на працягу некалькіх тыдняў пад Хоцімскам у вёсцы Альшоў разам з паэтам Аркадзем Куляшовым у яго бацькоў. Пабываць на Хоцімшчыне, бясспрэчна хочацца, але часу заўсёды не хапае і я гэту паездку ўсё адкладваю і адкладваю...».

Доўгі час не губляў надзей, што пісьменнік-зямляк магчыма знойдзе час і наведае Хоцімшчыну. Але ж колькі радасці было для мяне і актывістаў сельскай бібліятэкі, калі ў 1973 годзе з чарговай партыяй новых кніжак з бібкалектара мы атрымалі новую кнігу паэзіі Аляксея Зарыцкага «Мая асяніна», а ў ёй верш, прысвечаны Хоцімску, з назваю «Лепшая вуліца»:

*Нарадзіўся я ў Хоцімску, —*
*Колісь глуш-глухмень,*
*За барамі дрымучымі,*
*За гаямі далёкімі, —*
*Лясуны ў навакольных*
*пушчах галёкалі*
*Ад нудоты і ноч, і дзень.*
*Барабанаўка-вулка,*
*Дзве, як настырнае зерне,*
*Я ўзышоў на забытай*
*усімі зямлі,*
*Належала да Смаленскай*
*губерніі,*
*А суседнія вулачкі*
*ўжо Магілёўскай былі.*
*Белая Русь так*
*блізка-блізка,*
*І Вялікая тут —*
*не чужынай-чужой.*
*Над самай-самай мяжой*
*Калыхалася мая калыска:*
*То з Расіі ды ў Беларусь,*
*То ў Расію ды з Беларусі,*
*Змалку лёг я*
*на правільны курс,*

*І з яго не саб'юся!*
*Барабанаўка —*
*лепшая вуліца!*
*Будзіш ты да магілы*
*мне помніцца.*
*Да цябе і дагэтуль*
*душа мая туліцца,*
*Маё сарца*
*дзядоўскае горнецца.*

У другім вершы «Верце, хлопцы, толькі мне!» паэт дае рэцэпт-параду, асабліва слушную ў дні жаночага свята ў сакавіку:

*...А калі нявесту хочаш*
*Выбраць, друг мой малады,*
*Ты спяшайся ў Прыдняпроўе,*
*Паязджай хутчэй туды,*
*Там дзяўчат прыгожых многа,*
*У вачах глыбее сінь.*
*Там ужо, калі палюбяць,*
*То заўсёды — назусім.*
*Хлопцы, слухайце старога,*
*Верце, хлопцы, толькі мне:*
*Сам калісь шукаў нявесту*
*Я ў Дняпроўскай старане.*

Асабіста абсалютна згодзен з паэтам-земляком і аўтар гэтага допісу. Ды трымаю і цвёрдую думку, што не шкадуюць і ўсе мужчыны зямлі хоцімскай аб тым, што іх назаўсёды палюбілі прыгажуні жаночага полу Дняпроўскай стараны — нашы Зоркі Венеры.

Цікавым успамінам падзяліўся Аляксей Зарыцкі і ў кнізе «За словам — падарунак», якая з друку выйшла ў 1985 годзе, аб наведанні Хоцімска ў пачатку лета 1938 года:

*«...Гледзячы на даволі ўбогае мястэчка Хоцімск, думаў, якая ж глушыня была тут дваццаць сем гадоў назад, калі мне давялося нарадзіцца на яго ўскраіне — Барабанаўцы, тады фактычна асобнай вёсцы (зараз тэрыторыя вуліцы Дзяржынскага). Але мясціна, дзе ты ўпершыню зірнуў на свет, відаць, вабіць кожнага. Хоцімск у тыя гады не страціў ящчэ сваё местачковае аблічча. Пыльныя незабрукаваныя вуліцы, незайздрсныя домікі і хаты. Вельмі адчувалася там адрэзанасць ад гандлёвых і культурных цэнтраў, ад чыгункі. Прыйшоў я аднойчы туды, хацеў зайсці ў адзін магазін — зачынены, падышоў да другога, трэцяга, чацвёртага — тое самае. Выпадкова даведаўся ад сустрэчнага міліцыянера, што ў Хоцімск прывезлі піва, а гэта бывае вельмі рэдка, таму ўстановы пачнуць прадаваць нармальна толькі тады, калі хацімчане разбяруць і вып'юць усё піва. Ну, а на гэту справу яны звычайна трацяць дзве-тры гадзіны. Жылі тады ў Хоцімску старыя людзі, якія помнілі майго бацьку і маці і іхняе вяселле...».*

Каліб не раптоўная смерць на 77-м годзе жыцця таленавітага паэта-земляка, то Аляксей Аляксандравіч свой 85-гадовы юбілей адзначаў бы новымі творамі аб родным хоцімскім куце, аб хвалях дняпроўскіх, аб прыгажуні-Бесядзі, аб людзях прыбяседскага краю. З пашанай мы адносіцца абавязаны да творчасці таленавітага і самабытнага паэта-земляка.

**Ласоўскі, М.** "...Нарадзіўся я ў дняпроўскай старане..." : [да 85-годдзя з дня нараджэння А.А.Зарыцкага] / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1996. – 23 сакавіка. – С. 2.

# Нарадзіўся я ў Хоцімску

***22 сакавіка ~ 90 год з дня нараджэня Аляксея Зарыцкага***



Як доўга блукаючы падарожнік у спякотнай пустыні перасохшымі губамі прыпаў да крыніцы, каб наталіць смагу, так і я пасля васьмігадовай вайсковай службы ўдалечыні ад роднага бацькоўскага кута накінуўся на чытанне твораў беларускай літаратуры ў арыгінале. Вельмі ж чаравала паэзія: гэта ж паэты натхняюць у літаральным сэнсе - шчыра дораць чалавеку душу:

*"Радзіўся я ў Дняпроўскай старане,*
*І горды я, што вырас ля Дняпра,*
*І слова даў я вернае тады,*
*Што дзе б ні быў,*
*Днепро мой помніць родны..."*

Пры чытанні гэтых радкоў павеяла чымсьці блізкім, родным.

Тым больш, што і сам я нарадзіўся на беразе прыгажуні-Бесядзі – дачцы бацікі сівога Дняпра. Добра памятаю, як тэты цудоўны верш "Дняпро" захапіў, крануў мяне і прымусіў звярнуць увагу на аўтара. Ім аказаўся Аляксей Зарыцкі, які ў сваёй аўтабіяграфіі, змешчанай у друку, паведамляў, што "... нарадзіўся 22 сакавіка 1911 года ў глухім мястэчку Хоцімску". Бацька паэта быў акцызным кантралёрам на вінакурным заводзе. Маці працавала настаўніцай у школе, дарэчы, у паэта ёсць і верш аб маці "Вучыцелька Насця".

"Цікавіцца літаратурай я пачаў рана,- пісаў Аляксей Аляксандравіч,- гэтаму, відаць, спрыяў мой бацька. Спецыяльнасць яго не мела, здаецца, нічога агульнага з мастацтвам, але бацька вельмі любіў літаратуру, асабліва рускіх класікаў. Дома ў нас былі свае ўласныя Пушкін, Талстой, Чэхаў, Ляскоў і нават "Кабзар" Шаўчэнкі і народныя апавяданні Марка Ваўчка на ўкраінскай мове".

Пасля заканчэння сярэдняй школы працаваў электраманцёрам на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце. У 1936 годзе скончыў Маскоўскі інстытут замежных моў. З 1938 па 1946 год знаходзіўся ў Савецкай Арміі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, прымаў удзел у баях пад Арлом і Масквой, у баявых аперацыях на Волхаўскім і Ленінградскім франтах. Першы верш надрукаваў у 1927 годзе, а ў 1932 г. выйшаў першы зборнік вершаў "Эпічныя фрагменты". У пасляваенны час выдаў кнігі паэзіі "Дняпроўскае рэха", "Арліная крыніца", "Наш сын", "Світанскія сады", "Вершы і паэмы", "Залатое дно", "Праз бурныя парогі", "Пасылка ў рай", "Размова з сэрцам", "Вяртанне на зямлю", "Мая асяніна", "У дарогу", "Талоны на бяссмерце", "Пераклічка гадоў", "Каля вячэрняга кастра", "Трывожная госця". Выпусціў кнігу апавяданняў на рускай мове "Вересковый мёд". Двойчы выходзіў двухтомнік выбраных. твораў. Пяру Аляксея Зарыцкага належыць зборнік успамінаў, крытычных артыкулаў і нарысаў "За словам-падарункам".

У сваіх вершах і паэмах Аляксей Зарыцкі праслаўляў ратны подзвіг савецкага народа ў гады вайны, гераічную працу па аднаўленню разбуранай гаспадаркі, праудзіва і ярка адлюстроўваў духоўны свет нашыхс учаснікаў. Яго паэзіі ўласціва шчырая інтанацыя, мастацкая непасрэднасць, апавядальнасць, стрыманасць у выяўленні

пачуццяў, лірызм, уменне раскрыць філасофскі сэнс у звычайных з'явах. Найбольш уласцівыя яму жанры эпічнай паэзіі, сюжэтна-лірычны верш, блізкі да балады. Вершы і паэмы Аляксея Зарыцкага неаднаразова перакладаліся на русскую і іншыя мовы народаў СССР.

Вялікае месца ў творчасці паэта займала перакладчыцкая праца. Ён перакладаў з рускай, украінскай, літоўскай, нямецкай, польскай, сербалужыцкай моў. Памёр 29 кастрычніка 1987 года. Асабіста я прачытаў усё, што выйшла з-пад пяра пісьменніка-земляка, карпатліва шукаючы радкоў аб роднай Хоцімшчыне. Але, на вялякі жаль, нічога не знаходзіў. І тады я ў 1968 годзе звярнуўся з пісьмом да Аляксея Аляксандравіча, дзе выказаў просьбу, каб ён у жамчужынах сваёй паэзіі штосьці напісаў аб мясцнах, дзе нарадзіўся, бо там здаецца заўсёды цяплейшай рэчка, там саладзейшыя ў лесе суніцы, там халаднейшая крыніца і смачнейшая вада з яе, салавей званчэй спявае.

Неўзабаве зямляк даслаў свае кнігі з аўтографамі ў адрас чытачоў сельскай бібліятэкі: "Чытачам і супрацоўнікам Трасцінскай сельскай бібліятэкі са шчырай прыхільнасцю і з найлепшымі пажаданнямі на добры ўспамін ад аўтара. Аляксей Зарыцкі."

Прыслаў і пісьмо-адказ, датаванае 12 верасня 1968 года:

*"Паважаны таварыш Ласоўскі! З Хоцімска мае бацькі выехалі калі мне не было і двух гадоў, пагэтаму ніякіх дзіцячых успамінаў аб ім у мяне не захавалася. З гэтай прычыны я, відаць, нічога не напісаў аб Хоцімску і не ведаю - ці змагу што-небудзь аб ім напісаць. У Хоцімску і на Хоцімшчыне пасля таго, як выехалі адтуль з бацькамі, я быў першы раз у 1929 годзе: мне тэрмінова спатрэбілася пасведчанне аб нараджэнні. Другі раз я быў летам 1938 года, адпачываў на працягу некалькіх тыдняў пад Хоцімскам у вёсцы Альшоў разам з паэтам Аркадзем Куляшовым у яго бацькоў. Пабываць на Хоцімшчыне, бясспрэчна, хочацца, але часу заусёды не хапае і я гэту паездку ўсё адкладваю і адкладваю..."*

Доўгі час не губляў надзей, што пісьменнік-зямляк магчыма знойдзе час і наведае Хоцімшчыну. Калі адзначалі 50-годдзе бібліятэкі, запрашалі і Аляксея Аляксандравіча да сябе. Але зноў атрымалі шчырае пісьмо:

*"Паважаны таварыш Ласоўскі! У сувязі з 50-годдзем з дня засна-вання Трасцінскай сельскай бібліятэкі, якая за гады Вашай самаадданай працы стала адной з лепшых бібліятэк рэспублікі, віншую Вас з добрымі працоўнымі поспехамі.*

*Жадаю Вам, дарагі Міхаіл Аляксеевіч, моцнага здароўя і новых выдатных поспехаў у працы на ніве народнай асветы. Ваш Аляксей Зарыцкі 27.1.1972 г. Мінск".*

Але ж колькі радасці было для мяне і актывістаў сельскай бібліятэкі, калі ў 1973 годзе з чарговай партыяй новых кніжак з бібкалектара мы атрымалі новую кнігу паэзіі Аляксея Зарыцкага "Мая асяніна", а ў ёй выкананне нашай просьбы - верш, прысвечаныХоімску, з назваю "Лепшая вуліца":

*Нарадзіўся я ў Хоцімску,-*
*Колісь глуш-глухмень,*
*За барамі дрымучымі,*
*За гаямі далёкімі,-*
*Лесуны ў навакольных пушчах галёкалі*
*Ад нудоты і ноч, і дзень.*
*Барабанаўка-вулка,*
*Дзе былінкай з настырнага зерня*
*Я ўзышоў на забытай усімі зямлі,*
*Была спакон веку ў Смаленскай губерні,*
*А суседнія вулачкі ўжо ў Магілёўскай былі.*

*Белая Русь так блізка-блізка,*
*І Вялікая тут - не чужынай чужой.*
*Над самай-самай мяжой*
*Калыхалася мерна калыска:*
*То з Расіі ды ў Беларусь,*
*То ў Расію ды з Беларусі.*
*Змалку лёг я на правільны курс*
*І з яго не саб'юся.*
*Барабанаўка – лепшая вуліца!*
*Будзеш ты да магілы мне помніца.*
*Да цябе і да гэтуль душа мая туліцца,*
*Маё сэрца дзядоўскае горнецца.*

У другім вершы "Верце, хлопцы, толькі мне!" паэт дае рэцэпт-параду, асабліва слушную у *дні* жаночага свята ў сакавіку:

*А калі нявесту хочаш*
*Выбраць, друг мой малады,*
*То спяшайся ў Прыдняпроўе,*
*Паязджай хутчэй туды.*
*Там дзяўчат прыгожых многа,*
*У вачах глыбее сінь,*
*Там ужо калі палюбяць,*
*То заўсёды назусім.*
*Хлопцы, слухайце старога,*
*Верце, хлопцы, толькі мне:*
*Сам калісь шукаў нявесту.*
*Я ў Дняпроўскай старане.*

Нельга не адзначыць і аператыўнасць земляка ў выкананні адразу нашай просьбы. Гэтыя вершы напісаны ім у 1969 годзе. Асабіста абсалютна згодзен з паэтам-земляком у яго веру-параду ды трымаю і цвёрдую думку, што не шкадуюць і ўсе мужчыны зямлі хоімскай аб тым, што іх назаўсёды палюбілі прыгажуні жаночага полу Дняпроўскай староны - нашы Зоркі-Венеры. Цкавым успамінам падзяліўся Аляксей Зарыцкі ў кнізе "За словам - падарунак", якая з друку выйшла ў 1985 годзе, аб наведванні Хоцімска ў пачатку лета 1938 года:

"... Гледзячы на даволі ўбогае мястэчка Хоцімск, думаў, якая ж глушыня была тут дваццаць сем гадоў назад, калі мне давялося нарадзіцца на яго ўскраіне Барабанаўцы, тады фактычна асобнай вёсцы (зараз тэрыторыя вуліцы Дзяржынскага). Але мясціна, дзе ты ўпершыню з’явіўся на свет, відаць, вабіць кожнага. Хоцімск у тыя гады не страціў яшчэ сваё местачковае аблічча. Пыльныя, незабрукаваныя вуліцы, незайздросныя домікі і хаты. Вельмі адчувалася там адрэзанасць ад гандлёвых і культурных цэнтраў, ад чыгункі. Прыйшоў я аднойчы туды, хацеў зайсці ў адзін магазін - зачынены, падышоў да другога, трэцяга, чацвёртага – тое самае. Выпадкова даведаўся ад сустрэчнага мне міліцыянера, што у Хоцімск прывезлі піва, а гэта бывае вельмі рэдка, таму ўстановы пачнуць працаваць нармальна толькі тады, калі хацімчане разбяруць і вып'юць усё піва. Ну, а на гэту справу яны звычайна трацяць дзве-тры гадзіны. Жылі тады ў Хоцімску старыя людзі, якія помнілі майго бацьку і маці, іхняе вяселле...".

Калі б не раптоўная смерць на 77-м годзе жыцця таленавітага паэта-земляка, то Аляксей Аляксандравіч свой 90-гадовы юбілей адзначаў бы новымі творамі аб родным хоцімскім куце, аб хвалях Дняпроўскіх, аб прыгажуні-Бесядзі, аб людзях

прыбяседскага краю. З пашанай мы адносіцца абавязаны да творчасці таленавітага і самабытнага паэта-земляка, які заклікаў з аптымізмам сяброў-аднагодкаў:

*Было ў нас юнацтва,*
*Як вылет арліны,*
*Умела і сталасць высока ўздымацца.*
*Нам трэба да самай апошняй хвіліны*
*Душою, сябры, маладымі астацца.*

**Ласоўскі, М.** Нарадзіўся я ў Хоцімску : 22 сакавіка-90 год з дня нараджэня Аляксея Зарыцкага / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 2001. - 21 сакавіка. – С. 3. ; 24 сакавіка. – С. 2.

# Народны паэт – госць Хоцімшчыны

Беларускі народ свята шануе памяць свайго славутага народнага паэта Якуба Коласа. Але найлепшая памяць аб пісьменніку - гэта нашы штодзённыя сустрэчы з яго цудоўнымі творамі, якія сталі духоўнай патрэбай кожнага адукаванага, культурнага чалавека.

У гэтым годзе спаўняецца 100 гадоў з дня першага выступлення ў друку класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа.

У сваей аўтабіяграфіі ён пісаў: "Пасля рэвалюцыі 1905 года пачала выдавацца першая газета на беларускай мове "Наша доля". У нумары 1 за 1906 год надрукаваны верш "Наш родны край" - першы мой апублікаваны твор. Праз паўмесяца (15 верасня) у нумары 2 той жа газеты змешчана маё апавяданне "Слабода" пад псеўданімам "Дзядзька Карусь". У гэты час Я.Колас быў звольнены з працы і знаходзіўся пад наглядам паліцыі. Трэцці нумар газеты, у якім змешчаны верш "Беларусам" быў канфіскаваны, а паэт хутка трапіў за турэмныя краты.

З тае пары і да самай смерці слова беларускага народнага песняра нястомна працуе на карысць і славу свайго народа.

Але ж мой допіс аб асабістым дачыненні да твораў народнага паэта.

...У народаў Усходу ёсць звычай: калі толькі народзіцца дзіця, то яму пад галоўку ложаць кнігу каб усё жыццё паважаў яе.

Ёсць і прытча, што калі перад дзіцяці палажылі кавалак золата і кнігу, то дзіцяці адразу працягнула рукі да кнігі.

Штосьці падобнае атрымалася і ў мяне ў дзяцінстве. Нарадзіўся ў вялікай сям’і, дзесятым па ліку, апошнім паскрэбкам. У маленстве часта хварэў: толькі тройчы запаленнем лёгкіх. Трэці раз хвароба была настолькі цяжкай, што ўсе (медыцынскі фельчар Салаўцоў і"вясковы лекар"- бабка-шаптуха Анастасся Краўчанка з суседняй вёскі Боркі і ўся сям'я наша) страцілі самае галоўнае - веру ў тое, што я буду жыць.

Я згасаў, роўна, як дагараючая свечка. Здавалася, ні штомяне не выратуе. Час ад часу мне станавілася горш і горш.

Непрадбачаны выпадак змяніў лёс. У гэты дзень старэйшы брат Іван, у той час вучань сямігодкі, а ў далейшым - настаўнік, будучы ў мястэчку Хоцімску ў кніжнай лаўцы купіў для мяне кніжку "Два Маразы", народную казку ў літаратурнай апрацоўцы Якуба Коласа. І гэта кніжка, выдадзеная на дванаццаці старонках у Мінску

ў 1928 годзе ў суправаджэнні добрых малюнкаў мастака Кашкеля, расказаўшая аб перамозе селяніна над Марозам Чырвоным Носам, літаральна мяне зачаравала. Пераламіла, падняла тонус жыцця.

З таго часу я заўсёды лічу Якуба Коласа незвычайным чалавекам, сваім выратавальнікам, сваім Хросным Бацькам. За замілаваннем і асаблівай асалодай чытаю і перачытваю яго творы, і ўсякія друкаваныя радкі, якія адносяцца да жыцця і творчасці народнага паэта Беларусі, якое яму было прысвоена 80 год таму назад, калі я толькі з'явіўся на белым свеце.

І калі ў 1966 годзе ў маскоўскай бібліятэцы ў мае рукі трапілася пажоўклая ад часу захавання падшыўка газеты "Наш працаўнік" - орган Калінінскай акругі, якая выдавалася ў Клімавічах у 1924-1927 г.г. і асвятляла на сваіх старонках жыццё Хоцімскага раёна, маю найбольшую цікавасць выклікаў артыкул, змешчаны ў нумары ад 2 красавіка 1926 года на 2-й старонцы пад рубрыкай "Савецкае будаўніцтва" і называўся ён "Другі пленум Хоцімскага РВК". Тэкст засяродзіў канчаткова маю ўвагу, бо паведамляліся цікавыя факты, напісан ён быў добрай мовай:

3-га красавіка гэтага года ў м.Хоцімску адбыўся другі пашыраны пленум РВК з удзелам усіх старшынь, сакратароў, сяброў сельсаветаўі загадчыкаў устаноў. На пленуме яскрава былі абгавораны наступныя пытанні:

1-2: даклады аб выніках кампаніі і страхкампаніі.

3-4: справаздачна-перспектыўныя даклады спажывецкага і сельскагаспадарчага пазыковага таварыства.

5: даклад аб вясенняй пасяўной кампаніі.

6: аб мерапрымествах па ўзмацненню працы сельскіх Саветаў і аб ажыццяўленні працы сельскіх камісій.

7: аб рэвалюцыйнай законнасці.

Пленум у вырашэнні гэтых пытанняў выявіў вялікую актыўнасць. Было шмат дзелавых запытанняў і спрэчак па дакладам. Па дакладам аб сельска-гаспадарчай і страхавой кампаніях пленум адзначыў, што вялякім недахопам у гэтай працы была ўпэўненасць працаўнікоў у тым, што сельскагаспадарчы падатак і страхоўка будуць ісці самацёкам, па прычыне чаго, у гэтай галіне справа абстаяла дрэнна да тага часу, пакуль усе разам, актыўна не ўзняліся за гэтую працу, у выніку чаго, Хоцімскі раён пакінуў сваё апошняе месца.

У працы спажывецкага таварыства і сельскагаспадарчага пазыковага таварыства быў адзначан шэраг дасягненняў, асабліва ў сэнсе павялічэння гандлёвых зваротаў на 100% супраць мінулага году і павелічэння ліку пайшчыкаў.

Дзеля выканання пастановы апошняга пленуму АВК аб 50% кааперыраванні насельніцтва, пленум РВК пастанавіў: хутка правесці па ўцягненню ў кааперацыю вясковага насельніцтва, асабліва бяднейшай яго часткі, а таксама ў абавязковым парадку стаць пайшчыкамі ўсім старшыням, сакратарам і сябрам сельсаветаў.

Заслухаўшы даклад аб вясенняй пасяўной кампаніі, пленум адобрыў намечаныя камісіяй мерапрыемствы па ачыстцы і загатоўцы насення і метад размеркавання апошняга прызнаў правідловым.

Па дакладу аб мерапрыемствах па ўзмацненню працы сельсаветаў і ажыццяўленню працы сельскіх камісій былі адзначаны вялікія недахопы: адсутнасць належнай планавасці, безгаспадарчасць, адсутнасць якой-бы то нібыло працы сельскіх камісій і шмат іншых недахопаў з тэхнічнага боку.

Дзеля знішчэння гэтых недарэчнасцей райвыканком выпрацаваў інфармацыйны таварыскі ліст дзеля сельскага Савету, у якім, разам з паіменаваннем усіх недахопаў, даны канкрэтныя ўказанні дзеля знішчэння іх.

Адносна ажыўлення працы сельскіх камісій, Пленум парашыў паставіць гэту галоўную працу на першы план і прыняць самыя рашучыя меры да выканання яе, дзеля чаго арганізаваць пры кожным сёльскім Савеце па 4 камісіі, згодна палажэння ЦВКІСНК (Бюл. №6), умовы дзеля працы якіх у Хоцімскім раёне маюцца.

Там, дзе гэтыя камісіі яшчэ не распаліся, перагледзець іх склад, замяніў непрацаздольных сяброў больш працаздольнымі.

Разам з справаздачаю сельсавета аб працы, першым чынам РВК звярнуць увагу на тое, як працуюць сельскія камісіі.

Наогул, дырэктывы 3-га Рэгіённага з'езду Саветаў і аб планавасці гаспадарчасці і масава-калектыўнай працы, узмацняючы саюз серадняка з бедняком, з усебаковаю дапамогаю апошнім, чырвонаю стужкаю праходзілі час усей працы пашыранага пленуму. Поўнасцю тэкст артыкула я прывожу не толью з мэтай паказа канкрэтнага апісання працы Пленума, а яшчэ і па той прычыне, што пад артыкулам стаяў подпіс "Я. Колас".

З вялікай увагай прачытаў я некалькі разоў надрукаваны матэрыял. Мой позірк больш за ўсё быў накіраваны на прозвішча аўтара артыкула:

- Няўжо напісаў Якуб Колас, а можа гэта псеўданім каго-небудзь з супрацоўнікаў рэдакцыі? - устрывожыла мяне думка. Зноў праглядаю пажоўклыя лісты газеты, але падобнага прозвішча на старонках газеты нідзе не паўтаралася. Пасля гэтага давялося вясці доўгія пошукі, якія закончыліся безумоўна поспехам.

У газеце "Савецкая Беларусь" (у той час яна выходзіла на беларускай мове) на трэцяй старонцы 15 красавіка 1926 года ў падборцы матэрыялаў "У савецкай Беларусі за подпісам "Я. Каласок" (так па сяброўску Якуба Коласа называў Янка Купала) быў таксама змешчаны матэрыял пад назвай "За планавасць і гаспадарчасць" (З пленума Хоцімскага РВК) (Калініншчына).

У рэспубліканскай газеце ўдакладнялася: "Шмат дзелавых пытанняў і спрэчак па дакладах не далі магчымасць вырашыць усе пытанні ў працягу аднаго дню, вырашэнне астатніх пытанняў, было перанесена на другі дзень". Як бачна Колас знаходзіўся ў Хоцімску 3 і 4 красавіка 1926 года.

З дапамогай сына Якуба Коласа - Данілы Канстанцінавіча Міцкевіча, дырэктара літаратурнага музея Якуба Коласа, у цэнтральным дзяржаўным архіве Кастрычніцкай рэвалюцыі БССР было знойдзена пасведчанне, выпісанае 16 сакавіка 1925 года Народным Камісарыятам асветы, у якім гаворыцца: "Паказчык гэтага Міцкевіч Канстанцін камандзіруецца ў Калінінскую і Аршанскую акругі дзеля правядзення культурнай працы па беларусазнаўству, Міцкевіч мае права чытаць лекцыі, весці гутаркі па гісторыі беларускай літаратуры, чытаць свае творы і іншыя ўзоры прыгожага і беларускага пісьменства".

Калінінская акруга (цэнтр Клімавічы) была вылучана з РСФСР і далучана да беларускай ССР у 1924 годзе ў складзе васьмі раёнаў: Клімавіцкага, Хоцімскага, Касцюковіцкага, Краснапольскага, Чэрыкаўскага, Мсціслаўскага і Расняскага.

"— Цікава адзначыць, што ўжо ў 1925 годзе ўсе райкомы і партыі, і камсамола, усе райвыканкамы і сельсаветы вялі сваю работу на беларускай мове, - успамінаў у свой час дацэнт кафедры беларускай мовы Магілёўскага педінстытута, былы рэдактар газеты "Наш працаўнік" П. Юргелевіч. – Трэба сказаць, што народ з захапленнем сустрэў зварот і да яго на роднай мове. У акрузе пачалі адкрывацца беларускія школы, гурткі літбезаў і палітграматы. У Калінінскую акругу прыязджалі многія выдатныя пісьменнікі і вучоныя, каб што-небудзь даследаваць, вывучыць якую-небудзь галіну народнага жыцця, дапамагчы яму".

У 1926 годзе на тэрыторыі Калініншчыны працавала ўрадавая камісія па вывучэнню практычнага правядзення нацыянальнай палітыкі. Камісія ўсебакова

азнаёмілася з пастаноўкай працы ва ўсіх установах культуры. Па заданню народнага камісарыята асветы ўсе першыя трупы вясковых школ і сямігодак з 1 кастрычніка 1925 года былі пераведзены на беларускую мову навучання. Усе вясковыя школы з 1 лютага 1925 года перавялі выкладанні на беларускую мову. Хаты-чытальні таксама працавалі на беларускай мове.

Аддзелы РВК перавялі сваю канцылярыю на беларускую мову 1 красавіка 1925 года, а восенню ўсе сельскія Саветы. З другіх друкаваных крыніц я даведаўся, што Якуб Колас многа раз бываў у нас на Магілёўшчыне. Таку 1925 годзе ён прыязджаў на адкрыццё Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Горацкі раён наведаў і ў 1927 годзе, аб чым сведчыць захаваўшыйся фотаздымак, які знаходзіцца ў экспазіцыі музея акадэміі. Летам 1925 года Якуб Колас разам з пісьменнікам Максімам Гарэцкім наведваў Мсціслаўскі педтэхнікум, дзе на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў чытаў лекцыі аб методыцы выкладання беларускай мовы, Колас быў госцем у педтэхнікуме і ў снежні месяцы гэтага ж года. У складзе брыгады пісьменнікаў для ўдзелу ў трохмесяніку беларускай пралетарскай культуры прыязджаў у Магілёў у лютым 1930 года, а ў красавіку 1938 года наведаў горад калі драматычны тэатр ставіў яго п'есу "У пушчах Палесся". У свой час пісьменнік збіраўся наведаць Крычаў "На пошукі слядоў сярод народа аб паўстанні 1740-1744 гг.".

Удні святкавання дзевяностагоддзя з дня нараджэння Якуба Коласа Трасцінская сельская бібліятэка сумесна з кабінетам беларускай літаратуры сярэдняй школы арганізавалі некалькі цікавых сустрэч з удзельнкам другога Пленума Хоцімскага РВК у 1926 годзе Паўлам Пракопавічам Сычовым, які падзяліўся сваімі ўспамінамі, як давялося яму бачыць паэтаў у Хоцімску.

У той час ён працаваў старшынёй земляробчай арцелі "Ясная паляна" і членам Екацярынапольскага сельскага Савета.

- Пленум праходзіў у народным доме (непадалек ад царквы, будынак згарэў у 1941 годзе ў часы Вялкай Айчыннай вайны), - ажыўлена ўспамінаў Павел Пракопавіч.- Пасля заканчэння Пленума перад намі выступіў Якуб Колас. Пісьменнк быў добрым госцем у акруговым горадзе Клімавічы. Праз вёскі Забялышына і Трасціно госць завітаў і ў Хоцімск. Усім прысутным ён спадабаўся - быў вельмі простым, звычайным, сялянінам. Добра расказаў нам аб развіцці беларускай літаратуры ў першыя гады савецкай улады. А як надзвычайна, павольна і ціхім прыемным голасам паэт чытаў сваю паэму "Новая зямля", якую слухалі ўдзельнікі Пленума, прытаіўшы дыханне, тым больш, што бачылі ўпершыню жывога пісьменніка. Пранікненныя радкі паэмы вярталі нас, слухачоў, у недалёкае мінулае, калі гараваў мужык-беларус і над ім жорстка здекваліся паны і ўсялякія падпанкі. Да канца свайго жыцця добра буду помніць змест паэмы і цяжкі складаны шлях яе героў. Паэма запаланіла нашы сэрцы словам аб зямлі-карміцелкі, якая нясе збавення з няволі цяжкай і дае наймацнейшую аснову жыцця:

*Зямля не зменіць і не здрадзіць,*
*Зямля паможа і дарадзіць,*
*Зямля дасць волі, дасць і сілы,*
*Зямля паслужыць да магілы,*
*Зямля дзяцей тваіх не кіне,*
*Зямля - аснова ўсей Айчыне.*

У наш родны кут прыйшла савецкая ўлада і прынесла запаветнае шчасце. На Хоцімшчыне першым на Беларусі былі арганізаваны камуны, саўгас, земляробчыя арцелі і шлях калектыўных гаспадарак быў адкрыты і ясны. Для Коласа таксама, на мой погляд, было радасным быць на зямлі Хоцімскай і сярод людзей Хоцімшчыны-зачынальнікаў калектыўнай працы ў сельскай гаспадарцы. - Потым настаўнікі і вучні

беларускай сямігодцы выступілі з канцэртам. Колас разам з намі асаблівую ўвагу звярнуў на выкананне беларускіх народных песень, якіх багата было ў рэпертуары ўдзельнкаў мастацкай самадзейнасці.

Пасля сустрэч са сведкам незабыўнай падзеі вучні актывізавалі цікавасць да паэмы і ў сельскай і школьнай бібліятэках наперабой прасілі "Новую зямлю". З асаблівай павагай перачытвалі яе па другому, трэцяму разу.

Гэта быў прыклад карпатлівага адшуквання сярод багатай калекцыі залацінак беларускай культуры, якія потым і на ўроках у школе і ў масавай рабоце сельскай бібліятэцы ззялі ўсімі колерамі вясёлкі і запальвалі сэрца чытачоў бібліятэкі.

Высокую адзнаку праводзімай работы давалі работнікі абласной і рэспубліканскай бібліятэк, а таксама госці бібліятэкі - беларускія пісьменнікі Аркадзь Куляшоў, Іван Чыгрынаў, Аляксей Пысін, Віктар Карамазаў, Пятро Прыходзька і іншыя.

**Ласоўскі, М.** Народны паэт – госць Хоцімшчыны / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 2006. – 17 чэрвеня. – С. 2. ; 26 ліпеня. – С. 3. ; 6 верасня. – С. 3. ; 13 верасня. – С. 2. ; 4 лістапада. – С. 2. ; 9 лістапада. – С. 3.

# Не забываюць сэрцы мацярэй



Вывучаючы гісторыю роднага краю, я з асаблівай увагай аднёсся да прагляду, а потым да дасканалага вывучэння камплектаў падшывак раённай газеты, летапісу зямлі Хоцімскай за ўсе гады яе выпуску. Зрабіў у сваім сшытку паметкі аб важнейшых падзеях у нашым раёне, адлюстраваных на старонках газеты.



У адзін з вечароў маёй працы ў чытальным зале Нацыянальнай бібліятэкі Расіі ў Маскве, калі час ужо хіліўся да заканчэння рабочага дня, маю ўвагу прыцягнуў матэрыял, надрукаваны ў нумары ад 2 верасня 1938 года, які называўся "Буду камандзірам".

"Мала любіць Радзіму, - гаварылася у ім, - а галоўнае ў сучасны момант тое, што кожны савецкі патрыёт павінен ведаць і ўмець абараняць сваю зямлю. Брат мой, Цярэнцій, пайшоў служыць у авіячасць, а я пасля заканчэння Барысаўскага педвучылішча падаў заяву ў артылерыйскае вычулішча.

Працуйце, рабочыя, на фабрыках і заводах, калгасных на палях, вучыце моладзь, будуйце заможнае жыццё, а мы заўжды гатовы абараняць усе заваёвы Кастрычніка!" Пад матэрыялам-допісам стаяў подпіс Іван Цыганкоў.

Пасля вяртання з камандзіроўкі, напярэдадні 50-годдзя савецкіх Узброеных Сіл у 1968 годзе мінулага стагоддзя, я вырашыў даведацца аб лёсе яго аўтара. Пошукі прывялі мяне ў вёску Боркі. Завітаў на кватэру маці братоў Цыганковых. Здзівіўся, што ў той час на лаўках, табурэтках сядзела цэлая чарада дзятвы, дарэчы, усе яны былі актыунымі чытачамі нашай сельскай бібліятэкі, ды і навучаліся яны ў нашай сярэдняй школе і акружыўшы гаспадыню хаты, Фядору Фядоцьеўну затаіўшы дыханне, слухалі яе захапляючы расказ.

- Папрасілі мяне ўнукі і іх сябры расказаць аб іх дзядзьках Івану і Цярэнцію, якія злажылі галовы ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, - сказала прэстарэлая салдацкая маці, сустрэўшы мой дапытлівы позірк. Для мяне такая навіна была вельмі прыемнай і я з лагоднасцю папрасіў Фядору Фядоцьеўну прадоўжыць успаміны аб сынах.

- Іван скончыў Кіеўскае артылерыйскае вучылішча ў чэрвені 1941 года. Перад прызначэннем у часць яму прадаставілі водпуск наведаць родныя мясціны. Але не паспеў скінуць шынель з дарогі, як з вайскавой часці прыйшла тэрміновая тэлеграма: "Выязджай". ... Фядора Фядоцьеўна на хвіліну сціхае, дрыжачай рукой дастае з куфра

скрутак, загорнуты ў чысценькую хусцінку, разгортвае яго і падае пакамячаны ліст. Чытаю яго ўслых: "Ваш сын камандзір батарэі артылерыйскага палка капітан Цыганкоў Іван Мацвеевіч загінуў 11 верасня 1943 года і пахаван на хутары Соф'ін Ліман Данецкай вобласці. Разам з пахавальняй знаходзіцца пісьмо з Дабрапольскага ваенкамата: "Ваш сын капітан Цыганкоў І.М. запнуў 11 верасня 1943 года пад сялом Шастакоўка. Пахаван з ваенным ушанаваннем у х. Соф'ін-Ліман, затым перазахаван у с. Беззаботаўцы. На магіле ўстановлен скульптурны помнік".

Наступнае пісьмо з Галоўнага ўпраўлення кадраў. У ім гаворыцца, што за баявыя подзвігі Цыганкоў І.М. узнагароджан орденам Чырвонай Зоркі і двумя медалямі "За баявыя заслугі".

Затым мой позірк прыцягнула паведамленне аддзела уліку асабістых страт сержантаў і салдат Савецкай арміі, дзе паведамляецца, што адпаведна даносу камандара 55-га бамбардзіровачнага авіяцыйнага палка старшына Цыганкоў Цярэнцій Мацвеевіч 1915 год нараджэння ў баях за сацыялістычную Радзіму загінуў 10 мая 1942 года і пахаван у Калінінскай вобласці Балатоўскім раёне с. Макарава, былы дом адпачынку "Каменка".

У хаце наступіла маўчанне. Каб парушыць яго, сумесна з унукамі Фядоры Фядоцьеўны разглядаем фотаздымкі. Вось Іван сярод групы курсантаў Кіеўскага артылерыйскага вучылішча. На другім – Цярэнцій з сержантамі рыхтуюцца да палітзаняткаў і т.д. Даўно адгрымелі залпы Вялікай Айчыннай вайны. Час зараўняў акопы, зарубцаваў раны, але ніколі не згладзяцца ў памяці народа імёны тых, хто ў цяжкую гадзіну вайны мужна змагаўся з ворагам. Загінуўшыя героі вайны заўсёды з намі, яны і зараз з намі ідуць у адной шарэнзе да светлага будучага, і між волі на памяць прыходзяць словы бессмяротнага чэшскага Героя Юліуса Фучыка:

"Я хацеўбы, каб усе ведалі, што не было безымянных герояў, а былі людзі, якія мелі сваё імя, сваё аблічча, свае спадзяванні надзеі...

Няхай жа гэтыя людзі будуць заўсёды блізкія ўсім, як сябры, як родныя, як вы самі...".

Захаваліся ў маіх запісах і ўспаміны Фёдара Аляксандравіча Мазнева за першым піянерважатым Васілёўскай сямігодкі Цярэнціі Цыганкове.

- Пасля вучобы на педкурсах я вярнуўся ў родную вёску настаўнічаць у 1932 годзе - успамінаў Фёдар Аляксандравіч. - Калі ў школе адкрыўся пяты клас, яна стала развівацца ў сямігодку, і ў школе была ўведзена пасада піянерважатага. На гэту пасаду па рэкамендацыі камсамольскай арганізацыі сельскага Савета быў прынят Цярэнцій. Да гэтага ён працаваў брыгадзірам у паляводнай брыгадзе калгаса "Усход". Любілі мы ўсе яго. Ён запявалам усіх добрых спраў быў у нас. Днём працаваў з піянерамі. Вечарам разам з намі праводзіў работу па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. Сяляне цягнуліся да ведаў і Цярэнцій укладваў усю душу у любімую работу, вучыў людзей жыць па-новаму. Шмат тады ў нас было клопатаў. Неабходна было павярнуць аднаасобнкаў да калектыўнай гаспадаркі. Часта выступалі перад насельніцтвам з лекцыямі і канцэртамі.

У сямейным альбоме Мазнёва былі фатаграфіі настаўніцкага калектыва Васілёўскай сямгодкі і першага выпуска вучняў школы. На абедзвюх фатаграфіях у цэнтры групавых здымкаў Цярэнцій Цыганкоў.

Пабываў я ў тым годзе ў брата Мікалая, калгаснага брыгадзіра, які карыстаўся ў хлебаробаў вялікім аўтарытэтам. За дасягнутыя поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР у 1966 годзе ён быў узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета, а міністэрствам сельскай гаспадаркі БССР - значком "Выдатнік сацыялістычнай сельскай гаспадаркі".

Другі брат загінуўшых герояў Аляксей працаваў конюхам і рэдагаваў насценную газету ўкалгасе. Трэці брат Уладзімір працаваў электрыкам у калгасе і спраў у яго заўсёды хоць адбаўляй.

У сем'ях Цыганковых беражліва захоўваецца памяць аб загінуўшых Іване іЦярэнціі. Вось і на маю просьбу выкарыстаць у газеце фотаздымак даваеннага часу - калі Іван вучыўся ў Кіеўскім артылерыйскім вучылішчы разам з Чубаковым Якавам з вёскі Малуноўка, ахвотна дазволіла ўжо пляменніца, Цыганкова Вольга.

Даволі цкава склаўся лёс нашых землякоў былых курсантаў Кіеўскага артылерыйскага вучылішча - у баях удзельнічалі на поўдні камандзір батарэі капітан Цяганкоў Іван загінў 11 верасня 1943 года пры вызваленні Данецкай вобласці. Таксама пры вызвапенні Данецкай вобласці лейтэнант Чубакоў Якаў, камандзір узвода 12 знішчальнага танкавага артылерыйскага палка быў цяжка паранены і памёр ад ран 3 верасня 1943 года. Разам вучыліся, разам сябравалі, разам аддалі сваё жыццё за сацыялестычную Радзіму ў смяротнай схватцы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Ніколі не згладзяцца з памяці мацярэй Цыганковай Фядоры Фядоцьеўны і Чубаковай Алены Яфімаўны родныя сыны, якія па-геройску аддалі сваё жыццё за мір і шчасце на зямлі.

На здымках: (злева направа) Іван Цыганкоў і Якаў Чубакоў;
Цярэнцій Цыганкоў. (Фотаздымкі з сямейнага альбома).

**Ласоўскі, М.** Не забываюць сэрцы мацярэй / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 2005. - 30 красавіка. – С. 2.

# Непагасная памяць

У адзін з дзён тыдня Маці ва ўпрыгожанай па-святочнаму зале пасяджэнняў выканкома сельскага Савета сабраліся па-святочнаму апранутыя мнагадзетныя маці, якія пражываюць на Трасціншчыне. У цэнтры на сценах Дзяржаўны флаг Рэспублікі Беларусь, ікона Божай Маці, упрыгожаная, аздобленая ручнікамі з беларускай нацыянальнай вышыўкай.

Усе размясціліся за круглым сталом за чашкай чаю з цукеркамі. І гаворка пачалася аб дарагім сэрцу кожнага з нас — дню Маці, які адзначаецца ў нашай дзяржаве другі год. У адрас самых родных, самых любімых гучаць праніклівыя словы ўдзячнасці за ласку, за клопат, за дабрыню, душэўную шчодрасць. За тое, што маці сваім цяплом саграваюць дамашні ачаг. Бо няма нічога больш светлага і прыгожага на зямлі, чым вобраз жанчыны-маці. А маміны рукі нельга забыць, бо яны ўсё ўмеюць рабіць, а ў перапынках паміж працай і дамашнімі справамі прыгалубіць і пагладзіць кожнае сваё дзіця.

Сваё выступленне-віншаванне сакратар сельскага Савета Тамара Аляксееўна Корнева пачала з цудоўных радкоў верша дагестанскага паэта Расула Гамзатава, ў якіх добра выказана аб Маці:

*«..нежности её звезда...».*
*«Каждый день разумной жизни*
*Праздник Матери — для нас!».*

Мнагадзетных маці ў сельскім Савеце зараз 34. Асаблівай увагі і павагі заслугоўваюць Зоя Аляксандраўна і Лілія Сяргееўна Кузьмянковы, Ніна Іванаўна Лупекіна, Раіса Уладзіміраўна Мікуціна, Галіна Пятроўна Палунчанка, Ларыса Іванаўна Шаляпенка і другія. Усіх цяжка і назваць, і пералічыць. Але ж трэба абавязкова назваць Ларысу Пятроўну Парфенаву, у якой мужа Івана, ветфельчара, на рабочым месцы ў кашары жывёлагадоўчай фермы забіла маланкай. А ў яе на выхаванні трое дзяцей, і яна мужна вытрымлівае свой лёс і сцвярджае выказванне славутага нямецкага паэта Гётэ, што: «Самая лучшая мать та, которая может заменить детям отца, когда его не станет».

Дырэктар сельскага Дома культуры Наталля Папелыш прачытала верш Міхаіла Разанава «Матерям Могилёвщины», з асаблівай выразнасцю радкі:

*«Святые, милые!*
*Пускай невзгоды*
*Забудут к вам дорогу*
*навсегда.*
*Пусть в радости*
*проходят ваши годы!*
*Пусть от тоски не будет*
*и следа...».*

Бібліятэкар Ірына Маліноўская прачытала таксама верш, а Уладзімір Белікаў пад акампанемент гітары праспяваў песню аб Маці.

Педагог-сацыёлаг Галіна Мікалаеўна Прошкіна расказала аб паходжанні свята Трэцяй Прачыстай — Пакровы Прасвятой Багародзіцы і як дзеці з мнагадзетных сем'яў вучацца ў школе. А старшыня прафсаюзнай арганізацыі саўгаса Ірына Іванаўна Нікіценка — аб працоўных поспехах жанчын у саўгаснай вытворчасці.

Было прадастаўлена слова і мне, як старшыні пярвічнай арганізацыі ветэранаў вайны і працы. Дарэчы, на ўспамін прышло выказванне народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава, што «...жорсткая памяць абавязвае нас, былых салдат, быць праўдзівымі і сумленнымі да канца. Яна абавязвае нас расказаць сённяшняму пакаленню суровую праўду пра свяшчэнную вайну...»

...Стаяць на беларускай зямлі помнікі, абеліскі, каменны летапіс гісторыі. Стаяць, як ганаровая вахта. Як памяць. Як даніна вялікай любві нашай. Любві навечна.

Ёсць такія высокія словы — «Пакласці на алтар Айчыны...». Чым змераць усё тое, што паклалі на алтар Айчыны, алтар Перамогі беларускія жанчыны-маці! Колькі іх не дачакаліся сыноў з вайны! Колькі мацярынскіх сэрцаў працялі тыя ж варожыя кулі, якія напаткалі іх дзяцей! Беларускія маці не дачакаліся кожнага чацвёртага свайго сына ці дачкі.

*Страціла Радзіма мая*
*Столькі сыноў,*
*Колькі ў лесе дубкоў,*
*Столькі дачок,*
*Колькі ў небе аблок,*
*Столькі дзетак,*
*Колькі ў поле кветак,*
*Праліла столькі слёз,*
*Колькі ў поле рос...*
*Пакланіцсся гэтай зямлі...* — так пісала паэтэса ў сваім вершы.

Кожны чацвёрты... Ва ўсіх іх былі маці. Ад маці разам з першымі словамі і першымі песнямі ўспрымалі яны любоў да Радзімы. Калі настала часіна абараняць

Айчыну, маці благаславілі іх на подзвіг. І заўсёды вобраз Маці і вобраз Радзімы былі для іх непадзельныя.

А самі Маці? Яны ваявалі побач з сынамі. Яны працавалі за іх на заводах і на калгасных палях. Яны выхоўвалі іх дзяцей, вучылі ўнукаў дабру і справядлівасці.

Аплакаўшы сваіх загінуўшых сыноў, яны счарнелі ад гора, але знайшлі ў сябе сілы выстаяць, працягваць іх справу, выхоўваць у тых, хто прыйшоў у жыццё пасля вайны, вернасць высокім ідэалам Радзімы, свяшчэнную памяць пра герояў мінулых бітваў. У горадзе Жодзіна ля Маскоўскай шашы, непадалёк ад Кургана Славы ёсць манумент у гонар Маці-патрыёткі, у гонар усіх жанчын, якія ў ліхую часіну жыццём сваіх дзяцей, сваім, уласным жыццём засланілі і адстаялі Радзіму. Мацярынскі смутак і веліч подзвігу не забудуць нашчадкі» — напісаны словы на ім. У словах гэтых — і наша боль, і наша памяць, і клятва. Да гэтага нас абавязваюць мільёны прастрэленых сэрцаў, мільёны выцвілых салдацкіх трохкутнікаў, жалобных рамак, з якіх глядзяць партрэты тых, хто не вярнуўся з вайны. Да гэтага кліча нас усіх, хто будзе жыць на Зямлі, грамадзянскі подзвіг і святая памяць жанчын-маці, якія праводзілі на фронт пецярых, чатырох, трох сыноў ці дачок, якія выпраўлялі на вайну, назаўсёды, свайго адзінага сына. Правобразам маці-патрыёткі паслужыла Анастасія Фамінічна Купрыянава, у якой загінулі на вайне пяць сыноў. У скульптуры простай беларускай жанчыны-маці ўвасоблены вобраз усіх мацярок-зямлячак, іх смутак і надзея, боль і пяшчота ўсямерная любоў да жыцця і ненавісць да вайны.

Правобразам маці-патрыёткі маглі быць і мае аднавяскоўкі: Вульяна Апанасаўна Андросенка, Хіма Рыгораўна Кавалёва, Аксення Васільеўна Ласоўская, Ева Якаўлеўна Ткачова, якія блаславілі на абарону Айчыны па пяць сыноў, а Ганна Міхееўна Кузьмянкова і Арына Лявонаўна Раманенка блаславілі па чатыры.

Назаўсёды Вульяна Апанасаўна не дачакалася з бітваў сына Івана, Хіма Рыгораўна — Мікалая і Фёдара, Аксення Васільеўна — Івана, Пятра, Рыгора, Ева Якаўлеўна — Васіля, Мікалая, Сяргея, Якава, Ганна Міхееўна — Захара, Сцяпана, Сямёна, Арына Лявонаўна — Восіпа, Уладзіміра, Фёдара.

Працалюбства і самаадданасць, нястомнасць і мужнасць трэба адзначыць 31 салдацкіх удоў-аднавясковак, - асабліва Анастасіі Цярэнцьеўны Струмянёвай, у якой на выхаванні засталося дзевяць дзяцей, Марфы Фядотаўны Анішчанка — чатыры, Ефрасінні Міхайлаўны Анішчанка — чатыры ды пятая састарэлая маці мужа Аляксея, Вульяны Ягораўны Кавалёвай — чатыры, Пелагеі Цімафееўны Казімірскай – чатыры.

Трагічна склаўся лёс салдацкай удавы Марыі Ісакаўны Кузьмянковай, якісьці ліхадзей ці ліхадзейка забілі яе ў сваёй хаце. Безумоўна, калі б вярнуўся з вайны яе Сцяпан, гэтага не здарылася б. Усяго ж з вёскі Трасціно, дзе ў даваенны час налічвалася каля ста гаспадарак, загінула на вайне 56 волатаў-аднавяскоўцаў.

У сваім расказе я прывёў запаветныя словы Маці Тэрэзы, заснавальніцы ордэна міласэрнасці, лаўрэата Нобелеўскай прэміі, славутай дабрачынніцы: «Помните, вы все на земле для того, чтобы помогать тем, кто в этом нуждается». А ў канцы сваёй размовы пажадаў сваім мацёркам аднавяскоўкам: «...Шчодрых міласцей ад Госпада Бога, аднаўлення духоўнага, моцы духоўнай і цялеснай, дапамогі Божай і блаславенных поспехаў у працы і асабістым жыцці».

**Ласоўскі, М.** Непагасная памяць / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1997. – 19 лістапада. - С. 3.

Безмятежная радость, как будто ясное солнышко. А годы идут. Они просто летят. И, хотя смачиваем голову первым майским дождиком, как по велению родителей охотно исполняли поверье в детстве, чтобы волосы росли, как майская трава, получается обратное. Сейчас на Пасху в светлое Христово воскресение также охотно расчёсываем свои сохранившиеся волосы с пожеланиями, чтобы у нас было столько внуков, сколько волос на голове...

Мы, люди старшего поколения, стараемся не расслабляться, а с Божьей помощью держаться в меру своих сил и возможностей, ощущая радость земных благ в финишные дни своего земного календаря, в эти тяжёлые дни выживания нашего государства. Когда журналисты поинтересовались у известного сатирика Михаила Задорнова, о чём он размышляет, то он ответил: "...о том, что Земля перенасыщена энергией Зла. Наверное, когда-нибудь она не выдержит и стряхнёт с себя человечество, так, как это было с предыдущими цивилизациями. Россия и Америка – две половинки, которые уравновешивают планету. Задача американцев – показать, как должно жить туловище. Росси же – попытаться сохранить духовность мира. Наступает эра Водолея. Эпоха спокойного духовного развития. Водолей это знак России, она родилась под ним”. Я против всяких резюме в принципе. Факты не должны, как луна и горбатые, поворачиваться ко всем одной стороной!

— Смотрика, она ещё здорова, - злорадно говорит мужчина-односельчанин, способный по состоянию здоровья побороть буйствующего быка, указывая в сторону одинокой женщины, разменявшей восьмой десяток.

Сгорбленная старушка маленькими шажками, как уточка, движется по дороге в сторону наших земельных участков, таща за собой единственное транспортное богатство – детскую коляску, в которой каждое колесико износилось до основания. Свою версию он ещё подтверждает, для него кажущимся убедительным аргументом, что она в летнее время ежедневно посещает и копается на своём земельном лапике.

Как у председателя первичной организации ветеранов войны и труда в сельском Совете, до неудержимой боли сжимается даже моё, солдатское сердце, от этой его безжалостной информации. Женщину эту, он и я, прекрасно знаем. Её жизнь сложилась - прошла весьма неудачно. Первый и второй муж не составили достойную семейную пару. Не обрадовали и дети от первого брака. Вдобавок в предпенсионный период, когда, работая учительницей у неё заработная плата была выше ставки – коллега учительница-воровка хитроумно посоветовала ей спрятать на её имя, избавляясь вычета от якобы высокого подоходного налога, эту дополнительную плату. И как результат – минимальная пенсия только со ставочки. Свой домик передала сыну обзовёвшемуся семьёй: сама ютится в школьной квартирке.

И вот старость, почти полное одиночество, только лишь поддержка и помощь порядочных коллег-учителей. Замучили шпоры на ногах, в наступление пошла катаракта. Со своей скудной пенсии она ещё до последнего рублика покрывает расходы на учёбу внучки-студентки педагогического Университета, осуществляя свою заветную мечту-любовь к профессии учителя передать в родственнике наследство. Свою любовь к земле-кормилице, единственному источнику добавки к пенсии, своим образцовым примером отношения к земле, показывает пример всем односельчанам-тростинцам.

Однако в какой-то степени, нанаверное, переговор завистника-злорадника уложил страждущую в постель. Очень ослаблен организм, катаракта в запущенной форме. И операция уже не поможет.

Держу разговор с одногодком-односельчанином, обращаю внимание, что он свой пронзительный взгляд всё время устремляет в мой периодически раскрывающийся рот и, заметив у меня впереди имеющихся два зуба сохранившиеся в корнях с одетыми коронками-наконечниками, язвительно восклицает:

- Так у тебя ещё и зубы есть? - эти его слова насквозь пронзили моё тело.

Прошло несколько дней. Жена приготовила на обед моё любимое блюдо - постная, с сушеными грибами, квашеная капуста. Трудно сказать, когда славяне начали возделывать капусту, но известно, что она была завезена греками, римлянами и русскими купцами из Западной Европы. В нашей большой семье (восемь детей было у матери) все обожали капусту. Аромат блюда пленил моё воображение и я, как бывало в детстве, любил это блюдо кушать с корочкой окрайчика хлеба. И только дотронувшись, нажал, чтобы откусить корочку, как мои отреставрированные десять лет тому назад передние зубы не выдержали и все полетели в один миг: и надстройка-реставрация, и сами зубы...

Мыкаюсь без зубов более двух лет, анализирую эту злорадную встречу, ругаю себя, что сразу же не догадался мгновенно от нечисти и напасти сделать отговор и поплевать через левое плечо.

Аналогичную историю рассказывал мне инвалид ВОВ Титов из деревни Мосин. У него от переговора завистника разлетелись на несколько частей вставные зубные челюсти.

Автобусом возвращаюсь из "царь-града" Хотимска, где на базаре купил необходимые продукты весом около пуда. Жаркий июньский день с температурой выше тридцати. В сжатом воздухе салона автобуса закружилось в голове, обморочное состояние и, когда вышел на автобусной остановке в Тростино, решил вначале вволю надышаться свежим воздухом, а потом помаленьку покорить полукилометровое расстояние до своего дома.

- Вам помочь?

Да, если это в ваших возможностях то, пожалуйста, сделайте милосердное одолжение и окажите помощь,- даю согласие и радостным взглядом смотрю на спасителя своего положения. Передо мной новый житель деревни Тростино Иван Фёдорович Шершнёв, бывший войсковец, сейчас в запасе, и своей любезностью, своим тёплым отношением так растрогал меня, что моё полуобморочное состояние полностью рассеялось, исчезло и я полной грудью вдыхал чарующий аромат воздуха родного уголка, запахи берёзовой рощи-Кухаревщины, соснового бора-парка, с влажностью красавицы Беседи и её притоков Мужичка и Тростянки.

Разум и сердце были переполнены радостью, что сохраняются в наших людях роднички-золотинки человеческой доброты.

Израсходовалась в хозяйстве фуражная мука. Решил мешочек на санках отвезти к односельчанину, у которого в хозяйстве имеется крохотная самодельная мельница. Однако к обеду снежок растаял на дороге, а я тянул свой груз по останкам придорожного снега и, безусловно, приустал.

Вдруг передо мной на велосипедах останавливаются мальчишка и девчонка, школьники из соседней деревни Будочка.

- Дедушка, вам помочь?! - вежливо, почти одновременно, предложили свою услугу. Добротой своего стремления они меня ошарашили. От неожиданности я даже растерялся. А потом все, взвесив и оценив, что после занятий в школе спешат на обед, да при том им ехать ещё в соседний населённый пункт, а увлёкшись оказанием помощи, куда деть велосипеды, их могут не обнаружить, оставив возле дороги. На повторное предложение я похвалил их, назвав "Молодцы! Умники!", от всей души поблагодарил за такое тимуровское стремление (рассказал, что и мы, бывши школь-

никами, в довоенное время оказывали помощь престарелым односельчанам). И не спеша сделал задуманное сам. В растерянности я даже сразу и не уточнил имена своих доброжелателей. Только позднее я узнал имена моих настоящих друзей-шестиклассников - Николая Царапнева и Виктории Сливка.

О поступке их я охотно рассказываю и в своём материале. В наш век нехватки доброты и милосердия, к нашему счастью есть добрые люди. Они постоянно встречают тебя с добрыми пожеланиями, ласково дарят необыкновеннопленительные, чарующие, нежные, будто ясное солнышко, улыбки, помогают поднять настроение, решить любую, казалось бы, самую непростую проблему.

И мы, люди уже старческого возраста - старичьё, безгранично рады, что в какой-то степени не перетоптано всё человеческое, созданное учением Иисуса Христа: любить другого, как самого себя.

Именно про таких добрых людей говорил когда-то Лев Николаевич Толстой, юбилей которого сейчас широко отмечается в России и во всех странах: "...они живут своими мыслями и чужими чувствами, чувствуют душевное состояние других, принимают к сердцу радость и горе людей".

Больше бы было таких людей на нашей Хотимской земле! Дай Бог?

**Ласовский, М.** Не растерять доброту / М. Ласовский // Шлях Кастрычніка. – 2002. - 2 кастрычніка. – С. 2.

# Неўміручыя песні Кабзара

У першы пасля рэвалюцыі год, 30 ліпеня 1918 года, старшыня Саўнаркома У.І. Ленін падпісаў спіс выдатных людзей, якім трэба паставіць помнікі ў Маскве і Петраградзе. Побач з імёнамі вядомых дзеячаў рэвалюцыі, пісьменнікаў, філосафаў стаіць імя Тараса Рыгоравіча Шаўчэнкі — вялікага паэта ўкраінскага народа, 175-годдзе з дня нараджэння якога адзначана ў сакавіку бягучага года. І калі турысцкімі шляхамі мінулай восенню наведаў маляўнічую Чаркасчыну, землі, калісьці належачыя памешчыку Энгельгардту, у якога прыйшлося перанесці шмат здзекаў маладому Тарасу, то з вялікай цікавасцю слухаў расказы ўкраінскіх сяброў, якія з асаблівым гонарам гаварылі аб тым, што ні пагрозы, ні розгі на канюшні, нішто не змагло зламаць непакорную душу будучага народнага паэта і мысліцеля, заснавальніка новай украінскай літаратуры.

Цудоўныя ўражанні засталіся і аб Чаркасах з яго сямісотгадовай гісторыяй, запоўненай яркімі старонкамі паўднёвага фарпоста Кіеўскай Русі. Памяць аб слаўным мінулым захоўваецца ў назвах вуліц і помніках. Каля будынка абласнога музычна-драматычнага тэатра імя Т.Р. Шаўчэнкі ёсць добры помнік кабзару скульптараў Уронскага і Алейніка, да якога я наведаўся, каб зрабіць нізкі зямны паклон ад зямлі Белай Русі. Беларускую рэчаіснасць, фальклор, літаратуру Шаўчэнка ведаў добра. Ён выкарыстаў беларускі матэрыял у аповесці «Музыкант», некаторых вершах, зрабіў уплыў на творчасць беларускіх паэтаў Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, Цёткі, М. Багдановіча і іншых.

У горадзе вяліся шырокім фронтам падрыхтоўчыя работы да адкрыцця музея Т. Р. Шаўчэнкі. У краязнаўчым абласным музеі я азнаёміўся з матэрыялам аб жыцці і дзейнасці геніяльнага паста, мастака, рэвалюцыянера-дэмакрата.

«Шаўчэнка заслугоўвае высокай адзнакі іменна як першы сапраўдны народны паэт», — гэтым выказваняем А. М. Горкага пачынаецца экспазіцыя ў асобнай зале музея.

Увагу кожнага наведвальніка прыцягваюць «Копія адпускной Шаўчэнка ад 22 красавіка 1836 года». Побач партрэт В. Жукоўскага работы мастака Брулова, за продаж якога (за 2500 рублёў) быў выкуплен ад прыгону Тарас, фотакопіі выпіскі з журнала Акадэміі мастацтваў аб узнагароджванні Шаўчэнкі сярэбранымі медалямі ў 1839 годзе за малюнак з натуры, у 1840 годзе за малюнак «Хлопчык-жабрак», у 1841 — за акварэль «Цыганка-варажбітка».

У геніяў няма, як вядома, даты смерці. Іх духоўная спадчына жыве ў стагоддзях. За гады Савецкай улады творы паэта выдаваліся 612 разоў на 68 мовах народаў СССР агульным тыражом 30 мільёнаў экземпляраў. У музеі шырока прадстаўлены гэтыя памнікі палымянай народнай любві.

Ёсць у музеі і «Кабзар» на беларускай мове, які выйшаў у 1839 годзе (2-е выданне выходзіла ў 1952 годзе).

Украінскі пясняр яшчэ з маленства быў добра знаёмы з жыццём беларускага селяніна, ён сваімі вачыма бачыў яго бяду і нядолю. Шаўчэнка тройчы праходзіў і праязджаў праз Беларусь, праз Магілёўшчыну. Першы раз восенню 1829 года ён разам з дваровымі людзьмі пана Энгельгардта перасек беларускую зямлю з поўдня на поўнач, едучы ў Вільню па маршруту: Кіеў — Рэчыца — Бабруйск — Мінск — Маладзечна. Другі і трэці разы Шаўчэнка ехаў праз Беларусь у 1843 годзе з Пецярбурга і ў 1847 годзе ў Пецярбург дарогай: Кіеў — Гомель — Слаўгарад — Магілёў — Орша — Віцебск. Падарожжы гэтыя былі, вядома, кароткія, але пэўнае ўражанне аб Беларусі і жыцці яе народа ў памяці паэта засталося.

Дрымучыя лясы і балоты. Змрочныя вёсачкі. Бедны, абарваны, маркотны народ. Да іх, арыштанта і двух жандараў, падбягалі апцухлыя дзеці, кульгаючы, ледзь трымаючыся на нагах, жабрачкі-бабулі і працягвалі кашчавыя рукі за міласцінай.

Светлае імя паэта ў гэтыя дні я ўспамінаю не толькі ціхім словам нашай замілаванасці і любві да вялікага чалавека, а з глыбокай любоўю і павагай, бо творы яго блізкія да фальклору, напісаны народнай мовай.

Выконваю параду Тараса Рыгоравіча: «Вучыцеся, браты мае, думайце, чытайце» і трымаю ў руках на роднай мове «Кабзара», дзякуючы добрым перакладам Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, К. Крапівы, П. Броўкі. А. Куляшова, П. Глебкі і з вялікай любоўю чытаю яго кожную песню, кожнае слова і люблю песняра свабоды, як любяць найдаражэйшага ў свеце чалавека.

Невычэрпнай крыніцай яго сюжэтаў было жыццё працоўнага народа. Славуты «Запавет» змяшчаў адкрыты заклік да звяржэння царызму і прыгонніцтва і прадвяшчаў народам светлую будучыню:

*«І мяне ў сям'і вялікай,*
*Сям'і вольнай, новай*
*Памянуць вы не забудзьце*
*Нязлым ціхім словам».*

*Пераклад З. БЯДУЛІ.*

За песенны талент Кабзара, які абуджаў людзей, заклікаў іх на барацьбу за вызваленне, цар і паны пакаралі паэта бязлітаснай карай — аддалі ў салдаты ў далёкую Орскую крэпасць і забаранілі яму пісаць і маляваць.

Зайздрошчу сучасным школьнікам, якія ў дзевятым класе вывучаюць стаўшы хрэстаматыйным твор класіка беларускай літаратуры Я. Купалы «Тарасава доля», які мы ў даваенны час чыталі нарасхват у перыядычным друку ў часы святкавання 125-й гадавіны з дня нараджэння Тараса Шаўчэнкі. З творамі Кабзара, як бачыце, я сябрую больш пяцідзесяці гадоў і трымаю іх як сваіх спадарожнікаў да скону адлічаных мне год.

**Ласоўскі, М.** Неўміручыя песні Кабзара / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1989. – 11 красавіка. - С. 3.

# О братьях наших меньших

*«... Убивайте лишь зверей внутри себя»*
*Е. Евтушенко.*

Внучка Аня увлечена чтением научно-популярной книги «Эти загадочные животные» Ирины Царевой, изданной в «Энциклопедии загадочного и неведомого». Книга отвечает на многие вопросы и в частности, что ее и меня удивило: обладают ли разумом собаки и кошки?

Ведь буквально с нами рядом кипит таинственная и неведомая жизнь. А знаем ли мы все о братьях наших меньших. Например, собаке Рексе и кошке Таисии?

По делам направляюсь в Тростинский сельский Совет. По пути слышу голос соседа пенсионера Федора Романенко, ремонтирующего конную телегу возле своего дома:

- Алексеевич, запиши-ка в свою летопись события, произошедшие в нашем хозяйстве.

- С интересом, Владимирович, выслушаю Ваше сообщение и если оно заслуживает внимания, то охотно исполню и Вашу просьбу, - включаюсь я в разговор после приветствия.

- Так вот поведаю я Вам о крепкой дружбе нашей сучки Кнопки и кошки Мурки в сложных процессах выживания. Щенила наша малышка Кнопка троих щенят, которых совсем маленькими односельчане забрали. А сама же Кнопка по росту немножко больше кошки. Чуточку попозже котенилась и Мурка - принесла троих котят. Однако по какой-то причине у кошки отсутствовало молоко и котята в три голоса просили еду. И так продолжалось несколько дней. Двое котят погибли без кормежки. Третий жалобно продолжал мяукать. И вот тогда не оказалась равнодушной к судьбе котенка Кнопка. Она подошла к просящему помощи малышу, нежно обнюхала и улеглась возле него, подсунув свои соски. Котенок, почувствовав запах молока начал жадно сосать. Так Кнопка стала регулярно кормить котенка. Через некоторое время улучшилось состояние у Мурки, и она стала по примеру Кнопки также кормить котенка. Так и кормят две мамаши поочередно серенького симпатягу. Как видите, дружбе братьев наших меньших в трудное время можно позавидовать.

С большим интересом выслушал я рассказ соседа. Раскрыв рот, слушал его и внук-малыш Максим и супруга.

Поблагодарив рассказчика за откровенность сообщенного, пообещал ему, что все изложу на бумаге, чтобы читатели газеты узнали о необычайной взаимовыручке.

Одновременно вспомнился мне и случай полуторадеся-тилетней давности. На лето привезли к нам в деревню внучку Таню. Она со вниманием изучала подворье, любила кормить цыплят. Однако когда я ей сообщил, что наша кошка котенила котят в курином гнезде в сарайчике, то она пристала с просьбой, чтобы показали малышей. Отказать дед не смог, и она с радостью ручками потрогала маленькие пушистые комочки. Когда же на второй день мы снова пришли посмотреть котят, то в курином гнезде их не оказалось, и только через несколько дней, после тщ льных поисков, обнаружили их в кормушке для овцы. Вновь не удержались и потрогали их, и вновь повторилось их исчезновение. Несколько дней осматривали подворье, но котята вместе с кошкой, словно под землю провалились.

Решил спросить у соседки Софьи Григорьевны, не видела ли она нашу кошку с котятами. И та сообщила невероятное. Наша кошка дружила с их котом. Так кошка от

наших взглядов и проверок перенесла всех котят под защиту их кота в чулан - в сенях их дома.

Примерам, описанным мной, думаю и нам, людям, необходимо поучиться: дорожить дружбой и любовью, как это делают братья наши меньшие.

**Ласовский, М.** О братьях наших меньших / М. Ласовский // Шлях Кастрычніка. – 2004. – 22 верасня. – С. 3.

# Односельчане помнят своего журналиста

С большим вниманием и интересом осмотрел в помещении редакции районной газеты «Шлях Кастрычніка» выставку, посвященную 70-летию со дня выхода первого номера. Было приятно видеть на ней фотографию первых активистов газеты, которую сберегла и подарила через меня редакции преподавательница белорусского языка и литературы Клавдия Александровна Хайновская. В далёкие тридцатые годы её брат - Николай, был сотрудником газеты. Для меня дорого, что Николай мой односельчанин. И я решил на днях посетить его 90-летнюю тётю Марию Валерьяновну Дёмкину, верную солдатскую вдову. Она охотно поделилась своими воспоминаниями, дополнила необходимыми сведениями по многим интересующим меня вопросам.

Рассказчица была десятой в семье своих родителей Прасковьи Корнеевны - первой матери - героини в деревне и отца Валерьяна Исаевича. Четыре старших брата, один из которых, Иван - семейная гордость был первым библиотекарем в далёком 1922 году в деревне. Работая в кузне молотобойцем, авпоследствии в советские времена стал кандидатом исторических наук, доцент, заведовал кафедрой в Харьковском институте культуры. Пятеро старших сестёр, одна из которых Татьяна до Октябрьской революции была служанкой у помещика Ходоровича в соседней деревне Будочка. Там познакомилась с работавшим у помещика кузнецом Александром Емельяновичем Хайновским.

Октябрь изменил всё к лучшему. Кузнец от помещика перешёл работать в кузню еврея Шлемы Ковалёва. Спрос на кузнечные работы от крестьян был большой и, заработав денег, купили себе хатку в своей деревне, построили кузню. В 1920 родился сын Николай, а позднее и дочь Клава. В 1930 году стали членами колхоза «Заречье». Дети Николай и Клава учились на «отлично». После окончания семилетки продолжили учёбу в Хотимской средней школе. Николай стал писать в газету информации и статьи и его, как лучшего селькора, пригласили на работу в газету.

Вспоминаю и я хорошо те последние тридцатые годы, когда мы с детской завистью смотрели на газетчика-журналиста Николая Александровича Хайновского, бывшего ученика нашей Тростинской школы. Всегда с интересом читали и перечитывали его корреспонденции в районной газете, посвящённые жизни родной деревни, колхоза, школы. Мне хорошо помниться ещё и до сего времени очерк Николая Хайновского о семье учителя Степана Викентьевича Карпенко, который продолжительное время работал в нашей школе. В школе работали и его сыновья Василий и Иван с женой Анной.

Смело выступил Николай и в защиту старейшего селькора Карпа Борисовича Бургутина из колхоза «Чырвоны Серп», когда его незаслуженно правленцы стали обвинять за критические материалы о недостатках в работе в колхозе.

В своих записных книжках обнаружил и запись рассказа сестры Клавдии, что в 1939 году по путёвке комсомола Николай едут в Сибирь, где работает литературным сотрудником в редакции «Черновские копи» на одной из шахт Читинской области. В 1940 году он призывается в ряды Советской Армии.

Сохранилась запись, когда в 1967 году я обслуживал библиотечной книгой мать-пенсионерку Татьяну Валерьяновну, то она разрешила мне ознакомиться с письмами Николая военного времени. Николай служил в войсках противовоздушной обороны в зенитной артиллерии, которая почти всю войну охраняла небо Ленинграда. Письма его были оптимистичные.

«Дорогие мои родные, - писал в одном из них Николай, - я вам стал писать письма за три дня до вашего освобождения, ибо был уверен, что скоро родные места будут освобождены». После этого писал письма каждый день, а ответ пришёл только через 54 дня. Во время блокады были большие тяжести, оставалось только по одному снаряду на батарею, а сейчас их хоть отбавляй. За оборону города недавно нам вручили медали «За оборону Ленинграда»... Сожалею очень, что мало сделали записей из писем. С печалью выслушал и сообщил матери о том, что после войны жизнь журналиста трагически оборвалась. Нашёл его путевой обходчик возле железнодорожного полотна без чувств. Ноги были раздроблены, Николая доставили в больницу, где он и умер на операционном столе. Николай был принципиальным журналистом, никогда не проходил мимо нарушений социалистической законности. За это нарушители и столкнули его из вагона на ходу поезда.

Николай Хайновский не вернулся в редакцию, не вернулся в родные края. Однако память о нём свято хранят и деревья, любовно посаженные его руками.

**Ласовский, М.** Односельчане помнят своего журналиста / М. Ласовский // Шлях Кастрычніка. – 2005. – 10 жніўня. – С. 2.

# Пакланіцца памяці блізкіх

Радаўніца... Як далёка разбегліся думкі... Радаўніца — адзін з найболыш прыкметных памінальных дзён, які здаўна адзначаецца па Беларусі вясной, у аўторак пасля велікоднага тыдня.

Крочым да вясковага могільніка. Чамусьці на ўспамін прыйшлі радкі з паэмы «Заазер'е» Анатоля Вярцінскага:

*Ад вёскі да могілак – паўвярсты.*
*Ад вёскі да могілак —доўгія вёрсты.*
*Ад вёскі да могілак – шлях няпросты.*

І вось на падпраўленых магільных узгорках расцілаем абрусы, на якія выстаўляем велікодныя стравы. Каб нябожчыкі не загневаліся, а спрыялі ў нашых гаспадарках, ніхто нічога не шкадуе.

А прыйшлі пакланіцца памяці Паўла Сяргеевіча і Ксенні Дзіматраўны Елісеевых іх сын Пятро з жонкай Раяй, унучка Ірына з мужам Аляксандрам і дачкой Валерыяй, дачка Гаша мужам Міхаілам, дачкой Таццянай і ўнучкай Людай, дачка Ліда, сын Віктар з - унучкай Святланай. Адсутнічалі тры дачкі з сем'ямі: Марыя, Паша, Тамара, бо жывуць у Расіі.

Спачатку з прывітаннем паведамілі радасную вестку аб Хрыстовым Уваскрэсенні, што дае магчымасць нам дастойна пераносіць цяжкасці сучаснага зямнога жыцця і быць вытокам цярпенню, прымірэнню, згоды ў крызісных працэсах жыцця.

Усе амаль аднагалосна падзякавалі за добрае выхаванне, якое зводзілася да разумення, што ўсе радасці жыцця кароткія, усе хутка мінаюць, акрамя адной радасці працы. Радасць працы не паўтараецца нават пакутамі і, між іншым, ніколі не паўтараецца, яна заўсёды новая, заўсёды па-новаму напаўторна захапляе, хвалюе.

Адначасова просім усе і даравання і прабачэння за вольныя і нявольныя свае хібы і памылкі. Увесь час у размовах стараліся прытрымлівацца ўспамінаў пра нябожчыкаў.

...Толькі перавязлі сваю хату з пасёлка Ясная Раніца ў вёску Альшоў і не паспелі як мае адбудаваць яе, як пачалася вайна.

Бацька пайшоў абараняць Айчыну, а маці засталася адна з дзецьмі, аж з шасцярымі.

...Пры адступленні нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску, дзе згарэла і наша хата.

...Пасля вызвалення жылі доўгі час некалькі сем'яў у калгасным і клубе. Маці працавала днём на калгасным полі, а ноччу ахоўвала калгасныя склады.

...Бацька вярнуўся з вайны аж у канцы сорак пятага зімой. І калі на вайне смерць мінула салдата, дык амаль было не загінуў на Хоцімшчыне каля вёскі Баханы, дзе аднаго з мільёнаў пераможцаў банда было не знішчыла. Выратавала салдацкая кемлівасць.

...У даваенны і пасляваенны час бацька працаваў брыгадзірам паляводчай брыгады. Аб добрых справках калектыву і яго кіраўніка не аднойчы на сваіх старонках паведамляла раённая газета, якую ён шанаваў, выпісваў і чытаў з першага нумара і да канца свайго жыцця.

Для Паўла Сяргеевіча былі радкі дабрыні газетнай публікацыі як самая высокая ўзнагарода. Асаблівай радасцю для яго было, калі на 90-гадовым юбілеі ў парадку віншавання-сюрпрыза зачытаў ксеракопію невялікай інфармацыі, надрукаванай на першай старонцы раённай газеты ад 27 красавіка 1947 года «Яны першымі ў раёне закончылі сяўбу ранніх зернавых». Вось кароткі яе змест, тым больш яна ўяўляе цікавасць і зараз, бо гэта падзея пяцідзесяці гадовай даўніны:

«Брыгада. № 1 калгаса «Прагрэс» Елавецкапа сельскага Савета (зараз калгас «Маяк»), дзе брыгадзірам Елісееў Павел, 23 красавіка поўнасцю закончыла сяўбу ранніх зернявых і лёну. Замест плана пасеву 5 га пшаніцы пасеяна на 7,8 га, ячменю — 16 га, аўса — 15, ільну — 4. Высокія ўзоры працы паказваюць на сяўбе і калгаснікі Барэнкова Ніна, Валодзенка Няфёд, Сівакова Марыя. Дзённыя нормы яны перавыканалі ў паўтара-два разы».

А ў першамайскім нумары паведамлялася, што калгас «Прагрэс» (старшыня Савельеў) быў занесен на раённую Дошку гонару за паспяховае правядзенне веснавой сяўбы.

— Для мяне матэрыял, змешчаны ў газеце, быў самай высокай узнагародай, — гаварыў потым бацька.

— Хаця мы з маці былі ўзнагароджаны медалямі «Ветэран працы» а маці ордэнам «Мацярынская слава» за нараджэнне і выхаванне семярых дзяцей.

…Ад вясковых могілак як на далоні бачна альшоўскае поле. З прыходам вясны, з яе зелянінай траў і сінню нябёс свой пахмурны нарад мяняеш ты, поле, на пышнае кветкавае ўбранне, каб потым, у гарачую летнюю спёку, закалыхацца масівам хлябоў. Ва ўсе поры года вабіш ты, поле, сваёй незвычайнай прывабнсцю, і табе, услаўленаму ў легендах, песнях і былінах, нясуць людзі свае радасць і смутак.

Ніва роднага калгаса патрабавала клапатлівыя рукі, паўсядзённы клопат аб ураджаі. Не давала расслабіцца Паўлу Сяргеевічу і Ксенні Дзімітраўне. Яно — поле — давала ім вялікую сілу і крылы для працы па атрыманню добрых ураджаяў.

Цесная сувязь з прыродай, з зямлёй, палітай потам і кроўю бацькоў і дзядоў, з бацькоўскім домам, з старонкай роднаю — усё гэта, дзе радасць перамешана з горам — наша спадчына.

**Ласоўскі, М.** Пакланіцца памяці блізкіх / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1997. – 31 мая. - С. 3.

# Память подвигу

Сколько бы времени не прошло, но в памяти народной никогда не изгладится великий подвиг советских воинов, в жестоких схватках с сильным и коварным врагом отстоявших свободу и независимость своей Родины и принесших освобождение многим странам Европы и Азии. Во время Великой Отечественной войны раскрылись во всём величии и удивили мир высокие и благородные качества советских людей: безграничная любовь к Родине, идейная убеждённость, верность интернациональному долгу, непоколебимая стойкость, мужество и непреклонная воля к Победе.

По достоинству были отмечены многие участники Великого сражения наградами Родины. Для солдат особенную гордость представлял орден Славы, утверждённый в 1943 году. Мне неоднократно приходилось наблюдать, с какой гордостью в праздничные дни при земной жизни одевали эти ордена на свои костюмы, удостоенные этого ордена, участники войны с Тростинщины Семён Анищенко, Дмитрий Глушенков, Иван Гудков, Павел Самофалов и другие. Как утверждают справочники, за годы Великой Отечественной войны орденом Славы награждено около 900 тысяч советских воинов. Из них полными кавалерами стали только 2 456 человек.

Сейчас на Хотимщине ведутся работы по созданию хроникально-документальной книги "Память. Хотимский район". Большинство районов республики Беларусь уже

издали свои книги. Пора и нам, а для этого было достаточно времени, чтобы всё хорошо изучить и осмыслить, разложить по полочкам-разделам этой будущей книги, сохранить правдивость-достоверность событий далёких и близких дней, чтобы впоследствии не краснеть перед потомками.

Я хотел бы в своём материале рассказать о полном кавалере орденов Славы Иване Григорьевиче Зайцеве. Вновь знакомлюсь с материалами военных журналистов Г. Андреева и И. Вакурова. Вот что они сообщают о нём в своём документальном материале, который представляет интерес всем нам:

...Весна в 1944 году на Украину пришла рано. К концу апреля земля покрылась бархатной зеленью. После окончания зимней кампании на этом участке фронта наступило относительное затишье. Обе стороны готовились к новым боям. Передний край обороны 1-го стрелкового батальона 515 стрелкового полка 134 стрелковой дивизии проходил восточнее населённого пункта Свинжина Турийского района, Волынской области.

По указанию командира полка гвардии майора Пономарчука личный состав батальона копал траншеи, строил блиндажи, укрытия. Командир батальона капитан Иванов в один из дней, докладывая командиру полка о ходе оборонительных работ, пожаловался:

- Беда, снайперы противника жизни не дают!

Гвардии майор Пономарчук, вызвал к себе старшего снайперской команды полка ефрейтора Зайцева, спросил:

- Тебя совесть не грызёт?

- За что? - удивился ефрейтор.

- А за то, что фашистские снайперы ежедневно выводят из строя наших людей! - строго сказал командир.

- Понимаю, товарищ гвардии майор, - тихо ответил Зайцев. - Но я уже кое-что придумал.

Утро 28 апреля выдалось особенно тёплым и тихим. Увлечённые созданием обороны, воины не замечали артиллерийской и оружейно-пулемётной дуэли дежурных подразделений обеих сторон. И вдруг заговорила вражеская громкоговорящая установка: "Внимание! Внимание! Для вас, русские солдаты, передаём "Катюшу". И понеслась всем знакомая, дорогая сердцу советского человека.

В нейтральной стороне перед обороной батальона в разрушенной траншее ещё с ночи находились два снайпера - ефрейтор Зайцев и рядовой Денисов.

- Какую-то подлость задумали, мерзавцы, - прошептал Иван Зайцев.

- Усилим наблюдение, - ответил Денисов.

Вскоре хитрость врага была разгадана. Уже при исполнении второго куплета, нашлись любители посмотреть, откуда доносится песня и тотчас раздалось несколько выстрелов. Это по любопытным стреляли фашистские снайперы.

- Смотри, перед нами, на берёзах, два снайпера, - прошептал Денисов. За несколько минут друзья обдумали создавшееся положение. Берёзы находились тоже в нейтральной зоне метрах в 150-200.

- Бери на прицел правого, а я левого. Бить только наверняка, иначе нам удачи не видать, - тихо сказал Иван.

Прогремело два выстрела и почти одновременно из рук вражеских снайперов выпали винтовки. Но Зайцев и Денисов просчитались. На соседних двух берёзах сидело ещё по снайперу, и они моментально открыли огонь. Пуля пробила левую руку Денисова.

Зайцев трижды дёрнул за провод, соединявший их с передним краем, что означало: "Отходим! Прикрыть огнём!". Затем быстро оказал помощь Денисову.

- Ползти можешь? - спросил он. - Не исключена возможность, нас сейчас попытаются взять в плен. - Ползти могу, но неужели этих паразитов оставим живыми?! - показывая головой на берёзы, проговорил Дмитрий.

- И то верно.

Они отползли по траншее метров тридцать. Выбрав небольшой кустик, прильнули к оптическим прицелам. И через две-три секунды перестали существовать ещё два вражеских снайпера.

...Шли последние дни войны. Но враг подобно смертельно-раненому зверю с остервенением сопротивлялся. На рассвете 20 апреля подразделение полка в районе города Лебус подошли к сильно укреплённому оборонительному рубежу противника, проходящему по высоте с отметкой 62,9. Попытка прорвать этот рубеж сходу, успеха не имела. Дзоты, расположенные на восточных склонах высоты, изрыгали лавину пуль и прижимали наших бойцов к земле. Снайперская команда, находившаяся в первой цепи 2-й стрелковой роты, ослепить дзоты не смогла. Тогда сержант Зайцев принял смелое решение: повесив винтовку на спину, он взял в руки по гранате и, поднявшись по весь рост, скомандовал:

- Впереди Берлин! Смерть Гитлеру! За мной! И стремительно бросился вперёд. За ним поднялась вся снайперская команда, а затем и вся рота. За высотой наступающие роты попали под огонь вражеских орудий и снова залегли. Сержант Зайцев обратился к командиру полка:

- Товарищ гвардии полковник, разрешите нам разделаться с этими гадами! Он вкратце изложил свой замысел и заверил, что через полчаса с орудиями будет покончено. Командир одобрил замысел.

Вскоре сержант Зайцев и его подручный ефрейтор Абдурахманов уже пробирались кустарником к орудиям. Зашли с тыла. Договорились: огонь открыть одновременно, забравшись на деревья. С высоты двух вековых, уже хорошо зазеленевших дубов, несколько минут изучали действия гитлеровцев. Затем одновременно прогремели два выстрела, которые сразу же вывели из строя командиров расчётов. Вражеские артиллеристы на мгновение растерялись от неожиданности, а в это время раздалось ещё два выстрела, сразившие ещё двух фашистов. Остальные артиллеристы, бросив орудия, схватились за автоматы и открыли беспорядочную стрельбу. Стрелковые роты снова пошли вперёд. При попытке скрыться в роще нашли смерть от пуль советских снайперов ещё пять гитлеровцев.

Захватив Лебус, 134-я стрелковая дивизия устремилась на Берлин. Иван Зайцев одним из первых вошёл в поверженный город. Указом Президиума Верховного Совета СССР от 15 мая 1946 года за героизм, проявленный при завершении окружения в Берлине фашистской группировки, и за доблесть, проявленную при её разгроме, он Зайцев Иван Григорьевич был награждён орденом Славы I степени. В августе 1946 года после демобилизации И.Г. Зайцев вернулся в родной колхоз "Перамога" на Могилёвщину. Гитлеровские мерзавцы разграбили и разрушили всё богатство колхоза. Нужно было начинать всё сначала, как когда-то, в далёком 1929 году. Иван Григорьевич, не зная покоя ни днем, ни ночью, выполнял одно за другим ответственные поручения по восстановлению колхоза.

И вдруг в 1951 году при заготовке леса для колхоза получил перелом позвоночника. В 1952 году он скончался. Но память о нём, о его подвигах во имя Родины живёт и поныне.

**Ласовский, М.** Память подвигу / М. Ласовский // Шлях Кастрычніка. – 2001. – 20 чэрвеня. – С. 2.

# Паэт мужнасці
# і любві на Хоцімшчыне

## (12 снежня – 70 гадоў з дня нараджэння Кастуся Кірэенкі)

Выпадкова зазірнуў у аддзяленне сувязі начальнік гаргаза М. М. Кавалёў, калі я адпраўляў сваім адрасатам чарговыя пісьмы. Радасдь нечаканай сустрэчы ўзрушыла абодвух. Хоць прайшло ўжо некалькі гадоў, як мы разам перажывалі і страх перад аперацыяй, і боль, і радасць выздараўлення, знаходзячыся на лячэнні ў хірургічным аддзяленні райбальніцы. З таго часу мы і пасябравалі. Пасля цёплай і шчырай размовы пад добры настрой на памяць прыйшлі радкі верша паэта-земляка Кастуся Кірэенкі, заслужанага дзеяча культуры БССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (нарадзіўся на Слаўгарадчыне), якія сцвярджаюць істотнае разуменне простых маральных каштоўнасцей, з якіх і складаецца чалавечы побыт, жыццё, настрой:

*Цалуйцеся, людзі, часцей,*
*Не адкладвайце галубіцца.*
*Будзьце прасцей, будзьце прасцей,*
*Пакуль любіцца.*

Чамусьці ўспомнілася, калі не так ужо і ў далёкім 50-м годзе я служыў у радах Узброеных Сіл СССР у Закаўказзі. У вайсковай часці беларусаў было вельмі мала, і з нас заўсёды аднапалчане надакучліва пасмейваліся: «Што ў Беларусі ёсць?» — ставілі яны такое пытанне і самі ж на яго жартоўна адказвалі: «Ёсць бульба, ды толькі дробненькая».

Тым часам камандаванне часці прадаставіла кароткатэрміновы водпуск на радзіму. У сельскай бібліятэцы накінуўся з азартам на беларускія кнігі, па якіх знудзіўся. Дарэчы, трапіў у рукі зборнік вершаў «Мая рэспубліка» Кастуся Кірэенкі, якім аўтар праклаў свой след у беларускай паэзіі. У ім з асалодай прачытаў невялікую лірыка-публіцыстычную паэму, якая і дала назву зборніку. Кампазіцыя еадзейнічала сцвярджэнню асноўнай думкі паэмы: Беларусь з краю «цёмных лясоў», «ціхіх далін», «багнаў-балот» ператварылася ў квітнеючую індустрыяльна-калгасную рэспубліку. Аратарска-публіцыстычны пафас паэмы спалучаецца са шчырасцю пачуцця, з задушэўным народным лірызмам, з паэтызацыяй велічы, красы і хараства рэспублікі, над якой «свецяцца агні завадскіх карпусоў», «грымяць галасы магутных турбін», якая разліваецца ў садах, калыхаецца ў жытах.

Паэму перапісаў, па дарозе ў часць вывучыў напамяць і на адным з тэматычных вечароў з гонарам прачытаў крылатыя патрыятычныя радкі паэмы перад аднапалчанамі:

*Не завіце маю рэспубліку*
*Краінай цёмных лясоў!*
*Паглядзіце —*
*Над ёю свецяцца*
*Агні завадскіх карпусоў...*

І пасля гэтага як рукой былі зняты, заціхлі ўсе жартачкі з нас, беларусаў. А колькі пачуцця, задушэўнасці ўклаў К. Кірэенка ў лаканічны, кароткі верш «Магілёўшчына» (1949 г.):

*Зямля маёй цудоўнай Магілёўшчыны,*

*Ты ўся з красы і радасці саткана!*

Веліч і краса Магілёўшчыны не толькі ў яе маляўнічай прыродзе, але і ў натхнёнай, радаснай працы людзей, якія вырошчваюць на палях добрыя ўраджаі, квітнеючыя сады, уздымаюць гмахі новых заводаў і фабрык. З асаблівай цеплынёй напісан верш «Родная школа» (1966 г.):

*Матуля-школа. Слаўны, мілы кут.*
*Маленства я сваё згадаю тут.*

З паватай гаворыць паэт у вершы «Песня» (1965 г.):

*У тую крыніцу,*
*З якой піў ваду,*
*Гразёю не кіну,*
*Хоць, можа, лепшую з часам*
*Знайду свайму сыну.*

У «Слове пра любы край» (1968 г.) паэт піша слова «Радзіма» з вялікай літары. Радзіма — гэта родная зямля і глыбіні народнай гісторыі, далёкія імёны і подзвігі вялікіх продкаў: «Многа ўсякіх дарог і сцежак пройдзена ў жыцці, многа чаго забылася і не ўспомніцца. Але нідзе і ніколі не забывалася і не забудзецца тая зямля, тая мясціна, тыя прасторы палёў, лугоў і бароў наскіх, дзе пачуў матчына слова над калыскай, дзе прайшло залатое маленства, адкуль юнацтва сонечнымі дарогамі павяло ў вялікае жыццё. Не адну думку прысвячае чалавек бацькоўскаму краю, не адным сардэчным клопатам, і ў дні вайны, і ў дні міру стараецца аддзякаваць роднай зямлі за яе незабыўную ласку, за адзіна непаўторнае шчасце, дадзенае назаўсёды. Але колькі чаго не зроблена — усё ж гэтага мала, каб лічыць, што ўжо вьшанаў свой абавязак перад Радзімай. І колькі ні жыве чалавек — заўсёды ён адчувае, што многа яшчэ за ім застаецца, бо Радзіма столькі дала яму радасці і святла і дае штодзённа столькі шчырых даброт, што да канца дзён сваіх чалавек нясе, як паходню, перад дарагімі суайчыннікамі сваю душэўную ўдзячнасць».

Сыноўне-чыстае, першароднае адчуванне роднай зямлі, вялікая любоў да бацькоўскага краю, тонкае разуменне хараства родных прастораў — усё гэта характэрна для паэтычнай творчасці Кастуся Кірэенкі, творчы дыяпазон якога надзвычай шырокі: вершы, паэмы, проза, мастацкі нераклад, творы для дзяцей, публіцыстыка, сатыра... Да 70-годдзя паэта ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшаў збор твораў юбіляра.

Ідэйна-маральная пазіцыя паэта-земляка:

*Мой абавязак камуніста –*
*Быць чалавекам на зямлі.*

Адчуванне бацькоўскай зямлі знаходзіцца ў лепшай паэме «Трыпутнік», у якой усім пафасам сцвярджаецца, што паэт павінен цвяроза і бескампрамісна ставіць сябе на споведзь перад часам, перад свяшчэннымі рэчамі — такімі, як Радзіма, маці, - свой народ.

У свой час пры вывучэнні творчасці паэта-земляка з увагай чытаў паэму «Іспанка», пабудаваную на страсных маналогах-успамінах лірычнага героя, у якіх ён звяртаецца да Іспанскай дзяўчыны Марселіны. Яшчэ дзіцём пасля грамадзянскай вайны ў Германіі трапіла яна ў невялікую вёску на Магілёўшчыне. Трагічны лёс выпаў на долю герояў паэмы. Ваеннае ліхалецце разлучыла іх, раскідала па свеце, але пачуццё інтэрнацыянальнага яднання засталося. Асабліва звярнуў увагу на радкі паэмы:

*А пасля...*
*я надзеў шынель і ўзяў стрэльбу,*

*А пасля...*
*плакаў у Бранскім лесе,*
*Пакінуўшы апошні след на Беларусі...*

З іншых крыніц даведаўся, што ў гады Айчыннай вайны Кастусь Кірэенка служыў вежавым стралком на танку, быў карэспандэнтам армейскай газеты на Заходнім і 2-м Беларускім франтах. І чамусьці ўзнікла думка, як бы па інтуіцыі, а ці не плакаў паэт у Бранскім лесе, пакідаючы апошні след на Беларусі, на нашай Хоцімскай зямлі? Доўгі час затоена насіў гэту здагадку, а потым, набраўшыся смеласці, напісаў пісьмо аўтару.

Неўзабаве я атрымаў сцвярджальны адказ, які захоўваю, як дарагую рэліквію:

*«Вельмі паважаны таварыш Ласоўскі! На Хоцімшчыне мне давялося быць у 1941 годзе, у час баёў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Запомніліся ваколіцы вёскі Родня, дзе быў невялікі прыпынак на цяжкай дарозе адступлення, потым шлях на Хоцімск і сам Хоцімск, радзіма Аркадзя Куляшова, ціхі драўляны гарадок, такі зажураны і прыгнечаны самотай нарынуўшай вайны. Напэўна, па той дарозе была і вёска Трасціно, але, мусіць, знаёмства было зусім мімалётнае, таму і ўспамінаў ніякіх не засталося. На мяжы Хоцімшчыны ёсць тая мясціна, дзе адбылося развітанне з беларускай зямлёй пад страшэннай навалай варожага нашэсця. Ніколі не забудзецца зорная ноч, сціхшая і пакораная калі сэрца адчула, што раптам зусім асірацела, што бацькаўшчына твая засталася ў руках ворага, лютага, няўмольнага ката...*

*Пра сваю сустрэчу з Кузьмой Чорным у клімавіцкім лесе я напісаў у аўтабіяграфіі.* Як *потым К. Чорны ішоў далей* на *ўсход, — гэтага не ведаю. Пасля, за час вайны, я некалькі разоў сустракаўся з К. Чорным у Маскве і Мінску, але не памятаю, каб Чорны хоць раз загаварыў пра Хоцімск. Шчыра жадаю здароўя, поспехаў, шчасця. Моцна пацiскаю Вашу руку. З прывітаннем Ваш Кастусь Кірэенка».*

**Ласоўскі, М.** Паэт мужнасці і любві на Хоцімшчыне : [12 снежня – 70 гадоў з дня нараджэння Кастуся Кірэенкі] / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1988. – 10 снежня. – С. 4.

# Першая з узнагароджаных

На Хоцімшчыне жывуць цудоўныя людзі, знаёмства з якімі дастаўляе вялікую радасць. Аб кожным з іх можна смела пісаць кніжкі.

У канцы мінулага года мне давялося пагартаць уцалелыя захаваўшыеся нумары раённай газеты "Калгасная звязда" за трыццатыя - даваенныя гады ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь. З яе старонак дыхнула цёплымі павевамі маленства - школьнымі гадамі. Мяне цікавіла падрабязна тэма пастаноўкі школьнай справы на Хоцімшчыне, бо ў той час перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны ў раёне было 33 пачатковых, 16 сямігадовых і 6 сярэдніх школ, у якіх навучалася 7850 вучняў.

З гарачай сімпатыяй і жывым запалам чытаў я матэрыялы, напісаныя сейбітамі ўсяго добрага і вечнага - настаўнікамі, актыўнымі прапагандыстамі ведаў сярод жыхароў зямлі хоцімскай. Працавала ў школах раёна ў той час каля 300 настаўнікаў, сярод якіх знаходзіўся - працаваў настаўнікам мой брат Іван, у школах вёсак Малуноўка, Ельня, Васілёўка, Арлоўка.

Вось у нумары газеты ад 14 мая 1939 года змешчана-надрукавана выступление Марыі Паўлаўны Храмянковай, настаўніцы пачатковых класаў Баханоўскай сямігодкі: "Небывалая радасць. Моцна застукала сэрца, агнём і вясной запылала душа, калі ўбачыла я сваё імя сярод узнагароджаных Прэзідыумам Вярхоўнага савета СССР асоба вызначыўшыхся сельскіх настаўнікаў. Ад роду я так не радавалася, так не хвалявалася. Падумаць толькі! Я, сельская настаўніца, маладая грамадзянка ўзнагароджана медалём "За трудовое отличие". Я шчаслíва. І цяпер я яшчэ больш ганаруся пачэснай прафесіяй настаўніка. Толькі ў нас у Савецкай краіне так цэняць людзей, даражаць імі, як самым цэнным капіталам. Вялікая ўзнагарода натхняе мяне на яшчэ лепшую і ўпартую працу. З добрай думкай аб Радзіме я заяўляю, што ўсю энергію, усе сілы, усё жыццё буду аддаваць для выхавання нашага маладога пакалення. Буду вучыць дзяцей яшчэ лепш, прывіваць у іх любоў да Радзімы."

На маю думку-погляд, бязмежная, светлая любоў да працы настаўніцы Марыі Паўлаўны было сапраўдным прызваннем. Святло дабраты — гэта жывое святло. Яно ажыўляла і акрыляла ўзаемнасцю дзіцячыя душы і творчыя ўрокі настаўніцы. Менавіта з школы і з-пад яе крылляў - рук падавалася не адна чародка выхаванцаў. Падавалася, каб вярнуцца праз гады, людзьмі светлымі і ўзмужнелымі.

А калі закончыўся навучальны год у школе, газета 11 ліпеня 1939 года надрукавала рапарт-справаздачу Марыі Паўлаўны:

"Знаходзячыся паўсядзённа сярод арміі малых жыццёрадасных, вясёлых грамадзян, у мяне яшчэ больш атрымліваецца жаданне — выхоўваць дзяцей, упарта працаваць над іх ростам і выхаваннем. На прыкладзе свайго трэцяга класа я ведаю жаданні, імкненні і здольнасці дзяцей. Яны хочаць стаць героямі краіны. У аднаго жаданне - лятаць у паветры, другі марыць аб тым, каб стаць вадзіцелем танка, трэці імкнецца к таму, каб быць будаўніком дамоў, добрых заводаў. Аб такой думцы мараць і Валя Лагуценка, і Міша Зямцоў, якія на працягу года былі выдатнікамі і з добрай паспяховасцю закончылі клас. Аб гэтым мараць усе хлапчукі і дзяўчынкі.

У нас 35 вучняў перайшлі ў чацвёрты клас. А калі закончылася вучоба, яны весела адпачываюць. Часта яны збіраюцца да мяне, я прыходжу да іх, і мы гутарым, чытаем газеты, цікавыя кніжкі. Канікулы праводзяць дзеці весела, радасна. А калі настане новы вучэбны год, яны зноў прымуцца за ўпартую вучобу".

Знаходзячыся на лячэнні ў тэрапеўтычным аддзяленні раённай бальніцы, звярнуў увагу на хворага, прозвішча якога прагучала "Зямцоў". Аказаўся шчаслівы выпадак - гэта быў Зямцоў з Баханоў - вучань з таго класа, аб якім ішла размова ў газетным

матэрыяле. Толькі гэта быў другі Зямцоў - Трафім Васільевіч. І ён з павагай успамінаў і расказваў доўгі час з удзячнасцю і цеплынёй аб сваёй добрай настаўніцы Марыі Паўлаўне, аб яе клапатлівых стараннях, каб яны, вучні, былі парадачнымі людзьмі ў жыцці.

Трафім Васільевіч закончыў савецка-партыйную двухгадовую школу, працаваў аграномам, старшынёй калгаса, а пасля ўзбуйнення калгасаў сеў за баранку аўтамабіля, працаваў слесарам на жывёлагадоўчай ферме. Паведаміў і тое, што выдатнік класа Міша Зямцоў па пуцёўцы камсамола вучыўся, працаваў на Мінскім аўтамабільным заводзе начальнікам цэха. Мару сваю здзейсніў.

Добры водгук аб Марыі Паўлаўне прышлося чуць пры размове з Дар'яй Захараўнай Якімкінай, 80-гадовай пенсіянеркай-настаўніцай. Яны разам працавалі ў пасляваенны час у пачатковых класах Юзяфоўскай сямігодкі. Жыццёвы шлях у даваенныя гады складваўся добра. Была любімая праца, была любоў, была сям'я. На вайне загінуў мужык, дырэктар Бахаоўскай школы Жабыка.

Далі свае даволі дрэнныя ўплывы, глумленні хціўцаў-зайздроснікаў, "шэранькіх калег", як гэта звычайна вялося ў калектывах, каб унізіць настаўнікаў творчых наватараў. Але ўсё яна вытрымала стрымана, дастойна.

На шырокай прывакзальнай плошчы аўтастанцыі трымаю размову з самой Марыяй Паўлаўнай. Яна з хваляваннем расказвала, а я з прыемнай павагай, шчырай і чыстай, слухаў яе ўспаміны, успаміны ветэрана аб тым часе, калі яе праца была ў зеніце ганаровай славы, бо яна першай сярод настаўнікаў раёна атрымала ўзнагароду за працу.

Нашы позіркі былі скіраваны на крыжы царквы Святой Троіцы. З верай і надзеяй, што настаўнікі Хоцімшчыны будуць заўсёды сапраўднымі сейбітамі добрага і вечнага, жывога святла ведаў на ніве асветы, як і іх былыя папярэднікі, нястрымныя падзвіжнікі, тварцы-наватары.

**Ласоўскі, М.** Першая з узнагароджаных / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1999. – 7 ліпеня. – С. 2.

# Першы дэпутат з Хоцімшчыны

У час правядзення перадвыбарных кампаній мне часта даводзіца чуць пытанне: «Цікава, а хто ж быу першым дэпутатам Хоцімшчыны у парламенце рэспублiцы?» Адказы мае спачатку былі кароткімі і сціплымі, зводзілісятолькі да таго, што першыя выбары ў Вярхоўны Савет БССР адбыліся 26 чэрвеня 1938 года, а першым дэпутатам па Хоцімскай выбарчай акрузе быў абраны брыгадзір трактарнай брыгады Хоцімскай МТС Фёдар Лявонавіч Кушчанка.

У краязнаучым музеі СШ №1 захоўваецца фотаздымак першага дэпутата. Фотаздымку больш пяцідзесяці год, і адносіцца ён да першага склікання Вярхоўнага Савета БССР. У саставе 273 дэпутатаў першы прадстаўнік раёна прымаў актыўны ўдзел у вырашэнні задач, стаячых на павестцы дня вышэйшага органа дзяржаўнай улады рэспублікі. Фотаздымак у музей прынесла праправнучка дэпутата — Святлана Грыбянькова. Партрэт гэты доўгі час беражліва захоўваўся у сем'ях Грыбяньковых і Шаршнёвых.

«Трактарыст — фігура гістарычная», — пісаў пісьменнік Валянцін Авечкін. У вёсках іхназывалі «вогненным племем». Трактарысты былі ў вялікай пашане. Успамінаю першых трактарыстау вёскі Трасціно: Цярэнцій Ткачоў, Стэфан Макаранка, Васіль Кузьмянкоў, Міхаіл Кавалёў, Уладзімір Ласоўскі... А як яны беражліва адносіліся да трактара! Цярэнцій Ткачоў араў зямлю, калі ў вёсцы ўзнік пажар: гарэла і яго хата. Алеён не пакінуў трактар пакуль не прыйшоў зменны трактарыст.

Пасля працяглых карпатлівых пошукаў у архівах і музеях, а таксама шматлікіх гутарак з людзьмі старэйшага пакалення і сваіх асабістых успамінаў (у той час я быў вучнем чацвёртага класа іпрымаў удзел у громкіх чытаннях аднавяскоўцам выбарчага закона напярэдадні дня выбараў), удалося даведацца пра многае з жыцця першага дэпутата нашага краю.

...У пачатку чэрвеня больш четырехсот выбаршчыкаў Трасцінскага Савета роўнымі калонамі прыйшлі на паляну каля школы на мітынг, прысвечаны сустрэчы кандыдата ў дэпутаты са сваімі выбаршчыкамі. Не ўсядзеліў тэты час у хаце і мы, вясковыя хлапчукі. Нам таксама-вельміхацелася сваімівачыма ўбачыць першага народнага абранніка. У вызначаны час мітынг адкрыў старшыня выканкома сельскага Савета таварыш Емяльянцау іпрадаставіў слова Фёдару Лявонавічу Кушчанку.

— Давер'е, якое мне аказалі працоўныя раёна, вылучыўшы маю кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР, я адношу, — хвалюючыся гаварыў Кушчанка, — нашай Камуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам якой беларускі народ ідзе да радаснага ішчаслівага жыцця. Я беспартыйны, але мяне выхавала партыя, за справу якой я гатовы ў любы момант аддаць свае жыццё.

З дапамогай старажылаў вёскі Боркі і пратакольных радкоў, што захаваліся ўархівах, удалося ўстанавіць абставіны правядзення перадвыбарнага сходу па вылучэнню кандыдатуры Кушчанкіў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР на агульным сходзе калгаса «Усход» (зараз паляводчая брыгада калгаса «Перамога»). Сход праходзіў 25 мая, на імпрысутнічала 117 калгаснікаў-выбаршчыкаў.

З хвалюючай прамовай выступіў конюх Сямён Асташанка. Ён гаварыў аб заможным калгасным жыцці, шырокіх правах выбаршчыкаў у краіне Саветаў.

— Раней выбіралі і маглі быць выбранымі багацеі, хто меў шмат зямлі, грошай, — гаварыў ён. Яны бязлітасна эксплуатавал ібедняко і, за іх кошт нажывалі сваё багацце. Зараз мы выбіраем у свой вышэйшы орган улады людзей сумленных, адданых справе свайго народа. Я з радасцю вылучаю першага кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Савета

БССР, нашага аднавяскоўца Кушчанку. Ён выхадзец зсям'і беднякоў. Усё сваё жыццё працаваў батраком. Толькі пры Савецкай уладзе стаў жыць заможна, добра авалодаўдау прафесіяй трактарыста. Цяпер ён лепшы брыгадзір трактарнай брыгады Хоцімскай МТС. Працуеаддана. Давер'е заслужыў сумленнай працай на калгасных палях.

Кушчанка — чулы і ўважлівы таварыш. Сціпласць, прастата, дзелавітасць — вось лепшыя рысы характэра дэпутата.

Прамову Асташанкі падтрымалі калгаснікі Герасім Паўлючэнка, Фядора Барадзенка, Ксенія Старая і ішыя, Аднавяскоўцы аднадушна звярнуліся з просьбай да Кушчанкі даць згоду балаціравацца кандыдатам у дэпутаты Вярхоунага Савета БССР па Хоцімскай выбарчай акрузе № 130.

Вылучаную кандыдатуру падтрымалі калгаснкі сельгасарцелі «Чырвоная Зорка» (веска Маркаўка) Трасцінскага сельсавета, «Чырвоная пчолка» (веска Іваноўка) Хоцімскага пасялковага Савета і іншыя калектывы.

Нарадзіўся Фёдар Лявонавіч 13 лютага 1897 года ў вёсцы Боркі. Бацька яго быў інвалідам, чалавекам хворым і ціхім. Цяжка было расціць дзяцей у той час працалюбіваму, але слабаму чалавеку.

Колькі гора і крыўды нацярпелася сям'я Лявона Кушчанкі ад боркаўскіх кулакоўі багацеяў! Надоўга засталіся ў памяці моманты, калі, закінуўшы за плечы доўгую пугу падпаска, гнаў табун міма стараставай хаты хлопчык Фёдар. Аднойчы свіння з табуна пачухала свой брудны бок аб вугал стара-ставага свірна. За гэта багацей да крыві рассек раменнай пугай плячо дзесяцігадоваму падпаску. Маці Фёдара пайшла скардзіцца, стараста выгнаў яе з хаты. На старасту падаліў суд. Аднак, цімагла ў той час судзщца сям'я інваліда Лявона Кушчанкі?

У тое лета, пасвячы кароў з Фёдарам, маціўбачыла, што коні аднаго заможнага гаспадара патравілі авёс на палосцы бедняка. Маці не змаўчала. Багацею прыйшлося заплаціць. Аднак ён не мог дараваць беднячцы, што яна не пабаялася засведчыць патраву.

Аднойчы, калі статак быў далёка ад вёскі і паблізу не было людзей, ён жорстка збіў жанчыну. Маціне плакала, не крычала, не адбівалася, толькі ахоўвала рукамі жывот — яна была цяжарная. На другі дзень у яе нарадзілася нежывое дзіця.

Пайшоў дарогай бедняка іФёдар. Завяла яна яго ў чужыя багатыя дамы, паставіла за кулацкія плугі, дала ўрукі пугуіповады. Спачатку працаваў у багацеяў-аднавяскоўцаў Барадзёнак, потым у Баякова ў вёсцы Кузьмічы і Прамічкіна ў вёсцы Васілёўка.

Дзень у полі, вечарам вёў коней у начное. Спявалася тады іпеснятакая ў народзе:

*«Ты не ўмееш у мяне працаваці...*
*Я не знаю, што яму адказаці,*
*Завярнуся,*
*Слязамі абаллюся,*
*Рукавом уватруся...»*

У 1913 годзе выехаў Фёдар на вугальныя шахты Юзаўкі. Потым працаваў на металургічным заводзе. У 1918 годзе пайшоў у Чырвоную Армію, дзе праслужыў да 1921 года. Удзельнічаў у баях з Врангелем на Паўднёвым фронце. Вярнуўшыся ў гаспадарку, актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці. У хуткасці працоўныя Борак выбіраюць Кушчанку членам выканкома Васілёўскага сельскага Савета. У 1929 годзе разам з аднавяскоўцамі Аляксандрам Васільчанкам, Яфімам Цыганковым, Сямёнам Асташанкам, Фёдар Кушчанка арганізоўвае ў вёсцы Боркі калгас «Усход». Працуючы загадчыкам малочнатаварнай фермы, паказвае ўзоры стараннай працы. Ферма пад яго кіраўніцтвам не мела выпадку страты маладняку. Як лепшага арганізатара калгаснай вытворчасці Кушчанку пасылаюць на курсы трактарыстаў у Горкі. Пяць год працуе

трактарыстам у калгасе. Трактар яго заўсёды працаваў бездакорна, не ведаў пpастояў і паломак.

У 1935 годзе Фёдара Лявонавіча запрасілі працаваць брыгадзірам трактарнай брыгады ў Хоцімскую МТС. За сезон 1937 года брыгада Кушчанкі выпрацавала на чатырох «ХТЗ» у пераводзе на мяккае ворыва — 2163 гектары. Брыгада была адна з перадавых у МТС па выкананню ўсіх работ, у тым ліку і цераблення лёну.

Пасля вяртання з першай сесіі Вярхоўнага Савета БССР Фёдару Лявонавічу даручаюць кіраваць толькі што арганізаванай Разальмоўскай МТС, а з вызваленнем заходняй Беларусі пасылаюць працаваць дырэктарам Лепельскай МТС, што на Віцебшчыне.

— Я памятаю бацьку заўсёды працалюбівым, — успамінае Марыя Фёдараўна — дачка Кушчанкі, цяпер — пенсіянерка. — Увесь час ён аддаваўрабоце, дома бываў вельмі рэдка. А калі і забягаў, то стараўся аказаць дапамогу маціў хатняй гаспадарцы, прыцягваючы да яе і мяне з братам Васілём. Выхоўваў нас бацька з перакананнем і ніколі не прыбягаў да фізічнага пакарання. Таму мы яго любіліі моцна паважалі. Памятаю, заехаў аднойчы да хаты пераапрануцца па шляху з Арлоўкі, дзе працавала яго брыгада, як амаль услед за іму кватэру ўвайшоў механік Садоўскі.

— Дапамажыце нам, Фёдар Лявонавіч, — заглох трактар на палях суседняга калгаса «Чырвоны серп», і мы яго ніяк не завядзём...

— Што ж, час гарачы і дарагі, пойдзем, паглядзім, у чым яго капрызы, — ужо зачыняючы дзверы хаты, гаварыў бацька. І праз якіх поўгадзіны трактар запрацаваў.

Добра памятаю, як да яго вельмі часта заходзілі выбаршчыкі, дасылалі пісьмы. Ён заўсёды ўмеў уважліва выслухоўваць наведвальнікаў, даваць парады, як лепш вырашыць тое ціншае пытанне. Асабліва чула адносіўся бацька да патрэб людзей, трапіўшых у бяду.

1933 год быў неўраджайным. І тады бацька сабраў усё зерне ў доме, змалоў на млыне і раздзяліў муку па сем'ях, у якіх было многа дзяцей.

...У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны Ф.Л. Кушчанка арганізуе эвакуацыю машынна-трактарнага парку даверанай яму МТС. Перагружаныя эшалоны павольна ішліна ўсход. Фашысцкія самалёты неаднаразова падвяргаліх абстрэлу і бамбёжцы. У раёне Ярцава ў час бамбёжкі загінуў і наш першы дэпутат.

З той пары прайшло шмат год, але добрыя людзі абавязкова пакідаюць пасля сябе след. У памяці механізатараў Хоцімшчыны іўсіх, хто ведаў Ф.Л. Кушчанку, ён жыве, як сапраўдны віцязь «сталёвага каня», самаадданы барацьбіт за сялянскую справу.

**Ласоўскі, М.** Першы дэпутат з Хоцімшчыны / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1990. – 19 ліпеня. - С. 1-3.

# Першы пісьменнік Хоцімшчыны

У 1996 годзе на Беларусі распачата выданне ўнікальнай двухсоттомнай кніжнай серыі - "Беларускі кнігазбор". У гэтую залатую бібліятэку ўвойдзе ўсё самае лепшае, самае важнае, што створана на роднай зямлі ад старажытнасці да нашых дзён. У ліку аўтараў будуць не толькі айчынныя, але і рускія, польскія пісьменнікі, лёс якіх так ці іначай звязаны з Беларуссю, і якія цікава расказалі ў свой час пра зямлю нашых продкаў. У тамах кнігазбору раскрыецца ўся шматвяковая гісторыя шматпакутнай Радзімы. Плануецца таксама выдаць кнігі беларускай тэматыкі рускіх пісьменнікаў, сярод якіх значыцца прозвішча і першага пісьменніка Хоцімшчыны Якуба Брайцава.

Напярэдадні 50-годдзя Савецкай улады на Клімаўшчыне шырока актывізавалася ў бібліятэках і школах краязнаўства. На ўсю моц далучылася да гэтай справы і наша Трасцінская сельская бібліятэка (Трасціно ўваходзіць тады ў склад Клімавіцкага раёна). І вось пры вывучэнні дакументаў па гісторыі роднага краю: "Эканоміка і становішча працоўных у пачатку хх стагоддзя", што захоўваюцца ў нацыянальным гістарычным архіве Расіі ў Пецярбургу (р. 1412, воп. 242,1904, с-п. 1201, л. 1-2). Я звярнуў увагу на прашэнне сялян вёскі Запруддзе (зараз тэрыторыя калгаса "Авангард") цару Мікалаю II. Датавана прашэнне 25 жніўня 1904 года. У ім смела, з болем у сэрцы рассказана аб цяжкім сялянскім жыцці і ўтрымліваецца просьба аб канфіскацыі з уладанняў памешчыцы Какашынскай належачага сялянам па выкупных актах участка зямлі “мераю 7 дзесяцін 560 кв., саж., які ляжыць упоперак сялянскага поля за сядзібамі і служыць... як бы мастом паміж памешчыцкімі і сялянскімі ўладаннямі і, каб папасц*і* на палявую надзельную зямлю, мы павінны праходзіць, праязджаць і праганяць жывёлу праз гэту памешчыцкую зямлю, што прыводзіць заўсёды да непаразуменняў паміж памешчыцай і сялянамі, так як памешчыца і асабліва яе арэндатар Круглікаў, дзевяць год арэндуючы гэты маёнтак, забіраюць жывёлу пры перагоне праз гэты куток і абкладаюць нас, сялян, непасільным выкупам". Прашэнне заканчвалася: "Я, ніжэй падпісаўшыйся, з слоў прасіцеляў пісаў і перапісваў селянін Якаў Раманаў Брайцаў, а потым рукі прыклалі сяляне Кірыл Філімонаў, Павел Юрэеў, Прэснакоў і Шкрэдаў."

Так я упершыню сустрэўся з упамінаннем імя Якуба Брайцава. І хоць гэтае прашэнне было адхілена, але дакумент захаваў смеласць аўтара-першага пісьменніка нашага краю ў барацьбе супраць несправядлівасці.

Больш бліжэй і падрабязней я пазнаёміўся з Брайцавым, вярней з яго літаратурнай спадчынай, праз Івана Іванавіча Кісялёва – былога настаўніка-краязнаўцу Забялышынскай сярэдняй школы. У дзень адмены прыгоннага права у Расіі 19 лютага 1861 года у сям'і прыгонных Рамана Рыгоравіча *і* яго жонкі Аўдоцці Фамінічны Брайцавых у вёсцы Забялышын нарадзіўся першынец, якога назвалі Якубам (Якавам). Першапачатковую адукацыюназіральны хлопчык атрымаў у роднай вёсцы, а потым закончыў павятовае вучылішча ў Клімавічах. Вучыўся выдатна, любіў рускую літаратуру. Калі чатырнаццацігадовым хлопчыкам пачуў мастацкае чытанне твораў Лермантава, то ад хвалявання не змог заснуць цэлую ноч. Падлеткам Брайцаў гарэў жаданнем выйсці ў людзі. Некаторы час пасля вучобы ён працаваў памочнікам пісараваласнога ўпраўлення ў Забялышыне. Васемнаццацігадовым хлопцам Брайцаў едзе на заробкі на цукровыя заводы, дзе працуе канторшчыкам. У дваццацігадовым узросце у пошуках шчасця пераязджае ў Маскву і ўладкоўваецца там бухгалтарам у канторы купца-кветкавода. Адначасова ён вывучае русскую мастацкую літаратуру у Румянцаўскай бібліятэцы.

У 1884 годзе напісаў сваё першае апавяданне "Дудалева лаза", якое было надрукавана ў часопісе "Беларусь" (№9) у 1966 годзе. Яно прысвечана падзеям у

роднай вёсцы пры прыгоне і пасля. Даволі прыгожы пачатак апавядання звязаны з гісторыяй вёскі.

"Наша беларуская вёска гадоў шэсцьдзесят таму назад была маленькай, усяго васемнаццаць двароў, і поле было невялікае: сядзібы з канаплянікамі і гародамі, ды, бадай, столькі ж пашы.

А далей уздымаліся лясы, старажытныя, дрымучыя, перарэзаныя ў розных напрамках нізінамі і балотамі, зрэдку на якіх пападаліся лугі *і* лужкі, расчышчаныя сялянамі як каму ўздумалася. Зямлі было многа, за ёю ніхто не гнаўся, бо, вядома ж, была яна благая – балоты ды неўрадлівыя пяскі. Сяляне жылі бедна, і не дзіва: якая зямля - такое і жыццё..."

Піша "Багацеі" - аповесць з беларускага простанароднага жыцця, якая выйшла з друку ў 1889 годзе (надрукавана ў друкарні Кушнерава аб'ёмам у 103 старонкі). У аповесці аўтар паказаў жыццё сялянства ў паслярэформеннай вёсцы на Хоцімшчыне. Акадэмік Е.Ф. Карскі у 3-ім выданні III тома ў сваёй рабоце-манаграме "Беларусь" (1922 г.) адзначыў гэты твор як таленавітую аповесць. З вялікай прагнасцю і цікавасцю чытаў і я гэту аповесць у Фундаментальнай бібліятэцы Акадэміі навук БССР імя Якуба Коласа, перададзенай прафесарам, вядомым беларускім культурнікам Браніславам Эпімах-Шыпіла. Па маёй просьбе зрабілі для мяне ксеракопію гэтай кнігі. А вядомы беларускі паэт Станіслаў Шушкевіч падарыў мне фота чалавека-земляка, што пражыў багатае і вялікае жыццё і ў свае літаратурныя творы ўклаў душу і шчодрае сэрца, поўныя любові да роднага народа і роднай Хоцімшчыны, Якуба Раманавіча Брайцава, якое і друкуецца ў газеце.

Адначасова Брайцаў піша рад аповесцей, сярод якіх "Няўдашачка Анюта" (1887 г.), "Старая веска" і іншыя, у якіх паказана жыццё і вобразы роднай вёскі і павятовага горада Клімавічы ў 1870-х гадах. Паказваючы цемнату, забітасць народа, пісьменнік вялікую надзею ўскладваў на будучае. Як бы дэвізам, аптымістычна, радасна, з вялікай надзеяй гучаць апошнія радкі аповесці "Няўдашачка Анюта": "Усё - за жыццё і нічога - супраць".

Па сваёй натуры Я.Р.Брайцаў быў шукаючым чалавекам і дзейнасць бухгалтара яго не задавальняла. Ён пазнаёміўся з рускімі пісьменнікамі, часта наведваў Льва Талстога, які зрабіў пэўны ўплыў на фарміраванне яго філасофскага светапогляду ў сэнсе крытыкі існуючага правапарадку. У выніку гэтага знаёмства з'явілася апавяданне "Юда" (1899), якое аўтар назваў псіхалагічным эцюдам, у якім мы знаходзім крытыку таго ладу, фтасофскія разважанні аб сучаснасці. У канцы 19 стагоддзя Я. Брайцаў хацеў выдаць зборнік апавяданняў за свой кошт, але няўдача ў гандлёвай справе скасавала усё - зборнік, які ўжо быў набраны, так і не ўбачыў свету.

У 1901 годзе пісьменік вярнуўся на радзіму, займаўся сельскай гаспадаркай, юрыдычнай практыкай у абароне інтарэсаў сялян. З часам ён сапраўды набыў славу адвакага па сялянскіх справах. У яго выяўляецца аратарскі талент і здольнасць да вядзення заблытаных спраў. Якуб Брайцаў быў бясплатным і безадказным хадатаем за абяздоленую беднату. Больш папулярнага чалавека не было ва ўсім Клімавіцкім павеце, пагэтаму сяляне давяралі яму ўсе цягаты і гора, сведкам якіх і з'яўляецца прашэнне сялян вёскі Запруддзе Мікалаю II.

У перыяд рэвалюцыйных падзей 1905 года Якуб Раманавіч быў падвержаны вобыскам, у яго была знойдзена нелегальная літаратура. Ён Знаходзіўся пад наглядам паліцыі. У той жа час ім была напісана камедыя "Бяда цыгана", у якой рассказана аб людзях у глухой мясцовасці Беларусі.

У 1913-1916 г.г. Брайцаў напісаў вялікі раман "Сярод балот і лясоў", у якім апісваецца жыццё вёсак і мястэчак: Забялышына, Родні, Старой Буды, Хоцімска, Клімавіч у перыяд першай рускай рэвалюцыі і дзейнасці вядомага экспрапрыятара

Савіцкага. Раман поўнасцю пасля смерці пісьменніка не захаваўся, на вялікі жаль, засталіся толькі фрагменты.

Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 года Брайцаў працуе спачатку сакратаром Забялышынскага валаснога выканкома. Пасля кастрычніка 1917 года працуе ў Клімавіцкім павятовым выканкоме ў калегіі аддзела сацзабяспячэння, у зямельным аддзеле. У наступныя гады ў сувязі з пагаршэннем стану здароўя працуе ў Забялышынскім сельскім Савеце, а потым выкладае курс земляробства ў школе сялянскай моладзі. Дарэчы, у той час ён напісаў аповесць “Гаспадар", зноў займаецца літаратурнай дзейнасцю.

Якуб Раманавіч Брайцаў быў прынят у члены Усерасійскага саюза сялянскіх пісьменнікаў, пасылае і друкуе вершы і нарысы ў “Крестьянской газете" (Масква). Спрабуе пісаць паэму "Дудка” дзе аўтар выказвае радасць з выпадку ўстанаўлення Савецкай улады ўБеларусі.

Пісьменнік памёр у Забялышынскай бальніцы 2 сакавіка 1931 года ад запалення лёгкіх. Пахаваны на мясцовым могільніку сярод сваіх аднавяскоўцаў, вобразы якіх ён так любоўна паказваў у сваіх творах.

Імя пісьменніка занесена ў кнігу гонару раёна, а ў гарадскім пасёлку Хоцімск вуліца названа «імем братоў Брайцавых - Якуба, Івана і Васіля. Рукапісы твораў пісьменніка захоўваюцца ў Нацыянальным архіве літаратуры і мастацтва ў Мінску. Аб выхадзе з друку ў кніжнай серыі "Беларускі кнігазбор" твораў пісьменніка і іх набыцці можна даведацца па адрасу: 220034, г. Мінск, вул. Фрунзе,5, пакой 209, рэдакцыя "Беларускага кнігазбору".

**Ласоўскі, М.** Першы пісьменнік Хоцімшчыны / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 2001. – 28 красавіка. – С. 6.

# Першы старшыня

Свята — заўсёды свята. Яркай падзеяй у жыцці кожнага з нас былі юбілейныя ўрачыстасці ў дні 70-годдзя Вялікага Кастрычніка. І сярод іх знамянальны ўрачысты рытуал — мінутай маўчання ўшанавала Краіна Саветаў памяць герояў, якія аддалі жыццё за перамогу вялікай справы Кастрычніка, якім абавязаны кожны з нас сваім сённяшнім жыццём і дабрабытам. Схілены былі нашы сцягі, нізка схіліліся і нашы галовы перад памяццю тых, хто не пашкадаваў і сваіх сіл у рабоце, падобнай на бой, перад усімі, чыё сэрца разарвала куля або работа.

І пад жалобную мелодыю, якая гучала па цэнтральнаму тэлебачанню і Усесаюзнаму радыё, мне на ўспамін прыйшло прозвішча чалавека, які актыўна змагаўся за ўстанаўленне і ўмацаванне ўлады Саветаў у нашым краі. Безумоўна асабіста я яго не ведаў, але памяць аб ім такая ж дарагая мне, як памяць аб сваіх бацьках, блізкіх таварышах.

Сацыялістычная рэвалюцыя, пачатая гераічным пралетарыятам Петраграда пад кіраўніцтвам Уладзіміра Ільіча Леніна, абудзіла ўсю краіну. Але ж на Магілёўшчыне Савецкая ўлада была ўстаноўлена крыху пазней, чым у другіх гарадах Беларусі, таму што ў Магілёве знаходзілася стаўка Вярхоўнага галоўнага камандавання старой царскай арміі, вакол якой сканцэнтраваліся буйныя контррэвалюцыйныя сілы.

У Магілёў з Петраграда прыбылі рэвалюцыйныя матросы Балтыйскага Флоту і чырвонагвардзейцы на чале з новым Вярхоўным галоўнакамандуючым Крылевкам. У разгроме стаўкі ўдзельнічалі салдаты Заходняга фронту і жыхары Магілёва. 20 лістапада стаўка была разгромлена.

Бальшавікі арганізавалі Магілёўскі Ваенна-рэвалюцыйны камітэт, які аб'явіў сябе вышэйшай уладай на Магілёўшчыне, і разгарнулі вялікую работу па ўмацаванню Савецкай улады.

У цэнтральным дзяржаўным архіве Кастрычніцкай рэвалюцыі СССР захоўваецца тэлеграмма выканкома Магілёўскага Савета аб арганізацыі Саветаў у губерні ад 22 студзеня 1918 года, дзе гаворыцца: «Саветы маюцца ў павятовых гарадах: Клімавічы і г.д. Акрамя таго, мястэчкавы Касцюковіцкі — Касцюковічы Клімавіцкага павета». І адразу ж у газеце «Известия Могилевского Совета» ад 23 студзеня паведамлялася, што ў Клімавічах «...самачынна арганізаваўшыйся Савет народных дэпутатаў, які састаіць з былых паліцэйскіх і іншых контррэвалюцыйных сіл. Савет гэты не жадае прызнаць Саўдэпа, сее варожасць у насельніцтва і вядзе цёмную агітацыю...».

Губернскі выканаўчы камітэт накіраваў у Клімавічы члена губвыканкома Вераб'ева з атрадам чырвонай гвардыі, даручыўшы яму прыняць самыя рашучыя меры ў адносінах да віноўных. Прыбыўшы атрад чырвонагвардзейцаў забяспечыў рэвалюцыйны парадак у Клімавічах і павеце.

У гэты ж час з паўнамоцтва для ўстанаўлення Савецкай улады ў Клімавічы прыехалі пасланцы партыі бальшавікоў Мітрафан Сямёнавіч Ганчароў і Стратонік Ільіч Жбанкоў.

С.І. Жбанкоў — ураджэнец в. Канічы Касцюковіцкага раёна. На рэвалюцыйны шлях балтыйскі матрос стаў у 1914 годзе пасля арыту бальшавіцкай фракцыі IV Дзяржаўнай думы царскім урадам. У перыяд лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1917 года Жбанкоў у ліку нямногіх матросаў прымаў удзел у ліквідацыі ў горадзе Рэвеле органаў улады старога царскага рэжыму. Тады ж маракі-балтыйцы выбралі яго старшынёй флоцкага камітэта ў сваім дывізіёне. На долю Жбанкова і камітэта партыя бальшавікоў усклала адказную задачу: ва ўмовах рэжыму Часовага ўрада пакончыць са старымі парадкамі на флоце, абмежаваць уладу старога кадравага

афіцэрства і распаўсюдзіць бальшавіцкі ўплыў на матроскую масу, большасць якой ішло ў той час за партыяй эсэраў. Трэба было ўмацаваць сярод маракоў рэвалюцыйную дысцыпліну і падрыхтаваць іх да рашаючых бітваў за ўладу Саветаў.

На працягу снежня 1917 года С. І. Жбанкоў займаўся арганізацыяй Савецкай улады ў Касцюковіцкай, Бярозкаўскай і Бялынкавіцкай валасцях. Апорай яму служылі салдаты, якія вярталіся з фронта і ў большасці выпадкаў узначальвалі Саветы ў валасцях і сёлах.

У студзені 1918 года створаны ім Касцюковіцкі рэйком склікаў валасны з'езд сялянскіх дэпутатаў, які выбраў Жбанкова на Магілёўскі губернскі з'езд Саветаў (студзень 1018 г.). Адтуль С. І. Жбанкоў у ліку іншых дэлегатаў трапляе на ІІІ Усерасійскі з'езд Саветаў. Тут ён прайшоў вялікую школу палітычнай асветы. Чатыры разы яму давялося слухаць жывое слова У. І. Леніна і ў тым ліку гутарку, якую правёў Уладзімір Ільіч асобна з беларусамі па просьбе магілёўскай дэлегацыі. З сабою ён вёз брашуру з Законам аб нацыяналізацыі зямлі і «Дэкларацыю правоў працоўнага і эксплуатуемага народа».

Вось з гэтым багажом і прыбыў Жбанкоў у Клімавічы. Але тут давялося сутыкнуцца з польскімі легіянерамі з корпуса Доўбар-Мусніцкага. Легіянеры радавалі сялян, забіралі маёмасць, жывёлу, праследавалі бальшавікоў, разганялі Саветы. С. І. Жбанкоў выпадкова пазбег расправы. Выратавала яго сям'я бальшавіка Індэнбаума.

Як толькі легіянеры пакінулі горад, ён рашыў дзейнічаць адносна ўлады аднаасобна, 8 лютага вечарам надрукаваў у друкарні наступны дакумент: «Загад. Я, Жбанкоў, ураджэнец в. Канічы, дэлегат ІІІ Усерасійскага з'езда Саветаў, бяру на сябе ўладу ва ўсім павеце аж да склікання павятовага з'езда Саветаў. З'езд будзе склікан у бліжэйшы час».

Загад расклеіў у горадзе і пачаў дзейнічаць хутка і рашуча. Позна вечарам адправіўся ў бліжэйшае ад Клімавіч мястэчка Родню, звязаўся там па прамому праваду з атрадам чырвонай гвардыі, які стаяў ва Унечы (там тады быў М. В. Шчорс) і папрасіў зброю. Тая была абяцана. Атрымаўшы яе, ён адчуў сябе смялей. Стварыў атрад з дзевяці чалавек. Занялі адзін з дамоў у Клімавічах, устанавілі кулямёты, арганізавалі кругласутачнае дзяжурства. Загад набыў рэальную сілу.

Стратонік Ільіч заняўся скліканнем павятовага з'езда Саветаў для ўтварэння павятовай Савецкай улады. Быў утворан Клімавіцкі рэйком, старшынёй якога абралі С.І.Жбанкова. Рэйком, не чакаючы з'езда, прыступіў да ліквідацыі ўсіх рэшткаў улады царызму і Часовага ўрада.

Члены рэйкома і атрад чырвонай гвардыі не мелі ніякіх сродкаў на існаванне. Жылі і працавалі, як яны самі гаварылі, «бясплатна». Але ўсіх іх аб'ядноўвала ідэя — рэвалюцыя да пераможнага канца. Ей і аддавалі сябе цалкам.

Павятовы з'езд Саветаў адбыўся 25 лютага 1918 года. Амаль усе 70 дэлегатаў былі беспартыйнымі, у асноўным былі салдаты-франтавікі. С. І. Жбанкоў падрабязна паведаміў аб рашэннях ІІІ Усерасійскага з'езда Саветаў, расказаў аб прамовах У. І. Леніна, растлумачыў, чаму спачатку аднаасобна ўзяў на сябе ўладу ў павеце.

З'езд тэлеграфаваў Савету Народных Камісараў у Петраград і губвыканкому ў Магілёў, што з'яўляецца паўнамоцнай уладай у павеце, падтрымлівае палітыку народных камісараў.

Ад Забялышынскай воласці прадстаўнікамі з'яўляліся Лугаўцоў і Ляскоўскі. Ад Бярозкаўскай і Хоцімскай валасці дэлегатаў не было, але ім былі пакінуты месцы.

З'езд рашыў падпарадкаваць Саветам харчовыя, зямельныя праўленні і ўпраўленне вайсковай павінтасці. Былі арганізаваны аддзелы: народнай адукацыі, ваенны, сацзабеспячэння (загадчыкам назначаны Ляскоўскі з Забялышынскага Прудка), пошты і тэлеграфа (загадчык — Шарабурын з в. Трасціно), аховы здароўя,

зямельны, ўнутраных спраў (загадчык - Сурта з в. Бяседавічы). Быў абран выканком павятовага Савета ў саставе 33 чалавек на чале са старшынёй С. І. Жбанковым.

На з'ездзе абмяркоўвалася пытанне аб фарміраванні Чырвонай Арміі, дзе вызначылі яе стварыць на дабраахвотных пачатках. На першы час намячалася стварыць атрад у колькасці 4200 чалавек. Далей устанаўлівалася, што ў Чырвоную Армію могуць быць залічан толькі асобы, якія стаяць на платформе прызнання Савецкай улады і нічым не зганьбаваныя.

Пасля з'езда зноў створан павятовы камітэт і дэлегаты неадкладна прыступілі да арганізацыі валасных і сельскіх Саветаў. Як правіла, у Саветы ўваходзілі прадстаўнікі беднаты, былыя франтавікі, якія энтузіязмам прыступілі да работы.

У сярэдзіне красавіка 1918 года сходам бальшавікоў было створана арганізацыйнае бюро трох чалавек: С. Жбанко, Г. Індэнбаум і П. Іваноў. Неўзабаве пачалі ўзнікаць партыйныя ячэйкі ў валасцях пры валвыканкомах. Афармленне прыёму ў партыю мясцовых работнікаў ажыццяўляла арганізацыйнае бюро. Была таксама аформлена фракцыя бальшавікоў павятовым выканкоме, якая ўносіла яснасць у палітычную лінію Клімавіцкага Савета 1 чэрвеня 1918 года ў Смаленску адбылася абласная канферэнцыя бальшавікоў. На ёй дэлегатамі ад Клімавіцкага павета былі Г. Індэнбаум і С. Жбанкоў.

Наўзабаве быў склікан другі павятовы з'езд Саветаў. Фракцыя бальшавікоў на 1м налічвала 57 чалавек са 108 дэлегатаў.

У лістападзе 1918 г. С. І. Жбанкова накіроўваюць на партыйна-савецкую работу.

Зараз яго няма ў жывых, але добрая справа, асабліва ўклад у стварэнне і ўмацаванне Савецкай улады ў нашым краі, абавязвае нас помніць яго імя стагоддзямі.

**Ласоўскі, М.** Першы старшыня / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1987. – 12 снежня. – С. 2.

Староверов понял, что никогда не исполнит Луковенко его просьбу.

–Та-а-ак... тогда слушайте боевой приказ, капитан Луковенко. Отходите с бойцом Шаурой через овраг к лесу. Я буду прикрывать ваш отход.

–Товарищ начальник штаба! Дмитрий Дмитриевич! - взмолился Луковенко.

–Приказ есть приказ. Я не привык повторять его дважды, - жёстко сказал Староверов. - Не теряйте времени даром. Силы у меня на исходе...

–Ты ранен, Митя?

–Дважды!.. Выполняйте приказ, капитан.

Луковенко знал, что спорить со Староверовым бесполезно. Волоча за собой бесчувственного Шауру, он пополз к лесу. Староверов в это время яростно стрелял в гитлеровцев. Луковенко с Шаурой доползли до леса и скрылись в овраге.

Каратели обстреливали погреб без передышки. Падали гитлеровцы, подползавшие со всех сторон. Но вслед за ними поднимались новые. Староверов едва успевал отстреливаться. Дмитрий Дмитриевич выглянул из укрытия. Попытался приложить винтовку к плечу и не смог, окончательно ослабел, в глазах двоилось... Тогда он взял пистолет. Последняя пуля!

Последнюю пулю Дмитрий Староверов сохранил для себя.

Вскоре в Батаево появились Медведевцы. Они нашли раздетого, изуродованного фашистами Староверова. Похоронили в лесу под высокими соснами. Положили на могилу зелёные венки из ели. Из трофейного, захваченного у штаба 576-го саперного батальона противника, знамени нарезали красные ленты. Перевязали ими венки. Салютовал погибшему бойцу и другу весь партизанский отряд. На берёзе у могилы Староверова написали: "Здесь похоронен начальник штаба партизанского отряда Дмитрий Дмитриевич Староверов, геройски погибший за Родину у деревни Батаево 11 октября 1941 года".

Командир объявил, что винтовка Староверова будет передана лучшему бойцу и получить её - большая честь не только для партизана, но и для всего отделения или группы.

"… Ах, Митя, Митя! Дорогой товарищ наш боевой! Как же так с тобой получилось! Сколько было у тебя надежд и планов, да помешала их выполнить проклятая война. Мы никогда тебя не забудем, мы отомстим врагам за тебя. Прощай, дорогой наш герой!" - записал в своём дневнике комиссар Кулаков.

За геройский подвиг Староверов посмертно награждён орденом Ленина. Староверов был любимцем отряда, всегда весёлый, добрый, общительный, был в то же время непреклонен, суров и требователен к себе и другим. Отец Дмитрия работал кассиром на железной дороге в Сибири – он всё умел делать своими руками и приучал к этому детей. Поэтому всё умел делать и сын, не боялся ни работы, ни трудностей. Дима увлекался плаваньем, лыжами, коньками, стрельбой. В стрельбе из мелкокалиберной винтовки на соревнованиях в городе Кемерово занял первое место. Позже успешно занимался боксом. Староверов окончил геологоразведочный институт и работал в полярной экспедиции на Чукотке. Добровольно ушёл в Красную Армию и попал в отряд Медведева, в котором справедливо считался лучшим стрелком отряда.

**Ласовский, М.** По следам отряда особого назначения / М. Ласовский // Шлях Кастрычніка. – 2002. – 12 чэрвеня. – С. 2.

# Пясняр зямлі Хоцімскай

## (да 70-годдзя Пятра Прыходзькі)

«У вольны час іду ў кнігарню», каб быць разам з любай кніжкай, якая «адкрывае свету шыр» і «воч не адвесці ад якой». Гэтыя цудоўныя радкі з верша «Кніга» народнага паэта БССР Петруся Броўкі заўсёды чародкай прабягаюць у маіх думках, калі наведваючы сталічны град Хоцімскай зямлі я крочу нібы заварожаны, здаецца ў рай — у кніжны магазін. З вялікім задавальненнем і радасцю я знаёмлюся з навінкамі літаратуры, расстаўленымі на паліцах, і назіраю, як адначасова са мною працаўнікі-хацімчане таксама ў кнігах гартаюць увесь неабдымны свет духоўных багаццяў чалавецтва. Гэта ж у кнізе жыве слова Скарыны і зліваюцца разам думка і слова, навука і мастацтва, духоўнае жыццё асобнага чалавека і ўсяго грамадства.

Адразу інтуітыўна заўважаю і бяру ў рукі кнігу паэта-земляка Пятра Прыходзькі «Водгулле грому», і сэрца замірае ад радасці новай сустрэчы з аўтарам.

У новай, дваццаць шостай па ліку, кнізе паэзіі аўтар зноў звяртаецца на пройдзеныя франтавыя дарогі, піша пра тоё, якой нялёгкай цаной дасталася нам перамога.

— Тэма гераізму, неўміручага подзвігу савецкага народа так ці інакш праходзіць праз усю маю творчасць,— прызнаецца чытачам-паклоннікам паэт. — Паэты франтавога пакалення, якія загінулі, Змітрок Астапенка, Аляксей Коршак, Мікола Сурначоў, Андрэй Ушакоў, і тыя, хто засталіся жывымі і прыйшлі ў паэзію з акопаў, — Аляксей Пысін, Кастусь Кірэенка — не маглі не пісаць пра вайну. Занадта ж глыбока і сурова апякла яна нашы юначыя сэрцы, нялітасціва парубцавала маладыя целы, рана пасерабрыла галовы.

— Я не выпадкова адзін са сваіх зборнікаў вершаў і паэм назваў «Парог Памяці», які адзначаны літаратурнай прэміяй імя Аркадзя Куляшова ў 1985 годзе,— прадаўжае шчыра сваё прызнанне зямляк. — Сёння памяць пра Вялікую Айчынную, якая забрала толькі ў нас больш 20 мільёнаў чалавечых жыццяў, як папярэджанне супраць новай, ядзернай вайны. Мой абавязак, мая памяць працягваюць расказ пра грозныя 40-ыя, пра франтавое брацтва, горыч страт, радасць перамог.

Нарадзіўся Пятро Фёдаравіч Прыходзька 25 лютага 1920 года ў сялянскай сям'і. Будучы паэт рана застаўся сіратой, выхоўваўся ў дзеда Яфіма Іванавіча Пруднікава, які гадаваў яго з маленства.

«Мой родны кут — веска Альшоў непадалёк ад Хоцімска, дзе рэчка "Бесядзь нясе свае ціхія воды паміж шырокіх зяленых лугоў і шумлівых бароў,— піша ён у сваёй аўтабіяграфіі. — Хоцімшчына і Касцюкоўшчына для мяне — самы блізкі і родны кут, куды я прыязджаю кожны год, летам ці вясной, і адчуваю ўсёй душой пах роднай зямлі, шчодрасць і ласку чалавечых сэрцаў, сардэчнасць сваіх землякоў».

Скончыўшы Вялікаліпаўскую сярэднюю школу, працаваў кіраўніком спраў Хоцімскага райкома камсамола. Пасля заканчэння Магілёўскай партыйнай школы працаваў адказным сакратаром раённай газеты «Калгасная звязда».

У 1939 годзе паступае ў Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. М. Кірава ў Мінску.

У дваццаць гадоў давялося пакінуць шумлівыя студэнцкія аўдыторыі. Шэры салдацкі шынель лёг на плечы. Недачытаны засталіся канспекты, на сярэдзіне падручнікаў маўкліва сцішыліся закладкі.

Закончыўшы Сталінградскае ваенна-палітычнае вучылішча, у пачатку Вялікай Айчыннай вайны быў палітруком батальённай роты сувязі, затым адказным сакратаром

дывізійнай газеты «Призыв Родины», удзельнічаў у баях на Бранскім фронце, на Курскай дузе, у вызваленні Беларусі, Польшчы, у баях за Берлін, за вызволение Прагі.

Мой аднавясковец інвалід Вялікай Айчыннай вайны першай групы, кавалер ордэнаў Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны першай ступені Адам Маркелавіч Макаранка часта ўспамінае, што ў кастрычніку 1943 года паўднёвей Лоева іх 81-я стралковая дывізія першай фарсіравала Днепр, і байцы з радасцю ступілі на зямлю Беларусі. У той час і завітаў да іх, сапёраў, супрацоўнік дывізійнай газеты «Призыв Родины» Пятро Прыходзька з газетай «Савецкая Беларусь», са старонак якой на роднай мове ён прачытаў верш П. Панчанкі «Байцу, які першы ступіў на беларускую зямлю». А пасля чытаў свае вершы, прысвечаныя радаснай падзеі — вызваленню роднай Беларусі. Байцы слухалі яго з павагаю, бо ведалі палітрука як мужнага воіна, які разам з камбатам Меньшуном на правым березе Дняпра адбівалі са станкавага кулямёта кантратакі немцаў. За подзвігі пры вызваленні Дняпра 26 мужным і адважным воінам іх дывізіі прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза. Лёс у іх быў розны — адным удалося прайсці вайну да канца, іншыя засталіся ляжаць там, на пераправах альбо на высокіх кручах, абняўшыся навек з роднай зямлёй. Па гарачых слядах подзвігаў герояў Пятро Прыходзька напісаў верш «Ля Дняпроўскіх круч».

Восенню 1944 года 81-я дывізія адна з першых фарсіравала Віслу ў раёне горада Сандаміра і заняла плацдарм. Баі былі вельмі цяжкія. Каб утрымаць плацдарм, неабходна было авалодаць грэбнем вышыні, дзе ўмацаваліся фашысты. Сабралі ўсіх камуністаў і камсамольцаў, якія знаходзіліся ў медсанбаце, аўтароце, хлебапекарні, сапёрнай роце, аддзеле забеспячэння, рэдакцыі дывізійнай газеты і іншых тылавых падраздзяленнях. Пад ураганным агнём пераправіліся на левы бераг і разам з байцамі пярэдняга краю — пехацінцамі пайшлі ў атаку і сандамірскія вышыні былі ўзяты. Сярод ланцуга атакуючых былі і яны — камуністы — воіны з Хоцімшчыны Макаранка і Прыходзька.

У вершы «Мне не забыць акоп на полі бою» паэт амаль дакументаль напіша:

*Не раз і сам хадзіў я разам з імі*
*На самыя крутыя з пераправ.*
*Я смерць штыком і словамі сваімі*
*Ад чалавечых сэрцаў адбіваў...*
*Таму нясу я праўду святую*
*У людскія сэрцы,*
*У кожны кут і дом.*
*У полк паэзіі,*
*Дзе ўласны голас чую,*
*Іду служыць заўжды*
*палітбайцом.*

Пасля вайны Пятро Фёдаравіч служыў у групе савецкіх войск у Германіі карэспандэнтам рэдакцыі ваеннай газеты «Советская Армия».

Пасля вяртання на Радзіму доўгі час працаваў карэспандэнтам газеты Беларускай ваеннай акругі «Во славу Родины».

У 1956 годзе скончыў літаратурныя курсы ў Маскве. Працаваў у рэдакцыях часопіса «Беларусь», газет «Звязда», «Літаратура і мастацтва», на мінскай студыі дакументальных фільмаў, у выдавецтвах “Беларусь”, “Мастацкая літаратура”.

Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай зоркі, Айчыннай вайны I і II ступені і медалямі.

Першыя вершы паэта былі надрукаваны ў 1936 годзе на старонках нашай раённай газеты «Калгасная Звязда», затым у газетах «Камунар Магілёўшчыны», «Чырвонай змене», «Літаратура і мастацтва».

У 1947 годзе выйшла ў свет першая кніга паэта «Голас сэрца». Затым былі выдадзены зборнікі вершаў і паэм «Салдаты міру» (1951), «Ранак над Эльбай» (1952), «Пасля развітання» (1958), «Цёплы каравай» (1960), «Вішнёвы агонь»(1963), «Сонца раней узышло» (№?.), «Калінавыя зоры (1969), «Прызнанне». Выбранае (1970), «Не здадзеныя вышыні» (1972), «На пераправе» (1974), «Лірыка» (1975), «Плацдарм» (1978), «Лісты з паходаў». Выбранае (1980), «Вячэрняя паверка» (1982), «Парог памяці (1983), «Апаленыя версты» (1986), «Водгулле грому» (1989) і кнігі нарысаў «На новых землях» (1954, разам з П. Багаценкавым).

Паэзіі Прыходзькі ўласціва публіцыстычная страснасць, шчырасць пачуццяў, непасрэднасць выказвання.

На кнігах, што ёсць у Трасцінскай бібліятэцы, аўтографы паэта, напісаныя з прыемнай пяшчотай:

*«Дарагі чытач! Мой зямляк! У гэтай кнізе ты сустрэнеш многія вершы, мясціны ў паэме, якія адразу нагадаюць табе нашу родную Хоцімшчыну — вёскі Альшоў, Ліпаўку, само мястэчка Хоцімск. Тут прайшло маё маленства, аб якім складзена гэта кніга. А тое, што пражыта ў маленстве, застаецца ў памяці чалавека на ўсё жыццё. Не дрэнна сказаў хтосьці, што «паэт з дзяцінства бачыць на ўвесь свой век». Даруй, дарагі чытач, калі што не так. Але ўсё гэта напісана шчыра, ад душы. З павагай і найлепшымі пажаданнямі. Пятро Прыходзька».*

Таленавітыя і самабытныя вершы, з цеплынёй напісаныя аўтографы наскрозь пранізаны хоцімскім духам, пахам роднай хоцімскай зямлі.

Трапяткім хваляваннем ускалыхваюць душу, абуджаюць успаміны радкі яго вершаў. Яны нібы дыхаюць водарам сунічных палян і пералескаў, звіняць ляснымі крыніцамі, напоўнены салаўіным спевам. З асалодай чытаеш вершы і як бы зноў бачыш і чуеш ручайкі, без якіх цяжка ўявіць вялікія рэкі, пазнаеш жыццё маленькіх беларускіх вёсачак, без якіх немажліва наша вялікая Радзіма, чуеш дарагую сэрцу гамонку майстра шчырага трапнага слова, без якой мова беларускага народа стала б бядней.

**Ласоўскі, М.** Пясняр зямлі Хоцімскай : [да 70-годдзя Пятра Прыходзькі] / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1990. – 24 лютага. – С. 4.

# *Пясняр – працаўнік*

## *(да 70-годдзя з дня нараджэння І. Шамякіна)*

Па беларускаму радыё пазнаёмілі толькі што са зместамі студзеньскіх нумароў рэспубліканскіх часопісаў. Радаснай навіной для мяне было паведамленне, што ў часопісе «Полымя» пачаў друкавацца новы раман «Злая зорка» народнага пісьменніка БССР Героя Сацыялістычнай Працы Івана Шамякіна. У чаканні новай радаснай сустрэчы я, як паклоннік яго таленту і зайздроснага лёсу яго кніг, вельмі ўдзячны нястомнаму працаўніку за багацце маральна-этычных праблем і ўсе каштоўныя скарбы, адлюстраваныя ў творах юбіляра. Дабрата асабліва надоўга западае ў памяць...

Вярнуўся я ў родныя мясціны пасля фронту і службы ў радах Узброеных Сіл СССР у маі 1951 года. Сумаваў па дому і родных мясцінах амаль 8 гадоў развітання. А ў доме — адна старэнькая матуля. Хата патрабуе неадкладнага рамонту. Калгас пакулі, што беднаваты, спецыяльнасці няма: вайна перашкодзіла яе набыць. Адукацыя — сем класаў. Грошай няма. Што рабіць? Былы салдат крыху было і разгубіўся, хоць на фронце давялося многа пабачыць і перажыць разам з аднапалчанамі, знайсці выйсце з цяжкіх становішчаў. Рашыў падацца ў багатыя краі Закаўказзя, дзе служыў у арміі ў апошні час, або ў горад на будоўлю. Пакуль афармляліся дакументы пачаў працаваць у калгасе. Як аматар-чытач зайшоў аднойчы ў сельскую бібліятэку, кніг тут у той час было не багата. Звярнуў увагу на вельмі зашмальцаваную «Глыбокую плынь» І. Шамякіна, якая выйшла з друку ў 1949 годзе і тады ў 1951 годзе толькі што ўдастоена дзяржаўнай прэміі СССР. Знешні выгляд кнігі сведчыў аб тым, што пабывала яна ўжо не ў адных руках маіх аднавяскоўцаў. Раман запаланіў мяне і я прачытаў яго не адрываючыся. Глыбокай сімпатыяй пранікся да яго аўтара, які захапляюча і па-майстэрску апісаў усенародную партызанскую барацьбу, і да герояў кнігі, якія стойка і мужна змагаліся з ворагам на беларускай зямлі і перамаглі яго ў смяртэльнай схватцы. Асабліва запомніўся мне канец рамана, калі Карп Маеўскі «...пapляваў у далоні., глыбока капнуў рыдлёўкай старое вогнішча, адкінуў зямлю ў бок і сказаў: — Ну, дзеці, будзем будавацца».

Словы гэтыя ў якойсці ступені падыходзілі і мне, зрабіліся як бы камандай і перамянілі мае папярэднія задумы. Яны яшчэ мацней прывязалі мяне да родных мясцін, пабудзілі нястрымнае жаданне жыць на зямлі бацькоў, будаваць і ўпрыгожваць жыццё роднага Хоцімскага краю.

Перамяніў я сваё ранейшае рашэнне. З таго часу і жыву ў вёсцы на Бацькаўшчыне і ніколі аб гэтым не шкадую. А ў гонар ўдзячнасці пісьменнік за добрую параду з вялікім задавальненнем і асалодай зачытваюся творамі, якія так плённа выходзяць з-пад пяра майго добрага дарадчыка Івана Пятровіча. У кожнай яго кнізе я знаходжу для сябе штосьці новае, цікавае, захапляючае. Так, у «Глыбокай плыні» вялікая радасць для мяне адчуць партызанскую барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на беларускай зямлі. У «Добрым часе» — прачытаць аб пасляваенным аднаўленні калгаснай вёскі і ўдзеле ў ім франтавікоў і партызан. У «Крыніцах» — убачыць чысціню крыніц народнага жыцця. У «Трывожным шчасці» — перажыць гады ваенных выпрабаванняў, рамантыку маладосці, кахання, юнацкіх мар аб жыцці. У «Сэрцы на далоні» — даведацца пра душэўную чуласць людзей, сэрцы якіх адкрыты насцеж.

Запомнілася дарэчы на ўсё жыццё і сустрэча з Іванам Пятровічам на канферэнцыі чытачоў у час вучобы ў Мінскім педагагічным інстытуце на бібліятычным факультэце ў 1965 годзе.

Пры чытанні «Снежных зім» прыйшлося пранікнуцца глыбокай павагай да тае пары ў жыцці чалавека, калі сівізной пакрываецца галава. У творы «Ах, Міхаліна, Міхаліна!» — перажыць вечна хвалюючае пачуццё кахання. У «Атлантах і карыятыдах» — неспакойны рытм сённяшняга жыцця, дзе ў цэнтры архітэктар Максім Карнач вядзе пастаянны пошук, барацьбу за свае ідэалы, за справядлівасць. У аповесцях «Шлюбная ноч» і «Гандлярка і паэт», рамане «Зеніт» — зноў услаўленне мужнасці і гераізму савецкага чалавека на фронце і ў тыле. У аповесцях «Лес майго земляка» і «Браняпоезд «Таварыш Ленін» і раман «Петраград-Брэст» — адлюстраванне гісторыка-рэвалюцыйнай тэмы. У рамане «Вазьму твой боль» — праблема памяці і ёмістая карціна жыцця людзей сучаснай вёскі.

За 40 гадоў, на працягу якіх я не развітваюся з творамі І. Шамякіна, моцна пасябраваў і нават парадніўся з героямі яго кніг. Героі літаратурных твораў І. Шамякіна дапамаглі мне знайсці сваё месца ў жыцці, працаваць вучыцца, захапіцца ящчэ глыбей кнігай і вялікай павагай да яе, стаць бібліятэкарам-кнігалюбам-краязнаўцам. Творы пісьменніка натхняюць беззапаветна любіць Радзіму, родную Хоцімшчыну, заўсёды з адкрытай душой несці аднавяскоўцам цеплыню дабра і любві да кніг, ужо знаходзячыся і на заслужаным адпачынку — пенсіі. За гэты час ажыццявіў добры наказ Карпа Маеўскага: і дом пабудаваў (у той час хаця і існаваў закон аб прадастаўленні бясплатна кватэры работнікам культуры, але ключэй да гатовых кватэр нам не выдавалі і абзавёўся сям'ёй. А пра кнігу «Глыбокая плынь» захаваліся самыя чыстыя і светлыя ўражанні.

Яркі вобраз нашага жыцця жыве ў кожным творы пісьменніка. Гэта вялікая сіла і прываблівае чытачоў — маіх аднавяскоўцаў. Увасабленне ў вобразе Алёшы Касцянка лепшых рыс нашай моладзі: сціпласць, працавітасць, прынцыповасць юнака заўсёды натхняюць маіх аднавяскоўцаў-вучняў школы ў летні час працаваць памочнікамі камбайнераў на ўборцы зернавых культур у саўгасе. Любімымі клічамі яны сталі для настаўніцы-пенсіянеркі Д.З.Якімкінай, работніцы ашчаднай касы А.Е.Мікуцінай, загадчыцы магазіна Л.І. Кузьмянковай, жывёлавода К.І. Марозава і іншых. Юбіляру жадаем даўгалецця, натхнення і плёну ў напісанні новых твораў.

**Ласоўскі, М.** Пясняр – працаўнік : [да 70-годдзя з дня нараджэння І.Шамякіна] / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1991. – 31 студзеня. – С. 4.

*Нават дзень, скажы,*
*Пражыць мне як.*
*Рукі склаўшы, калі знаю я:*
*Кінеш зерне – колас зазвініць,*
*Слова знойдзеш – песня ўзляціць...*
*Кастусь Цвірка*

Як толькі дуб ліст разгарнуў, ды зацвіла чаромха, адразу ж павеяла холадам, а ноччу пракінуліся марозчыкі.

У дзень імянін Барыса і Глеба, які быў калісьці значным святам у народзе, накіраваўся на сядзібу паглядзець свае пасевы. Па дарозе ў думках малю Бога, каб паслаў тых пару цудадзейных майскіх дажджоў для моцы сцябла і каб кінутае зерне ў зямлю прарасло магутным сцяблом і выспела коласам умалотным.

Сказаць праўду, што, як і многія старыя, больш усяго пакрыўджаныя і ўніжаныя перабудовамі, рэформамі, як гаворыцца, мы з жонкай не палі духам. Кіруемся ў сваім жыцці правілам: "Паміраць збірайся, а жыта сей". Як гэта аптымістычна выразіў у сваім вершы паэт са слаўгарадчыны Кастусь Кірэенка:

*А нам загад нязменны - жыць,*
*Ні ў век не забываць,*
*Што лёс наш - радасці служыць,*
*Вёсны веснаваць".*

Увогуле, калі сабраць усё, што гаворыцца пра Барыса ў народных песнях, то можна з упэўненасцю назваць гэты дзень святам працы, бо Барыс лічыцца апекуном веснавых палявых работ: "Святы Барыс - коні пасець, прывёўшы дамоў закладываець...", "барануець, поле раўнуець", "ячмень сеець з поўнай сявенькі, з правай жменькі, кіне рэдка - дасць Бог густа". Дарэчы, найпершы крок пасяўной намі быў зроблены яшчэ ўвосень, калі пасеялі азіміну-пшаніцу "Капылянка", насеннем якой надзяліў нас аднавяскoвец Станіслаў Лугаўцоў. Раней жа, калі саўгас меў кірунак як насенняводчы, то набылі добры сорт "Надзея", які высявалі некалькі год падрад, пакуль не стаў выраджацца.

Першы год высева "Надзея" на 0,08 га прынесла нам у падарунак ураджай 500 кг. А зараз уся ўвага "Капылянцы", увесь клопат як прыжылася, ці не адмерзла, ці адмокла. Вясной пасеялі ячмень 'Тонар". І ўсе работы былі выкананы і ўвосень і ўвесну аднавяскоўцам Аляксандрам Балабенкам, у якога свой конь з імем Барыс.

Пасля агляду пасеваў пры добрым настроі рашыў адведаць крынічку, якая знаходзіцца непадалёк, бо ў гэты дзень у народзе шанаваліся крыніцы, якія не замярзалі і лічыліся гаючымі, асабліва ад хвароб вачэй.

Крынічкі гэтай шмат стагоддзяў. Размешчана яна, дзе рэчка Трасцінка нясе-улівае свае воды ў прыгажуню-Бесядзь, а побач на ўзгорках археалагічныя помнікі - старажытныя курганы нашых продкаў-радзімічаў IX-XI стагоддзяў.

З асалодай наталяю крыштальнай вадою смагу і ад задавальнення чытаю лірычныя радкі любові захавальніцы скарбаў чалавечай сілы і моцы, нібы на літаратурным вечары ў свой час перад чытачамі сельскай бібліятэкі верша зноў паэта - земляка Кастуся Кірэенкі:

*Крынічкі, ціхія крынічкі,*
*Як я люблю вас, як люблю!*
*Жывы струменьчык невялічкі*
*Мне апавяе ўсю зямлю.*

*З наклонам схілішся напіцца –*
*І раптам спынішся, замрэш:*
*Як быццам з гулкае зарніцы*
*Табе адкрыецца бязмеж,*
*Гэдоў світанні, пошум алы,*
*Нязнаны нейкі свет святла...*
*А то ж крыніца нагадала*
*Твой шлях і ўсмешкай абдала.*

Добрую справу па добраўпарадкаванню крыніцы больш дзесяці год робіць Упадзімір Захаравіч Корнеў, нібы майстар залатыя рукі: зроблены зруб з бярозавых дошак, наслана сцежка да крыніцы, ачышчан равочак, па якому сцякае вада, усё зроблена па-гаспадарску.

Тройчы наталяю смагу, тройчы асвяжаю свой твар з выцякаючай ручаіны і ў задуменні назіраю за нібы жывым цудадзейным струменьчыкам.

Да слыху данесліся з кустоў вербалоза слаўныя песні-рулады. Сапраўды вясковая ідылія. Барыс - гэта яшчэ і салаўіны дзень.

Падзеі дня бязмежна радавалі мяне, бо гэты дзень яшчэ і Міжнародны дзень сям'і. *ён* нагадаў мне ўспамін аб нашых дочках Таццяне і Людміле, якія разам са сваімі мужыкамі Віктарам і Іванам прыехалі адведаць нас на майскія святы і арганізавалі і выканалі пасадку бульбачкі ажно на трох участачках. У першы дзень каля дома ўзараў агарод на сваёй кабылцы Майцы сусед, былы механізатар шырокага профілю Фёдар Раманенка, які другі дзень на сваім кані Мальчыку, зрабілі пасадку 0,08 га бульбы пенсіянер - былы настаўнік Сяргей Восіпавіч Бянькоў, зараз на грамадскіх пачатках ён яшчэ працуе і старшынёй вулічнага камітэта, дапамагае ў меры сваіх магчымасцей састарэлым людзям, 0,10 га пасадкі бульбы ў полі завяршыў на сваім Барысу Аляксандр Балабенка.

Пенсіянерка, былая настаўніца - выкладчыца біялогіі Валянціна Паўлаўна Дзёмкіна падзялілася - надзяліла насеннем новага гатунку бульбы "Санта". Пенсіянер, былы жывёлавод Гаўрыла Гаўрылавіч Макаранка дазволіў на сваёй чарзе пасвіць маім гасцям чарговую радоўку кароў аднавяскоўцаў, трымаем яшчэ кароўку Венеру.

Радавала нас, старшэйшых, што сям'я надзяліла нас кры-нічнай цеплынёй нашых дзяцей да нас, што яны праяўляюць клопат аб нас і іхнія залацінкі дабрыні даюць адчуванне паўнаты жыцця на зямлі-матухне, любоў да нас - галоўныя лекі.

Давялося быць сведкам, з якой радасцю на твары і сэрцы вярталася з палетку, плошчай усяго 0,30 га, 80-гадовая пенсіянерка, старэйшая былая настаўніца Дар'я Захараўна Якімкіна, калі Дзмітрый Мікуцін, пенсіянер, на сваёй кабылцы Машы, пасеяў ёй ячмень "Гонар" і зрабіў пасадку бульбы.

Радавала мяне, як старшыню пярвічнай арганізацыі пры сельскім Савеце ветэранаў вайны і працы, што на сядзібе 90-гадовай салдацкай удавы Ефрасінні Міхайлаўны, інваліда 1-й групы, быў пасеяны ячмень і пасаджана бульба.

Адчувалася ва ўсім, што жыццё буяе. Беларускі паэт Пятрусь Макаль у сваім вершы адлюстроўвае наступнымі радкамі:

*Хаця насення меней, меней,*
*А трэба сеяць поўнай жменяй.*
*І не вядома, колькі зерня*
*Зямля ў тваё далоні верне.*
*Выкідвай зерні дарагія*
*Пакуль жыццём набракла глеба,*
*І нават хай пажнуць другія,*
*А трэба сеяць, сеяць трэба.*

*І робіць вывад - параду нам, вяскоўцам:*
*І шчаслівей за ўсіх на свеце*
*Не той, хто жне, а той, хто сее.*

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ў Міжнародны дзень пажылых людзей звяртаўся да народа: "Прызываю ўсіх, каму дарагія ідэі дабра, гуманізму і міласэрнасці, асабліва моладзь, уключыцца ў актыўную работу па аказанню маральнай падтрымкі і рэальнай дапамогі адзінокім і малазабяспечаным пажылым людзям..."

Як інвалід Вялікай Айчыннай вайны і ветэран працы, радуюсь і ганаруся, што ў маёй роднай вёсцы Трасціно, што на Хоцімшчыне, краі Магілёўскім на зямлі Белай Русі ёсць добрыя, прыстойныя людзі, якія прыкладам добрых спраў будуць натхненнем для будучых пакаленняў. Людзі, людзі - высокія зоркі. Цудоўная россып залатых людскіх сэрцаў - вось што галоўнае ў маіх аднавяскоўцаў, якія сваім светам і цеплынёй саграваюць зямлю.

**Ласоўскі, М.** Радасць сейбітаў / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 2000. – 22 ліпеня. – С. 2.

# Радасць сустрэч

Ад веснавога прысвятка, прымеркаванага да дня Прападобнага Аляксея, штогод з нецярплівасцю чакаю прылёту буслоў. Асабліва з хваляваннем непакоіўся ў гэты Еўрапейскі год аховы прыроды. Роіліся розныя непрадбачаныя акалічнасці і здарэнні на шляхах вяртання, ды і пахаладанні давалі аб сабе знаць. Па некалькі разоў у дзень на памяць ланцужком плылі радкі з «Новай зямлі» Якуба Коласа:

*Эх, луг шырокі! Як жывы ты,*
*Праменнем сонейка заліты.*
*Увесь стаіш перад вачыма,*
*Ты мал і смуцен, як радзіма,*
*Як наша ціхая старонка...*
*А на дубах, як шапкі тыя,*
*Чарнеюць гнёзды буслявыя.*
*Буслы клякочуць, бусляняты*
*Пішчаць жалобна, як шчаняты,*
*Насы закідаваюць угору*
*І просяць есці ў сваю пору.*

Неаднаразова зазіраў у свае запісы, дзе занатаваны даты прылёту буслоў у 1993 годзе — 25 сакавіка, у 1994 — 31 сакавіка. І хацелася на ўсю моц, чалавечага голасу трымаць размову са шчырым запрашэннем, як калісьці рабіла хорам вясковая дзятва:

*Ляціце, буслы-бусляняткі,*
*Ляціце да роднае хаткі…*
*Ляціце буслы, ці чуеце?*
*Ляціце, не пашкадуеце!..*

Белы бусел — гонар нашай вёскі Трасціно. Ён сімвал і носьбіт шчасця і дабра. З маленства зачараван таемным меладычным стракатаннем наймілейшым, самым любым усякай музыкі.

Буслы з году ў год прылятвалі вясной, займалі свае гнёзды і да самай восені жылі побач з людзьмі. Пакрыўдзіць буслоў лічылася ў нас вялікім злом і кашчунствам. Толькі аднойчы ў час нямецка-фашысцкай акупацыі п'яны паліцэйскі рабіў спробу стрэліць у буслаў, але яму яго паплечнікі не далі волю.

Вярнуўшыся з зімоўкі ў далёкай Афрыцы, яны пачыналі ладзіць свае гнёзды. З прыемнасцю можна было назіраць заўсёды за іх працай, якую яны выконвалі без шуму, без мітусні, па-сялянску павольна і грунтоўна, каб потым не перарабляць і каб ніякая навальніца не разнесла жыллё. Добра агледзеўшы і яшчэ раз як след праверыўшы гняздо, самка адкладвала ад двух да пяці, часам шэсць яек. Выседжвалі буслянят па чарзе. Буслы не кормяць сваіх малых з дзюбы ў дзюбу, як іншыя птушкі. Яны кладуць прынесеную здабычу проста ў гняздо, а бусляняты самі яе падбіраюць. Пакуль бусляняты малыя, адзін з бацькоў ляціць на здабычу, а другі застаецца пільнаваць, каб ніхто малых не пакрыўдзіў. Калі бусляняты ўжо стаяць на нагах, бацькі вылятаюць на здабычу разам. Але самае чароўнае прадстаўленне, калі, стукаючы верхняй палавінай дзюбы аб ніжнюю, бусел выказвае такім спосабам усе свае пачуцці і вернасць сваёй - абранніцы, і гэтыя пачуцці радасці — клёкат разносяцца навокал.

— Дзядуля, пабач, як буслы цалуюцца, — аднойчы назіраўшая за гэтым цудам дашкольніца Вольга таксама з радасцю паведамляла навіну свайму дзядулю Сяргею Восіпавічу Бянькову, на сядзібе якіх на меднастволай сасне размешчана буслянка.

І вось у пятніцу 7 красавіка на Благавешчанне кіруюся ў студню за вадой і позірк свой накіраваў на буслянку. А там проста цуд! Хочаце верце, а хочаце не, справа ваша. А для мяне гэта быў нарэшце доўгачаканы сапраўдны цуд! У гняздзе стаяла двое буслоў і пасля дальняга шляху дзюбамі прыводзілі ў парадак належны свае пер'е.

Старанна праціраю насоўкай шкельцы акуляраў і зноў гледзячы, згаджаюся, што гэта не міраж, а сапраўднасць, адчуваю дзівосную радасць сустрэчы з прыгажосцю прыроды. Ад бязмежнасці хваляў гэтай цеплыні і любві шапчу словы з твора «Наша Бацькаўшчына» класіка беларускай літаратуры пісьменніка з Мсціслаўшчыны Максіма Гарэцкага:

«...І ты, буцян магутна-крылы... Відзеў ты піраміды фараонаў егіпецкіх, у шкляной, бліскучай люстраной вадзе Ніла гістарычнага глядзеўся ты, прыгажун. Цераз нашага прадзеда Дуная мнагаводнага ляцеў ты, даўганогі, і многа старонак з рознымі людзьмі нянашанскай веры і гаворкі, і аблічча відзеў ты!

Але — дарма! Бо ніколі не выхадзіць ні табе, ні буслянятам тваім балот нашае зямелькі, ніколі не накрасавацца табе бясконцай і неабгляднай уздоўжкі і ўшыркі стужкай палёў нашых рознакаляровых, нашых лясоў зялёна-сініх, нашых рэчак ціхаводных, што вербалозам ды краскамі абраслі...».

Бязмежная радасць сустрэчы працятваецца штодзённымі сустрэчамі, і як вяршынямі гэтай радасці вусны вымаўляюць то шэптам, то на ўвесь голас радкі аднаго з самых папулярных і любімых беларускіх аўтараў, як аўтара самабытнага і яркага даравання пісьменніка, драматурга, паэта, публіцыста Уладзіміра Караткевіча:

«Зараз вясна. Над усёй нашай краінай, наставіўшы белыя ветразі крылаў, плануюць буслы. Іх многія і многія тысячы – хто лічыў?.. Гнёзды паўсюль. І таму мне здаецца, што ў гэтыя — і не толькі ў гэтыя — дні зямлю нашу, Беларусь, можна назваць «зямлёю пад белымі крыламі...».

Вось так і плануюць, плануюць буслы. Ветразі іхнія раскрылены над дрэвамі, пушысты хвост, як веерам, накрыў выцягнутыя ногі. А мне пад іхні паллет асабліва добра думаецца пра Беларусь, нашу з вамі радзіму...

Аўтар шчыра даваў савет моладзі: «Любіце гэтую сваю святую зямлю аддана і да канца. Іншай вам не дадзена, ды й непатрэбна».

«...Напісаць так, як гэта зрабіў ён (Уладзімір Караткевіч), не зможа ніхто», — сказаў аб гэтым народны пісьменнік Рэспублікі Беларусь Васіль Быкаў.

Ірашу прабачэння ў чытачоў, што сваю бязмежную любоў да прыгажосці прыроды Прыбяседскага краю выказаў з дапамогай вялікіх майстроў матчынай мовы. Заўсёды, калі праходжу побач з гэтымі цудамі прыроды, я, як былы салдат, выконваючы вайсковы «страявы статут», пераходжу на парадны страявы крок і сам сабе даю каманду: «Раўненне на прыгажосць!». А атрыманую бязмежную радасць дзялю папалам з табою, шаноўны чытач - хацімчанін.

**Ласоўскі, М.** Радасць сустрэч / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1995. – 12 ліпеня. – С. 4.

# Самая дарагая радасць

*Людзі, верце ў радасць,*
*Гэта вера — свету*
*Неспазнанага працяг.*
*А. Пысін*

З дзяцінства нашу любоўныя адносіны і рыцарскае пакланенне кнізе. З веку ў век збірае яна і нясе ў будучае мудрасць чалавецтва. Кніга для мяне, былога бібліятэкара, была заўсёды рэліквіяй, самай добрай і дарагой з усіх зямных радасцей.

Але ж, атрымаўшы чарговую пошту, якую акуратна дастаўляе паштальёнка Валянціна Васільеўна Каток, у першую чаргу са шчымлівай асалодай душы і сэрца бяру вястунку зямлі Хоцімскай — грамадска-палітычную газету «Шлях Кастрычніка» — кнігу на быстрыні нашага жыцця. Вабіць яна яшчэ і сваім свежым своеасаблівым пахам друкарскай фарбы. І кожная сустрэча з газетай нібы тост вясновы, як кілішак дабра і святла перад сабою душой адчуваю і разумею. Матэрыялы газеты вабяць, прыцягваюць сваёй шчырасцю. Гэта — першааснова для чытача. З газетай звязана ўсё мае свядомае жыццё, а дакладней — з 31 сакавіка 1935 года, калі яна пачала выдавацца. У той час я вучыўся щ першым класе, а чытаць навучыўся яшчэ да школы ад старэйшых братоў Івана і Рыгора, сясцёр Лены, Ліды і Валі, якія вучыліся ў той час у старэйшых класах школы. Калі я аднойчы расказваў аб гэтым сваім аднавяскоўцам, то адзін з іх, які асвойваў грамату ў кожным классе пачатковай школы па два гады, не паверыў. Недавер яго я за крыўду не прыняў, успомніўшы, што не выпадкова ў канцы свайго жыцця нямецкі паэт Гётэ сказаў: «Добрые люди не знают, как много времени и труда необходимо, чтобы научиться читать. Я затратил на это восемьдесят лет жизни и всё ещё не могу сказать, что достиг цели». Такое ж сціплае становішча і ў мяне: за семдзесят два гады я цалкам не засвоіў з хуткасцю маланкі хуткацечнае чытанне, што ў апошні час так шырока прапагандуецца рэкламна. Уважлівае ж і прадуманае засваенне прачытаных радкоў, безумоўна, патрабуе патраціць больш часу, за-тое ж бязмежную асалоду атрымліваеш на больш працяглы час.

Вось і ў калядныя вечары праглядаю і паўторна перачытваю з задавальненнем матэрыялы газеты за мінулы 1997 год. Раённая газета заўсёды была і ёсць галоўным летапісцам гісторыі Хоцімшчыны, бо вытокі, пачаткі навін і падзей бярэ з крынічак — з

кожнай вёсачкі, вядзе размову аб працы, справах, лёсах простых людзей зямлі Хоцімскай. І як надзвычай ашаламляльнае, радаснае ўражанне на мяне зрабіла паведамленне у нумары 80 ад 14 кастрычніка аб тым, што архімандрыт Кірыл адшукаў у Іпацьеўскім летапісу ўспамінанне, датуемае 1398 годам, аб нашым царградзе Хоцімску.

Паводле пісьмовых крыніц, з 1136 года вядомы Прапойск (Слаўгарад), з 1160 г. — Крычаў, з 1150 г. — Мсціслаў, з 1267 г. — Магілёу. Хоцімск жа ў першыню, як нам было дагэтуль вядома, у пісьмовых крыніцах памянуты, калі землі ўсходняй Магілёушчыны знаходзіліся ў складзе Вялікага Княства Літоўскага пры князі Свідрыгайлы ў 1430 годзе. У Іпацьеўскім летапісу — гістарычным творы з апісаннем падзей па гадах архімандрыт Кірыл выявіў упамінанне горада Гродна пад 1128 годам, Бранска — 1146 годам і Хоцімска — 1398 годам. Іпацьеўскі летапіс — вялікі помнік пісьменнасці ўсходніх славян 11-18 стагоддзяў і для мяне Хоцімск з больш сталым узростам стаў яшчэ даражэй, бо яго пачатак уходзіць у глыбокую старажытнасць і дае цвёрдую падставу адзначыць яго 600-гадовы юбілей сёлета.

Радуе мяне асабіста каласальная энергія і энтузіязм настаяцеля сабора святой Троіцы архімандрыта Кірыла, у якога нам, краязнаўцам, працаўнікам аддзелаў культуры і адукацыі райвыканкома трэба вучыцца сапраўднаму творчаму падзвіжніцтву, самаадданасці. Бо адраджэнне царквы у Хоцімску ў ранейшай велічы, каб яна зноў несла ў народ суцяшэнне, прапаведвала дабро і мір на зямлі, любоў да Бога і чалавека — яго шматгадовая нястомная праца кожнага дня на працягу сарака год знаходжання ў Хоцімску. Дарэчы, сам ён ураджэнец Брэстчыны, што яшчэ больш падкрэслівае яго высокую духоўнасць да нашай Хоцімскай зямлі і нас, прыхаджан. Падкрэсліваючы высокую эрудыцыю архімандрыта Кірыла, яго шырокую і рознабаковую адукаванасць, дастаткова адзначыць, што апрача чыстага багаслоўя ён вельмі добра ведае гісторыю і культуру Беларусі, філасофію, логіку, эканоміку і іншыя навукі. Ён — вялікі кнігалюб, эрудыт.

Радасна мне асабіста, думаю, радасна і ўсім хацімчанам, што ад падзвіжніцтва архімандрыта Кірыла папрыгажэў увесь свет, асабліва папрыгажэў наш найдаражэйшы гарадскі пасёлак Хоцімск. Адраджаецца Хоцімскі сабор Святой Тройцы, які па вобразу свайму з'яўляецца меншым братам велічнага храма Хрыста-Спасіцеля ў Маскве і з'яўляецца найкаштоўнейшым помнікам хрысціянства, гісторыі і старажытнай архітэктуры. Божы храм, як і раней, нясе службу, накіроўвае на шлях ісціны аблудных, умацоўвае веру ў думках тых, каго апанавала марнасць спакушэння, благаслаўляе на правільны шлях узыходжання да Бога набожных веруючых. А таксама аб'ядноўвае людзей у богаўгоднай справе адраджэння хрысціянскіх ідэалаў, ажыццяўлення ў жыцці Божых запаведзей, якія сэрцам прымуць большасць, аднак далёка яшчэ не ўсе ў думках і справах сваіх, кіруючыся іх праведнай мудрасці, якая вучыць: «Не укради, возлюби ближнего своего яко себя самого»...

Вельмі шкада, што чырванець прыходзіцца ў некаторых выпадках за “новых” хацімчан-інтэлегентаў, якія не даражаць беражліва родным кутком, дзе нарадзіліся і выраслі, зрабіліс вае першыя крокі па зямлі сэрцу мілай глыбінкі – Белай Русі. Не прыслухоўваюцца да парады маці Тэрэзы — лаўрэата Нобелеўскай прэміі міру: “Любовь берёт начало с дома и не так важно, как много мы сделали, важно, сколько любви мы вложили в дела свои...». Яшчэ лепш прапануе вучням з першага класа «Буквар» у тэме «Беларусь — твая Радзіма”, дзе вялікім шрыфтам прапануе словы Ф.Скарыны: “Бо ад нараджэння звяры маюць ямы свае; птушкі маюць гнёзды свае; пчолы бароняць вуллі свае, - так жа і людзі, дзе нарадзіліся і ўскормленыя… да таго месца вялікую ласку маюць...».

Цвёрда перакананы, што вялікая любоў да зямлі, да роднага слова, з гарачым подыхам якой прасякнуты кожны друкаваны радок, кожная старонка кожнага нумара нашай хоцімскай газеты-вястункі заўсёды застанецца пуцяводнай зоркай усіх далейшых творчых памкненняў не толькі рэдакцыйнага калектыву, але і ўсіх чытачоў — людзей зямлі Хоцімскай і агульнымі намаганнямі газета і надалей будзе несці заўсёды людзям праўду і чалавечнасць. А з газетай і нам, хацімчанам, будзе весялей крочыць па жыццёвых сцяжынках і шляхах.

Лічу, што і ў краязнаўчым музеі ўсе тамы — гадавыя падшыўкі «Шлях Кастрычніка» больш за паўсотні год будуць аднымі з галоўных экспанатаў пад першым нумарам.

**Ласоўскі, М.** Самая дарагая радасць / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1998. – 4 красавіка. – С. 2.

# Свая газета – наша пуцяводная зорка

- Фёдар Уладзіміравіч, скажыце, калі ласка, якія перыядычныя выданні вы выпісалі на будучы год? - пацікавіўся я ў свайго бліжняга суседа механізатара шырокага профілю Раманенкі, каб заадно ўзгадніць і сваю падпіску з мэтай узаемнага абмену і карыстацца большым лікам газет і часопісаў. Бо зараз калі б і хацеў мець асабіста больш выданняў, ды хаценне абмежавана рубяжом нашай беднасці.

- А гэтым пытаннем займаецца мамаша, - быў яго кароткі адказ.

Маці яго, 74-гадовая пенсіянерка, былая рабочая-палявод вытворчага ўчастка саўгаса, актыўная чытачка роднай літаратуры ў час маёй працы ў сельскай бібліятэцы, палымяная прапагандыстка народнай песні, з вялікай павагай адносіцца да друкаванага слова, робіць павольна пералік выпісаных выданняў: «Шлях Кастрычніка», «Звязда», «Сельская жизнь», «Аргументы и факты», «На страже», «Работніца і сялянка», «Вокруг света», «Охота и охотничье хозяйство». Усяго коштам больш адной тысячы рублёў.

— Прабачце, Соф'я Рыгораўна, Вы ў першую чаргу назвалі газету «Шлях Кастрычніка», - з якога часу Вы з'яўляецеся яе падпісчыкам? - пытаннем хачу ўдакладніць дэталь.

— Ды яшчэ са школьнай парты, і не магу жыць без сваёй газеты, з якой так звыклася і палюбіла, бо мяне заўсёды цікавіць жыццё роднай Хоцімшчыны. Нездарма ж у народзе складзены і загадкі, мабыць, і Вы знаёмы з імі: «Галубка белая ў хату заляцела, а дзе і што сустрэла, пра ўсё расказала». Альбо вось другая: «Сарока-белабока да хаты прыляцела, у парозе села, з-за мяжы і з усёй краіны прынесла навіны». Ну а калі б я здрадзіла і не паважала сваю газету, то, безумоўна, не была б яе сталым падпісчыкам і чытачом амаль з першага дня яе выхаду ў 1935 годзе, - старанна сцвярджала ў размове са мною Соф'я Рыгораўна.

І калі я звярнуўся да працаўнікоў-аднавяскоўцаў, якія знаходзіліся на збожжатоку, што за матэрыялы раённай газеты яны чытаюць, што падабаецца, а што не, то яны нібы згаварыўшыся адказалі:

— Газету, як гаворыцца, мы чытаем ад першага да апошняга радка, «ад коркі да коркі».

— Ці сапраўды ж гэта па самай справе? - нібы са здзіўленнем перапытаў я.

— А што тут дзіўнага, - уступіла ў размову рабочая-палявод Зінаіда Мікалаеўна Вашчыліна, маці чатырох дзяцей, ёсць ужо ўнук і ўнучка ў яе і амаль як на ўроку ў школе пры праверцы дамашняга задання пераказала змест апошняга нумара газеты.

Магчыма, выпадковасць трапіла, што ў групе аказаліся прыхільнікі газеты і што яны ўжо аформілі падпіску па густу на будучы год. Толькі, дарэчы, жыхары вёскі Маркаўка зрабілі папрок свайму паштальёну Шумілінай Н. К., што яна суботні нумар дастаўляе падпісчыкам толькі аж у аўторак, пасля двух дней выхадных – нядзелі і панядзелка.

Мяне, безумоўна, абрадавалі добрыя водгукі аб газеце трасцінцаў. І калі я пішу ў раённую газету, гэта таксама, мне думаецца, немалаважна выбраць, знайсці «сваю газету», сваіх чытачоў, застацца верным ім доўгія гады. Пісаць аб добрых справах, лічу, лягчэйшым, бо і слова патрэбнае як бы хутчэй трапляецца, і настрой лепшы. Мне здаецца, што матэрыялы, у якіх расказваецца аб добрым чалавеку, або добрых адносінах паміж людзьмі і выхоўваюць не ў меншай меры, чым крытычныя вострыя заметкі. Актыўна адвучаць людзей патрэбна ад дрэннага праз паказ добрага. Як бы ні было цяжка, у нас нямала цудоўнага і патрэбна не праходзіць міма, а расказваць аб гэтым так, каб любы чытач з цікавасцю прачытаў і глыбока задумаўся.

Усе папярэднія водгукі чытачоў газеты напісаны ў самым добразычлівым тоне. Аўтары добрым словам падтрымліваюць журналістаў газеты ў перыяд падпісной кампаніі. Кожны жадае з радасцю чытаць нумары газеты, калі з'яўляецца пачуццё, што ў матэрыялах выказаны твае думкі і падзеі, нашы агульныя клопаты, нашы праблемы, нашы радасці і няшчасці.

Хочацца нагадаць, як хацімчане ў першыя гады ўтварэння раёна, калі яшчэ не было спрыяльных умоў для друкаванага органа, гарэлі жаданнем мець сваю трыбуну, сваё люстэрка, сваю газету, “маленькае сэрца раённай культурнасці”. Гэта добра перададзена ў невялікай заметцы «Райгазета» Ар. Курапкі, надрукаванай у газеце «Наш працаўнік» 13 верасня 1925 года: «У нашым раёне пачаўся селькораўскі рух. Да 1 жніўня стварылі раённую насценную газету «Чырвоны Ратай» (Араты). Матэрыялы сяляне падаюць многія. Кожны раз к вызначанаму тэрміну выходзіць нумар газеты і частка матэрыялаў заўсёды застаецца на чарговы. Рэдкалегія праглядаючы допісы, некаторыя з іх адсылае ў «Наш працаўнік» і «Малады камуніст» і г. д., якія маюць больш шырокае значэнне.

Газета выдаецца ў колькасці трох экземпляраў. Вывешваецца на відным месцы. 9 жніўня ў м. Хоцімск была склікана першая парада селькораў, якая адбылася ў Народным доме. Заслухалі даклад аб селькораўскім руху, вызначылі значэнне райгазеты, выбралі бюро. Рэдкалегія спадзяецца, што сяляне раёна і далей будуць так актыўна пісаць у сваю газету. «Чырвоны Ратай» - гэта маленькае сэрца раённай культурнасці».

Акруговыя газеты ахвотна змяшчалі дасылаемыя рэдкалегіяй «Чырвонага Ратаю» заметкі. Вось некалькі даволі цікавых паведамленняў. Газета «Наш працаўнік» 30 жніўня 1925 года: «Вёска Бруёўка пажадала мець уласны школьны будынак (раней быў наёмны), але сродкаў для пабудовы не было. Райвыканком адпусціў 100 рублёў, але гэтага мала – школа каштуе 175 рублёў. На агульным сходзе сялян пастанавілі прасіць Хоцімскае сельскагаспадарчае таварыства пры РВК, каб яно дапамагло. Таварыства задаволіла патрэбы сялян, часова адпусціла 150 рублёў грошай.

Гэта ўжо гаворыць за тое, што наша сельскагаспадарчае крэдытнае прадпрыемства моцнае і па магчымасці дапамагае сялянству. Няхай ведае кожны селянін, што крэдытнае прадпрыемства і ў будучым будзе задавальняць запарабаванні сялян. Ягораў».

Газета «Наш працаўнік» 25 кастрычніка 1925 года. «Працоўныя Хоцімска будуць слухаць радыё. Яшчэ вясной на агульным сходзе сяброў (членаў) усіх саюзаў, служачых і працоўных м. Хоцімск была зроблена пастанова, каб, на агульныя сродкі паставіць радыёпрыёмнік. Былі зроблены зборы, заказалі і прывезлі і паставілі гучнагаварыцель. Працоўныя Хоцімска будуць мець магчымасць паслухаць музыку, словы, прамовы нашых сялянскіх выдатных правадыроў непасрэдна з Масквы. Ягараў».

З другіх крыніц вядома, што ЦВК Беларусі выдзеліў на Калінінскую акругу (цэнтр г. Клімавічы) два гучнагаварыцелі, якія былі ўстаноўлены да дня 8-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Адзін у Мілаславічах, а другі ў Хоцімску.

Газета «Малады камуніст» 26 жніўня 1926 года. «Добрую справу можна і ў свята зрабіць. Камсамольцы вёскі Маркаўка 2-й Васілёўскай ячэйкі ЛКСМБ парашылі скарыстаць рэлігійнае свята «Спас» дзеля дапамогі сям'і чырвонаармейца. Парашылі і зрабілі. І вось у дзень 19 жніўня, калі, як і звычайна бывае ў вёсцы - старыя пайшлі ў царкву, і наогул ніхто нічога ў полі не рабіў, камсамольцы дружнаю сям'ёю сабраліся і скасілі ўсю сенажаць аднаго чырвонаармейца. Прыйшоў дапамагчы ў працы і адзін беспартыйны. Старыя сяляне і сялянкі вельмі задаволены зробленым, нягледзячы, што рабяты працавалі ў свята і кажуць: «Добрую справу можна і ў свята рабіць». Камсамольцы другіх вёсак, бярыце прыклад. Г. Будзянка».

Як бачыце, матэрыялы і тых гадоў прадстаўляюць вялікую цікавасць і для сучасніка. Нам стала вядома, што школа ў Бруёўцы стала мець свой уласны будынак толькі у 1925 годзе, радыё ў Хоцімску ўпершыню пачулі ў дні святкавання 8-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, што камсамольская арганізацыя ў 2-й Васілёўцы рабіла першыя крокі і справы ў 1926 годзе.

Трэба ж і нам рабіць усё магчымае, каб газета была цікавай і для нашчадкаў. Берагчы і планаваць, падтрымліваць сваю газету, шырыць бязмежна яе аўтарскі актыў. Трэба выкарыстаць і такі прыклад, які шырока прымяняўся і ў тыя далёкія дваццатыя гады: выпісвалі газету калектыўна на дзесяцідворку, альбо некалькі чалавек, жывучых па суседству. І тады газета дапамагала зблізіцца, пасябраваць па-суседску аднавяскоўцаў. Пры той беднасці атрымліваліся тры выгады: чыталі і выпісвалі сваю «Галубачку белую», жылі ў згодзе чалавек да чалавека, са сціпласцю выкарыстоўваючы свае невялікія грашовыя сродкі.

І калі ж вы, чытач, яшчэ не афармілі падпіску на раённую газету «Шлях Кастрычніка» на будучы год, то, не губляючы часу, адпраўляйцеся ў бліжэйшае аддзяленне сувязі паасобку, альбо разам з суседзямі і зрабіце падпіску на «маленькае сэрца раённай культурнасці». Не хварэйце раўнадушнасцю! «Шлях Кастрычніка» - у кожную сям'ю!

**Ласоўскі, М.** Свая газета – наша пуцяводная зорка / М. Ласоўскі // Шлях кастрычніка. – 1992. – 31 кастрычніка. – С. 2.

# Светлая крыніца сэрца і памяці паэта

Пры ўпамінанні імя народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова чамусьці мне заўсёды ў апошнія гады на успамін прыходзяць словы, таксама народнага паэта Рэспублікі Беларусь, Ніла Гілевіча, што, " ... калі на гістарычнай карце беларускай літаратуры правесці прамую па самых высокіх паэтычных вяршынях, то яна пройдзе так: Багушэвіч-Багдановіч-Колас-Купала-Куляшоў. Куляшову, як і кожнаму з яго вялікіх папярэднікаў, было суджана лесам рушыць далей паэтычнае развіццё нацыі, узняць нацыянальны паэтычны геній на якасна новую ступень".

А далей Ніл Гілевіч робіць вывад, што Аркадзь Куляшоў, бяспрэчна, - самая буйная постаць, самая значная велічыня сярод тых, чыя творчасць істотна шырыла духоўныя і мастацкія гарызонты беларускай паэзіі. Пад уражаннем сказанага ясней бачыш і разумееш, якога паэта ў асобе Аркадзя Куляшова, якога волата творчага духу дала нам, беларусам, і ўсяму свету сціплая, у бярозах і соснах, магілёўская зямля. Усходная Магілёўшчына — радзіма Аркадзя Куляшова, з якой непарыўна звязана яго паэтычная творчасць.

Бываючы ў вёсках Альшоў і Елавец, я звярнуў асаблівую ўвагу на геаграфічныя прывязкі твораў паэта, асабліва паэмы "У зялёнай дуброве", у якой паказан новы свет калгаснага жыцця, вызвалены ад прыватнаўласніцкіх путаў, перадае радасць супольнай працы, таварыскую падтрымку калектыву, захопленасць агульнай справай. Часам задумваўся, ці не ў гэтых месцах лірычны герой паэта напаткаў, як і аўтар гэтых радкоў, дзяўчыну незвычайнай прыгажосці? Менавіта пад уплывам асалоды крынічна-празрыстай народнай паэзіі, народных звычаяў, вясельных і заручальных песень, якія аксамітамі рассыпаны ў рамантычна-узнёслай паэме-песні "У зялёнай дуброве", я ў 1968 годзе звярнуўся з пісьмом да паэта, каб адказаў, ці не на Хоцімшчыне яна была напісана, і якія яшчэ творы паэта былі напісаны на хоцімскай зямлі?

Неўзабаве атрымаў шчыры адказ, інтуіцыя мяне не падвяла. Вось радкі пісьма, якія даюць ясны прамень пра сувязь паэта з Хоцімшчынай: "Паважаны т. Ласоўскі! Пасылаючы Трасцінскай бібліятэцы чатырохтомнік, хачу коратка і сціпла адказаць на некаторыя Вашы пытанні да мяне.

1. Маці мая працавала ў Хоцімскім раёне з 1927 года ў Юзяфоўскай, Альшоўскай і Елавецкай школах. Я прыязджаў да яе на летнія канікулы ў Альшоў і Елавец. Якія гэта былі гады, я ўжо дакладна не памятаю. Ва ўсякім разе - трыццатыя.

2. У Елаўцы я адпачываў з сям'ёй у 1938 і 1939 гадах (летам) мною была напісана паэма "У зялёнай дуброве" і некаторыя асобныя вершы з цыкла "Юнацкі свет", у прыватнасці, "Бюро даведак". Там жа задуманы былі і напісаны ўжо ў Мінску "Магілёўская хмарка", "Мая Бесядзь", "На сотай вярсце", Глушцы", "Плыла, цалавалася хмара з зямлёй...", "Добры чалавек" і іншыя.

3. У 1940 годзе ў Хоцімску (у будцы на сядзібе бацькоў) напісана паэма "Хлопцы апошняй вайны" (здаецца, май-чэрвень месяцы).

4. У той жа будцы, але ўжо ў 1950 годзе, напісана паэма "Толькі ўперад", як бачыце, "творчыя сувязі мае з Хоцімшчанай не такія ўжо малыя, і я ўдзячны сваёй роднай зямлі і яе людзям, якія і да гэтага часу з'яўляюцца светлай крыніцай майго сэрца і памяці. З павагай да Вас і нізкі паклон да чытачоў. Аркадзь Куляшоў. 02.08.1968г., г.Мінск.

Як самая каштоўная рэліквія захоўваюцца яго творы ў чатырох тамах, на якіх ён пакінуў надпіс: "Трасцінскай сельскай бібліятэцы - аднаму з асяродкаў народнай асветы і культуры ў далёкім кутку роднай Магілёўшчыны ад аўтара. Аркадзь Куляшоў. 02.08.1968 г., г. Мінск".



На здымку: Аркадзь Куляшоў (справа) з М. Ласоўскім у час наведвання Трасцінскай сельскай бібліятэкі.

А на двухтомніку твораў у мой адрас 22 сакавіка 1969 года пакінуў аўтограф "Дарагому кнігалюбу і краязнаўцу М. Ласоўскаму на добрую памяць ад земляка. З павагай Аркадзь Куляшоў, г. Мінск".

23 жніўня 1972 года Аркадзь Аляксандравіч даслаў маёй дачцы пяцікласніцы зборнік вершаў "Пускай бушуют волны", выдадзенай серыяй "Поэтическая библиотека школьника" у выдавецтве "Дзіцячая літаратура" у Маскве з аўтографам "Людміле Ласоўскай на добрую памяць ад аўтара. Аркадзь Куляшоў".

7 мая 1973 года зямляк дасылае з аўтографамі «Паважанаму Ласоўскаму з найлепшымі пажаданнямі дабра ў жыцці і рабоце. Аркадзь Куляшоў» зборнік лірыкі "Мая Бесядзь" і кнігу паэзіі "Сасна і бяроза", у якіх паэт з пачуццём асабістай адказнасці папярэджвае людзей: «беражыце зялёны пакроў зямлі, беражыце ад пагрозы сасну і бярозу».

У запыюных кніжках паэта-земляка Аляксея Зарыцкага занатаван успамін, што летам 1938 года разам з Аркадзем жылі ў Елаўцы, дзе ён займаўся перакладчыцкай працай, а Аркадзь жа пачаў пісаць паэму "У зялёнай дуброве": " Раніцай Аркадзь ішоў да завітастай рэчкі Альшоўкі і выбраў такое месца, каб і лес быў побач. На прырэчным узлессі, у зацішку, ён рассцяліў коўдру, узбройваўся алоўкам і паперай і браўся за працу. І ў гэтым, аграмадным "кабінеце", прыкрытым толькі "сінім дахам неба", Куляшоў пад спеў жаваранкаў, стракатанне конікаў і прарэзлівы крык кнігавак, працаваў надта плённа".

Хтосьці з пісьменнікаў верна сказаў: "Каб зразумець паэта, трэба наведацца ў яго краіну".

Дык з чаго пачынаецца пісьменнік? Мабыць, з любві, з паэтычнага захаплення роднай зямлёй. Як і калі яно прыходзіць да паэта?"

І вось што Аркадзь Куляшоў адказаў:

- Аднойчы я ішоў у Елавец да сваіх бацькоў. Гэта было на світанні. Яшчэ жоўтае святло месяца залівала жытнёвае поле, а ад рэчкі слаўся перадрамаўшы туман. Не прыпомню зараз ужо, аб чым тады думаў, але раптам адчуў, паверыў, што ўсё здзейсню ў жыцці, усё што хачу, што задумаў. І гэта была такая лёгкая, расхінаючая душу і імклівая, нібыта прыўзнімаючая ад зямлі ўпеўненасць, што, магчыма, гэта і было натхненнем.

Сваю вялікую працалюбівасць у дні юбілею ён падкрэсліваў:

Трэба працаваць. Юбілей - гэта свята, а жыццё - праца, нічога няма важней працы.

І сведкай гэтаму - кожны радок яго вершаў і паэм - гэта гарачае сцвярджэнне пераўтвараючай сілы сацыялістычнага ладу, яго гарманічнага ўздзеяння на асобу, на цэлыя пакаленні. Нам, хацімчанам, заўсёды радасна, што праз голас Бесядзі, праз голас свайго маленства наш дарагі паэт-зямляк, пясняр новага свету, сведка і ўдзельнік вялікіх гістарычных падзей, просты юнак, што вырас на тройчы блаславеннай магілёўскай рачулцы з ціхай і цёплай, быццам дыхание блізкага чалавека, назвай Бесядзь, нясе штодня чары і цуд сапраўднай паэзіі, якая вызначаецца высокай культурай, глыбокім ідэйна-палітычным і выхаваўчым зместам.

Толькі, на вялікі жаль, "... самотным жаўранкам звініць і плача май...". У тым ліку і мы, землякі, бо няма Аркадзя Аляксандравіча Куляшова у дні яго 90-годдзя з намі. Недапісанымі засталіся і шмат задуманых твораў, якія так радавалі нас у жыцці.

На ўсё свядомае жыццё захавалася незабыўная сустрэча з чараўніком паэзіі. У сярэдзіне дня 3 ліпеня 1972 года ў бібліятэцы за столікамі сядзелі дочкі жывёлаводаў Шасцерыковых і чыталі свежыя нумары часопісаў "Маладосць" і "Полымя", а я растаўляў на паліцах кнігі. Калі ж свой позірк, адарваўшы адкніжных паліц, накіраваў на заходзячага ў памяшканне наведвальніка, то вачам сваім не паверыў ад здзіўлення. Да мяне, з працягнутай рукой і ўсмешкай на твары, падыходзіў наш зямляк, народны паэт Беларусі Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў. Пакуль ён ласкава вітаўся са мною, я выказваў словы бязмежнай радасці ад нечаканай і прыемнай сустрэчы на гасціннай трасцінскай зямлі, у маёй галаве прамільгнулі тысячы думак, аб чым далей павесці размову? Ды няёмка было адразу задаваць усе цікавячыя пытанні. Выручыў сам Аркадзь Аляксандравіч, сам распачаў гамонку:

- Атрымаў ваша пісьмо з просьбай даслаць у бібліятэку свае новыя кнігі з аўтографамі. Едучы да бацькоў у Хоцімск, рашыў выканаць вашу просьбу і зрабіць чытачам бібліятэкі падарунак.

Сеўшы за стол, паважаны госць напісаў на сваіх кнігах "Сцяг брыгады" і "Сасна і бяроза" аўтографы: "Трасцінскай сельскай бібліятэцы ў дні яе 50-годдзя ад аўтара-земляка. Аркадзь Куляшоў. 3 ліпеня 1972 года, веска Трасціно".

Пасля ўручэння падарунка, шаноўны госць пацікавіўся кніжным фондам бібліятэкі, якія кнігі карыстаюцца попытам у чытачоў, колькасцю і саставам чытачоў бібліятэюкі, іх густамі. Дэталёва азнаёміўся з краязнаўчай работай, праводзімай бібліятэкай, даў ёй станоўчую і высокую адзнаку:

- У будучым такую карпатлівую работу па краязнаўству будуць праводзіць усе бібліятэкі нашай рэспублікі, - сказаў ён.

У шчырай гутарцы я расказаў, з якім вялікім задавальненнем і любоўю чытачы нашай бібліятэкі чытаюць яго цудоўныя вершы "Мая Беларусь", "Станцыя Камунары", "Магілёўская хмарка", паэму-біяграфію "Далека да акіяна", прысвечаную роднай Магілёўшчыне.

- Ад імя ўсіх хацімчан, да Вас, Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў, ёсць вялікая просьба. Напішыце, калі ласка, літаратурны твор аб нашым старажытным Хоцімску,- звярнуўся я да паэта. - Краязнаўцы нашай бібліятэкі адшукалі легенду аб далёкім мінулым нашага роднага гарадка. Змест легенды надзвычай цікавы. Такі-ж, як і падание аб узнікненні горада Магілёва, пакладзеным Янкам Купалам у аснову паэмы "Магіла Льва". Дарэчы запіс легенды зроблен умелай рукой этнографа, фальклярыста і археолага Еўдакіма Раманава, аўтара "Беларускага зборніка" - своеасаблівай энцыклапедыі побыту і культуры беларусаў дарэвалюцыйнага часу.

- Прыемна чуць ваша паведамленне, калі можна, то дашліце мне і тэкст гэтай легенды. Фальклорны твор мне трэба добра вывучыць, і потым даць яму належны змест і гучанне. З крышталёвых глыбокіх крыніц, фальклорных я заўсёды чарпаю ручаінкі народнай паэзіі, - адказаў тады Аркадзь Аляксандравіч...

Потым госць звярнуўся з пытаннем да чытачкі Любы Шасцерыковай, які верш, з напісаных ім, больш за ўсё хвалюе яе?

Дзяўчына адразу пачала выразна чытаць адзін з лепшых вершаў ваенных гадоў "Балада аб чатырох заложніках":

*Іх вядуць па жытняй сцяжынцы.*
*Чатырох.*
*Пад канвоем.*
*З дому.*
*Чатырнадцаць - старэйшай дзяучынцы*
*Тры гады хлапчуку малому...*

Разам слухаем трагедыю мінулай вайны пра сям'ю народнага мсіўцы камбрыга бацькі Міная, узрушыўшую болем і тугой сэрца юнай чытачкі. Міжволі яе боль перадаўся і ў нашы сэрцы, на вачах выступілі слёзы.

Гэту нашу цёплую, незабыўную сустрэчу з народным паэтам Беларусі Аркадзем Куляшовым, творчасць якога яшчэ на першай дэкадзе беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве высока ацаніў рускі пісьменнік Аляксей Талстой, назваўшы яго "салаўём паэзіі", будзем памятаць вельмі доўга.

Незабыўнымі засталіся ў памяці і тыя дні, калі работнікі кінастудып "Беларусфільм" рэжысёр У. Цяслюк і аператар У.У. Цяслюк здымалі дакументальную стужку "Край крынічны" - аб жыцці і творчасці паэта. Быў абедзены перапынак, і да памяшкання бібліятэкі, дзе рабіліся здымкі, прыйшло многа людзей, рабочых саўгаса з сенажацей, чытачоў бібліятэкі, каб вітаць свайго земляка, творы якога, як сказаў хтосьці з беларускіх паэтаў, не проста чытаем і не проста любім, а іх хочацца чытаць, як хочацца дыхаць і есці.

Творы Аркадзя Куляшова для многіх з нас - надзённы хлеб, чысты крынічны струмень. Радкі твораў яго адчуваеш у сэрцы, як сцежку пад нагамі, як неба над сабою. Ва ўсіх была вялікая радасць: прыехаў паэт, без якога немагчыма ўявщь сваё жыццё, чый лёс, чые словы зрабіліся часцінкай цябе самога, а яго кнігі - нашым агульным святам.

Цудоўная дабрата і сардэчнасць у адносінах да людзей была неад'емнай рысай характару нашага земляка - народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова, які быў дэпутатам Вярхоўнага Савет БССР васьмі скліканняў, узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі.

- Бачу, што зусім цесна вашай бібліятэцы ў гэтым пакойчыку, - гаварыў наш госць пры развітанні пасля здымкі кадраў для фільма, бо апаратура не месцілася ў пакойчыку і здымкі вяліся на вуліцы, праз акно, з якога была вынута рама. А потым параіў: "Абмяркуйце пытанне аб будаўніцтве памяшкання для бібліятэкі і дашлще сваё хадатайніцтва на маё імя. Я паспытаю выкарыстаць свае дэпутацкія паўнамоцтвы і

дапамагчы вам, каб і ў вашай вёсцы бібліятэка была размешчана ў добрым памяшканні".

І для бібліятэкі было пабудавана асобнае, утульнае памяшканне — зборнашчытавым доме, абліцаваным сілікатнай цэглай, з вадзяным ацяпленнем і лямпамі дзённага асвятлення. Усё было зроблена так, як хацеў бачыць зямляк – выдатны майстар паэзіі.

**Ласоўскі, М.** Светлая крыніца сэрца і памяці паэта / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 2004. – 7 лютага. – С. 2-4.

# Святліца з добрымі людзьмі

Зараз усё часцей можна чуць словы, што свет выратуе краса, прыгажосць, як пісаў Ф. Дастаеўскі – вялікі рускі пісьменнік. Яго добрую думку дапаўняюць яшчэ выратавальным словам дабрата, дабрыня.

Хаця Мікола веснавы і азначаў канчатковы прыход вясны, і я планаваў памаліцца святому Міколу ў Храме, але ж здалі 6ронхі і я ў пасцелі. Сям'я прымае ўсе захады лекамі народнай медыцыны. Каб не запусціць хваробу ў далейшае, запрашаем для праверкі кансультацыі свайго вясковага доктар Зінаіду Васільеўну Кажамякіну.

Адразу пасля ўважлівага агляду стану майго арганізма закруціўся дыск тэлефоннага апарата і праз якую паугадзіну на парозе кватэры медфельчар Алена Сакратарова запрашае ў салон "хуткай дапамогі", вадзіцель якой Аляксандр Кудраўцаў за некалькі хвілін дастаўляе ў лякарню-бальніцу. Дзяжурная доктар-тэрапеўт Таццяна Васільеўна Борматава карпатліва аглядае мяне, нібы якога паважанага чыноўніка".

— Каб не прадзьмула Вас у нас тут, на першым паверсе, я без затрымкі накіроўваю у тэрапеўтычнае аддзяленне, дарэчы, як арганізм Ваш, ці station ўча ўспрымае лекі праз уколы,— гаворыць доктарша, хутка запаўняе карту, вызначае лекі.

Дзяжурная сястра Алена Захаранкава дае каманду санітарцы Алене Саўчанка заслаць-падрыхтаваць пасцель-ложак, робіць укол, прыносіць жменю другіх лекаў. Усё было зроблена хутка, нібы на аўтаматычным канвееры, нібы ў той народнай казцы пра шчупаковы распараджэнні, прытым на дзіва усё гэта рабілася ў суботні дзень.

Хваляванні мае адразу зніклі, бо я адчуў у заспакаенні, што знаходжуся ў святліцы-бальніцы ў асяроддзі добрых і чулых людзей. Дзесяць дзён станаўлення майго здароўя – гэта былі дні яскравага бачання як аддана выконваюць назначэнні доктара дзяжурныя медыцынскія сёстры Валянціна Вашчыліна, Алена Захаранкава, Людміла Макаранкава, Ірына Мікуціна. Старанна працавалі санітаркі Таццяна Дзяржак, Наталля Завадэўка, Алена Саўчанка, Надзея Сігель. Быў зроблены ўклад лабарантак, працаўніца лячэбных кабінетаў, прозвішчы якіх і цяжка пералічыць. Адчувалася, што кіруе аддзяленнем добры кіраўнік-гаспадар Надзея Арцёмаўна Бабакова. Смачнымі блінцамі, сырнікамі, макаронамі, грэчкай, рысам, манкай, бульбай, мясам, рыбай, маслам, малаком, чаем, кісялём, хлебам своечасова частавалі хворых Людміла Задорная і Таццяна Глухава.

А аб сваім лечачым доктары-тэрапеўце, якая для нас, хворых другой палаты першага блока, была сонцам. Як яснае сонейка Вера Васільеўна Лімарава кожны дзень з ветлівым прывітаннем заходзіла ў нашу палату і пачынала сваё чарадзейства, якое

цяжка перадаць на паперы. Нашы пакуты ад букетаў хвароб у адно імгненне знікалі, ствараўся якісьці незвычайны гаючы мікраклімат, вітаў у паветры водар нашых адкрытых чыстых размоў, перажыванняў, шматлікіх парад. Мы знаходзіліся ў захапленні ад сустрэч з доктарам, бо Бог надзяліў яе найбольш характэрнымі нацыянальнымі рысамі нашага беларускага народа, якія высока шануюцца ў чалавечым грамадстве: дабрынёй, працавітасцю, адказнасцю, лагоднасцю, гасціннасцю. З шматдзетнай сям'і бацькоў, што на Мсціслаўшчыне, яна, нібы чараўніца, бадзёрыць нас, людзей ужо сталых год, удзельнікаў вайны, ветэранаў працы, надзяляе нас верай, надзеяй і любоўю (дарэчы, і імя ёй даволі добрае надалі), да адчування вялікага шчасця жыць на белым свеце зямным.

Радуюся свайму станаўленню ў строй, што вернута магчымасць узяць у рукі рыдлёўку, матыку ды корпацца на сваім лапіку - зямельным участку. Са шчырасцю і ўдзячнасцю сыплю мільён падзяк ёй — Веры Васільеўне - выратавальніцы, за тое, што яна дорыць людзям гаючае дабро, што ў яе б'ецца добрае сэрца, а сумленне чыстае, крыштальнае.

Радуюся, што мой сусед па ложку былы франтавік-сувязіст Іван Прошкін з вёскі Разальмова, які ў пасляваенны час на камбайне ў хлебным і дарожным пылу зрабіў аж цэлых 38 жніваў, павесялеў і расказвае з гумарам вясёлыя прыгоды са свайго жыцця. Радуюся, што Мікола Маляванаў – былы механізатар шырокага профілю з вёскі Васілёўка, ідзе на папраўку, што з суседняй першай палаты з дапамогай кіёчка пашлёпаў па калідоры інвалід вялікай Айчыннай вайны Мікола Баравікоў з вёсі Клін і з кімсьці там варкуе-жартуе, што шырыцца надзея на выздараўленне і ў Міколы Мінчанкі – былога механізатара, а потым жывёлавода з вёскі Бруёўка.

Арабская прыказка падказвае, што калі табе зрабілі дабро, то рас-кажы аб гэтым. Што я і раблю ў сваіх сціплых магчымасцях.

Дамоў вяртаюся ў добрым ураджанні, не знікаюць з памяці майскія чароўныя, прывабныя, радасныя, вясёлыя ўсмешкі на тварах абаяльных, чулых медыцынскіх работнікаў і з радасцю чытаю радкі з верша Генадзя Бураўкіна:

*... Якое шчасце -*
*Даланёй сялянскай*
*Адчуць слухмянасць гэбля* і *касы*
*І з нечаканай прадзедаўскай*
*ласкай*
*Расчулена пагладзіць каласы....*
*...Аднойчы выйшлі ўполе на*
*дасвецці,*
*Каб зразумець -*
*Да ачышчальных слёз,—*
*Якое шчасце -*
*Жыць на белым свеце*
*Сярод вясёлак-птушак* і *бяроз!*

**Ласоўскі, М.** Святліца з добрымі людзьмі / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 2006. – 14 ліпеня. – С. 2.

Пуцяводнай зоркай для мяне сталі словы-парады народнага пісьменніка БССР, лаўрэата Ленінскай прэміі, Дзяржаўнай прэміі БССР, літаратурнай прэміі Якуба Коласа, Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа Івана Паўлавіча Мележа:

«Любіце зямлю нашу. Слаўную беларускую зямлю, яе гарады і яе палі, яе лясы і рэкі. Любіце славу яе і душу яе — беларускую літаратуру, выдатныя кнігі, створаныя сынамі нашага народа».

У Трасцінскай сельскай бібліятэцы, дзе я працаваў, чытачы з пашанай адносіліся да літаратурнай спадчыны пісьменніка. З вялікай ахвотаю ўдзельнічалі ў прапагандзе яго твораў пры правядзенні масавых мерапрыемстваў. Захаваліся запісы аб тых радасных падзеях.

Вось у лютым 1971 года ўдзельнікам і прысутным канферэнцыі чытачоў па раману «Людзі на балоце» глыбока запалі ў душу словы Івана Мележа, дзе ён выказвае свой погляд на праблему сучаснасці і мастацкай літаратуры: «Думаецца, не варта пагарджаць і кнігамі, якія расказваюць пра ўчарашні дзень: сучасным маладым людзям вельмі не шкодзіць ведаць, як здабывалася бацькамі шчасце для іх, колькі поту і крыві яно каштавала. Не ведаючы таго, што расло ўчора на нашай зямлі, нельга зразумець таго, што расце сёння, убачыць загадзя, што будзе заўтра, нельга любіць па-сапраўднаму сваю зямлю, свой дзень!..».

...У суботні лютаўскі надвячорак 1981 года бралася на завіруху. Нягледзячы на такое надвор'е, моладзь школы і саўгаса з цэнтральнай сядзібы і аддаленых вытворчых участкаў сабралася на канферэнцыю чытачоў «Лёс чалавека — лёс народа».

Увесь вечар вялася шчырая размова аб юбіляры, пра тое вечнае, што існуе з чалавекам, пра першааснову жыцця, працу па зямлі, пра каханне, вернасць, чалавечую годнасць, адказнасць чалавека перад людзьмі і сваім сумленнем, гуманнасць, чалавечнасць у адносінах да так званага «простата» чалавека, пра намаганні чалавека насуперак лёсу і абставін узняцца ва ўвесь свой духоўны рост і многае, многае іншае, так добра апісанае Іванам Паўлавічам.

Успамінаецца, як пасля прачытання «Палескай хронікі» 70-гадовая старэйшая чытачка бібліятэкі Анастасія Маркелаўна Дзёмкіна з хваляваннем расказвала мне, як праходзіла калектывізацыя ў нашай вёсцы. Яе светлыя ўспаміны аб той пары я вельмі часта выкарыстоўваў у сваёй прапагандысцкай справе.

Мне асабіста спадабалася, як умела Іван Мележ уключыў у раманы «Палескай хронікі» дакументы-урыўкі са стэнаграмы сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Беларусі ад 1929 года: «...З пільнай увагай чакаў Апейка, што скажа ў садакладзе Тарасенка, старшыня Клімавіцкага райвыканкома. Клімавіцкія былі героямі сесіі: іх хвалілі, на іх заклікалі раўняцца».

Для мяне было вядома, што Забялышынскі і Арлоўскі сельская Саветы пры скасаванні Хоцімскага раёна ў той час былі ў складзе Клімавіцкага раёна. На старонках газеты «Беларуская вёска» ад 25 лістапада 1929 года азнаёміўся з рапартам калгасаў Клімаўшчыны 2-й сесіі ЦВК БССР.

«37 буйных фабрык хлеба гонар працоўнага сялянства Клімаўшчыны, — гаварылася ў ім. — Клімаўшчына калектывізавана на 80 працэнтаў на плошчы ў 80 тысяч га».

А на старонках нашай акруговай газеты «Магілёўскі селянін» ад 26 ліпеня 1929 года з вялікай радасцю прачытаў добры матэрыял Мельнікава, як быў арганізаван калгас у вёсцы Хацімча.

Пісьменнік гаварыў, што «Палеская хроніка» дарагая яму, што стараўся пісаць яго сумленна, што можа паставіць свой подпіс пад кожным радком — там няма няпраўды.

Зварот Мележа да падзей калектывізацыі, да «нашага рэвалюцыйнага мінулага» тлумачыўся менавіта жаданнем глыбей разгледзець яго з пазіцыі сучаснасці, па-філасофску асэнсаваць «не дзеля мінулага, а ў імя будучыні», якую, на думку пісьменніка, нельга назваць, не ведаючы таго, «з чаго мы пачыналі, праз што прайшлі» і што зараз мы маем.

Улюблёнасць у літаратурную спадчыну Івана Паўлавіча, радасць за яго творчыя здабыткі натхняе і мяне заўсёды пісаць свае допісы сумленна і праўдзіва.

**Ласоўскі, М.** Сейбіт дабра і прыгажосці / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1991. – 7 лютага. – С. 4.

# Сонца і песня

## *(да 70-годдзя з дня нараджэння лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Купалы, песняра зямлі Магілёўскай Аляксея Пысіна)*

Спяваючая зямля беларусаў толькі ва Усходніх раёнах Магілёўшчыны нарадзіла выразнікаў песен-сінонімаў шчасця народнага паэта Беларусі А. Куляшова, паэтаў А. Пысіна, К. Кірэенку, А. Зарыцкага, А. Русецкага, П. Прыходзьку, П. Пруднікава і інш.

Мне проста ўспомнілася. Восенню 1967 года ў Трасцінскую сельскую бібліятэку, дзе я працаваў, завітаў супрацоўнік “Магілёўскай праўды” Аляксей Пысін, нарысамі і вершамі якога з вялікай асалодай я зачытваўся на старонках абласной газеты. Дарэчы, яго нарысы «Ясь і яго сяброўкі» і «Сустракала волю Беларусь» (урачыстасці ў Хоцімску, прысвечаныя 25-годдзю вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў) цікавы для нас, хацімчан, і зараз сваім майстэрствам і праўдзівасцю напісанага.

Крэдам у маім жыцці сталі і радкі верша паэта аб вызначэнні чалавечага шчасця — актыўным выяўленні чалавечай дзейнасці:

*Шчасце так не даецца*
*І яго не купіць;*
*Шчасце сеяцца, жнецца,*
*Шчасце ў кузнях куецца,*
*У мартэнах кіпіць.*
*І, як запавет — прысягу дапаўнялі:*
*Хачу аднаўленай і чыстай*
*Аддаць людзям любоў сваю.*

Пры размове спачатку аб справах службовых, яго ўразіла армейская чысціня і акуратнасць у памяшканні — пакойчыку бібліятэкі колькасцю назапашаных і размешчаных кніг і часопісаў. Палічкі былі прымацаваны нават пад столлю, дзе стаялі гадавыя камплекты часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Дружба народов» і другія. Стэлажы, палічкі, рамкі — самаробныя, ды змайстраваны былі з любоўю. Не тоячы

свайго здзіўлення, спытаўся ён у мяне, дзе я, маючы сціплы бюджэт, бяру сродкі на такое шыкоўнае абсталяванне.

Я маўкліва паказаў свае шырокія далоні і сказаў, што ўсё прыходзіцца рабіць самому і як цесляру, і як столяру, і як мастаку.

Пацікавіўся Аляксей Васільевіч і маім удзелам у Вялікай Айчыннай вайне. Калі я паведаміў, што ваяваў на Прыбалтыйскіх франтах, у 9-й Чырвонасцяжнай гвардзейскай стралковай дывізіі 18 гвардзейскім стралковым палку, трэцім батальёне, то ён з хваляваннем пачаў выпытваць, а хто быў камандзірам палка, хто камандаваў батальёнам, ротай.

Аказваецца, што ў гэтай дывізіі, у гэтым палку, і ў гэтым батальёне ваяваў і Пысін. Толькі першы раз ён пакінуў дывізію ў снежні 1942 года, калі быў паранены пад Вялікімі Лукамі.

Са шпіталя ён зноў вярнуўся ў роднае падраздзяленне, удзельнічаў у баях за вызваленне горада Белы Калінінскай вобласці і пасля другога ранення ў сакавіку 1943 года выбыў у другую вайскавую часць. Выходзіць яго месца ў батальёне заняў я.

А далей я даведаўся ад Аляксея Васільевіча, што на адным фронце, па суседству, мы ўдзельнічалі ў баях за вызваленне Літвы і Латвіі. І Дзень Перамогі сустрэлі, на беразе Балтыйскага мора.

З таго часу ён заўсёды звяртаўся да мяне, як да аднапалчаніна, а я прыліп да паэтычных радкоў яго прываблівых глыбінёй думак і пачуццяў, сцвярджаючых усё жывое, добрае, светлае.

І да гэтага часу захапляючыся мужнымі людзьмі, прыгажосцю да спеваючага коласу, чысцінёй пялёсткаў першай лясной кветкі — што ўсё гэта зліваецца ў адзін канкрэтны вобраз — вобраз Радзімы.

«Галоўная тэма вершаў Пысіна, — пісаў К. Куліеў, — любоў да зямлі, дзе мы жывём, дзе адбываецца цуд паспявання каласоў і чалавек робіць свой цяжкі штодзённы подзвіг, пераўтварае сусвет і рухае жыццё ўперад. Учытайцеся ў гэтыя вершы і падумайце, як добра гэта сказана:

*“Мне ў жыта хочацца ўвайсці.*
*Мне вечнасцю здаецца жыта”.*

Аркадзь Куляшоў высокую адзнаку даваў творчасці Пысіна: «Таленавітых хлопцаў у нас шмат. Мне, як магіляўчаніну, хочацца назваць свайго земляка — Аляксея Пысіна. Гэта вельмі здольны, самабытны паэт».

Гвардыі радавы пяці франтоў асэнсоўваў вайну і думаючы аб будучым пісаў:

*“Прайсці мы шмат з табой змаглі,*
*Ішлі праз полымя і дымы,*
*Каб болей людзі на зямлі*
*Не паміралі маладымі”.*

Пачуццё адказнасці, адчуванне віны перад сваёй дывізіяй, гатоўнасць падзяліць лес сяброў, для якіх бой за той запаветны ўзгорак стаў апошнім:

*...Ведайце, калі мяне не стане —*
*Я ў сваю дывізію пайшоў.*

І кожны з нас, аднапалчан пры склоне год пойдзе ў сваю дывізію, бо там прапісаны назаўсёды.

Кожны радок вершаў добрай і суровай ваеннай лірыкі дакументален:

*«Зямлянку» — зімнюю элегію*
*Спяваў камроты Весялоў .*
*(«Станцыя Гушчына»)*

Старшы лейтэнант Весялоў, заатэхнік з Волгі, спяваў пад гітару: «Бьётся в тесной печурке огонь» — песню, якую Аляксей Суркоў напісаў зімой 1941 у размяшчэнні

нашай 9 гвардзейскай, у адной з франтавых зямлянак пад Масквой. Гэту песню вельмі любілі ў нашай дывізіі ўсе байцы. Аляксей Васільевіч шчыра прызнаваўся: «Мне пажары, пажары ўсё сняцца, я баюся аслепнуць ад іх».

Паэзія прызвана без каментарыяў гаварыць чытачу безумоўна больш, чым аўтабіяграфія паэта, больш, чым анкета. Таму і незалежваліся на паліцах у Трасцінскай сельска бібліятэцы зборнікі верша і паэм песняра зямлі Магілёўскай Аляксея Пысіна.

З вялікай пашанай і беражлівасцю захоўваюцца ў краязнаўчым кутку бібліятэкі кнігі з аўтографамі паэта-земляка. Асаблівую каштоўнасць прадстаўляе кніга вершаў і паэзіі «Твае далоні», за якую паэт быў удастоены звання лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БСС імя Я. Купалы. На кнізе ў адрас уважлівых чытачоў аўтограф паэта, прасякнуты цеплынёй: *«Маім землякам — чытачам Трасцінскай сельскай бібліятэкі, што на Хоцімшчыні якія шануюць матчыну мову і бацькоўскую зямлю роднай Магілёўшчыны ў дзень 50- годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. 1 студзеня 1969 год А. Пысін».*

*«Маім шчырым сябрам, аматарам паэзіі, чытачам Трасцінскай, самай народнай на Магілёўшчыне сельскай біблітэцы з удзячнасцю і найлепшымі пажаданнямі»,* — напісаны аўтографы на другіх кніжках паэта.

Сціплая радасць і стоенная горыч страты яго, захапленне неўміручай сілай жыцця і бацькоўскі клопат аб наступных пакаленнях чалавека незвычайнай сціпласці і душэўнай чысціні аднаго з выдатных паэтаў Беларусі — ўсё гэта будзе з намі, у нашай памяці праз усё жыццё аб грамадзяніну-песняру зямлі Магілёўскай.

**Ласоўскі, М.** Сонца і песня : [да 70-годдзя з дня нараджэння лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Купалы песняра зямлі Магілёўскай Аляксея Пысіна] / М. Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1990. – 24 сакавіка. – С. 4.

Неяк зайшоў у родную школу і ў размове з яе дырэктарам Марыяй Васільеўнай Барыбкінай, выкладчыцай беларускай мовы і літаратуры, даведаўся, што пры правядзенні ўрока аб сучаснай беларускай літаратуры ў XI класс па тэме «Адлюстраванне подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне» вучні з асаблівай прагнасцю і ўвагай слухалі яе расказ аб тэматычным багацці твораў народнага пісьменніка Рэспублікі Беларусь Івана Гаўрылавіча Чыгрынава.

— Калі ласка, скажыце, — усхвалявана гаворыць мая субяседніца, — каго не зацікавяць, старонкі яго раманаў, дзе ўсе падзеі адбываюцца ў нашым Прыбяседскім краі? І як прыемна мне было зачытаць радкі з рамана «Апраўданне крыві» з апісаннем пахода верамейкаўскіх жанок да лагера ваеннапалонных. Разам з імі, ідзе нявестка Антона Жмэйды Анюта, каб адведаць хворую маці.

— Якраз нічога не здарылася б з тваёй маці ў тым Трасцяне. Ну, захварэла, дык ці трэба яшчэ з такой далечыні дачку, клікаць? — папракаюць яе жанчыны.

— Не, я матку так не магу пакінуць! — запярэчыла Анюта. —…адведаць матку трэба. Яны, старыя, доўга хварэюць. І пасля добрых меркаванняў Анюты ў адрас маці жанчыны згаджаюцца з яе доказам, а ўсё ж рашаюць: «Дак праверым во, паглядзім, ці горш тваё Трасціно за нашы Верамейкі».

Калі чытала гэтыя радкі, то. і ў самой, і ў маіх вучняў сэрцы поўніліся радасцю, на тварах былі радасныя ўсмешкі. Гэта радасць гонару кранала кожнага, што родная веска Трасціно ўвайшла на старонкі мастацкай літаратуры. Радавала і тое, што Іван Гаўрылавіч — ганаровы піянер піянерскай дружыны нашай школы.

З замілаваннем уважліва слухаў я Марыю Васільеўну, не рашаючыся перапыніць яе расказ і не адважваўся ўступаць у размову.

— І зараз пісьменнік-зямляк моваю драмы рашыў напісаць праўдзіва ўсю, гісторыю Беларусі ў яе важнейшых падзеях і асобах. У творах ён вяртае народу гістарычную памяць. Думаецца, што тэма вайны ім поўнасцю не вычарпана і ў чатырох яго раманах «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві», «Свае і чужынцы», «Вяртанне да віны» з паказам жыцця на акупіраванай ворагам тэрыторыі ў першыя ваенныя месяцы. Яму ёсць што сказаць пра гераічнае мінулае сваіх землякоў, свайго народа.

Поўнасцю згаджаюся з думкамі-меркаваннямі Марыі Васільеўны. Мне асабіста шматразова давялося перажыць радасць цеснай сяброўскай сувязі з даволі цікавым пісьменнікам, які жыве вялікаснай задумай напісаць цыкл раманаў пра беларускі народ. З усведамленнем патрэбы нашай літаратуры раздзімаць полымя, пашыраць кола святла, якое запалілі калісьці Багушэвіч, Купала, Колас, Багдановіч, Гарэцкі, Чорны, Куляшоў…

Многія пісьменнікі пасмейваліся з зайздрасцю ў свой час: «Добра Івану Чыгрынаву! Ён закінуў сабе хатулю за плечы і пайшоў вандраваць ад вёскі да вёскі, ад хаты да хаты!». У адным з твораў ён адкрыта сказаў: «Галоўнае, каб сярод людзей быць», а на запытанне старога цыгана Мікалы «што цябе пацягнула на гэта бадзянне?», з якім правёў каля вогнішча ноч, адказаў: «Людзі цікавыя, прыгожыя мясціны».

Але ж знаёмства з новымі людзьмі, з новымі мясцінамі не цясняць у яго сэрцы любоў і прывязанасць да роднага прыбяседскага кутка, адкуль пачынаўся ягб жыццёвы шлях, дзе прата-тыпы герояў яго твораў.

«Лёс, жытнёвыя палеткі. Збажына высокая, з цяжкім коласам, важкасці, якога нараджае ў душы радаснае хваляванне. Бо як нялёгка тут, на гэтых пясчаных астраўках,

вырасціць добры ўраджай. А цяпер ён больш чым па 20 цэнтнераў з гектара», — такім паўстае перад пісьменнікам родны кут.

Зачараваў, прывабіў мяне Чыгрынаў сваім апавяданнем «Бульба», якім адкрываўся першы зборнік апавяданняў «Птушкі ляцяць на волю», выйшаўшым 3 друку ў 1965 годзе, а ў перыядычным друку з'явіўся ў пачатку шасцідзесятых гадоў. У 1967 годзе абрадаваў мяне і другі зборнік апавяданняў «Самы шчаслівы чалавек». Маю ўвагу апавяданні маладога пісьменніка- земляка цешылі высокім гуманістычным пафасам, праўдзівасцю, народнасцю, багатым і разнастайным светам чалавечых лёсаў, іх пачуццяў і думак. А потым у часопісе «Маладосць» азнаёміўся з радасцю з першым раманам «Плач перапёлкі».

І раптам нечаканая незабыўная першая сустрэча з аўтарам, які ў лютым 1971 года, калі на Магілёўшчыне праходзілі дні беларускай літаратуры, са сваёй творчай справаздачай у складзе групы беларускіх пісьменнікаў пабываў у нас на Хоцімшчыне. Сустрэчы прахозілі ў раённым Доме культуры, у калгасе «Чырвоны маяк», саўгасе «Трасціно». Мне прыйшлося суправаджаць гасцей і выступаць з аглядам іх жыццёвага і творчага шляху. Запомнілася, як ва ўрачыстай абстаноўцы, калі залы клубаў былі перапоўнены хацімчанамі, што яблыку недзе было ўпасці, Іван Гаўрылавіч быў прыняты ў ганаровыя піянеры Хоцімскай і Трасцінскай сярэдніх школ.

— Для мяне асабіста, — гаварыў ён шчыра, — гэта цудаўная, радасная падзея. Ведаеце, я ўпершыню ў жыцці прынят у піянеры. Так атрымалася, што ў нашай Вялікаборскай сямігадовай школе ў першыя гады пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў піянерская работа чамусьці не вялася. А тут на хоцімскай зямлі ліквідавалі гэты прабел у маёй біяграфіі. Вялікае дзякуй хоцімскім таварышам за вялікую для мяле радасць.

Для многіх хацімчан было вельмі цікавым блізкае знаёмства з пісьменнікам, як з чалавекам жыццёрадасным, у якога душа нараспашку, унікнуць у нейкай ступені ў працэс яго творчасці. У размове з хацімчанамі, як ён стаў пісьменнікам, Іван Гаўрылавіч з адкрытай душой расказваў:

— У нашай Саматэвіцкай сярэдняй школе вучыўся Аркадзь Куляшоў, паэт, які не мае патрэбы ў ацэнцы. Дык вось, калі ў іншых школах літаратуру пазнавалі па кнігах безадносна да мясцовасці, дзе вучні нарадзіліся і жылі, дык мы, хто хадзіў у Саматэвіцкую школу, мелі магчымасць знаходзіцца сярод герояў куляшоўскіх кніг, сярод жывых герояў яго паэзіі. Мы хадзілі па апетай ім зялёнай дуброве, купаліся ў Бесядзі, ведалі Шкробата і Шандабылу. Гэта быў цэлы свет, жывы і паэтычны і ўсё свяшчэннадзейства — “стварэнне літаратурнага твора”, “абпальванне гаршкоў” (помніце – не багі гаршкі абпальваюць) – адбывалася на маіх вачах. Ну, напрыклад, ён заўсёды заразлівы. Можа гэта і садзейнічала смеласці, з якой і я пачаў спрабаваць сябе на заманлівай ніве.

Вясной 1952 года на выпускны вечар у Саматэвіцкую школу прыехаў з Мінска Аркадзь Куляшоў — жывы класік! У прысутнасці госця — ураджэнца гэтых мясцін малады выпускнік Іван Чыгрынаў чытаў вершы. І ў той час ніхто, не змог прадбачыць перадачы ланцужка дароў зямлі касцюковіцкай Аркадзь Куляшоў — народны паэт, нібы перадаваў эстафету сучаснаму народнаму пісьменніку Івану Чыгрынаву адзіным народным талентам зямлі нашай Магілёўскай.

Найбольш поўна тэма вайны і чалавека на вайне раскрываецца ў раманах пісьменніка. Дзеянне адбываецца ў мясцінах, праз якія не ішлі торныя дарогі, якія вайна мімаходзь зачапіла сваім вогненным крылом. Але ж раманы пісьменніка-земляка — гімн роднай зямлі, гэта раманы пра народ, пра народнае жыццё, нацыянальны характар. На Хоцімшчыну Чыгрынаў прыязджаў летам 1971, 1972, 1979, 1983 гадоў для збора і вывучэння матэрыялаў аб подзвігу кавалерыйскага заслону ў жніўні 1941 года

на хоцімскай зямлі, аб дзейнасці партызанскага атрада Дзмітрыя Мядзведзева восенню 1941 года.

У час сустрэчы прайшлі разам з ім да вытокаў прыгажуні-Бесядзі, доўгі час назіралі і слухалі тонкія і чыстыя галасы светлых капель крыніц, які напаўнялі раку каля вёскі Ціхань, па тройчы асвяжалі крынічнай вадой свае твары, прагна наталялі смагу. Па сцежках партызанскага атрада Дзмітрыя Мядзведзева яго цікавіла кожная ручаіна, кожнае дрэва, кожная травінка, кожны грыбок. Ён дасканала вывучаў птушак, травы, расліннасць, занатоўваў у свае запісныя кніжкі ўсё: і птушыныя спевы, і пахі траў.

— Чытач любіць праўдзівую літаратуру. — падкрэсліваў не аднойчы Іван Гаўрылавіч. — Антэны чытача заўсёды настроены на праўду. Найдаражэйшы мне чытач маладзейшы. Мо таму, што кнігам, якія мы пішам, заставацца з ім. Таму і боязі перад ім больш, таму і адказнасць перад ім большая. Адказнасць — гэта найперш.

— Калі нам удасца жыць на зямлі, калі ўсе зладзіцца з радыяцыяй, — гаворыць Іван Гаўрылавіч, калі размова куды мы ідзём у сваёй гісторыі, — то мы паспрабуем наладзіць сваю дзяржаву са сваёй мовай, сваёй прыгожай нацыянальнай душой, працавітай і вясёлай. Мяркую, што самай светлай старонкай стане наша дзяржава. Думаю, што пераможам. Пры цяперашняй сваёй прыцiхласці наш народ не проста з'ёжыўся, але і збіраецца з думкамі, з сіламі.

**Ласоўскі, М.** Сустрэчы з пісьменнікам / М. Ласоўскі // Шлях кастрычніка. – 1995. - 8 ліпеня. – С. 3.

## Сябры-аднапалчане

Аглядаючы шматлікія стэнды Крычаўскага краязнаўчага музея, маю ўвагу прыцягнула экспазіцыя: «Яны вызвалялі наш край». Чытаю фотакопіі газеты ваенных гадоў «Бей врага» адной са стралковых дывізій 50-й арміі. І раптам нечаканае радаснае здзіўленне! Адна з карэспандэнцый «За родную Беларусь» расказвае аб гераічных подзвігах маіх аднавяскоўцаў — Парфена Андросенкі і Леаніда Гаркаліна. Ваенны журналіст Іван Мартынаў пісаў:

> «У трупе маладых байцоў новага папаўнення прыйшоў у полк беларус Парфен Андросенка. Гэты дваццацігадовы здаровы хлопец з моцнымі рукамі, з адкрытым і простым тварам адразу спадабаўся таварышам па роце. Нягледзячы на сваю маладосць, Андросенка многае пабачыў...

Парфен Андросенка расказаў таварышам, як лютаваў на беларускай зямлі вораг, як калечыў і забіваў бязвінных людзей, як апляваў і забрудзіў родныя палі і лясы.

— Я верыў, што мне давядзецца ваяваць у радах Чырвонай Арміі... І я не падвяду ў баі!

І вось наступіў доўгачаканы бой. Падраздзяленню лейтэнанта Галубцова загадана было на світанні фарсіраваць водны рубеж, зламіць лінію абароны праціўніка. Байцы хутка перайшлі раку, кінуліся наперад. Андросенку пры пераправе з непрывычкі перашкаджаў абутак. (Тылы хутка наступаючых часцей адсталі, і маладое папаўненне было ў цывільнай вопратцы і ў лапцях). Ён скінуў яго і босы пайшоў у атаку. Шлях перагарадзіла дротавая агароджа. Андросенка прыкладам разарваў дрот і адным з

першых уварваўся ў акопы ворага. У гэты момант свежае падраздзяленне гітлераўцаў кінулася ў контратаку. Некаторыя нашы байцы заляглі.

— Уперад, за Радзіму! Не адставаць! — крыкнуў Андросенка.

Захопленыя яго нарывам, байцы ў другі раз адкінулі немцаў і праследавалі іх у гушчыні лесу. Рука аб руку з Парфенам Андросенкам змагаўся яго таварыш, таксама малады баец Леанід Гаркалін. У лесе ім перагарадзіла шлях трупа немцаў.

— Кідай зброю! Капут Гітлеру!

Збянтэжаныя дзёрзкацю савецкіх байцоў, фашысты кінуліся наўцёкі. Двое ўзнялі рукі ўгору.

— «Языкі» вельмі патрэбны камандзіру, — сказаў свайму таварышу Андросенка. Палонных павялі на камандны пункт. Паранены асколкам міны ў галаву, Андросенка коратка далажыў камандзіру:

— Захапіў і даставіў двух палонных. Дазвольце вярнуцца ў роту?

Камандзір не дазволіў. Ён загадаў маладому байцу абсушыцца, замяніць абмундзіраванне (зараз ужо на вайсковае), перавязаць рану. Раненне Парфен атрымаў лёгкае і ў той жа дзень вярнуўся ў роту. Камандзір часці ўзнагародзіў Парфена Андросенку і Леаніда Гаркаліна медалямі «За адвагу».

...Многа пасля гэтага прайшоў Парфен баявых дарог. Вызваляў родную Беларусь і брацкую Польшчу, штурмаваў Кенігсберг, граміў японскіх самураяў на Далёкім Усходзе. Вярнуўся дадому пасля вайны. Стаў Андросенка трактарыстам. Шэсць гадоў вадзіў трактар па палях роднага калгаса «Новы шлях», даводзіў да ладу запусцелую пры акупацыі зямлю. Але падвяло чалавека здароўе. Прыйшлося Парфену Андросенку стаць конюхам, а потым працаваць у паляводстве.

Вельмі часта мне прыходзілася назіраць, як ён у час працы конюхам беражліва, з любоўю адносіўся да коней. Аднойчы быў сведкам, як наш Парфен «прабіраў» двух рабочых, якія так заганялі коней, што жывёліны ледзь дух перавялі. Ну, кажу я вам, ніколі не бачыў Парфена такім гнеўным...

Знаходзячыся на заслужаным адпачынку, Парфен Андросенка ў час напружаных работ у саўгасе прымае актыўны ўдзел. Увосень ён, як майстар, працаваў на буртоўцы бульбы і буракоў. А зараз аднавяскоўцы даверылі яму працаваць малаказборшчыкам.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны Парфен Андросенка і зараз у наступленні— сваёй самаадданай працай умацоўвае агульную скарбонку Харчовай праграмы.

А што з Леанідам Гаркаліным? Вярнуўся ён з вайны жывы і здаровы. Два гады ўзначальваў калгас «Новы шлях», больш чатырох гадоў працаваў брыгадзірам паляводчай брыгады, а потым доўгі час — на больш цяжкім участку — у жывёлагадоўлі пастухом. Падвяло здароўе — памёр. Прах яго пахаван на вясковых могілках.

**Ласоўскі, М.** Сябры-аднапалчане / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1988. –19 красавіка. - С. 2.

## Сярод добрых людзей

*Не трэбажыць, як набяжыць.*
*Так жыць на свеце трэба,*
*Каб да апошніх дзён любіць*
*Людзей, зямлю і неба...*

*А. Грачанікаў*

Побач з намі і на нашым шляху многа людзей шчырых і хітрых, добрых і злых, адкрытых і затоеных. Па-living рознаму адчуваеш сябе сярод іх. Іншы раз, здаецца, і аднесліся да цябе з усёй гасціннасцю, і пры размове ўсміхаліся, а ўсё роўна хочацца хутчэй развітацца. Затое якое задавальненне, якая радасць ад знаёмства з людзьмі цікавымі, шчырымі. З імі хочацца пабыць больш, бо душой адпачываеш, аб многім ад іх даведаешся, і нешта пойдзе на карысць табе самому.

У дзень, калі разам з сусветнай грамадскасцю Рэспубліка Беларусь адзначала Дзень пажылых людзей, і калі гэты дзень пачаў адлік Міжнароднага года пажылых людзей, абвешчанага Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый пад дэвізам: "Да грамадства ўсіх пакаленняў" з асаблівай увагай разам з жонкай Гашай некалькі разоў падрад чыталі і перачытвалі радкі віншавання Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ў наш адрас: *"Ад усяго сэрца жадаю Вам, дарагія нашы ветэраны, добрага здароўя, разумения з боку блізкіх, даўгалецця і дабрабыту... Жыццё кожнага з Вас - яркая старонка гісторыі, заслугоўваючая глыбокай павагі. Многія з Вас, нягледзячы на свой узрост і стан здароўя, працягваюць плённа працаваць і займацца грамадскай дзейнасцю, выхаваннем падрастаючага пакалення".*

З вялікай асалодай смакавалі мы гэтыя радкі віншавання, і хаця дзень быў непагодлівы, але ў нашых сэрцах адчувалася бурнае захапленне адносінамі пашаны Прэзідэнта да нас, ветэранаў, ажно ў далёкай ад сталіцы глыбінцы, тут на роднай хоцімскай зямлі. Кранула бязмежна душэўная цеплыня радкоў віншавання. Яны рабілі ўплыў як бальзам на нашы збалелыя душы.

Удзячнасць - адна з самых цудоўных уласцівасцей, дараваных нам. Удзячнасць той бярозцы, пад якой іграўся калісьці ў дзяцінстве. Удзячнасць рукам маці, выпесціўшым цябе. Бацькоўскай хаце, у якой быў узгадаваны. Лагоднай карміцельцы – зямлі прыбесядскага краю. Гэта пачуццё - наша сувязь з мінулым, духоўная сувязь з людзьмі.

У першую чаргу мы, людзі сталага ўзросту, добра ўсведамляючы, што жыццё наша больш не паўторыцца і, каб не спазніцца, спяшаемся лепшыя словы ўдзячнасці выказаць чулым людзям з аддзела сацыяльнай абароны райвыканкома і асабліва яго кіраўніцы - дабрадзейцы Галіне Андрэеўне Каралёвай. Аддзел сацыяльнай абароны- гэта наш апошні востраў добрых надзей.

Кожны з пенсіянераў, хто ў свой час з натхненнем працаваў у скарбонку Бацькаўшчыны не звяртаючы асаблівай увагі на стан свайго здаороўя, мае к фінішу жыцця букет хвароб. У тым ліку мае гэта і аўтар допіса.

За паратункам нядаўна звярнуўся да чараўніцы-тэрапеўта раённай паліклінікі Веры Васільеўны Лімаравай. Яе прафесіяналізм, яе добрае чалавечае сэрца, яе гаючыя словы не аднойчы прыходзілася паспытаць самому і шмат разоў чуць добрыя словы ад хацімчан, хто лячыўся ў яе. Вера Васільеўна - міласэрны маг, патрыіярх у тэрапіі. І вось чарговае ўважлівае комплекснае абследаванне з шматлікімі лабараторнымі аналізамі дае ёй магчымасць вызначыць правільны дыягназ захворвання, выпісаць рэцэпт на лекі ў аптэку, а таксама даць стос парад, што выкарыстаць з народнай медыцыны. І ўжо з

добрым настроем у адказ сыплю мільён падзяк ёй - выратавальніцы за ўвагу, клопат, шчырасць, што яна дорыць людзям гаючае дабро і гаючую ласку, дорыць нам, хворым, здароўе, што, выконваючы клятву Гіпакрата, мае вялікую чалавечнасць Ідабрату. Яе абаяльнасць, яе ўменне знайсці агульную мову з кожным пацыентам – важнейшая рыса характару.

... У сярэдзіне дня гаспадыня даклала, што на падворку захварэў парсючок "Чарныш" і трэба тэрмінова звярнуцца за дапамогай да ветэрынарнага доктара. Працоўны дзень у разгары і месца знаходжання доктара не так лёгка знайсці. Але ж мне пашанцавала. Як толькі я выйшаў на вясковую вуліцу, сустрэў машыну ветэрынарнай дапамогі саўгаса. У вадзіцеля аўтамабіля Аляксея Аляксеевіча Лупекіна даведаўся, што ветэрынарныя работнікі праводзяць прафілактычныя мерапрыемствы на свінагадоўчай ферме саўгаса. Да фермы гэта амаль тры кіламетры, і каб не ісці туды самому, прашу Аляксея Аляксеевіча, што як ветэрынарныя работнікі закончаць свой працоўны дзень, дык каб хто з іх заехаў і аказаў дапамогу. І як сапраўднае дзіва - увечары завітала на дапамогу сама галоўны ветэрынарны доктар саўгаса Зінаіда Васільеўна Лупекіна. Колькі я і памятаю, заўсёды ўважлівая, чулая, спагадлівая,

Зінаіда Васільеўна проста, без усялякіх хітрыкаў акажа неабходную дапамогу. Вось і ў папярэдні раз, калі хварэў наш парсючок "Бельчык", а доктару патрэбна было ў той дзень ехаць у райцэнтр са справаздачай, дык яна ў святочным адзенні зрабіла выратавальны ўкол, і потым паехала на справаздачу. Сваім асабістым прыкладам Зінаіда Васільеўна вучыць гэтаму і сваіх падначаленых ветэрынарных фельчароў і санітараў. Грэх не сказаць тут, што калі я ў свой час працаваў у Трасцінскай сельскай бібліятэцы, то Зінаіда Васільеўна была самым актыўным чытачом. Чытала шмат не толькі сама, а чытала ўся сямейка: імуж, і дзведачкі, у той час школьніцы, а зараз настаўніцы. Паэт-рамантык Навэлік, разважаючы аб фарміраванні ідэальнай асобы, гаварыў: "Чалавекам стаць - гэта мастацтва". Зінаіда Васільеўна валодае гэтым вялікім мастацтвам, якое спалучае духоўнае багацце, маральную чысціню, фізічную дасканаласць. Яна не скупіцца ішчодра дзеліцца бескарысліва душэўнай цеплынёй, імкнуцца рабіць больш дабра людзям.

... У чаканні прывозкі хлеба ад дзённай мітусні рашыў крыху расслабіцца і прысеў на лаўку пад дрэўцамі ліпак каля магазіна, бо прышоў раней пэўнага часу. Павольна вачыма зрабіў агляд, нібы пераклічку, прыгажунь меднастволых сосен і беластволых бяроз. Амаль адразу на сэрцы запанавала заспакоенасць ад убачанага цудоўнага хараства прыроды роднай трасцінскай зямлі. Павітаўшыся, побач прыселі на лаўкі падышоўшыя пакупнікі-аднавяскоўцы і пачалася задушэўная гамонка аб розных падзеях і тэмах.

Магчыма, на першы погляд гэта і дробязь, але ўсё гэта дзейнічае станоўча на настрой асабліва старых людзей, людзей сталага веку. Бо тут праяўлен клопат работнікамі сельскага Савета па добраўпарадкаванню тэрыторыі каля магазіна. Зроблена некалькі лавак, на якіх могуць прысесці некалькі дзесяткаў чалавек і крышку перадыхнуць пасля хадзьбы ад свайго парога. Бо крочыць прыходзіцца некаторым парадачную адлегласць, ды са слабым здароўем і з дапамогай кіёчка. Прыемна самому, ды і пачуць удзячнае слова ад аднавяскоўцаў у адрас выканкома сельскага Савета. Атрымалася вельмі хораша, як нібы раней збіраліся людзі ў вёсцы на прызбах-завалінках. Побач зроблен і невялікі павільён з дахам і прылаўкам, дзе можна весці продаж сельскагаспадарчай прадукцыі кожнаму, у каго яна ёсць.

Калі ласка, з Вас, Міхаіл Аляксеевіч за бохан хлебушка чатырнаццаць тысяч пяцьсот рублёў,— сустракае з вясёлай усмешкай і цёплым ласкавым словам каля касы загадчыца, гаспадыня магазіна Надзея Уладзіміраўна Лімарава. Лагоднае абслугоўванне кранае да глыбіні душы. Асабліва прыемна пачуць вымаўленне з

пяшчотай яго вялікасці - "хлебушка". Узаемна ў адказ бадзёра рапартуеш адказам: "Вялікае дзякуй!"

За бездакорную працу Ганаровай граматай Хоцімскага райпо быў узнагароджан калектыў работнікаў магазіна у Міжнародны Дзень кааперацыі, а за арганізацыю гандлю і афармленне залы ў навагоднія дні ў конкурсе магазіну было прысуджана другое месца.

... Добрае ўдзячнае слова хочацца сказаць пісьменніку Міхасю Фядотавічу Карпенку. У пачатку пяцідзесятых гадоў нас, дэмабілізаваных воінаў-камсамольцаў накіравалі працаваць загадчыкамі хат-чытален і адначасова ў камсамольскіх арганізацыях калгасаў абралі сакратарамі. Гэта Мікалая Анціпенку ў Бярозках, Івана Бяспалава ў Ліпаўцы, Адама Касцюшкіна ў Баханах, Апанаса Легчанкова ў Дубраўцы, мяне ў Трасціно. Спецыялізацыю атрымалі на месячных курсах толькі ж.

У той час на Хоцімшчыну прыехаў выпускнік Гродненскага культасветвучылішча Міхась Карпенка - адзіны ў раёне дыпламіраваны работнік культуры. Яго прызначылі працаваць дырэктарам раённага Дома культуры. Дык ён быў нашым настаўнікам. У яго мы прагна вучыліся пазнанню і вопыту культурна-асветнай работы. Настаўнік чулы і зараз не забыў свайго вучня. У маіх матэрыялах на старонках самай чытаемай газеты на Хоцімшчыне - "Шляха Кастрычніка" заўважыў зярнятка, завязь магчымай у будучым кнігі. Міхась Фядотавіч падбадзёрвае, натхняе над працай па вывучэнню і напісанню матэрыялаў, звязаных з мірамі далёкімі і блізкімі роднай Бацькаўшчыны - Хоцімшчыны. А каб апець, уславіць Хоцімшчыну, неабходна шмат папрацаваць - азнаёміцца і прачытаць мноства старонак шматлікіх пісьмовых крыніц. Гісторыя не любіць паспешнасці. Гэта ж вунь як гаварыў вялікі рускі мастак-гуманіст, пісьменнік і грамадскі дзеяч Мікалай Рэрых: "Библиотекарь - первый вестник красоты и знания. Ведь это он открывает врата и из мёртвых полок добывает сокровенное слово для просвещения ищущего духа".

... Шмат добрых водгукаў чуў аб якасным і смачным хлебе, спечаным у пякарні калгаса "Авангард". Ну і як не паспытаць новай мясцовай прадукцыі! Прашу аднавяскоўца, вадзіцеля аўтамабіля Віталія Корнева, які часта наведваў вёску Ельня, каб ён мне купіў два боханы. Віталь ахвотна выканаў маю просьбу. А я пераканаўся ў праўдзівасці факта.

... У мінулым годзе, праходзячы па вясковай вуліцы, мімаходзь на сядзібе Ліпскіх заўважыў ярка-жоўтыя гарбузы. Адразу падумалася, што, па ўсёй верагоднасці, яны будуць смачныя, калі зварыць з прасянымі крупамі на малацэ - будзе адменная ежа для бяззубых старых. Пры сустрэчы прашу гаспадыню: - Марына Пятроўна, не адкажыце ў просьбе старых, калі ласка, дайце некалькі семак для сяўбы.

- Вашу просьбу задаволю вясною, калі буду садзіць гарбузы на сваім агародзе, — паабяцала яна тады.

Абяцанне сваё выканала. У гэтым годзе ў нашым агародзе выраслі чакаемыя гарбузы. Сапраўды, страва ў радасць старым - талерку і лыжку абліжаш і шчырае дзякуй заўсёды выказваеш дарыльшчыцы-дабрадзейцы Марыне Пятроўне Ліпскай.

... Паехаў за лекамі ў аптэку, а там санітарны дзень. Аўтобус рэйсавы не ходзіць жа кожны дзень. Прашу суседа Анатоля Рыгоравіча Зайцева, каб ён зрабіў для мяне паслугу і па майму рэцэпту атрымаў лекі. Анатоль Рыгоравіч на працу ездзіць штодня, бо працуе ў Хоцімскай бальніцы. І ён ахвотна зрабіў для мяне добрую справу.

... Аднойчы пры размове бедаваў, што гадзіннік-будзільнік выйшаў са строю, а гадзіннікавы майстар адмовіў у выкананні рамонта.

- Не бядуй, Аляксеевіч, пастараюся паставіць ваш будзільнік у строй. - Прыміце ўпэўненне ў маёй поўнай павазе да вас, старых, - запэўніў мяне Мікалай Мікітавіч

Аўдзюшка, калі наведваў сваіх блізкіх родзічаў у нашай вёсцы, сам жа ён працуе і жыве ў райцэнтры. І хоцімскі Кулібін сапраўды аднавіў гадзіннік-будзільнік.

... Эх, час касьбы, вясёлы час! Гэтыя коласаўскія радкі навяваюць смутак нам, старым, што па стану здароўя не можам цешыцца гэтай радасцю і прыходзіцца з просьбамі звяртацца да маладых касцоў - "ваякаў мірнай працы". І вельмі добра, што на дапамогу да нас яны прыходзяць. Так атрымалася, што першы ўкос зрабіў Аляксандр Балабенка, а другі Аляксандр Сафонаў. А калі сушылі і зграбалі сена на выручку прышлі вучні мясцовай школы браты Аляксандр і Сяргей Цішчанкі і Валерый Кавалёў. Не забыла пра нас і дырэктар Трасцінскай СШ Марыя Васільеўна Барыбкіна, улічваючы нашу нядужасць:

- Ведаю, што ўсе лужкі захоплены і пакошаны "хватамі" і ў вас няма ніякіх магчымасцей у нарыхтоўцы для каровы сена, дык мы скасілі ўчастак каля памяшкання школы, дык вы высушыце і вазьміце сабе для асабістых патрэб, - з цёплай лагоднасцю прапанавала яна сваю дапамогу. Перавёз сена з сядзібы на сваёй кабылцы Машы аднавясковец-інвалід Іван Іванавіч Шасцерыкоў. Восенню таксама не пакінулі нас у бядзе і адзіноце. Распашку баразён бульбы зрабілі аднавяскоўцы Аляксандр Балабенка, Віктар Мікуцін і Сяргей Іосіфавіч Бянькоў. Капаць бульбу дапамаглі жанчыны Валянціна Фёдараўна Падалякіна і Валянціна Васільеўна Ласоўская. Перапашку бульбянішча, узорванне агарода зрабілі Сяргей Зайцаў, Сяргей Нікіценка і Пятро Барадзенка. Увогуле выратавала нас грамадства - добрыя аднавяскоўцы. 60 год таму назад у вершы "Наша моладзь" народны пясняр Янка Купала пісаў:

*Вёсны прыходзяць, вёсны адходзяць,*
*Моладзь красуе заўсёды,*
*Слаўная весна ў вечным народзе*
*Славу будуе з народам.*

Кветкі жыцця - моладзь. І так хочацца, каб яны, маладыя, жылі лепш і былі шчаслівей нас, увергнутых цяперашнім не простым часам у вір суровых жыццёвых выпрабаванняў.

**Ласоўскі, М.** Сярод добрых людзей / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1998. – 12 снежня. - С. 4.

# *Тактоўнасць і цеплыня*

Апошнія дні мая, напярэдадні Міжнароднага Дня абароны дзяцей, чарга ахвотна прапускала без затрымкі пацыентаў-дзяцей разам з маці для праходжання шматразовых працэдурных сеансаў лячэння ў фізіятэрапеўтычным кабінеце раённай бальніцы на другім паверсе ў пакоях-кабінетах 15 і 18. А потым пасля вясёлага дзцячага ланцужка - будучыні нашай Бацькаўшчыны гаспадыня кабінета Вольга Ліпкіна з лагоднасцю прапануе мне, як інваліду Вялікай Айчыннай вайны, сесці на крэсла, каб апарат, начынены дыстыліраванай вадой разам з лекамі "Вулкан" прыдаў бадзёрасць мне сваімі лекавымі магчымасцямі.

І пакуль я павольна варочаўся-вяртухаўся, нечакана адчыняюцца дзверы і ў пакой забягае спазніўшыйся хлопчык, шпаркімі крокамі абганяе мяне і ўсаджваецца на прапанаванае мне месца. Крышку разгублена здаўлены яго руплівымі дзеяннямі, павольна разглядаю з цкавасцю малюнак на яго кашулі, верагодна з аднайменнай беларускай народнай казкі - ката Максіма, а, магчыма ж, і гаспадар кашулі носіць гэта імя**,** і каб непрыемнае ўражанне згладзілася, прапаную: — Што ж, сястрычка, падлячыце гэтага хлопчыка... Відаць смяляка, магчыма ж будзе генералам, а я, як ужо былы салдат, крышачку і пачакаю,— вяду я размову з медыцынскай сястрой з цвёрдаю вераю, што гэта ўсё ў яго хлапечых будучых магчымасцях. Хоцімшчына ж па праву ганарыцца сваімі землякамі-генераламі Я. Шарабуркам, В. Васільчанкам, У. Драздовым, В. Казловым, М. Піліпенкам, Я. Сусько, І. Юркіным і заўсёды з радасцю ўспрыме, калі гэты спіс дапоўніцца і новымі імёнамі. Ды і ў нашай сітуацыі зараз патрэбны новыя героі, як калісьці Аляксандр Македонскі з атрадам усяго 10 тысяч чалавек адважна разагнаў мільённую армію аб'яднанага, але заблытанага ў інтрыгах і махлярствах Усхода.

— Каб стаць генералам, трэба ж з дзяцінства трымаць вытрымку, запасціся разуменнем і цярплівасцю,— раз'ясняе мне гаспадыня і дадае,— ды прытым яму ж патрэбны зусім другія саставы лекаў.

Уключан "Вулкан". Удыхаю гаючае, нібы ў гарачай парной лазні карыснае паветра для здароўя і здзіўляюся ўменню накіраваць псіхалагічнае ўздзеянне пачуцця тактоўнасці ў дапамогу хвораму.

Праца і цярпенне – справы здзяйснення,— гавораць у народзе. Сапраўды лёгкіх шляхоў-дарог у жыцці рэдка ў каго бывае, а трэба на сваім жыццёвым шляху перамагчы ўсе перашкоды, выпрабаванні, кааб быць потым пераможцам у дасягненні сваіх мэт і вышынь.

Далікатнасць медыцынскай сястры хлапчуку спрыняў, відаць, таксама павучальна для сябе. Тварык у яго пакрыўся чырванню.

Дай Бог! Надзялі хлопчыка талентам генерала! Каб зберагаў ён мірнае неба над нашай Бацькаўшчынай - Белай Руссю! Мір на зямлі - мы яго дастойна адстаялі вялікаю цаною! Для будучыні цудоўнай усяго чалавецтва на планеце -Зямля!

На доўгі час захаваецца ў маёй памяці тактоўнасць, цеплыня і гэтага выпадка, і другіх добрых назіранняў, калі атрымліваў гаючыя лекі ў фізіятэрапеўтычным кабінеце, дзе працуюць добрыя медыцынскія работніцы Вольга Мікалаеўна Ліпкіна і Ірына Пятроўна Сенчанка.

**Ласоўскі, М.** Тактоўнасць і цеплыня / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1999. - 17 ліпеня**.** - С. 4.

«Перада мною праходзяць войскі — таварышы мае. Я прапускаю іх, як камандуючы, хоць я і не генерал, зразумела, і не маршал, — просты сержант Іван Арлюк, калгаснік з Прыдняпроўя, звычайны, так сказаць, пераможца ў сусветнай вайне».

Не выпадкова ўспомніліся мне гэтыя радкі з «Аповесці палымяных год» Аляксандра Даўжэнкі, вядомага савецкага рэжысёра і драматурга. Такія словы мог бы сказаць і другі «звычайны пераможца», па званню таксама не генерал і не маршал. Праўда, такі самы радавы пехацінец Іван Андросенка, ураджэнец маёй роднай вёскі Трасціно, мой аднакласнік і аднагодка і таксама кнігалюб.

Іван Андросенка адносіцца да пакалення тых, каго Вялікая Айчынная вайна захапіла падлеткам, каго яна прымусіла пасталець раней тэрміну, апрануўшы семнаццацігадовых у салдацкія шынялі. У акопе перад наступленнем яму быў уручан і камсамольскі білет. З баямі ён прайшоў многія кіламетры па зямлі роднай Беларусі і Літвы да Усходняй Прусіі. Усходне-Пруская аперацыя Савецкай Арміі ўвайшла ў летапіс Вялікай Айчыннай вайны як адна з яе старонак. На тэрыторыі -Усходняй Прусіі гітлераўцы стварылі рад ўмацаваных раёнаў, моцных у інжынерных адносінах, франтальныя і адсечныя пазіцыі. Глыбіня абароны дасягала 150 — 200 кіламетраў. Асабліва моцнай была інжынерная абарона, якая налічвала да дзесятка ўмацаваных палос па галоўным для нас напрамку Гумбініен — Інстэрбург — Кенігсберг.

Раніцай 13 студзеня 1945 года тысячы гармат ударылі раскаленым дробячым металам па абароне ворага. Дым артылерыйскай стральбы паплыў над пярэднім краем. Хутка капрызныя вятры Балтыйскага мора прыгналі туман. Зліваючыся з дымам, ён станавіўся ўсё шчыльней, апускаўся ніжэй і хутка закрыў зямлю.

Пяхота разам з танкамі без авіяцыйнай падтрымкі хутка і рашуча паднялася ў атаку. Наступленне разгарнулася ў незвычайных для 3-га Беларускага фронту ўмовах. Войскі пераадолелі дзевятую, трыццатую траншэю, і зноў трэба было пачынаць усё спачатку.

Поспех баёў рашылі танкавыя злучэнні. І вось пільна ўглядаюцца салдаты ў вялікі горад Кенігсберг. Аб ім яны ведаюць толькі па падручніках гісторыі. Барацьба за Кенігсберг пачалася з гіганцкага артылерыйскага і авіяцыйнага ўдару. 80 гадзін працягвалася бітва за Кенігсберг. І ўвесь час трапны кулямётны агонь камсамольца Івана Андросенкі касіў ворага. Асабліва запамятаўся форт № 10, на тэрыторыю якога нашы падраздзяленні ўварваліся з паўночнай часткі, пераадолелі знешні роў і ў рукапашнай сутычцы супраціўленне ворага было падаўлена. У гэтым баі гвардзейцы заваявалі перамогу не лікам, а уменнем. Памянёны гарнізон ворага аказаўся па ліку ўтрая большы нашых штурмуючых стралкоў.

Крэпасць Піллаў стала канцом баявога шляху Івана Андросенкі. Салдату гвардзейскай дывізіі прыйшлося высаджвацца на гэты кавалачак, з трох бакоў акружаны морам. Мы не ведаем, як яны развітваліся з таварышамі па зброі, якія заставаліся на сушы, як станавіліся на калена перад сцягам часці са словамі «гонар гвардыі», так ужо прынята ў гвардзейцаў перад смяротным боем. Атрад гэты павінен быў выйсці на караблях морам, падыйсці да заходняга берага касы Фрыш-Нерунг, выйсьці тут і рухацца на злучэнне з усходнім дэсантным атрадам. Задача — перарэзаць дарогу Піллаў — Данцыг, якая праходзіць па касе, не даць немцам адступіць.

У ноч з 25 па 26 красавіка дэсантны атрад выйшаў у мора на катэрах, на шляху былі сустрэты праціўнікам — два катэры былі затоплены, 50 дэсантнікаў не дайшлі да

берага. Астатнія падыйшліі да касы на магчымую адлегласць, і гвардзейцы сталі скакаць у ледзяную ваду Балтыкі, трымаючы над галавой зброю.

У першыя мінуты была занята траншэя, якая ішла ўздоўж берага. Пачаўся няроўны бой. Тут, у гэтым крошыве металу, агню і чалавечага мяса, дзе на аднаго рускага прыходзілася дзесяць фашысцкіх салдат, кожны быў героем і кожны застаўся героем. І той, хто загінуў, і той, хто застаўся жывым. Вораг не павінен быў прарвацца да дарогі, яго трэба было скінуць у мора.

Бой працягваўся з 5 гадзін раніцы да 12 гадзін дня. Кожная наша, група адбівала па 10 — 15 атак праціўніка. На рахунку кожнага салдата былі дзесяткі забітых фашыстаў.

Апоўдні прарваўся ўсходні дэсантны атрад, ударылі сухапутныя войскі з цэнтра, г. зн., ужо з крэпасці Піллаў. Вораг быў разбіты.

Пасля вайны Іван Андросенка застаўся ў роднай армейскай сям'і. Гэта адзін наш аднагодак, які здолеў пераадолець усялякія цяжкасці часоў культу асобы Сталіна (з акупіраванай тэрыторыі), але ён закончыў ваенна-інжынернае вучылішча і стаў афіцэрам. Доўгі час працаваў па размініраванню беларускай зямлі. Прымаў удзел у вучэннях «Днепр» інжынерам у танкавым палку. У прэсе так паведамлялася аб іх часці: «Зямля ўздрыгнецца ад нястрыманага ходу танкавых калон, якія ўзначальвае палкоўнік Грыгаран. Іх дзеянні ў час вучэнняў былі высока ацэнены Міністэрствам абароны СССР. Для гэтых машын не страшны вялікія перашкоды, яны мабільныя, валодаюць вялікай сілай удару».

Час разбурае скалы, падмывае берагі рэк. Старэюць і паміраюць людзі, але наша салдацкая дружба з гвардыі маёрам запасу Іванам Андросенкам, маім аднагодкам і аднавяскоўцам, не падпарадкавана часу. Памяць аб выпакутаваным чыстая, як крынічная вада. І хацелася б, каб гэтыя радкі развілі ў юнакоў і дзяўчат Хоцімшчыны імкненне быць падобнымі ў сваіх дзеяннях сённяшніх, дапамаглі захоўваць у сэрцах невычарпальны зарад мужнасці і вернасці любімай Радзіме. Аб сціпласці франтавога пабраціма гавораць радкі пісьма Андросенкі: «На маёй кандыдатуры зрабіўшы выбіты, Міша, нямнога няўдала падабраў яе. На фронце я нічога геройскага не зрабіў, а ганарова нёс ратную службу. І такі трыццаць год у армейскім страі. Зараз я на ўмацаванні грамадзянскай абароны сталіцы рэспублікі — горада-героя Мінска».

**Ласоўскі, М.** У васемнаццаць хлапечых гадоў / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1988. – 23 лютага. - С. 2.

# Хадзіў па "Хоцімскаму друку"

## (100 год з дня нараджэння Андрэя Александровіча)

Пры вывучэннні Хоцімшчыны, тым больш даталёва, мяне як бібліятэкара-краязнаўцу цікавілі ўсе пытанні вытокаў і таямніц блізкага і далёкага мінулага. На вялікі жаль вядомыя даследчыкі нашаму прыбеседскаму краю ўвагу не ўдзялялі і як вынік - адсутнасць у бібліятэках нашай рэспублікі літаратуры па гэтай тэме. Заветнай марай была: зазірнуць бы ў кніжныя сховішчы бібліятэк Ленінграда і Масквы, і вось шчасце! Напярэдадні 50-годдзя Вялікага Кастрычніка ў 1966 годзе мне пашанцавала прыняць удзел ва Усесаюзнай нарадзе бібліятэчных работнікаў, арганізаванай Выстаўкай дасягненняў народнай гаспадаркі СССР і Дзяржаўнай бібліятэкі імя У.І. Леніна. Трасцінская сельская бібліятэка ў той час была лепшай бібліятэкай па краязнаўству на Магілёўшчыне – школай перадавога вопыту. Аб творчых пошуках і ўдасканальванні краязнаўчай работы бібліятэкі было прысвечана і маё выступленне на нарадзе. Незвычайнае ўражанне зрабіла на мяне прамова міністра культуры СССР Фурцавай, якая натхнёна заклікала нас: "…Трымаць вышэй галаву, больш упэўненасці, ніколі не губляцца ў бядзе, не губляць чалавечай годнасці і пажадала: "...каб у кожнага з удзельнькаў нарады было шмат творчых радасцей і удач".

З вялікай цікавасцю мы знаёміліся на выстаўцы з павільёнам "Савецкая культура". Арганізавана была экскурсія па Крамлю па бібліятэцы - центральным кнігасховішчы Айчыны. Усе вячэрнія часы свайго знаходжання у сталіцы я правёў у чытальных залах чароўнай "ленінкі".

Ёсць жартоўная метафара "як рэпу грыз". Дык вось і я "як рэпу грыз" у чытальных залах друкаваныя радкі ў выданнях з матэрыяламі аб родным куточку - Хоцімшчыне, краю Магілёўскага, зямлі Беларускай.

Захаваўся даслоўны запіс інфармацыі за подпісам Ягораў "Будзем працаваць на адраджэнне свайго краю", змешчанай 26 ліпеня 1925 года ў Клімавіцкай акруговай газеце "Наш працаўнік", у той самай газеце, дзе быў надрукаваны 30 верасня 1926 года верш дванаццаці гадовага Аркадзя Куляшова "Ты мой брат" (пад псеўд. Арк. Дуда).

"26 ліпеня адбыўся выпуск слухачоў-курсаў па беларусазнаўству для сакратароў сельскіх Саветаў нашага раёна. Выпускная камісія заявіла, што. за час існавання курсаў 4 курсанты скончылі добра і 9 здавальняюча. Пасля пасяджэння выпускной камісіі адбыўся ўрачысты сход, на якім прысутнічалі прадстаўнікі ад арганізацый. Дз. Фёдараў (старшыня РВК) у сваей заключнай прамове адзначыў, што свята на роднай мове - шлях да адраджэння нацыянальнай культуры.

Ад імя слухачоў выступілі 3 таварышы, якія адзначылі - мы будзем першымі піянерамі па правядзенню беларусізацы па нашых вёсках. Мы прыкладзем усю моц, усе нашы веды, якія мы атрымалі на курсах, кааб растлумачыць сялянству, якую карысць дала правільная нацыянальная палітыка ў нашай рэспубліцы, дзе ўсе нацыянальнасці роўны і дзе кожны зможа адраджаць сваю культуру.

Пасля прадмоў і заключнага слова слухач Казакоў прачытаў свой верш, ахвяраваны выпуску. Апрача яго, напісаў верш і слухач Майсеянкаў, які зачытаў раней. Гэтыя таварышы ўступілі сябрамі мясцовага гуртка "Маладняк". Пасля ўсяго магчыма смела сказаць, што курсы далі шмат і іх добрыя вынікі будуць відавочны ў самым хуткім часе".

У газеце асобна быў надрукаваны і верш Несцера Казакова "Наш кліч". Безумоўна, верш не літаратурны шэдэўр. Але ж мяне зацікавіла тое, што потым чытаючы архіўную даведку з нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь за 1926 год

сакратаром у Трасцінскім сельскім Савеце працаваў Казакоў Несцер – першы паэт нашай вёскі, першы сябра літаратурнай арганізацыі пісьменнікаў БССР (лістапад 1923 - лістапад 1928) "Маладняк", якое аб'ядноўвала пераважна маладыя літаратурныя сілы.

Дзейнасць "Маладняка" не замыкалася ў прафесійных рамках. Маладнякоўцы праводзілі вялікую культурна-асветніцкую і палітыка-выхаваўчую работу, былі актыўнымі памочнікамі камсамола і партыі ў культурным будаўніцтве.

Заслуга "Маладняка" ў выяўленні літаратурных талентаў сярод працоўных мас, іх ідэйна-эстэтычным выхаванні, творчай кансалідацыі на палітычнай платформе партыі Савецкай улады. Філіял "Маладняка" у Клімавічах пачаў сваё жыццё ў сакавіку 1925 года. У гэты ж час быў арганізаваны першы гурток у акрузе пры Хоцімскай беларускай сямігодцы. Кіраўнік Несцер Чубакоў, В.Е. Радчанка – член. Выдаваўся рукапісны часопіс.

Хоцімскія маладнякоўцы актыўную дапамогу аказвалі краязнаўцам у зборы і запісу народных песень, казак, слоў жывой мовы. Разам выдалі часопіс, прысвечаны 400-годдзю беларускага друку. У часопісе цікавыя звесткі аб Хоцімшчыне. Дублікат часопіса быў перададзен у дзяржаўную бібліятэку БССР у Мінск, але ў часы Вялікай Айчыннай вайны згінуў.

Міжвольна звярнуў увагу, што рэдактарам газеты "Наш працаўнік" працаваў у той час Андрэй Александровіч. Яскрава ўспомніліся трыццатыя гады, гады маёй вучобы ў вясковай сямігодцы, калі ў школьных беларускіх чытанках і хрэстаматыях былі змешчаны многія вершы паэта-наватара. З імем яго звязана нараджэнне беларускай савецкай паэзіі на першых яе кроках, у першыя паслякастрычніцкія гады. Вершы Александровіча вывучалі на ўроках у школе, - рэкламавалі на вечарах мастацкай самадзейнасці, на дзіцячых ранішніках, бо вучыліся тады амаль усе ў школе: днём - дзеці, па вечарах дарослыя.

*"Эх, сасоніца-сасна,*
*Дні суровыя,*
*Бервяно да бервяно - хата новая.*
*Гаратлівасці былой*
*Час пазбыцца нам,*
*Забудуем шыр балот*
*Камяніцамі".*

Андрэй Александровіч у беларускай паэзіі развіваў тэму авангарднай ролі рабочага класа ў будаўніцтве сацыялізму. Першы верш "Да моладзі" быў змешчаны ў газеце "Савецкая Беларусь" 12 мая 1921 года, калі яму не было шаснаццаці гадоў. А за час працы выдаў каля пяцізесяці кніжак. Пераклаў на беларускую мову "Інтэрнацыянал", паэму А. Пушкіна "Руслан і Людміла", шэраг твораў рускіх, украінсіх, літоўскіх паэтаў і празаікаў. Актыўна ўдзельнічаў паэт у грамадскім жыцці, абіраўся ў склад кіруючых партыйных органаў, быў членам ЦВК БССР, членам ЦК ЛКСМБ, членам праўлення СП СССР, наместнікам старшыні праўлення саюза пісьменнікаў БССР. З'яўляўся дэлегатам 8 надзвычайнага з'езда саветаў, на якім быў абраны членам камісіі па рэдагаванню Канстытуцыі СССР. У семнаццаць гадоў Андрэй Александровіч - адзін з арганізатараў літаратурнага аб'яднання "Маладняк", якое адыграла ролю ў развіцці беларускай савецкай літаратуры.

"У газетах рэспублікі сістэматычна змяшчаліся літаратурныя старонкі. Рэдакцыі адчувалі патрэбу ў літаратурных супрацоўніках, - піша ён у сваёй аўтабіяграфіі. – Асабіста востра гэта адчувалася ва ўсходніх раёнах, далучаных у 1924 годзе да БССР. Па камсамольскай пуцёўцы ў 1925 годзе мяне накіравалі на працу ў г. Клімавічы – цэнтр новаўтворанай Калінінскай акругі – рэдактарам акруговай газеты "Наш працаўнік".

"Для ўстанаўлення селькорамі і арганізацыі літаратурных гурткоў я часта выезджаў ў Хоцімск, Мсціслаў, Касцюковічы, Краснаполле іншыя раёны, бываў у многіх вёсках, дзе па-сутнасці я, гарадскі юнак, упершыню блізка пазнаёміўся з жыццём і бытам сялянства," - пісаў паэт.

Біяграфія была напісана ў кастрычніку 1962 года, і хаця ў акрузе было 10 раёнаў, першым ён назваў Хоцімск. Пры дэталёвым вывучэнні перыяда знаходжання паэтаў у нашым краі выявілася, як адкрыццё, як вялікая радасць, што паэт, знаходзячыся ў Хоцімску напісаў верш "Мястэчка", гэта першы мастацкі твор аб Хоцімску, і надрукаваны ён упершыню быў у газеце "Чырвоная змена" №104 1926 года. Восемьдзесят год таму назад. Верш прысвечан асноўнай тэме паэта – рабочай вуліцы новага горада, менавіта гэта тэма ўпершыню ў беларускай паэзіі загучала ў вершы Александровіча і назаўсёды вызначыла яго месца ў беларускай савецкай паэзіі. І калі першыя радкі верша:

*"Пятніца.*
*Вечар.*
*Запалілі свечкі*
*У кожнай хаце*
*Ціхага мястэчка"* перадаюць абставіны таго часу, то у канцы верша паэт перадае радасць будучага часу, новага жыцця:

*«Над мястэчкам, сонцу распасцёршы веццi,*
*Зазвінелі хвоі, ускалыхнулі ціш.*
*Цемень ночы знікла горкая, густая,*
*Ветры пагасілі змрочныя агні.*
*Золакам вясёлым узышла і ззяе*
*Новая раніца - прозалаць зарніц".*

З сатканага тысячамі друкаваных радкоў палатна першых газет нашага краю я пастараўся расказаць сучаснікам старонкі гісторыі Хоцімшчыны. Вытокі першых далёкіх пачынаючых пісьменнікаў-піянераў друкаванага слова.

**Ласоўскі, М.** Хадзіў па "Хоцімскаму друку" : [100 год з дня нараджэння Андрэя Александровіча] / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 2006. – 29 красавіка. - С. 4.

# Цуд радасці

У веснавыя дні радуюся сонцу, шчабятанню птушак, клёкату буслаў, журчанню ручаёў. На душы стан захаплення, калі хочацца падзяліцца радасцю з другімі людзьмі, выдзеліцца ад мітусні, глянуць на свет яснымі вачыма.

Вось і светлае свята Вялікадня, азначаючае сабой спрадвечную ўрачыстасць любві, абмывае неспакойныя душы прымірэннем, размякчае агрубелыя і бязлітасныя сэрцы, дорыць надзею на выратаванне ад брыдоты і пагібелі.

Раніцай у студні бяру ваду. Цешуся асалодай хараства зямнога шчасця. І, як песня, да майго слыху даносіцца мілагучнае і ласкавае:

— Добрай раніцы, Аляксеевіч!

Добрай раніцы і радаснага працоўнага настрою, дарагі Саша! – сыплю нібы з аўтамата скарагаворкай узаемна свайму аднавяскоўцу — былому актыўнаму чытачу сельскай бібліятэкі зваршчыку Аніщчанку, які спяшаецца на працу ў раённы цэнтр, праязджаючы на веласіпедзе побач па дарозе.

Кранула цеплыня прывітальных слоў, і адразу на ўспамін, як цудадзейныя лекі, прышлі вершаваныя радкі народнага песняра Якуба Коласа:

*Слова-радасць, слова-чары,*
*Вобраз вечна юных вёсен,*
*Ёсць ты ўсюды:*
*Ў сонцы, ў хмары,*
*Ты глядзіш праз неба просінь,*
*Лашчыш слух мой, слова-ззянне,*
*Атуляеш сэрца ласкай,*
*Ноч і вечар, дзень, світанне*
*Абняла ты, слова-краска.*

Займаюся прыборкай застарэўшых ліп, якія стваралі небяспеку руху па дарозе. Бензапілой іх зрэзалі старшыня сельскага Савета Уладзімір ІванавічКучанкоў і ўчастковы іспектар аддзела ўнутраных спраў райвыканкома Уладзімір Віктаравіч Балабенка і прапанавалі мне выкарыстаць іх на паліва за актыўны ўдзел уграмадскім жыцці вёскі. З бязмежнай удзячнасцю ацэньваю іх добразычлівы ўчынак у мой адрас, адрас апошняга інваліда Вялікай Айчыннай вайны з даваеннай вёскі Трасціно (зараз веска ўзбуйнены населены пункт і значна расшырыла свае граніцы за лік вёсак 1-га і 2-га Зарэччаў і Азёрнай). Карпатліва сякерай абсякаю галінкі са стараннем да драбніц, каб выкарыстаць іх па гаспадарску. І раптам чую пяшчотнае і звонкае, нібы выразнае вайсковае прывітанне:

— Добрага здароўя Вам зычу, Міхаіл Аляксеевіч!

— Добрага здароўя ўзаемна і Вам, Леанід Фёдаравіч! — з лагоднасцю адказваю я суседу, падпалкоўніку ў адстаўцы, былому лётчыку Тулікаву, які таксама на веласіпедзе праязджае па дарозе ў магазін.

Безумоўна, кранула да глыбіні душы прывітанне былога вайскоўца, напоўненае пачуццём шчырай любвіда роднай мовы, да суайчыннікаў. Пад уздзеяннем цеплыні ўспомніўся выпадак, як падзея незабыўная. Чарговым рэйсам у аўтобусе дабіраўся да райцэнтра. Як заўсёды, аўтобус быў перапоўнен людзьмі і мы, хто садзіўся ў Трасціно, рады былі, што вадзіцель зрабіў прыпынак і ўзяў нас у салон аўтобуса з разлікам на стаячыя месцы. Але як толькі крануўся аўтобус з прыпынку, да мяне са шчырай усмешкай на тварах звярнуліся дзве дзяўчыны-прыгажуні:

—Дзядуля, калі ласка, сядайце побач з намі. Іх запрашэнне выклікала пачуццё замілавання, захаплення нацыянальнымі асаблівасцямі характару маіх спадарожніц. І я, дажджынкай краплістай узрадаваны, уздымаюся па прыступках сусветнае гары, па галінках Божага дрэва існасці, каб спатоліць вечную прагу любві-адкрыцця, пранікненняў глыбізну жыццёвае касмічнае таямніцы, са здзіўленнем удакладняю:

— Дык я ж вам нараблю турбот і абмежаванняў.

— Ды Вы не хвалюйцеся аб нас, а сядайце, калі ласка, на сядзенне, а мы ўладкуемся па-сяброўску, на каленях аднаў другой... І адразу ўсё робяць, як гавораць.

Каб не пакрыўдзіць дзяўчат, уладкоўваюся на сядзенні і сыплю ім словы падзякі:

— Вялікае і шчырае дзякуй вам, дзяўчаты, за цеплыню вашых адносін у адрас старых людзей.

Дай Божа вам добрых хлопцаў, каб любоў і шчасце абнялі вас моцна-моцна, а радасць у вашым жыцці была заўсёды пастаянным ветразем-спадарожнікам. Ды і самі старайцеся смялей рашаць свае праблемы, кааб жрыцы не аднялі, не перахапілі пасланае вам Богам!

Цікаўлюся, адкуль такія маладыя дабрадзейкі.

— Мы з вёскі Гарадок Забялышынскага сельсавета, амаль адначасова гавораць яны.

А як вашы імя, прозвішча, дзе працуеце? — працягваю цікавіцца сваімі спадарожніцамі.

— Мяне завуць Света, і працую даяркай на ферме, а гэта мая сяброўка Лена пасля заканчэння сярэдняй школы яшчэ не ўладкавалася на працу. Ну а прозвішчы нашы мы Вам не скажам, — чамусьці засаромелася бойкая Света.

Пачуццё ўдзячнасці перайшло ў вострае жаданне без адкладна даведацца больш падрабязна аб дзяўчынах.

Праз некаторы час з дапамогай загадчыцы магазіна вёскі Гарадок Святланы Аляксандраўны Гайдарэнка я даведаўся, што незвычайную чуласць праявілі да зусім незнаёмага ім старога чалавека даярка саўгаса «Забялышына» Святлана Паўлаўна Долатава і яе сяброўка Алена Вітальеўна Гаўрыленка.

Часценька на ўспамін прыходзіць гэта падзея, як адна з самых цудоўных уласцівасцей, дараваных нам Богам. І я ў думках выказваю ўдзячнасць і Святлане, і Алене, і той зямлі, дзе яны нарадзіліся, і рукам іх маці, якія выпесцілі прыстойных дачок. Пачуццё ўдзячнасці – гэта сувязь з мінулым, духоўная сувязь з людзьмі, прытым, я лічу, высокая духоўная культура.

Днямі пры сустрэчы са мною сусед Мікалай Сяргеевіч Балабенка прапаноўвае:

— Ведаю, што працуеце Вы над тэмай «Памяць», я рэкамендую азнаёміцца з матэрыялам, змешчаным у газеце «Звязда» па гэтай тэматыцы. Вось і нумар газеты я Вам даю.

У гэты ж дзень тэхработніца сярэдняй школы Раіса Уладзіміраўна Мікуціна праходзіла па вуліцы, каб наведаць хворую маці, разам са сваімі дзецьмі —- вучнямі мясцовай школы дзевяцікласніцай Аленай, сямікласнікам Андрэем, Дзмітрыем — вучнем чацвёртага класа і хорам у чатыры галасы прывіталіся:

— Добры вечар!

Для мяне тэта быў цуд. Цуд радасці, шчасця, сілы, буяння, жыцця, сонца і святла.

Прасякнуты светлым, натхнёным пачуццём удзячнасці, не адкладваючы, каб не запазніцца проста быць чалавекам, як вучыў настаўнік Парфірый Карнеевіч Іваноў, на ўзбраенне бярыце яго параду «Дзетка»: «Здоровайся со всеми везде и всюду, особенно с людьми пожилого возраста. Хочешь иметь у себя здоровье — здоровайся со всеми».

**Ласоўскі, М.** Цуд радасці / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1998. – 27 мая. – С. 3.

Раніцаю ў кватэры раздаўся тэлефонны званок. Да апарата хуценька падбегла ўнучка Аня і пачала размову, а потым прамовіўшы: "Дзядуля, гэта якаясьці цёця пытаецца Вас" - передала мне трубку.

У трубцы чую мілагучнае прывітанне ў свой адрас сакратара сельскага Савета Тамары Аляксееўны Корневай і адразу ўсхваляваную размову: — Вось перада мною сядзіць наведвальніца з вёскі Жукаўка Таццяна Андрэеўна Ісаева, а на стале ляжаць прынесеныя ёю даволі інтарэсныя дакументы, якія я маю магчымасць упершыню бачыць у сваім жыцці. Лічу, што яны для вас таксама прадставяць вялікую цікавасць як краязнаўцу, які вывучае гісторыю Трасціншчыны. Калі ёсць у Вас магчымасць, то, калі ласка, прыдзіце і азнаёмцеся.

Цікавасць да дакументаў падзей былых часоў не знатавалася, не згубілася ў мяне і на схіле сваіх гадоў зямнога жыцця-быцця. І я спяшаюся на чарговую сустрэчу з неспазнанай, магчыма яшчэ і радаснай невядомасцю.

І сапраўды, мяне зацікавілі і самі дакументы, і асабліва беражлівыя адносіны да іх захавання гаспадыняй, на мой погляд, як даследчыка мінулых дзён. Гэта былі значнай важнасці дакументы, нябачаныя таксама яшчэ і мною ў нашай мясцовасці не толькі сямейнай раліквіі, але і заслужана музейнай захаванасці.

Уладальнікам большасці дакументаў быў яе мужык Васіль Яфімавіч Ісаеў, прах якога спачывае на вясковых могілках ужо 13 гадоў. У свой час пры сустрэчах з ім на вуліцы, на працы я не ведаў, што бачыў чалавека з легенды, жывога носьбіта слаўных традыцый, сведку і ўдзельнка хвалюючых подзвігаў. Праца чалавека зачароўвае заўсёды незалежна ці працоўная яна, стваральная, альбо ратная. Асабліва калі паказана яна бачна і яскрава, з вялікай павагай да майстра і да працы яго, якой ён служыў.

З жалем вельмі шкадаваі, што і мітусні і беганіне службовых абавязкаў і жыццёвых спраў мне не прышлося трымаць размовы з ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, і пагэтаму я з выключнай ўважлівасцю знаёміўся і чытаў дакументы, якія передавалі пахі пажарышчаў вялікіх жудасных бітваў, праз якія прайшоў наш зямляк-хацімчанін.

З хваляваннем браў я дзівам захаваўшуюся "Чырвонаармейскую кніжку", дзе пазначана, што ўладальнік яе, гвардыі старшы сержант, ураджэнец вёскі Слабада з верасня 1938 года па жнівень 1943 года служыў і ваяваў у 28 кавалерыйскім палку 3 гвардзейскага кавалерыйскага корпуса камандзірам аддзялення кабельнай лініі і ўзнагароджан ордэнам Айчыннай вайны II ступені № 7229 ў 1942 годзе. Атрымаў раненні ў абедзве нагі 28 лютага 1943 года. А далей ваяваў у 168 гвардзейскім асобным батальёне сувязі да 9 мая 1945 года з Германіяй, а з 8 жніўня па 3 верасня 1945 года - з Японіяй, дзе быў узнагароджан ордэнам Чырвонай Зоркі ў верасні 1945 года. Ён уладальнік медалёў "За перамогу над Германіяй" і "За перамогу над Японіяй". Зайздросціў шчасліваму лёсу ветэрана, што Гасподзь Бог беражліва яго захоўваў, хаця шляхі-дарогі былі не з лёгкіх.

Вось чытаю падзякі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, атрыманыя за выдатныя баявыя дзеянні ў бітвах за вызваленне горада Барыслава 13 сакавіка, горада Мікалаева 23 сакавіка, горада Адэсы - 16 красавіка, сталіцы брацкай Югаславіі горада Белграда 20 кастрычніка 1944 года, горада Брно на подступах да сталіцы Чэхаславакіі — 27 красавіка 1945 года Узнагароджан медалямі "За вызваленне Адэсы", "За вызваленне Белграда", "За вызваленне Прагі", "За ўзяцце Вены", "За ўзяцце Будапешта". Звяртаю ўвагу на дакументы, якія адносяцца да ўдзелу ў баях за горад Будапешт,- дзе ў лавіне

воінаў-вызваліцеляў знаходзіўся і мой брат кулямётчык Іван, які загінуў там, на венгерскай зямлі 21 снежня 1944 года. Мне думалася, што і Васіль, і Іван - прадстаўнікі Хоцімшчыны — там былі побач на ратным полі бою. Далей захоўваецца падзяка за выдатныя баявыя дзеянні ў баях з японцамі на Далёкім Усходзе.

Цікавасць да біяграфіі воіна-пераможцы заставіла зазірнуць у архіўныя сховішчы, пагаспадарчыя кнігі вёскі Слабада, дзе значыцца, што сям'я бацькоў стала членамі калгаса "Ранняя Зорка", які арганізаваны ў студзені 1930 года. Васіль, закончыўшы 7 класаў, да прызыву ў армію працаваў у калгасе. Пасля дэмабтілізацыі з арміі 26 снежня 1945 года вучыўся на курсах шафёраў у Мсціслаўлі. Па вяртанню з курсаў у МТС быў малы лік аўтамабіляў і яго прызначылі загадчыкам склада гаруча-змазачных матэрыялаў, а пасля рэарганізацыі на гэтай пасадзе сціпла адпрацаваў у саўгасе да выхаду на працоўны адпачынак - пенасію. Але і знаходзячыся на пенсіі, прымаў акгыўны ўдзел у працах на саўгаснай вытворчасці. Варыў куляшы на жывёлагадоўчай ферме для малых цялят.

Калі працаваў у МТС, пазнаёміўся з Таццянай, працаваўшай у бухгалтэрыі, ураджэнкай хутара Ерашоўка, што каля вёскі Міхалоў. Шлюб зарэгістравалі ў верасні 1949 года, хату пабудавалі ў 1959 годзе. Вырасцілі 2 сыноў. Але ліхалецце суровых дзён вайны ўнесла жыццё ветэрана ў 68-гадовым узросце.

Даўно закончылася вайна. Кожны новы мірны дзень аддзяляе ад нас грозныя падзеі гэтай гістарычнай бітвы нашага народа за сваю свабоду, за гонар і незалежнасць. Але ж у нашай памяці назаўсёды застануцца тыя, хто, не шкадуючы свайго жыцця, змагаўся, каб на зямлі быў Мір.

Мой допіс-расказ аб гераічнай мужнасці свайго земляка Васіля Яфімавіча Ісаева, які варты, каб пра яго ведалі ўсе людзі зямлі хоцімскай. У памяці кожнага ўдзельніка вайны яшчэ жывыя падзеі далёкіх гадоў і ў сэрцах нашых ніколі не пагасне полымя, што грэла нас у самыя цяжкія дні выпрабаванняў.

**Ласоўскі, М.** Чытаю дакументы ветэранаў / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1999. – 19 чэрвеня. – С. 2.

# *Шчырая песня салдата з вёскі Альшоў*

## *(да 75-годдзя П.Ф. Прыходзькі)*

І на старасці год сваіх да драбніц вывучаю родную матчыну мову, каб глыбей і шырэй пазнаць багатую культуру свайго народа, гісторыю роднага краю.

Ужо ў каторы раз карпатліва знаёмлюся з выданнем 12-м падручніка для 6—7 класаў з беларускай мовай навучання аўтараў У. Андрэенка і М. Яўневіч «Беларуская мова». З увагай у параграфе «Правапіс канчаткаў назоўнікаў у адзіночным ліку» у практыкаванні 163 выразна чытаю тэкст: «Родны край, дарагая Радзіма! Ты заўсёды ў нашых сэрцах, у нашых думках і пачуццях. Усё, што зроблена, дасягнута ў жыцці, звязана з табой, з тваімі клопатамі і любоўю. Ты вечна будзеш свяціць нам сваімі яснымі зорамі, узыходзіць ласкавым сонцам, звінець неўміручай матчынай песняй. Табе да канца жыцця мы прысвячаем сваё лепшае слова, свае шчырыя думкі і пачуцці, свае справы.

Ты — наша надзея, наша жыццё, радасць. Ты - наша сонца...». У думках з усхваляваннем чытаю прозвішча аўтара гэтых радкоў (П. Прыходзька). Зачараваны тэкстам, успамінаю, што ў свой прыезд у вёску Трасціно ў лютым 1971 года выдатны паэт-зямляк падарыў сваёй аднавяскоўцы, выкладчыцы беларускай мовы і літаратуры, маёй жонцы кніжку «Слова пра родны кут» з аўтографам: «Паважанай Галіне Паўлаўне — шчыраму, цудоўнаму чалавеку, які захоўвае ў сваім сэрцы глыбокую любоў да роднай зямлі і вучыць любіць яе нашых дзяцей сваім цёплым словам пра родны кут — Хоцімшчыну, дзе:

*Кожная травінка мае*
*свой тут пах,*
*Кожная птушынка мае*
*свой узмах.*
*Мы ж дамоў дарогу*
*знаем у бары,*
*Як вада да мора*
*ў сівым Дняпры».*

— Хоцімішчына для мяне, — гаварыў у дапаўненне госць, — самы блізкі і родны кут, куды я прыязджаю летам ці вясной, і адчуваю ўсёй душой пах роднай зямлі, шчодрасць і ласку чалавечых сэрцаў, сардэчнасць сваіх землякоў, і аб чым я і расказваю ў нарысе «Праз усё жыццё» у гэтай кніжцы, пра гэта я пісаў і ў аўтабіяграфіі «Бацькоўскімі сцежкамі», змешчанай у кнізе «Пра час і пра сябе».

Пры паўтарэнні прыназоўнікаў і злучнікаў у гэтым жа падручніку ў практыкаванні 661 зноў заданне прачытаць і выразна адказаць, якія думкі і пачуцці выказаў паэт П. Прыходзька ў вершы «Мая школа».

*Як толькі восеньскай парой вясёла*
*Званок абвесціць раніцы прыход*
*Мне кожны раз прыгадваецца школа*
*Ў якой вучыўся цэлых дзесяць год*
*Яна мяне, як роднага, страчала*
*Прыемным пахам хвоі, дзеразы*
*Любіў яе заўжды –*
*І ў снег падталы,*
*І ў восеньскія дні, і ў маразы.*

А пры вывучэнні правапісу канчаткаў назоўнікаў у множным ліку ў практыкаванні 784 трэба растлумачыць правапіс іх канчаткаў ва ўрыўку з верша “Першы гудок” (аб станцыі “Камунары”):

*Паднёс мне дзядзька сундучок драўляны*
*Да самых рэек, дзе стаяў цягнік.*

А ў падручніку «Беларуская мова» для 8—9 класаў гэтыя аўтары пры паўтарэнні вывучанага ў практыкаванні 570 даюць заданне паставіць знакі прыпынку і растлумачыць іх зноў з урыўка гэтага верша:

*Я мчаўся ў свет*
*З сваёй юнацкай марай,*
*Глядзеў на Бесядзь — родную раку.*

Падагульняючы думкі, не будзе перабольшваннем сказаць, што шматлікія вершы паэта-земляка, змешчаныя ў школьных падручніках і кнігах для пазакласнага чытання для вучняў, Пятра Федаравіча даюць падставу лічыць яго настаўнікам. І клас у яго вельмі вялікі: цэлая рэспубліка, і вучняў у яго вельмі многа — сотні тысяч. Выкладчыкам жа беларускай мовы і літаратуры на Хоцімшчыне трэба ганарыцца сваім земляком, які дапамагае ў вывучэнні дзіўнай роднай мовы. І пры ўмелым выкарыстанні вершаваных радкоў паэта-земляка:

*Мы хочам знаць, чаго*
*яшчэ не знаем,*
*І прага ведаў мроіць думкі нам*

вучні будуць наведваць з неўтаймаваным жаданнем урокі беларускай мовы і літаратуры, якія для іх стануць самымі цікавымі. Толькі патрэбна настаўнікам бездакарна ведаць і валодаць сваім прадметам, умець адказваць на самыя цяжкія пытанні сваіх вучняў, адкрываць вучням сваю душу і лічыцца чалавекам. Зліццё гэтых якасцей натуральна і неабходна для сапраўднага педагога, якога вучні жадаюць-мараць сустрэць.

А ў паэта-земляка вялікі духоўны скарб аб роднай хоцімскай старонцы паэмы: «Бесядскія віры», «Калыска паэта», «Дар князёўны» і цэлая нізка вершаў: «Родны кут», «Мой родны дом», «На радзіме», «Веска Альшоў», «Веска Ліпаўка», «Хоцімская камуна» і другія. А хіба не крануць сэрца кожнага хацімчаніна, калі па-майстэрску прачытаць радкі з лірычнага рэпартажа «Мая Магілёўшчына»:

*Магілёўшчына — край мой любімы!*
*Ганаруся я славай тваёй.*
*Ты — часцінка вялікай Радзімы,*
*Што жыве шматмільённай сям’ёй.*

Думаю, што прывабяць увагу і не будзе бяздушным, абыякавым выхаванец у дзіцячым садку альбо дашкольнік, калі яму прачытаць радкі з верша «Родны кут»:

*Каля вербаў па-над рэчкай*
*Хаты нашай вёскі,*
*Дзе-нідзе, нібыта свечкі,*
*Белыя бярозкі.*

Часта свае вершы аб Хоцімшчыне Пятро Фёдаравіч дасылае ў раённую газету, з якой не парывае сувязі, бо благаславенне атрымаў 5 мая 1936 года: на старонках нашай газеты быў надрукаваны яго першы верш «Стаханаўскі май». Але ж магістральная лінія ў творчасці паэта — гераічная барацьба савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны. І сам паэт у радах воінаў-вызваліцеляў ішоў па краіне, па Еўропе. На адным з франтавых фотаздымкаў, змешчаных у зборніку «Дні паэзіі», можна бачыць Пятра Прыходзьку перад будынкам паверžанага рэйхстага.

Яго верш «Помнік савецкаму салдату ў Берліне» (салдат-мінчанін Лук'яновіч ахвяраваў сваім жыццём, каб выратаваць нямецкую дзяўчынку) стаў хрэстаматыйным. Нельга без хвалявання чытаць верш «Апалены сон», прысвечаны памяці танкіста-камісара настаўніка Вялікаліпаўскай школы Максіма Захаравіча Шаўцова, які склаў сваю юную галаву ў грандыёзнай танкавай бітве на Курскай дузе. Кранае сэрца верш «Балада пра салдата» (пра артылерыста Мікалая Сірацініна, яікі загінуў у першыя дні вайны пад Крычавам).

З друку выйшла больш дваццаці зборнікаў-кніг паэзіі юбіляра. На чарзе новая кніга паэзіі «Каляровыя халады», у якую ўключаны вершы, балады, паэмы, напісаныя ў апошнія два-тры гады.

У адрас юбіляра Мікола Ваданосаў напісаў:

**ГОЛАС ВЁСКІ**
**АЛЬШОЎ**

*Па-над Бесяддзю людна не глуха,*
*П’ецца-льецца там нібы рака,*
*З паліваных гаршкоў медавуха*
*За здароўе Пятра-земляка*
*Там збіраў ён нямала арэхаў,*
*І рабіў у жыцці першы крок...*
*З таго часу паўсвету аб’ехаў*
*Наш зычлівы Прыходзька Пятрок.*
*Пачынаў сваю сцежку з Альшова*
*Беларускі вядомы паэт,*
*Майстар шчырага, трапнага слова –*
*Мы яго павіншуем як след.*
*Мы дадзім і зайчынага хлеба,*
*І застольную разам спяём,*
*Мы сустрэнем яго як і трэба,*
*І на шчасце гаршчок...разаб’ём.*

У дапаўненне пажадаем шчыра юбіляру творчага плёну ў напісанні добрых новых вершаў, здароўя, даўгалецця і шчасця.

**Ласоўскі, М.** Шчырая песня салдата з вёскі Альшоў : [да 75-годдзя з дня нараджэння П.Ф.Прыходзькі] / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1995. – 7 сакавіка. – С. 4.

# Яе вялікасць — вернасць і мужнасць

З вялікай  улюбёнасцю чытаю і перачытваю радкі матэрыялаў на сторонках нашай хоцімскай вястункі-ластаўкі, асабліва ж з замілаванасцю і асалодай, калі заўважу радкі, якія, нібы праменьчыкамі сонейка, высвечваюць добрый ўчынкі людзей зямлі хоцімскай. Асабіста лічу, што гэта «людзі-свечкі», ідучыя па шляху любві і дабрыні, міласэрнасці і спагады. Яны сваім жыццём сцвярджаюць ідэі перамогі дабра над злом дзейснай любові, творчай самааддачы, справядлівасці, вернасці, сумленнасці.

Шмат разоў дакранаюся да нумара «Шляха Кастрычніка» ад 1 сакавіка 1997 года, які нясе першы подых веснавой радасці, дзе на першай старонцы надрукавана віншаванне ад усёй душы доктара-тэрапеўта, лекара-мастака-чарадзея Веры Васільеўны Лімаравай сваёй пацыентцы, інваліду другой групы, салдацкай удаве з 90-годдзем з дня параджэння Ефрасінні Іванаўне Зарэцкай — жыхарцы гарадскога пасёлка.

Цеплыня гэтага віншавання ў якойсьці ступені штуршком натхніла, абавязала мяне, як краязнаўцу, прадоўжыць размову аб салдацкай удаве — добрай душы чалавеку. Вайна прайшла праз усё маё жыццё, праз маё пакаленне. Безнас, без мінулай вайны шмат што будзе незразумелае ў сённяшнім і будучым Рэспублікі Беларусь. Пагэтаму я не маю права маўчаць іне пісаць абвайне.

Успамінаю да драбніц, штоў той дзеньраніцай Есррасіння Іванаўна па тэлефонупаведаміла мне, штояеўнучка Антаніна, якая працуедоктарам у Мінску, прыслала мне асабіста праваслаўную літаратуру, да якой я ў апошні час маю вялікую зацікаўленасць. Не адкладваючы справу ў далёкую скрыню, раблючарговысвойвізіт у Хоцімск. І ў першую чаргу спяшаюся наведаць кватэру Ефрасінні Іванаўны.

З радасным хваляваннем вітаюся з гаспадыняй і з яе гасцямі — сынамі-волатамі Леанідам і Віктарам, нявесткай Зінай, дачкой Валяй. Іх узбуджаная, радасная гамонка і настрой перадаюцца і мне, тым больш, што мне ўручаюць добры падарунак — стосік жаданых кніг. Прашу перадаць шчырую падзяку асабіста Антаніне за кнігі, адначасова дзякую за арганізацыю перадачы і ўсіх прысутных.

Як толькі хацеў пакінуць кватэру, Ефрасіння Іванаўна разам з гасцямі, амаль у адзін голас паведамілі, што яны адзначаюць свята асаблівае — дзень нараджэння і вялікі 90-гадовы юбілей гаспадыні і ветліва запрасілі прыняць удзел у гэтым свяце. У гэты момант у кватэру ўваходзіць архімандрыт Кірыл, які таксама шчыра віншуе з днём нараджэння юбілярку і па яе асабістай просьбе праводзіць споведзь.

Ефрасіння Іванаўна ўручае часцінку сваёй пенсіі архімандрыту Кірылу на аднаўленне Свята-Троіцкай царквы. Усё гэта адбывалася так урачыста, прыгожа, пры высокай духоўнасці, што я і зараз адчуваю цеплыню той рытуальнай цырымоніі. Пад уплывам бачанага яскрава адчуваю прыстойнасць адказу Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі на пытанні галоўнага рэдактара газеты «Советская Белоруссия» П.Якубовіча «Большое видится на расстоянии»:

*«...Есть идеалы вечные. Для меня это христианские ценности, которые веками служат народам Европы, в том числе и белорусам, в качестве воспитателей, пастырей и утешителей. По сути, Христовы заповеди являются нравственным компасом для любого порядочного человека…»*

Гавораць, што салдацкі акоп  зраўнуецца з зямлёй толькі праз сто гадоў. Колькі ж стагоддзяў патрэбна, каб на нашай беларускай зямлі забыць плач салдацкіх удоў, сірат той мінулай вайны?

Адказу нельга атрымаць, ды яго ніхто і не ведае. Кожны раз, калі сустракаешся і развітваешся з салдацкімі ўдовамі, хочацца з захапленнем узяцца за пяро, каб напісаць пра старэйшых жанчын, такіх дарагіх і родных, на плячах якіх ляжаў цяжар вялікіх пакут. Толькі зараз, калі самі ўжо маем вялікіх дзяцей, мы сэрцамадчуваем, якімі сціплымі і самаадданымі гераінямі з'яўляюцца салдацкія ўдовы. Нельга не схіліць галавы перад мужнасцю і гордым цярпеннем простых жанок зямлі хоцімскай, якіх гора заўчасна састарыла, але не зламала, якія сваёй сціпласцю ўтойваюць у сабе незвычайную прыгажосць душы, тую прыгажосць, якую не змог адолець нават бязлітасны агонь вайны.

Ефрасінні Іванаўне ў сорак трэцім ішоў трыццаць пяты год. Пры адступленні нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі хату і ўвесь падворак, а на руках чацвёра дзяцей: чатырнаццацігадовы Ваня, дванаццацігадовы Лёня, сямігадовы Віця, двухгадовая Валя, якая ад ваеннага спалоху захварэла і стала інвалідам з дзіцінства. А нававбранец трыццаціпяцігадовы Пятро Нічыпаравіч (былы белабілетнік па стану здароўя ў даваенны час) папоўніў асабовы склад адной з дывізій 50-й арміі.

— Чатырнаццаць гадоў сумеснага нашага жыцця былі як сон, як казка, светлага, чыстага кахання, святога шчасця, песні чыстасардэчных адносін, — успамінае Ефрасіння Іванаўна. — І ўсё гэтае добрае, зямное перакрэсліла вайна. І як сведка таго былога засталося адно адзінае пісьмо, дакладней, паштоўка, перачытаная тысячу разоў, якую я захоўваю, як самую дарагую рэліквію.

Беражліва і я бяру ў рукі гэты дакумент вогненных год мінулай вайны самага дарагога для яе чалавека — Пятра Нічыпаравіча, жыццё якога абарвалася на паўдарозе ў 35 год, чалавека-працаўніка, волата зямлі Хоцімскай, успамін пра якога застаўся ў людскіх сэрцах светлай песняй жальбы аб незваротным, няскончаным, незабыўным. Дрыжачым голасам, глытаючы слёзы, з хваляваннем чытаю: *«Здравствуйте, дорогие родные: жена и дети. Шлю вам сердечный привет и желаю всего хорошего. Я нахожусь в лесу на обучении. Пока жив и здоров. Записок посылал две штуки. Не знаю, получили вы или нет. Вскорости отправят нас на передовую. Дорогая Фруза, напиши, что у тебя нового и положи в конверт конверт и бумаги листок, чтобы написать ответ. До свидания, с приветом. Зарецкий. 17 октября 1943 года».*

Дрыжанне не сціхае, і я перачытваю паштоўку некалькі разоў. Звяртаю ўвагу на штамп «Просмотрено военной цензурой», а побач штамп з датай: 19.10.43 г. А далей уважліва слухаю ціхую і журботную гаворку Ефрасінні Іванаўны:

— Пятро доўгі час працаваў конюхам у калгасе «Баявік» — зараз калгас «III Інтэрнацыянал». З надзвычайным стараннем завіхаўся каля коней. І коні ў яго былі хоць на выстаўку. Часта бываючы ў калгасе, старшыня райвыканкома т. Палякоў угледзеў яго стараннасць і запрасіў да сябе ў райвыканком загадчыкам гаспадаркі. Па стану здароўя будучы белабілетнікам, у 41-м годзе не быў мабілізаваны, а пры вызваленні раёна ў 43-м годзе палявым штабам 50-й арміі быў прызваны. На развітанне прасіў: «Беражы дзяцей». Гэту просьбу я выканала.

Колькі незваротнай страты і гора чуецца ў словах удавы, якая, уздыхаючы, паказвае паштоўку ваенных год: «І гэта ўсё, што засталося ад самага дарагога чалавека». Разам з сынамі наведала яго магілу ў вёсцы Любаны Слаўгарадскага раёна. У другіх даведніках знайшоў вёску Любаны, у якой маецца тры захаванні савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Брацкая магіла на паўднёвай ускраіне вёскі, дзе пахаваны 321 воін, на вясковых могілках пахаваны сем воінаў і пяць воінаў за 1 км ад вёскі ва ўрочышчы Загуменне.

Каб удакладніць, дзе пахаваны салдат з Хоцімшчыны, завітаў у райваенкамат, дзе абаяльная супрацоўніца Святлана Адамаўна Ільюшчанка выдала даведку: «Зарецкий Пётр Никифорович, 1908 года рождения, умер в госпитале 29 октября 1943 года.

Опушка леса 1 км юго-восточнее д. Любаны Славгородского района. Могила № 7, место 4. Извещение передано жене Ефросинье Ивановне 14 декабря 1943 г. № 501».

Аб 12 днях жыцця на фронце ў баявой абстаноўцы я хацеў бы расказаць паэтычнымі радкамі, якія нібы маланкай ідуць-бягуць на ўспамін аб тых вогненных днях. Мікола Аўрамчык у вершы «У начы перад наступленнем пісаў»:

*...Перад наступленнем*
*Змоўкла франтавая паласа:*
*Хоць бы прастрачыў хто з аўтамата*
*Здрадлівую ціш такой начы...*
*Хоць бы дзе адзіная гармата*
*Зноў ускалыхнула далячынь.*
*Адчуваеш, як пад плашч-палаткай*
*Прабіваецца з зямлі мурог...*
*У тылу цяпер не спяць салдаткі,*
*Нас чакаюць з баявых трывог.*

А вось радкі паэта з Клімаўшчыны Івана Бурсава, напісаныя па расказах землякоў аб сапраўдных падзеях таго часу, што адбыліся:

*Возле Прони-реки,*
*у безвестного града Пропойска...*
*Был густым листопад*
*в октябре сорок третьегогода,*
*Листья пахли тротилом,*
*и гарью несло от воды,*
*И лежала в грязи*
*необученная пехота,*
*и лоснились от грязи*
*домашнего кроя порты,*
*Молодой лейтенант в галифе*
*дрогнул тонким коленцем,*
*и в сердитом изломе*
*скривился мальчишеский рот:*
*— Это вам не на печке*
*два года скрываться*
*от немцев! —*
*И сославшись на мать,*
*первым встал из воронки:*
*— Вперёд!*
*В посиневшие лица*
*Плеснула огнём переправа.*
*Непролазным осинником*
*встали взрывы на черном лугу...*
*До сих пор поименно*
*перечислить не может их слава,*
*пехотинцев в домашних портах,*
*что на левом лежат берегу.*
*...После смерти их скульптор*
*в военную форму одел.*

А далей ідуць чаргой радкі, напісаныя паэтам-франтавіком Аляксеем Пысіным:

*Пяць патронаў ў абойме,*
*Пяць патронаў.*

*Подымаемся ў бой мы*
*У полі роўным.*
*У патроне кожным — куля,*
*Дзевяць грамаў.*
*Не чакай, мая матуля,*
*Тэлеграмы.*
*Ні з санбата палявога,*
*Ні з пагоста.*
*Ходзіць ціха, бо дарога —*
*Наша пошта.*
*Цэлы–месяц будзе весці*
*праз краіну*
*Спавяшчэнне ў канверце,*
*Быццам міну.*
*Цэлы месяц будзеш верыць,*
*Што жыву я,*
*Скажаш яблыням і вербам:*
*— Ён ваюе...*

Гавораць — пуля-дура. Асколак гранаты, бомбы або снарада — не разумней. Таксама не выбірае, у якога менавіта салдата ўваткнуцца і куды менавіта. І фінальныя радкі Міколы Аўраменкі з верша «У шпіталі»:

*Толькі зрэдку адчыняюцца дзверы палаты,*
*Прамількне санітарка*
*Бясшумна, як цень...*
*Доктар суткі з плячэй  не знімае халата,*
*А паранены трызніць ізноў цэлы дзень.*
*«Што вы хлусіце, доктар...*
*Ну, дзе ў мяне раны?..*
*Гляньце-вы,*
*Як чаромха цвіце каля хат....*
*Дайце соку з бярозы...*
*Я вып'ю  — і ўстану...*
*Ну, навошта вам белы*
*халодны халат?».*
*Санітарка маўчыць,*
*Заціхаюць нясмелыя крокі...*
*Нават чутна*
*Дыханне з суседніх палат.*
*Па шчацэ пракацілася*
*Цяжкая кропля,*
*Упадзе —*
*І, здаецца, прапаліць халат.*

У якойсьці ступені дэталёва я хацеў паказаць абставіны апошніх дзён нашага земляка-хацімчаніна, які не вярнуўся з безтэрміновай перадавой, дзе змагаўся да апошняга дыхання, дзе чалавек выпрабоўваўся зла і ў самых складаных жыццёвых абставінах здзейсніў подзвіг, неўміручы подзвіг. Подзвіг... Што гэта? Слоўнікі даюць такі адказ: «Гераічны, самаадданы  ўчынак». У даўнія часы чалавека, які здзейсніў учынак, называлі не героем, а падзвіжнікам. Рухалі яго на самаадданае дзеянне любоў да ісціны, да людзей, да сваёй краіны. Усім было цяжка — ад радавога да маршала. Але цяжэй усяго было тым, хто першым падымаўся ў атаку.

— Доктара Веру Васільеўну лічу сваім выратавальнікам, яна двойчы вяртала мяне з таго свету, — працягвае свой расказ Ефрасіння Іванаўна. — Яна валодае вялікім мастацтвам міласэрнасці. У яе адкрытае і чулае сэрца да людзей. Вялікае дзякуй і Мар'і Мікітаўне Кавалёвай, якая ў пасляваенны час працавала дырэктарам Хоцімскай сярэдняй школы, якая запрасіла мяне на працу тэхработніцай школы, дзе я пасля калгаса працавала да выхаду на пенсію. Агульны працоўны стаж мой трыццаць адзін год.

У наступным годзе Ефрасіння Іванаўна будзе адзначаць дзень нараджэння ў 91-ы раз. Нялёгкае цікавае жыццё пражыта ёю. Праз усё жыццё яна пранесла вернасць першаму каханню. Наперадзе яшчэ ўсходы і захады. Хочацца, каб іх было багата. Няхай адсвечваюцца яны ў вачах умудроных і так шчыра раскрытых на жыццё як і ў семнаццацігадовай дзяўчыны, пакахаўшай Пятра ў далёкім тысяча дзевяцьсот дваццаць сёмым годзе. Яна ўжо бабуля, а маладосць не ўходзіць з думак. Пастарэўшая жанчына па сённяшні дзень чакае свайго каханага, маладога і па-ранейшаму прыгожага Пятра. Трымае, безумоўна, надзею на цуд, нягледзячы, што з безтэрміновай перадавой няма нікому звароту. Але ж усё-роўна нібы чуваць яго голас размовы:

*На выжырах баёў*
*Мы не адны,*
*Плыве над намі ўдовіна малітва.*
*Ярчэе ў кветках смутак даўніны,*
*Дзе боль салдата*
*Зарывам разліта.*
*Мы ў жураўлінай песні*
*Адплылі у забыццё,*
*Дзе сорам нас не паліць.*
*Вярнуліся б да вас,*
*Калі б змаглі*
*Вы захаваць пра нас*
*Зямную памяць.*
*Душу байца вякі не разатруць,*
*З нябёсаў свецяць зоркі франтавыя,*
*Забітыя ў баях за Беларусь,*
*Мы да нашчадкаў вернемся жывымі.*

У свеце ўсё імкнецца да дасканаласці, да прыгажосці, да радасці быцця, вернасці любові.

Прашу прабачэння, што, магчыма, я не змог у поўнай меры перадаць багацце пачуццяў простай, мужнай жанчыны-гераіні, не здолеў знайсці больш дакладную характарыстыку, не знайшоў больш важкіх, душэўных, сакавітых, слоў, у якойсьці ступені не расказаў, што да галоўнага гора дабавіліся новыя — пры выкананні службовых абавязкаў загінуў старэйшы сын Іван, доктар-хірург, загінуў праўнук школьнік Павел летам гэтага года ў час урагану. Не ўдзяліў увагі, як на карэце-красуні з лесу в. Бяседавічы з сынамі-хлапчукамі-безбацьковічамі вывазілі бярвенні, адпушчаныя дзяржавай пагарэльцам на будаўніцтва хаты. Як арала, касіла за мыльныя працадні ў калгасе. Як у часы ўраўнілаўкі дзяліла дзецям адзіны батон хлеба, куплены ў краме, і шмат чаго іншага. Еўдакія Лось у сваім вершы «Адрэзак» піша:

*Ад, сорак трэцяга*
*Да дзевяноста восьмага*
*Хапіла хвалёнага,*
*Хапала праклятага...*
*Край быў на ўдоў,*

*на сірат багаты,*
*На скраспелыя кузні і хаты,*
*На цягавітыя бабскія сілы,*
*І на бяспомнікавыя магілы...*
*Бабы ўпрагаліся ў плуг  непакорны.*
*Бабы травой харчаваліся чорнай...*
*Помнікі, помнікі,  горкая замець,*
*Над курганамі плакала  памяць...*

Нізкі зямны паклон Вам, салдацкая ўдава Ефрасіння Іванаўна — наша хоцімская Мадона, наша хоцімская Яраслаўна. У Вас чысціня перад людзьмі, перад Богам.

**Ласоўскі, М.** Яе вялікасць – вернасць і мужнасць / М.Ласоўскі // Шлях Кастрычніка. – 1998. – 24 студзеня. – С. 1.

Спадчына трасцінскага краязнаўцы

*Зборнік артыкулаў з перыядычнага друку*

Складальнік: Л.А.Кляцова
Адказны за выпуск: А.Ф.Лутчанкова

Хоцімская бібліятэчная сетка
Трасцінская сельская бібліятэка

213670, Хоцімскі р-н, в. Трасціно
Тэлефон: 8 (02247) 2 44 22